МАТЭРЫЯЛЫ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ:

## СТАН, ЗДАБЫТКІ І СУПЯРЭЧНАСЦІ, ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

У 4 частках

Частка 1

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»
КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ:

## стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця

Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі

3-4 мая 2002 года

Гродна

У 4 частках

Частка 1

Гродна 2003

УДК 947.6
ББК 63.3(4Беі)
А 43

Арганізацыйны камітэт:
П.І.Брыгадзін (старшыня)
М.С.Сташкевіч (сустаршыня)
М.П.Касцюк (сустаршыня)
А.А.Яноўскі (сустаршыня)
В.В.Сянько (сустаршыня)
І.П.Крэнь (нам. старшыні)
І.А.Змітровіч (нам. старшыні)
І.І.Коўкель
А.М.Нечухрын
І.А.Фёдараў
В.М.Чарапіца

Рэдакцыйная калегія:
І.П.Крэнь (адказны рэдактар)
У.І.Навіцкі (адказны рэдактар)
І.А.Змітровіч (адказны рэдактар)
В.А.Белазаровіч
І.І.Коўкель
М.Я.Калацэй
У.М.Міхнюк
С.В.Марозава
І.В.Соркіна
У.А.Сосна
С.Я.Сяльверстава
С.М.Ходзін
Э.С.Ярмусік

Рэцэнзенты: доктар філасофскіх навук, прафесар Ч.С.Кірвель;
доктар гістарычных навук, прафесар Э.А.Забродскі.

А 43 **Актуальныя** праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця: Матэрыялы рэспуб. навук. канф.: У 4 ч. Ч. 1 / Пад рэд. І.П.Крэня, У.І.Навіцкага, І.А.Змітровіча. – Гродна: ГрДУ, 2003. – 348 с.

ISBN 985-417-496-4 (ч. 1)
ISBN 985-417-500-6

Надрукаваны даклады і паведамленні рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, прысвечанай гістарычнай навуцы Беларусі, яе стану, здабыткам і супярэчнасцям, перспектывам развіцця.

Матэрыялы будуць цікавымі для навукоўцаў, выкладчыкаў, аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў ВНУ, настаўнікаў гісторыі школ, ліцэяў, гімназій, прафесійна-тэхнічных і мастацкіх вучылішчаў, каледжаў, спецыяльных навучальных устаноў, шырокага кола чытачоў.

**УДК 947.6**
**ББК 63.3(4Беі)**

**ISBN 985-417-496-4 (ч. 1)**
**ISBN 985-417-500-6**

© Афармленне. ГрДУ імя Я.Купалы, 2003

# АД РЭДАКЦЫЙНАЙ КАЛЕГІІ

*І.П.Крэнь,*
*намеснік старшыні аргкамітэта і адказны рэдактар, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь* *г. Гродна*

У прапануемым зборніку змешчаны матэрыялы рэспубліканскай канферэнцыі «Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця», якая адбылася ў Гродне 3-4 мая 2002 года. Ініцыятар канферэнцыі – кафедра гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Ініцыятыва падтрымана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Інстытутам гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь і Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Аргкамітэт канферэнцыі ўзначаліў міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктар гістарычных навук, прафесар Брыгадзін Пётр Іванавіч, а сустаршынямі з'яўляліся дырэктар Інстытута гісторыі НАН РБ, доктар гістарычных навук, прафесар Сташкевіч Мікалай Сцяфанавіч, загадчык аддзела гэтага ж Інстытута, доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік НАН РБ Касцюк Міхаіл Паўлавіч, першы прарэктар БДУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Яноўскі Алег Антонавіч і прарэктар па навуковай працы ГрДУ імя Я.Купалы, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Сянько Васіль Васільевіч.

У канферэнцыі прынялі ўдзел навукоўцы практычна з усіх навуковых і вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, шэраг даследчыкаў-гісторыкаў з Расійскай Федэрацыі, Польшчы, а таксама аспіранты, настаўнікі, студэнты. Усе ўдзельнікі канферэнцыі, матэрыялы якіх былі ўключаны ў праграму, мелі магчымасць выступіць як на пленарным пасяджэнні, пасяджэннях секцый, так і прыняць удзел у рабоце «круглага стала» «Гістарычная навука і гістарычная адукацыя. Распрацоўка канцэпцыі гістарычнай адукацыі», кіраваў пасяджэннем якога аўтар гэтых радкоў.

Неабходна адзначыць, што ў шэрагу выступленняў па розных аспектах разглядаемых на канферэнцыі праблем выказваліся і дыскусійныя пункты гледжання і меркавання. Таму пры падрыхтоўцы дадзенага зборніка да друку рэдакцыйная калегія не палічыла патрэбным уносіць тыя ці іншыя карэктывы канцэптуальнага і метадычнага фактараў у прадстаўленыя аўтарскія тэксты. У сувязі з гэтым адказнасць за прапанаваныя тэксты, іх змест і навуковы ўзровень нясуць аўтары. Даклады і артыкулы друкуюцца на мове арыгінала.

# ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА

*У.П. Амелька,*
*начальнік Упраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі Гродзенскага аблвыканкома* *г. Гродна*

Шаноўныя ўдзельнікі канферэнцыі!
Паважаныя калегі, госці!

Перш за ўсё дазвольце мне па даручэнні кіраўніцтва Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта сардэчна павіншаваць Вас з нагоды адкрыцця такой прадстаўнічай канферэнцыі.

Канферэнцыі вельмі важнай і актуальнай, бо яна закранае ўсе бакі далейшага развіцця як гістарычнай навукі ў цэлым, так і гісторыі Беларусі, яе набыткі, сучасны стан з усімі супярэчнасцямі.

Я ведаю, што гістарычная навука Рэспублікі Беларусь перажывае зараз складаны і супярэчлівы перыяд у сваім развіцці. Не хачу называць яго крызісным, бо гэта не азначае заняпад навуковых ведаў, а звязаны больш за ўсё з пераасэнсаваннем карэнных метадалагічных асноў гістарычнай навукі. Мяняюцца важнейшыя арыенціры і крытэрыі, вучоныя адказваюцца ад адных канцэпцый на карысць іншых, з'яўляюцца новыя ацэначныя падыходы як да гістарычнага мінулага, так і да сённяшняга дня.

Працэсы гэтыя няпростыя, бо закранаюць праблемы і маральныя, і палітычныя ды і проста чалавечыя ўзаемаадносіны.

І таму я хачу выказаць шчырую ўдзячнасць арганізатарам канферэнцыі, якія вынеслі на абмеркаванне гісторыкаў з розных мясцін Беларусі, з розных навучальных устаноў усе супярэчлівыя і надзённыя праблемы.

Некалькі дзён таму, знаёмячыся з навуковымі выданнямі і дысертацыямі па гісторыі Беларусі за апошнія 10 гадоў (калі Беларусь стала незалежнай і суверэннай), мне трапіў у рукі зборнік артыкулаў амаль з такой жа назвай – «Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі». У 1992 годзе аналагічную канферэнцыю праводзілі ў Мінску.

Я ўпэўнены, што сённяшняя канферэнцыя ў многім выправіць асобныя прабелы ў вывучэнні гісторыі нашай краіны. Бо не з усімі падыходамі дзесяцігадовай даўніны можна пагадзіцца.

Прыемна, што наш Гродзенскі універсітэт у апошнія гады ўсё больш заяўляе пра сабе як аб своеасаблівым навуковым цэнтры заходняга рэгіёну. Тут, на мой погляд, склалася добрая школа па падрыхтоўцы навукоўцаў, настаўнікаў – даследчыкаў.

Толькі за апошнія два гады я налічыў больш за два дзесяткі абароненых дысертацый, сёння многія кандыдаты гістарычных навук будуць выступаць з дакладамі. Абаронены 4 доктарскія дысертацыі па гісторыі Беларусі – С.В.Марозавай, С.Я.Куль-Сяльверставай, В.В.Шведам, А.К.Краўцэвічам, на падыходзе яшчэ некалькі.

Навукоўцы з кафедры гісторыі Беларусі пад кіраўніцтвам І.П.Крэня плённа працуюць над падрыхтоўкай падручнікаў і навучальных дапаможнікаў і могуць аказаць дапамогу Міністэрству адукацыі ў выкананні прэзідэнцкага даручэння напісаць такія падручнікі гісторыі Беларусі, якія былі б аб'ектыўнымі, поўнымі і даступнымі.

Безумоўна, не магу не сказаць, што гістарычны факультэт, перш за ўсё, кафедра гісторыі Беларусі дапамагае нам у падрыхтоўцы гісторыка-дакументальных кніг-хронік «Памяць». Зараз па 7 раёнах яны выйшлі, па 3 – вось-вось выйдуць, а па 7 – на канчатковай стадыі падрыхтоўкі.

Вельмі дапамаглі вучоныя аблвыканкому ў падрыхтоўцы да 200-годдзя з дня ўтварэння Гродзенскай губерні, мерапрыемствы з нагоды якога мы правялі ў снежні 2001 года.

Актуальнасцю вызначаюцца навуковыя канферэнцыі па этнасацыяльных і канфесіянальных працэсах, што адбываюцца ў Гродзенскай вобласці і Беларусі, міжнародныя канферэнцыі «Шлях да ўзаемнасці», чарговая з іх будзе праходзіць сёлета ў 10-ты раз у Гродне.

Пажадана, каб у час работы секцый ішла сапраўдная дыскусія.

Не трэба баяцца спрэчных думак і прапаноў, пастановачных пытанняў. Бо ісціну можна знайсці толькі пры абмеркаванні праблемы. Добры прыклад у гэтым паказвае навуковы часопіс «Веснік Гродзенскага універсітэта».

Плённай творчай працы Вам, дарагія сябры!

# УСТУПНАЕ СЛОВА

*В.В.Сянько,*
*прарэктар па навуковай працы*
*Установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны*
*універсітэт імя Янкі Купалы»* *г. Гродна*

Дазвольце мне ад імя рэктара універсітэта праф. С.А.Маскевіча, усяго калектыва вітаць Вас у адной з буйнейшых навучальна-навуковых устаноў Рэспублікі Беларусь – Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы.

Думаецца, будзе правільным і слушным на канферэнцыі, дзе абмяркоўваюцца актуальныя праблемы гісторыі Беларусі, некалькі слоў сказаць аб развіцці нашага універсітэта.

Універсітэт бярэ свой пачатак з настаўніцкага інстытута, які быў створаны ў 1940 годзе. Але яго сапраўдная дзейнасць пачынаецца пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і стварэння ў 1944 г. на базе настаўніцкага педагагічнага інстытута.

Пачаткам актыўнага развіцця навукова-даследчай працы лічыцца другая палова 50-х гадоў. Менавіта ў гэты час усталёўваецца цесная сувязь навучальнай і навуковай працы. Колькасць кандыдатаў навук у перыяд з 1949 па 1959 год вырасла з 9 да 19 чалавек, але іх удзельная вага ў агульнай колькасці навукова-педагагічнага персаналу інстытута складала толькі 28 %. Асноўнымі навуковымі кірункамі ў 50-я гады з'яўляліся: гісторыя савецкага грамадства, гісторыя атэізму, гісторыя савецкай агульна – адукацыйнай школы, методыка выкладання матэматыкі, навуковы аналіз творчасці пісьменнікаў. На мой погляд, адной з падстаў стварэння ў 1954 годзе гістарычнага факультэта з'явіўся назапашаны за мінулы перыяд значны навуковы патэнцыял у галіне гістарычных даследаванняў.

У 70-я гады інстытут становіцца не толькі цэнтрам падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў, але і цэнтрам навуковых даследаванняў, што і дае падставу ператварэння яго ў 1978 г. ва універсітэт. Менавіта з гэтага моманту пачынаецца шырокае развіццё навуко-

ва-даследчай работы, адкрываюцца новыя магчымасці развіцця студэнцкіх навуковых даследаванняў.

На момант стварэння універсітэта ў ім працавалі 238 чалавек прафесарска-выкладчыцкага персаналу, у тым ліку 3 доктары і 85 кандыдатаў навук, навуковыя даследаванні вяліся па 90 тэмах.

У перыяд з 1978 года пачынаецца яшчэ больш дынамічнае развіццё ўсіх галін дзейнасці універсітэта, але ўжо як навучальна-навуковай установы. Плённая праца ўсяго калектыва універсітэта дазволіла за перыяд існавання універсітэта ператварыць яго ў адзін з буйнейшых цэнтраў адукацыі, навукі і культуры Рэспублікі Беларусь.

У прыватнасці, на сённяшні дзень ва універсітэце працуюць 35 дактароў і 281 кандыдат навук. Навуковыя даследаванні вядуцца па 218 тэмах. Універсітэт узначальвае рэгіянальную навукова-тэхнічную праграму і дзве міжінстытуцкія праграмы фундаментальных даследаванняў, удзельнічае практычна ва ўсіх, па профілю сваіх навуковых даследаванняў, дзяржаўных праграмах фундаментальных навуковых даследаванняў, выдае навуковы і навукова-метадычны часопісы.

У апошнія 5 гадоў штогод ва універсітэце абараняецца 2-3 доктарскія і 15-20 кандыдацкіх дысертацый, публікуецца звыш адной тысячы навуковых артыкулаў, 20-30 манаграфій, 50-80 падручнікаў і дапаможнікаў, 45-55 студэнтаў з'яўляюцца дыпламантамі рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў, студэнтамі публікуецца 250-350 тэзісаў дакладаў і артыкулаў.

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі, упэўнены, сённяшняя канферэнцыя «Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця» з'яўляецца значнай падзеяй не толькі для нашага універсітэта, але і для ўсяго навуковага грамадства Рэспублікі Беларусь, яна ўнясе значны ўклад у развіццё гістарычнай навукі Беларусі.

Дазвольце павіншаваць Вас з яе адкрыццём, пажадаць плённай працы, шчасця і дабрабыту Вам і Вашым блізкім.

# ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

*М.С.Сташкевіч,*
*дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі,*
*доктар гістарычных навук, прафесар* *г. Мінск*

## СУЧАСНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ: СТАН, ДАСЯГНЕННІ, ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

У другой палове XX ст. у развіцці беларускай гістарыяграфіі можна вылучыць дзве важнейшыя вехі – сярэдзіна 1950-х і другая палова 1980-х г.

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў гістарычнай навуцы БССР працягвала дамінаваць ідэалагічная трактоўка, якая скоўвала творчы падыход і аб'ектыўны аналіз у асвятленні гісторыі беларускага народа. Гэта было характэрна для ўсёй савецкай гістарычнай навукі. Партыйна-ідэалагічныя лозунгі прадпісвалі ёй строга вызначанае асвятленне асноўных праблем, падзеяў і характарыстыку дзейнасці галоўных гістарычных персанажаў. Гэтыя партыйна-ідэалагічныя крытэрыі вызначалі ў абсалютнай большасці выпадкаў вартасць тых ці іншых гістарычных прац.

Праца гісторыкаў была пастаўлена ў жорстка вызначаныя рамкі паводле партыйных дырэктыў і пастаноў, указанняў кіраўнікоў партыі і дзяржавы. Мяжа паміж гісторыяй як навукай і палітычнай прапагандай была фактычна сцертай, асабліва гэта тычылася тых навуковых сфераў, якія ўяўлялі практычна-палітычную цікавасць. Роля гістарычнай навукі ў СССР зводзілася да функцыі абслугоўвання тых ці іншых партыйна-ідэалагічных патрэбаў. У грамадстве фармавалася спрошчаная гістарычная свядомасць, якая адлюстроўвала канфармісцкую карціну падзей і працэсаў.

І хоць пасля смерці І.В.Сталіна і асабліва пасля выступлення новага кіраўніка КПСС М.С.Хрушчова ў лютым 1956 г. на XX з'ездзе партыі з дакладам пра культ асобы было заяўлена аб неабходнасці пераадольвання яго наступстваў, у тым ліку і ў сферы гістарычных ведаў (у рашэннях XX з'езда КПСС падкрэслівала-

ся неабходнасць сур'ёзнай барацьбы супраць дагматызму і суб'ектывізму пры трактоўцы гістарычнага працэсу, аб'ектыўнага даследавання падзей мінулага), тым не менш, у паўсядзённай практыцы савецкае кіраўніцтва не адышло ні на крок ад прынцыпу марксісцка-ленінскай партыйнасці ў гістарычнай навуцы. Адыход ад прынцыпаў партыйна-класавага падыходу ў ацэнцы гістарычнага мінулага не дапускаўся. Такім чынам, у 1960 – 1980-я г. даследаваць гістарычныя праблемы было дазволена толькі ў рамках і ў кантэксце марксісцка-ленінскай метадалогіі. Менавіта ў гэты перыяд марксісцкая канцэпцыя гістарычнага працэсу ў БССР атрымала найбольш шырокае ўвасабленне ў значных абагульняючых працах – «Гісторыя Беларускай ССР» (у 5 тамах), «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» (у 12 тамах), «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» (у 8 кнігах), «Францыск Скарына і яго час», «История Белорусской ССР».

Безумоўна, гэтыя выданні аказалі пазітыўны ўплыў на развіццё гістарычнай навукі ў рэспубліцы. Аднак адлюстраванне зместу гістарычнага працэсу ў гэтых выданнях, пры ўсім багацці выкарыстанага фактычнага матэрыялу, было зведзена, урэшце рэшт, да змены грамадска-эканамічных фармацый, што адбываліся ў выніку класавай барацьбы. Прымат гэтай барацьбы вызначаў падыход да гісторыі вытворчасці, ідэалогіі, станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці, права, палітычных працэсаў, рэлігіі, навукі і мастацтва. Марксісцкім дэтэрмінізмам быў прасякнуты змест усіх гэтых выданняў, плюралізм у ацэнцы гістарычных падзей не дапускаўся.

У гэты перыяд значныя поспехі былі дасягнуты ў навуковым асэнсаванні гісторыі Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны 1941 – 1945 г. Па праблематыцы гэтага перыяду было абаронена звыш 100 доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, выдадзены фундаментальныя абагульняючыя працы. Сярод апошніх трэба адзначыць трохтомнае выданне «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941–1945 г.)», «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне» (Мн., 1990), кніга «Навечна ў сэрцы народным» (вытрымала 3 выданні), прысвечаная Героям Савецкага Саюза, ураджэнцам рэспублікі і тым, хто атрымаў гэтае ганаровае званне ў баях за Беларусь, зборнікі дакументаў і матэрыялаў, унікальныя даведачныя выданні пра дзейнасць падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый, партызанскіх фармаванняў, шэраг даследаванняў пра патрыятычнае падполле ў Мінску і іншых насе-

леных месцах, працы па пытаннях функцыянавання акупацыйнага рэжыму, дапамогі савецкага тылу партызанам і інш.

У 1970 – 1980-я г. у рэспубліцы пачалі выходзіць кнігі з серыі «Памяць» (было запланавана да выдання каля 130 кніг). Кнігі «Памяць» – гэта збор унікальнай інфармацыі па кожнаму гораду і населенаму пункту, якая асвятляе іх гісторыю са старажытнага часу і да сённяшняга дня. Вялікая ўвага ў гэтых выданнях традыцыйна надаецца перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Апублікаваныя навуковыя даследаванні, дакументальныя зборнікі па праблемах гісторыі апошняй вайны сведчаць пра тое, што многія аспекты гісторыі Беларусі ваеннага часу атрымалі даволі шырокае і грунтоўнае асвятленне, трывала ўвайшлі ў навуковы ўжытак. Безумоўна, у гэтых даследаваннях на першы план была пастаўлена задача раскрыць кіруючую ролю Камуністычнай партыі як арганізатара перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй. Натуральна, у гэтай масе літаратуры былі адлюстраваныя і іншыя аспекты ваеннай праблематыкі – пытанні фармавання і функцыянавання акупацыйнага рэжыму, розныя формы супраціву нямецка-фашысцкім захопнікам, у асаблівасці збройнае змаганне партызан і падпольшчыкаў, дапамога савецкага тылу партызанам, жыццё і дзейнасць насельніцтва ў партызанскіх зонах і інш. Разам з тым знаёмства з апублікаванай літаратурай па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны паказвае, што шэраг праблем па гэтай тэме свядома замоўчваўся і заставаўся па-за ўвагай даследчыкаў.

У цэлым развіццё айчыннай гісторыі за сорак пасляваенных гадоў адбывалася неадназначна і вельмі супярэчліва. У гэты перыяд, асабліва за апошнія дваццаць гадоў, было назапашана нямала фактычнага матэрыялу, выяўлены новыя крыніцы, ішло станаўленне новых, не існуючых раней галін айчыннай гістарыяграфіі (славяназнаўства, гісторыі сярэднявечча Беларусі, беларускага нацыянальнага руху, станаўлення і развіцця беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, вайсковай гісторыі і інш.). У беларускай гістарычнай навуцы ў савецкі час былі створаны значныя даследаванні, якія атрымалі заслужанае прызнанне не толькі ўнутры СССР, але і па-за яго межамі.

Адначасова ў гэты перыяд набіраў моц і адваротны працэс. У 1970 – 1980-я г. паскоранымі тэмпамі адбывалася пераўтварэнне марксізму з навуковага метаду ў калекцыю непахісных догмаў, што прывяло да з'яўлення антыгістарычных прац, павярхоўных і палітычна кан'юнктурных падробак, у якіх панавалі агульныя

меркаванні, дагматычныя стэрэатыпы, замшэлыя клішэ і лозунгі. Ваяўнічая прымітыўнасць, якая апраналася ў тогу баявітай партыйнасці і бескампраміснай абароны марксізму-ленінізму, рэзка паніжала патэнцыял беларускай савецкай гістарыяграфіі.

З пачаткам перабудовы, якая пачалася ў красавіку 1985 г., сталі прыкметныя пэўныя зрухі і ў сферы гістарычнай навукі. Аднак перагляд ранейшых гістарычных уяўленняў быў звязаны з вялізнымі цяжкасцямі. Працэс выпраўлення ад перакручванняў гістарычнай карціны пачаўся толькі з найбольш відавочных іх праяваў. У гэты перыяд яшчэ захоўвалася моцная ідэалагізацыя ў працах беларускіх гісторыкаў, большасць з якіх не маглі адразу адмовіцца ад гатовых метадалагічных пастулатаў, спрошчаных ацэнак і высноваў у сваіх даследаваннях.

Абвяшчэнне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь прывяло да кардынальнага перагляду гістарычных канцэпцый. Падчас вострых дыскусій у пачатку 1990-х г. паміж беларускімі гісторыкамі вызначыліся тры падыходы да праблемы абнаўлення беларускай гістарычнай навукі і гістарычнай свядомасці беларусаў. Пэўная частка гісторыкаў заняла кансерватыўна-дагматычныя пазіцыі, заклікаючы толькі да касметычнай папраўкі старых канонаў, не жадаючы адступіцца ад ранейшых ідэалагічных прынцыпаў, і фактычна адхіляла ідэю абнаўлення. Да гэтага кірунку далучыліся гісторыкі, якія не імкнуліся зразумець і асэнсаваць тыя змены, якія адбыліся ў Беларусі ў канцы 1980 – пачатку 1990-х г. Для іх выступленняў і публікацый былі характэрны дагматызм, прыхільнасць да старых, класавых падыходаў у ацэнцы гістарычнага мінулага, наяўнасць абмежаванага метадалагічнага інструментарыя. Значная частка прадстаўнікоў гэтага кірунку канцэнтравалася вакол грамадскай арганізацыі «Славянскі сабор «Белая Русь». Да гэтага ж кірунку далучылася і грамадскае аб'яднанне «Гістарычныя веды» (утворана вясной 1996 г.), якое згуртавала вакол сябе галоўным чынам гісторыкаў, што прытрымліваюцца класавага падыходу ў ацэнцы гістарычнага мінулага. У праграмных дакументах члены гэтага аб'яднання абвясцілі сябе «защитниками и сторонниками советской государственности» і выступілі з прэтэнзіяй стаць экспертным органам па айчыннай і сусветнай гісторыі. У праграмным звароце, які быў апублікаваны ў прэсе, гэтая група гісторыкаў на чале з прафесарам А.І.Залескім заявіла, што будзе весці «барацьбу супраць фальсіфікацыі падзеяў мінулага», выкарыстоўваючы «сусветны досвед рэвалюцыі і контррэвалюцыі».

Другі кірунак у айчыннай гістарычнай навуцы быў прадстаўлены гісторыкамі, якія заявілі пра сябе як прыхільнікі «творчага стваральнага падыходу», выступілі за крытычны самааналіз сваіх навуковых прац, а таксама выказаліся за ўлік пазітыўных і негатыўных вынікаў уласнай дзейнасці. Прадстаўнікі гэтай групы выказаліся за плюралізм не толькі «на грунце творчага выкарыстання марксісцка-ленінскай метадалогіі», але і прапанавалі інтэграваць у навуковым аналізе розныя тэарэтыка-метадалагічныя падыходы, такім чынам, каб яны давалі магчымасць паглыблена разумець гістарычныя працэсы і з'явы. Да другога кірунку належала тая частка гісторыкаў (галоўным чынам выкладчыкі ВНУ рэспублікі), якая імкнулася аб'ектыўна, на аснове шырокай базы крыніц, асэнсаваць многія складаныя працэсы, што ішлі ў гісторыі, даць непрадузятую ацэнку падзеям і фактам мінулага. У першай палове гэтая група гісторыкаў не займала дамінуючага становішча ў гістарычнай навуцы.

І, нарэшце, да трэцяга кірунку належала тая частка гісторыкаў, якая схілялася да негатыўна-нігілістычнай платформы і патрабавала поўнага дэмантажу ранейшай гістарычнай навукі, не знаходзячы ў ёй увогуле нічога, вартага захавання. Прадстаўнікі гэтага кірунку сталі праводзіць нацыянал-патрыятычную лінію, адмаўляючы гістарычную агульнасць беларускага народа з рускім і ўкраінскім народамі, узмацняючы этнацэнтрызм, фіксуючы ўвагу на этнічнай гісторыі, аж да вылучэння этнанацыянальнага фактару ў якасці асноўнага крытэрыю гістарычных ведаў. Гісторыкі, што прытрымліваліся гэтай лініі, у сваіх выданнях праяўлялі неапраўданае жаданне ідэалізаваць гістарычнае мінулае, спрабавалі выдаваць феадальныя міжусобіцы за сапраўдную праяву беларускай самасвядомасці, а супрацоўніцтва калабарацыяністаў з акупантамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны – за патрыятызм і нацыянальнае адраджэнне.

У першай палове 90-х гадоў большасць гісторыкаў гэтага кірунку ў сваіх даследаваннях, а, значыць, і ў падручніках і вучэбных дапаможніках аддавалі прыярытэт нацыянальным прыхільнасцям. У гэтых выданнях, як правіла, гістарычныя працэсы ў Беларусі разглядаліся ізалявана ад працэсаў, што праходзілі ў дзяржавах, у склад якіх уваходзілі беларускія землі. Асабліва гэта адбілася на падручніках і вучэбных дапаможніках першага пакалення па айчыннай гісторыі, выдадзеных у 1991 – 1995 г. У іх пераважалі сюжэты, звязаныя з вузканацыянальнымі праблемамі айчыннай гісторыі (яе асновы былі сфармуляваны ў «Праекце новай

канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў Беларусі»). У 1993 г. асноўныя палажэнні гэтага дакумента выклаў доктар гістарычных навук М.В.Біч у публікацыі «Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», надрукаванай у «Беларускім гістарычным часопісе». Асноўныя прынцыпы канцэпцыі былі зарыентаваны на прыцягненне новых падыходаў у даследаванні праблем гісторыі Беларусі. У падручніках і навуковых даследаваннях рабіліся спробы закласці ў якасці асноўнага крытэрыю гістарычных ведаў этнанацыянальны фактар. У падручніках першай паловы 90-х гадоў, як і гістарычных даследаваннях, Расія выступала ў ролі агрэсіўнага, эгаістычнага суседа, які навязваў свой лад і вобраз жыцця. Беларусь набывала выявы калоніі, а беларускі савецка-партыйны апарат разглядаўся як каланіяльная адміністрацыя, што абслугоўвала інтарэсы акупацыйнага рэжыму вярхоў.

Вызначальным прыярытэтам у канцэпцыі адпавядала і новая праграма гістарычнай адукацыі, якую распрацавалі навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і выкладчыкі гісторыі Белдзяржуніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта пад кіраўніцтвам М.В.Біча. Згодна з гэтай праграмай, да пачатку 1993/94 навучальнага года было падрыхтавана 20 новых падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі. У іх упершыню гісторыя Беларусі разглядалася не з класавых, а з агульнанацыянальных пазіцый, адмаўлялася Старажытнаруская дзяржава (Кіеўская Русь), не прызнавалася адзіная старажытнаруская народнасць, што склалася ў IX – XIII стагоддзях, на аснове якой у XV – XVI ст. сфарміраваліся руская, украінская, беларуская народнасці. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці звязвалася з Полацкім княствам і Вялікім княствам Літоўскім (ВКЛ), якое ўзнікла ў другой палове XIII ст. і ў наступным стала называцца Вялікім княствам Літоўскім, Рускім, Жамойцкім (паўтаралася версія беларускага гісторыка М.І. Ермаловіча, які лічыў ВКЛ выключна беларускай дзяржавай). Войны, якія адбываліся паміж маскоўскімі царамі і літоўскімі князямі ў гэты перыяд, ацэньваліся і разглядаліся як агрэсіўныя з боку маскоўскіх цароў (не ўлічвалася імкненне літоўскіх князёў да пашырэння тэрыторыі ВКЛ). Савецкі перыяд гісторыі Беларусі трактаваўся выключна ў негатыўным плане.

У найноўшай беларускай гістарыяграфіі, выдадзенай у першай палове 90-х гадоў, асаблівая ўвага надавалася пытанню пра станаўленне розных формаў дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі

ад Полацкага княства XIII ст. да абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту БССР і Рэспублікі Беларусь у жніўні – верасні 1991 г. Аднак, на жаль, гісторыкі розных арыентацый не заўсёды адназначна ацэньвалі тую або іншую форму беларускай дзяржаўнасці. Прыхільнікі «заходнерусізму», напрыклад, вельмі тэндэнцыйна разглядалі абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), а паслядоўнікі нацыянальна-радыкальнага кірунку не прызнавалі БССР як форму дзяржаўнасці беларускага народа.

Несумненна, найважнейшай гістарычнай працай апошняга дзесяцігоддзя з'яўляюцца «Нарысы гісторыі Беларусі» ў 2 частках (Мінск, 1994, 1995). Нарысы базіруюцца на нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі, і хоць яны адлюстроўваюць многія недахопы гістарычнай навукі 80 – пачатку 90-х гадоў, тым не менш, гэта першая абагульняючая праца, у якой побач з традыцыйнымі метадалагічнымі падыходамі ўлічаны новыя напрацоўкі беларускай гістарыяграфіі апошняга дваццацігоддзя.

Беларускія гісторыкі ў гэты час таксама, як і многія іншыя постсавецкія рэгіянальныя інтэлектуальныя эліты, перажылі рамантычныя надзеі на хуткія і радыкальныя перамены ў іх жыцці і зведалі расчараванні, што надышлі ў сярэдзіне 90-х гадоў.

У другой палове 90-х гадоў у Рэспубліцы Беларусь адбыліся значныя змены ў сферы гістарычнай навукі. У цэлым у гэты перыяд гістарычная свядомасць зведала ў Беларусі прыкладна тыя ж трансфармацыі, што і на значнай частцы постсавецкай прасторы. Да пэўнай ступені можна казаць пра фарміраванне, калі не адзіных, то, прынамсі, блізкіх па сваёй сутнасці рэгіянальна-нацыянальных ідэалогій найноўшых гістарычных ведаў, значную частку якіх складаюць падобныя стэрэатыпы ўспрыняцця дынамічных працэсаў грамадскіх пераменаў і пераасэнсавання ў кантэксце сацыяльна-палітычных, эканамічных і ідэалагічных зрухаў. Гэты працэс паскорыўся ў Рэспубліцы Беларусь пасля выбрання Прэзідэнтам А.Р. Лукашэнкі.

Разам з тым было б памылкай атаясамліваць ход эвалюцыі беларускай гістарычнай думкі другой паловы 90-х гадоў з кансалідацыяй гісторыкаў на адзінай навукова-метадалагічнай аснове. І ў другой палове 90-х гадоў гісторыкі не былі адзіныя ў сваіх метадалагічных падыходах у вывучэнні праблем айчыннай гісторыі. Аднак, тым не менш, у гэтыя гады адбыліся пэўныя зрухі ў асяроддзі беларускіх гісторыкаў. Логіка развіцця палітычных падзей у рэспубліцы прывяла да таго, што сярод гісторыкаў нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі адбылася дыферэнцыяцыя. З

гэтага кірунку вылучылася невялікая група гісторыкаў, што прытрымліваецца нацыянальна-радыкальных памкненняў. Прыхільнікі гэтага кірунку пераважна канцэнтруюць сваю дзейнасць у межах грамадскага ініцыятыўнага аб'яднання «Беларускае гістарычнае таварыства» (старшынёй таварыства з'яўляецца доктар гістарычных навук А.К.Краўцэвіч).

Стан гістарычнай навукі ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 90-х гадоў вызначаўся ў першую чаргу дзейнасцю вядучай навуковай установы ў дадзенай галіне гуманітарных ведаў – Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, а таксама адпаведнымі факультэтамі і кафедрамі ВНУ краіны – Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта, Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы і іншых. Кансалідуючы пачатак у дзейнасць гэтых навуковых і навукова-адукацыйных арганізацый унесла Дзяржаўная камісія па падрыхтоўцы і выданні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па сацыяльна-гуманітарнаму цыклу, якая была створана ў жніўні 1995 г. У яе склад увайшлі вядомыя вучоныя: Я.М.Бабосаў, І.Я.Навуменка, Э.М.Загарульскі, І.В.Аржахоўскі, У.С.Кошалеў, А.І.Падлужны, У.В.Гніламёдаў, В.І.Боўш, П.Ц.Петрыкаў, П.Ф.Дзмітрачкоў, Г.Я.Галенчанка і інш. Дзяржаўную камісію ў розны час узначальвалі У.В.Русакевіч, І.І.Антановіч, У.П.Замяталін. Ёй фактычна былі нададзены функцыі навукова-метадычнага цэнтра, які праводзіў экспертызу і прымаў рашэнні аб выданні вучэбнай літаратуры па гісторыі, філасофіі і іншых грамадскіх дысцыплінах.

Праца Дзяржаўнай камісіі, несумненна, прынесла станоўчыя вынікі. На працягу 1997 – 1998 г. фактычна было створана новае пакаленне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гісторыі для сярэдняй школы, якія былі выдадзены ў другой палове 90-х гадоў. У гэты перыяд з улікам найноўшых дасягненняў гістарычнай навукі І.І.Коўкель і Э.С.Ярмусік выдалі вучэбны дапаможнік для студэнтаў «Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да нашага часу» (1998). П.Г.Чыгрынаў апублікаваў «Нарысы гісторыі Беларусі» (1997) і «Беларуска-расійскія адносіны. Гісторыя і сучаснасць» (1999). Выдадзены курс лекцый для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў «Гісторыя Беларусі. Частка першая. Са старажытных часоў да канца XVIII ст.» (І.П.Крэнь, І.І.Коўкель, С.В.Марозава, С.Я.Сяльверстава, І.А.Фёдараў; 2000) і вучэбны дапаможнік «Гісторыя Беларусі» (Я.К.Новік, Г.С.Марцуль, Э.А.Забродскі, У.К.Коршук, М.С.Сташкевіч, М.К.Сакалоў і інш.; выйшлі

два выданні – 1998, 2000), «Нарысы гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя» (Г.М.Сагановіч, 2001).

Дзейнасць Дзяржаўнай камісіі ўнесла творчы імпульс у працу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, гістарычных кафедраў вышэйшых навучальных устаноў краіны. Шмат хто з гісторыкаў сталі больш удумліва і грунтоўна ставіцца да крыніцаў, пераасэнсоўвалі многія свае ранейшыя канцэпцыі і погляды. Пэўныя зрухі ў гэтым рэчышчы адбыліся ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, які фактычна пераўтварыўся ў цэнтр па арганізацыі і каардынацыі навуковых даследаванняў фундаментальных праблем асноўных перыядаў па айчыннай гісторыі. На сённяшні дзень Інстытут выконвае ролю галоўнай навуковай гістарычнай установы ў краіне.

У ліку характарыстык, якія вызначаюць «твар» сучаснай беларускай гістарычнай школы, трэба назваць адносную стрыманасць крытыкі ў дачыненні да гістарычнага мінулага, схільнасць ісці на кампраміс у трактоўцы і характарыстыцы многіх праблем айчыннай гісторыі. Аднак неабходна адзначыць, што пэўная частка гісторыкаў сёння не пазбегнула спакусы надаць большай «старажытнасці» ў пытанні ўзнікнення беларускай дзяржаўнасці, пачынаючы яе з часоў існавання Полацкага княства, незалежнага ад тагачаснага кіеўскага вялікакняжацкага пасаду. Адсюль рабіліся высновы, што беларуская народнасць (этнас) існуе з IX ст. і не мае нічога агульнага са старажытнарускай народнасцю, што, паводле традыцыйнай канцэпцыі, стала асновай трох братніх народаў – беларускага, рускага і ўкраінскага. Гэты пункт гледжання атрымаў адлюстраванне на старонках першага тома навуковага выдання «Гісторыя Беларусі. Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст.», якое выйшла ў мінскім выдавецтве «Экаперспектыва» ў 2001 г.

Гісторыя кожнай краіны – гэта ўвасабленне сувязі часоў і народаў. І гісторыя Беларусі не з'яўляецца выключэннем. Яна шчыльна звязана з гісторыяй старажытнарускай дзяржавы (Кіеўскай Русі), Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Вялікага княства Маскоўскага і Расіі. Улічваючы гэты фактар, Інстытут гісторыі НАН Беларусі сумесна з выкладчыкамі гістарычных факультэтаў дзяржаўных універсітэтаў краіны пачаў распрацоўку Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў па тэме: «Даследаванне гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі». Гэтая акалічнасць, безумоўна, будзе стымуляваць большую цікавасць навукоўцаў да праблемы паходжання беларускага этнасу, генезісу станаўлення сучаснай беларускай мовы, узнікнення на тэрыторыі Беларусі дзяржаўнасці.

У апошніх навуковых выданнях і публікацыях, асабліва ў чатырохтомніку, падрыхтаваным супрацоўнікамі Інстытута гісторыі «Археалогіі Беларусі» (выданне завершана ў 2001 г.), выразна праводзіцца думка пра тое, што беларусы з'яўляюцца часткай славянскага свету. Гістарычныя лёсы беларусаў былі звязаны з гісторыяй усяго славянства.

Разам з тым, аўтахтоннае жыхарства Беларусі, якое здаўна пражывала на гэтай тэрыторыі, мае свае ўласцівасці. Як сцвярджаюць беларускія археолагі і мовазнаўцы, за 4,5 тысячы гадоў на вялікім абшары ад Еўропы да Індыі рассяліліся шматлікія плямёны індаеўрапейцаў. Яны прасунуліся таксама на тэрыторыю Украіны, Беларусі, балтыйскага рэгіёну. У бронзавым веку індаеўрапейцы падзяліліся на некалькі галінаў: германскую, славянскую, балцкую і інш. На тэрыторыі старажытнай Беларусі, як вядома, рассяліліся балты (лета-літоўцы), якія жылі тут да V – VI ст., а месцамі яшчэ пазней, як лічыць большасць даследчыкаў. У канцы V – VII ст. славяне ўключыліся ў працэс «вялікага перасялення народаў». Яны паступова дасягнулі вярхоўяў Дняпра, Дона, Акі, Ладажскага возера. У VI–VIII ст. славяне каланізавалі землі Усходняй Еўропы, адначасова асіміліруючы балтаў, якія знаходзіліся на тэрыторыі тагачаснай Беларусі. Славянізацыю балтаў некаторыя даследчыкі лічаць пачаткам фармавання беларускага этнасу. Неабходна падкрэсліць, што можна казаць толькі пра перадумовы этнагенезу беларусаў. Працэс гэты быў паступовым і працяглым па часе, які доўжыўся да XV – XVI ст. Гэтая праблема застаецца адкрытай для беларускіх гісторыкаў і, безумоўна, мае дыскусійны характар.

У гістарычнай навуцы заўсёды была і застаецца тэма старажытнарускай дзяржавы – Кіеўскай Русі, буйнога еўрапейскага дзяржаўнага ўтварэння, якое праіснавала да 40-х гадоў XIII ст., г.зн. да мангола-татарскага нашэсця. Апынуўшыся на стыку еўрапейскай і азіяцкай тыпаў цывілізацый, усходнія славяне стаялі перад дылемай: альбо загінуць пад ударамі ордаў стэпавых качэўнікаў, альбо адбіцца і перамагчы шматлікіх ворагаў, умацавацца на дняпроўскім і волжскім гандлёвых шляхах, каб пазней, у XVI і XVII ст., прасунуць далей на ўсход рубяжы сваёй дзяржавы, тым самым вырашыць усходнюю праблему. У працэсе складвання старажытнарускай дзяржавы паўстаў і заходні кірунак яе знешняй палітыкі, які вызначыў геапалітычныя межы Кіеўскай Русі ў IX – XIII ст. у Еўропе, што пазней вылілася ў задачу па ўз'яднанні Беларусі і Украіны. Натуральна, што гэты комплекс праблемаў шырока асветлены ў беларускай гістарыяграфіі.

У беларускай гістарыяграфіі існуюць розныя пункты гледжання на храналагічныя рамкі існавання старажытнарускай дзяржавы. Так, напрыклад, Г.В.Штыхаў лічыць, што ўжо ў гады княжання Яраслава Мудрага Кіеўская Русь як адзіная дзяржава фактычна перастала існаваць. У другой палове XI ст., па яго сцвярджэнні, Кіеўская Русь распалася на часткі, а пазней, у XII ст., на яе месцы ўтварылася 5 зямельных аб'яднанняў, у якіх адбывалася паступовае складванне элементаў рэгіянальнага дзяржаўнага ладу. На Любецкім з'ездзе князёў у 1107 г. юрыдычна была замацавана раздробленасць старажытнарускай імперыі Рурыкавічаў. Гэты ж факт адзначае і расійскі гісторык А.М.Сахараў, цяперашні дырэктар Інстытута расійскай гісторыі РАН. У прыватнасці, ён робіць такую выснову: «У другую палову XII – першую трэць XIII ст. кожнае з буйных рускіх княстваў (Кіеўскае, Галіцка-Валынскае, Чарнігаўскае, Наўгародскае, Смаленскае, Уладзіміра-Суздальскае, Полацкае і некаторыя іншыя) з'яўлялася паўнапраўным і «паўнамоцным» носьбітам як сацыяльна-эканамічнай, культурнай, канфесійнай, так і знешнепалітычнай спадчыны Старажытнай Русі, і не выпадкова, што кожнае з іх на пэўных этапах сваёй гісторыі станавілася прэтэндэнтам на новае аб'яднанне рускіх земляў, якое б грунтавалася на больш высокай цывілізацыйнай аснове, на безумоўным лідэрстве сярод рускіх земляў, якое не адбылося па розных, у тым ліку і знешнепалітычных варунках. Гэта можа быць пацверджана ўсёй знешнепалітычнай гісторыяй рускіх княстваў на працягу 100 гадоў пасля распаду Русі ў 30 – 40-я гады XII стагоддзя».

У сувязі з гэтай праблемай узнікае пытанне, што ўяўляла сабой старажытнаруская народнасць у дзяржаўных межах Кіеўскай Русі? Ёсць пэўныя разыходжанні ў гісторыкаў і філолагаў адносна праблемы этнічнага развіцця гэтай дзяржавы. Думкі даследчыкаў можна звесці да двух палажэнняў. Згодна з першым палажэннем, старажытнаруская народнасць была ўстойлівай этнічнай супольнасцю, якая перажыла Кіеўскую Русь і на яе аснове сфарміраваліся тры народнасці – беларуская, руская (велікаруская), украінская. На карысць існавання старажытнарускай народнасці сведчыць тое, што на тэрыторыі Кіеўскай Русі была распаўсюджана літаратурная старажытнаруская мова. Яна выконвала дзяржаўныя і свецкія функцыі на тэрыторыі ўсёй Кіеўскай Русі. Гэтая мова функцыянавала паралельна з царкоўнаславянскай.

Паводле другога пункту гледжання, старажытнаруская народнасць не склалася канчаткова, і яе распад вызначаўся распадам

Кіеўскай Русі ў XII – XIII ст. Пацвярджэннем гэтаму лічаць тое, што ў летапісах няма тэрміна «рускі народ», але да сярэдзіны XII ст. называюцца крывічы, дрыгавічы, радзімічы, нашчадкі якіх склалі аснову беларускай народнасці. Пры ўсіх дапушчальных умовах і агаворках не заўважаць ці нават адмаўляць існаванне старажытнарускай народнасці, як робяць некаторыя аўтары, будзе няправільна.

У ходзе эканамічнага, сацыяльнага і дзяржаўнага развіцця асобныя княствы-землі, на якія распалася Кіеўская Русь, паступова аб'ядноўваліся ў групы, што былі папярэднікамі арэалаў будучых трох усходнеславянскіх народаў – беларускага, рускага, украінскага. Утварыліся пяць груп зямель, унутры якіх намеціліся даволі цесныя эканамічныя і культурныя ўзаемасувязі. Пятую групу складалі Полацка-Менская, Турава-Пінская, Смаленская і Наваградская землі. Менавіта ў гэтай групе княстваў у перыяд феадальнай раздробленасці закладваліся асновы беларускай народнасці.

90-я гады XX ст. характарызуюцца рэзкім узрастаннем увагі айчынных гісторыкаў да праблем палітычнай гісторыі Беларусі ў складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Атрыманне дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь абумовіла павышэнне зацікаўленасці ў грамадстве да прац, прысвечаных вытокам беларускай дзяржаўнасці, месцу беларускіх зямель у дзяржаўных працэсах на абшарах Усходняй Еўропы, уздзеянню на іх міждзяржаўных канфліктаў. У гэтых умовах беларускім даследчыкам давялося сутыкнуцца са значнымі цяжкасцямі, звязанымі, перш за ўсё, з амаль поўнай адсутнасцю ў айчыннай гістарыяграфіі напрацовак у падобным кірунку. Праўда, яны маюцца ў гістарыяграфіях суседніх народаў, найперш расійскай і польскай, аднак, суб'ектнасць беларускага народа ў палітычнай гісторыі ўсходнеславянскага рэгіёну не была ў іх адлюстравана ў той ступені, як таго патрабавала ўзросшая нацыянальная самасвядомасць беларускага грамадства. Землі Беларусі разглядаліся пераважна як арэна змагання паміж Расіяй і Захадам. З пачатку 1990-х г. пры вывучэнні праблем палітычнай гісторыі гісторыкі зрабілі спробу звярнуцца да прынцыпу «нацыянальнай канцэпцыі беларускай гісторыі», у адпаведнасці з якім гістарычныя падзеі мусілі разглядацца праз прызму іх уплыву на развіццё беларускага народа. У цэлым гэтая спроба, якая мела на мэце засведчыць беларускае бачанне падзей, што разгортваліся на ўсходнееўрапейскім абшары, можа разглядацца як цалкам натуральная ва ўмовах існавання

беларускага этнасу з уласнымі інтарэсамі, якія складваліся гістарычна. Разам з тым, значная грамадская запатрабаванасць падобнай праблематыкі абумовіла імкненне да выкарыстання сюжэтаў палітычнай гісторыі ў ідэалагічных мэтах. Прычым, калі частка гісторыкаў заставалася на традыцыйных расійска-савецкіх пазіцыях, якія фактычна адмаўлялі беларускі фактар у палітычнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага, то асобныя беларускія даследчыкі ў той ці іншай ступені яго перабольшвалі. Такім чынам, гістарычныя працэсы ў шэрагу выпадкаў сталі трактавацца не праз іх уплыў на развіццё беларускага народа, а праз прызму залежнасці іх саміх ад беларускага фактару.

Узрослая ўвага айчынных даследчыкаў да пытанняў палітычнай гісторыі Беларусі XIII – XVIII ст. праявілася ў 90-я XX ст. у двух падыходах. Першы быў відавочна скіраваны на выхаванне нацыянальнай годнасці, гераізацыю пэўных гістарычных асоб, стварэнне гістарычных міфаў, фарміраванне прывабнага аблічча гісторыі Беларусі. Працы падобнага кшталту, якія часта не абапіраліся ў поўнай меры на гістарычныя крыніцы і часам ствараліся непрафесійнымі гісторыкамі, могуць быць залічаны да гістарыяграфіі толькі з пэўнай доляй умоўнасці. Тым не менш, яны мелі прыкметны рэзананс у грамадстве, і таму ў адных выпадках падаваліся як важкі набытак і найноўшыя дасягненні беларускай гістарычнай навукі, а ў іншых – як сведчанне яе крызісу і кан'юнктурнай заангажаванасці.

Разам з тым, апаненты «нацыянальнай канцэпцыі беларускай гісторыі» не здолелі супрацьпаставіць ёй сур'ёзныя распрацоўкі і таксама звярталіся пераважна да жанра публіцыстыкі.

З гістарыяграфічнага пункту гледжання, большую каштоўнасць маюць працы, якія ставяць на мэце даследаванне праблем, малавывучаных ці ўвогуле не вывучаных у айчыннай гістарыяграфіі. Перш за ўсё гэта тычыцца войнаў Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай у канцы XV – першай палове XVI ст., Лівонскай вайны, войнаў Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654 – 1667 г. і падзелаў Рэчы Паспалітай, якія разглядаліся Г.М.Сагановічам, У.І.Канановічам, А.М.Янушкевічам, В.І.Мялешкам, Я.К.Анішчанкам, У.П.Емяльянчыкам і інш. Можна канстатаваць, што па меры паглыблення вывучэння дадзеных пытанняў усё больш пераважае ўзважаны падыход, які ўлічвае не толькі новыя крыніцы, але і напрацоўкі прадстаўнікоў розных гістарычных школ. Супрацоўніцтва з імі пры разглядзе найбольш вострых момантаў міждзяржаўных стасункаў дазволіла б у яшчэ большай меры пазбегнуць

пэўнай аднабаковасці пры ацэнцы знешнепалітычнай сітуацыі ў рэгіёне. Важнай задачай у вывучэнні палітычнай гісторыі беларускіх зямель на сучасным этапе бачыцца больш дэталёвае даследаванне не толькі ўсходняга, але і заходняга вектару знешнепалітычнай дзейнасці Вялікага княства Літоўскага. Пэўныя напрацоўкі ў гэтым кірунку зроблены Ю.М.Боханам, Г.М.Сагановічам, П.Ф.Дзмітрачковым, А.І.Дзярновічам і інш. Яны дазваляюць падкарэктаваць існуючае дагэтуль меркаванне аб выключна канфрантацыйных адносінах паміж дзяржаўнымі ўтварэннямі на беларускіх землях і крыжацкімі ордэнамі ў XIII – XVI ст.

Значная ўвага надаецца айчыннымі гісторыкамі пытанням, звязаным з утварэннем Вялікага княства Літоўскага і палітычнага статусу ў гэтай дзяржаве беларускіх зямель. Традыцыйная канцэпцыя аб заваёве літоўскімі феадаламі тэрыторыі Беларусі і падпарадкаваным становішчы беларусаў у гэтай дзяржаве, якая ў савецкай гістарыяграфіі найбольш прадстаўлена ў працах У.Т.Пашуты, была аспрэчана М.І.Ермаловічам, працы якога на пачатку 1990-х г. атрымалі шырокі рэзананс у грамадстве і сярод прафесійных гісторыкаў. Аднак у далейшым асноўныя палажэнні гэтага даследчыка былі пастаўлены пад сумненне не толькі замежнымі, але і айчыннымі даследчыкамі. На сённяшні дзень праблема ўтварэння Вялікага княства Літоўскага ў беларускай гістарыяграфіі не можа лічыцца канчаткова вырашанай і надалей спараджае розныя канцэпцыі, сведчаннем чаго служаць працы В.Л.Насевіча і А.К.Краўцэвіча.

Па сённяшні дзень не суціхаюць спрэчкі і пра этнічны характар дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага. Спектр поглядаў на гэта вельмі шырокі – ад трактавання Вялікага княства дзяржавы да абвяшчэння беларускай імперыяй. У значнай ступені гэта звязана з адсутнасцю ў пісьмовых крыніцах інфармацыі пра юрыдычныя асновы аб'яднання балцкіх і славянскіх тэрыторый у адзіную дзяржаву, у розных сферах якой у далейшым дамінаваў або балцкі, або славянскі элемент. Раней гісторыкі лічылі ВКЛ руска-літоўскай дзяржавай, але, на наш погляд, у працэсе развіцця гэтай дзяржавы ўсё больш выразна праяўляўся беларускі фактар (тады, калі сфарміравалася беларуская народнасць). Менавіта істотнае ў развіцці ВКЛ было тое, што ў рамках яго існавання найбольш інтэнсіўна ішоў працэс фарміравання беларускай народнасці (этнасу).

Аднак і гэта праблема вельмі супярэчна трактуецца ў беларускай гістарыяграфіі. Дыскусійнасць і абвостранасць гэтай праб-

лемы звязана перш за ўсё з недастатковай распрацаванасцю і спрэчнасцю амаль усіх асноўных тэарэтычных і метадалагічных праблем этнічнай гісторыі ў беларускай, расійскай і сусветнай гістарыяграфіі, на якую ўздзейнічаюць таксама палітычныя і ідэалагічныя ўплывы. Нават ключавыя тэрміны этнічнай гісторыі (такія, як «этнас», «народ», «народнасць», «нацыя», «этнічная свядомасць», «культура» і інш.) не ўсе ўспрымаюцца даследчыкамі як навуковыя паняцці ці не маюць агульнапрынятых вызначэнняў, што ўскладняе вырашэнне праблем фарміравання беларускай народнасці.

У апошнія гады ў некаторых працах усходнеславянскіх гісторыкаў прасочваецца імкненне замяніць тэрмін «народнасць» (характэрны для савецкай гістарыяграфіі 50–80-х гадоў XX ст.) іншым традыцыйным ці новым вызначэннем. Між тым, пры ўсёй трафарэтнасці гэтага тэрміна (і яго відавочнай рэтраспектыўнай залежнасці ад вызначэння тэрміна «нацыя» ў вядомай фармуліроўцы савецкай гістарыяграфіі), у ім прасочваецца дыялектыка гістарычнага развіцця ўсходнеславянскіх народаў у розныя гістарычныя эпохі. Выкарыстанне абязлічанага тэрміна «народ» для ўсіх эпох і часоў не дае такой магчымасці і патрабуе каментарыяў. Спробы даследчыкаў знайсці нейкі новы тэрмін для вызначэння гэтага прамежкавага звяна ў ланцугу згаданых этнагістарычных паняццяў не далі пакуль пераканаўчых вынікаў.

У даследаванні этнагенезу беларусаў найбольш актуальнымі застаюцца праблемы яго этнагенетычнай і сацыяльнай асновы (праблемы славянскага засялення зямель Беларусі, узаемаадносіны з балтамі, старажытнарускай народнасці і інш.). Большасць сучасных прафесійных гісторыкаў і этнографаў Беларусі і Расіі лічаць, што фарміраванне ўсходнеславянскіх этнасаў (беларусаў, рускіх і ўкраінцаў) пачалося не непасрэдна на іх рэгіянальных рода-племянных каранях, а на аснове старажытнарускай народнасці. Пад уплывам унутраных пераўтварэнняў і палітычна-дзяржаўных змен на землях старажытнай Русі (прыблізна з XIII – XIV ст.) сталі павольна фарміравацца новыя ўсходнеславянскія этнасы. У апошнія гады да гэтых поглядаў далучыўся маскоўскі гісторык і археолаг В.Сядоў (асноўны аўтар вядомай канцэпцыі аб балцкім субстраце). Гэтых думак прытрымліваюцца многія беларускія гісторыкі, у тым ліку і вядомы беларускі этнограф М.Ф.Піліпенка. Яны лічаць мэтазгодным называць «старажытнарускую» народнасць усходнеславянскай, што больш выразна, чым традыцыйны тэрмін, падкрэслівае яе старажытныя агульнаславян-

скія карані і неабходнасць дыферэнцыяцыі новых і архаічных этнагістарычных працэсаў на землях Русі ў IX – XIII ст. Асобная пазіцыя прадстаўлена ў працах гродзенскага гісторыка А.К.Краўцэвіча, які аднаўляе і развівае канцэпцыю аб біэтнічным балтаславянскім рэгіёне. На працягу некалькіх стагоддзяў мірнае сужыццё славянскіх і балцкіх этнасаў вызначала, на яго погляд, спецыфіку этнічных працэсаў у Беларусі і абумовіла ўзнікненне біэтнічнай балтаўсходнеславянскай дзяржавы – ВКЛ з дамінаваннем усходнеславянскага элемента.

Перад беларускімі гісторыкамі стаіць задача даць навукова абгрунтаваны адказ на пытанне: калі пачалося фарміраванне новай этна-гістарычнай супольнасці на землях Беларусі і што аказала ўплыў на завяршэнне гэтага працэсу ў асноўнай і канчатковай стадыях. Традыцыйны пункт гледжання савецкай гістарыяграфіі 50 – 70-х гадоў XX ст. і большасці сучасных беларускіх гісторыкаў і этнографаў вызначае гістарычныя межы фарміравання беларускай народнасці XIV – XVI ст. Падобная ж перыядызацыя да апошніх часоў панавала ў рускай і ўкраінскай гістарыяграфіі. Крайнія пункты гледжання вядомы яшчэ з часоў фарміравання афіцыёзнай расійскай і пазнейшай нацыянальнай гістарыяграфіі ўсходнеславянскіх народаў канца XIX – пачатку XX ст.: беларускі і ўкраінскі народы – гэта рэгіянальныя адгалінаванні рускага народа, некаторыя спецыфічныя рысы, якія сфарміраваліся пад уплывам гістарычных абставін; па кантрасту асабліва радыкальныя нацыянальныя гісторыкі сцвярджалі, што беларускі і ўкраінскі народы маюць адасобленыя гістарычныя карані. Верхняя мяжа фарміравання беларускага этнасу ў асобных сучасных працах (У.В. Чаквін і інш.) даводзіцца да сярэдзіны XVII ст. або ўвогуле не вызначаецца. (Апошняе характэрна для сучасных апалагетаў М.В.Каяловіча.)

На наш погляд, у XI – XII ст. ва ўмовах дзяржаўна-палітычнай раздробленасці Русі ўзнікалі пэўныя перадумовы фарміравання беларускай народнасці, а непасрэдны працэс яе складвання і кансалідацыі пачаўся пасля цэласнага ўключэння зямель Беларусі ў склад ВКЛ. Прычым Беларусь у гэтым утварэнні была як суб'ектам, так і аб'ектам палітычных, сацыяльна-эканамічных, культурных і іншых агульнадзяржаўных працэсаў. Яе этна-гістарычнае развіццё было паскорана сацыяльна-палітычнымі і культурнымі ўмовамі ВКЛ. Па комплексу этнавызначальных прыкмет можна абгрунтавана сцвярджаць аб узнікненні да XVI ст. цэласнага беларускага этнасу (беларускай народнасці). Наступныя стагоддзі

пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай, паступовай культурнай і рэлігійнай паланізацыі, якая праводзілася ў ВКЛ, а таксама іншыя сацыяльна-палітычныя падзеі, у т.л. шматлікія войны, значна замарудзілі, але не змаглі спыніць працэс станаўлення і развіцця беларускага этнасу. Цэласнасць беларускага этнасу прадстаўлялі галоўныя яго дэмаграфічныя пласты (сялянства, большасць мяшчанства, дробная шляхта, часткова духавенства), якія захоўвалі народную духоўную і матэрыяльную культуру, беларускую мову, забяспечвалі асноўныя жыццёвыя патрэбы выжывання і існавання беларускага народа.

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ў цэлым дадзена правільная ацэнка Люблінскай уніі 1569 г. Згодна з уніяй, ВКЛ, ядро якога складалі беларускія землі, увайшло ў склад Рэчы Паспалітай. Многія даследчыкі – Г.Я.Галенчанка, П.Ф.Дзмітрачкоў, В.Л.Маразевіч, Я.К.Анішчанка, В.І.Мялешка, П.А.Лойка, У.П. Емяльянчык, В.Ф.Голубеў, М.Ф.Спірыдонаў – лічаць, што ўваходжанне беларускіх зямель у склад Рэчы Паспалітай мела выключна важнае значэнне для самаідэнтыфікацыі беларусаў як самабытнага этнасу і развіцця нацыянальна-вызваленчай барацьбы на тэрыторыі Беларусі. Адначасова за апошнія гады ў беларускай гістарыяграфіі ўмацаваліся пазіцыі той часткі гісторыкаў, якія лічаць, што ўключэнне беларускіх зямель у склад Расіі – цэнтралізаванай дзяржавы з магутнай вярхоўнай уладай – мела толькі пазітыўныя наступствы. У сучаснай навуковай і вучэбнай літаратуры аб'яднанне з Расіяй нярэдка разглядаецца як адбітак яго традыцыйнай цягі да аб'яднання з рускім народам, як, безумоўна, прагрэсіўная з'ява, хоць некаторыя гісторыкі з такой выслоўай не пагаджаюцца.

Важнейшым кірункам беларускай гістарыяграфіі за апошняе дзесяцігоддзе з'явіліся даследаванні праблем духоўнага, грамадскага і палітычнага жыцця Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст., станаўленне грамадзянскай супольнасці. Для распрацоўкі тэм выкарыстаны матэрыялы замежных архіваў і бібліятэк (Літвы, Расіі, Польшчы), што дазволіла зрабіць аб'ектыўны навуковы аналіз вывучаемых праблем. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі пастаўлены і ў пэўнай ступені асветлены пытанні аб часе, умовах і шляхах фарміравання грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Упершыню ажыццёўлены комплексны аналіз аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, якія ў час рэвалюцыі 1917 г. актуалізавалі пытанне аб будучым дзяржаўна-палітычным і нацыянальна-культурным статусе Беларусі. Гэтай праблематыцы прысвечана манаграфія С.С.Рудовіча «Час выбару: праблема самавызначэння

Беларусі ў 1917 г.». У манаграфіі ўпершыню аналізуюцца ўнутраныя і знешнія палітычныя фактары, якія актуалізавалі ў ходзе рэвалюцыі 1917 г. пытанне пра будучы дзяржаўны і нацыянальна-культурны статус Беларусі. Гэта фактычна першае даследаванне ў беларускай гістарыяграфіі, у якім разглядаецца дзяржаваўтваральны працэс у Беларусі ў кантэксце міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе на трэцім годзе першай сусветнай вайны, паказваецца месца беларускага пытання сярод іншых усходнееўрапейскіх праблем таго часу.

Несумненным дасягненнем за апошнія дзесяць гадоў у беларускай гістарыяграфіі стала і распрацоўка канфесійнай гісторыі Беларусі: высвятленне асаблівасцяў палітыкі царызму ў дачыненні да ўсіх канфесій беларускіх губерняў, ролі хрысціянскай царквы ў грамадскім жыцці краю, што дае магчымасць больш аб'ектыўна і ўсебакова разглядаць развіццё гістарычнага працэсу ў азначаны перыяд. Практычным вынікам праведзеных даследаванняў стала публікацыя калектыўнай працы «Канфесіі на Беларусі. Канец XVIII – XX ст.». (В.В.Грыгор'ева, У.М.Завальнюк, Ул.І.Навіцкі, А.М.Філатава) і манаграфіях В.В.Яноўскай «Хрысціянская царква ў Беларусі. 1863 – 1914 г.», Т.Б.Бліновай «Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения», С.В.Марозавай «Уніяцкая царква ў энтакультурным развіцці Беларусі (1596 – 1839 г.)». У названых манаграфіях аналізуюцца змены, што адбываліся ў стане хрысціянскіх канфесій Беларусі ў XVIII – 1914 г. Зроблена высновa, што на працягу ўсяго XIX ст. адносіны паміж дзвюма галоўнымі хрысціянскімі канфесіямі (праваслаўнай і каталіцкай) былі даволі напружанымі. Скасаванне ўніяцкай царквы, паўстанні 1830 – 1831 і 1863 – 1864 г. – гэтыя і іншыя падзеі не давалі магчымасці згладзіць вастрыню праблемы. Расійскія даследчыкі бачылі ў такой сітуацыі адну прычыну – варожыя адносіны каталіцкага насельніцтва Беларусі да Расіі і праваслаўнай царквы. У сувязі з гэтым зроблена ўдакладненне: прычына заключалася не столькі ў рэлігійнай нецярпімасці і варожасці насельніцтва, колькі ў супрацьстаянні каталіцкага і праваслаўнага духавенства.

Нават царскі ўказ аб верацярпімасці 1905 г., які шмат у чым змяніў становішча ўсіх хрысціянскіх канфесій, не мог зняць напружанасць і вастрыню ў іх адносінах.

У 90-я гады пачаўся паступовы адыход ад дагматычных стэрэатыпаў і палітызаваных ацэнак праблем гісторыі грамадска-палітычнага жыцця Беларусі ў XIX стагоддзі. Менавіта гэтым выз-

начаецца манаграфія В.В.Шведа «Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772 – 1863 г.)». У манаграфіі на падставе новых крыніц асвятляецца механізм далучэння зямель Беларусі да Расійскай імперыі, раскрыта палітыка адносна іх расійскага ўрада, паказаны роля і значэнне розных палітычных і рэвалюцыйных арганізацый, у тым ліку і масонскіх лож, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі, у польскім і рускім апазіцыйных рухах. У гэтым кантэксце разглядаюцца польская і руская плыні грамадска-палітычнага жыцця на землях Беларусі, а таксама нараджэнне беларускага нацыянальнага руху.

У 90-я гады Я.І.Трашчонак даследаваў пытанні гістарыяграфіі і метадалогіі гістарычнай навукі, а таксама вывучаў праблемы гістарыяграфіі грамадскай думкі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. У яго публікацыях раскрыта ўздзеянне ідэалогіі расійскага палітычнага руху на станаўленне і развіццё грамадскай думкі на беларускіх землях у XIX–пачатку XX ст., паказана, як ішло фарміраванне асноўных кірункаў гістарыяграфіі ў Беларусі ў гэты час.

Вывучэнне праблем грамадска-палітычнага жыцця ў Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. стымулявала разгортванне даследаванняў па гісторыі палітычных партый, якія праявілі палітычную актыўнасць у Беларусі ў ходзе трох расійскіх рэвалюцый. Гэтыя праблемы занялі важнае месца ў беларускай гістарыяграфіі. У выдадзеных навуковых працах яскрава пераважалі мясцовыя сюжэты. П.І.Брыгадзін, напрыклад, даследаваў дзейнасць эсэраўскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі з канца XIX ст. да лютага 1917 г. Гэтай праблематыцы прысвечаны і працы А.А.Вараб'ёва. Ён даследаваў дзейнасць эсэраўскіх арганізацый у Беларусі ў перыяд рэвалюцыі 1917 г. і грамадзянскай вайны. У яго публікацыях на грунтоўнай дакументальнай аснове раскрыта палітычная стратэгія і тактыка партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў у Беларусі ў 1917–1920 г., асэнсоўваецца яе палітыка ў аграрным і нацыянальным пытаннях. У арыгінальных працах М.М.Забаўскага, У.С.Пуціка раскрыты важныя аспекты тактыкі мясцовых арганізацый (кадэтаў), рэвалюцыйна-дэмакратычных партый (сацыял-дэмакратаў, эсэраў, БСГ) пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у Дзяржаўную думу. Актуальныя аспекты гэтай тэмы атрымалі асвятленне ў публікацыях М.С.Сташкевіча. У іх дадзена новая інтэрпрэтацыя стратэгіі і тактыкі палітычных партый у рэвалюцыі 1905 – 1907 г., раскрыта іх палітычная эвалюцыя ў пасляваенны перыяд.

Праблемы палітычнай стратэгіі і тактыкі кадэтаў і партый урадавага блока (Рускай манархічнай партыі, Усерасійскага саю-

за зямельных уласнікаў, Саюза рускага народа) у Беларусі на этапе дэмакратычнай рэвалюцыі атрымалі асвятленне ў працах К.М.Бандарэнкі і Д.С.Лаўрыновіча. У публікацыях У.У.Шардыкі прааналізавана ў шырокім кантэксце рэвалюцыйных падзей тактыка кадэтаў, беларускіх палітычных, ліберальных і рэвалюцыйна-дэмакратычных партый (меншавікоў, эсэраў, БСГ) у вырашэнні аграрнага пытання ў Беларусі ў 1905 – 1918 г.

У першай палове 90-х гадоў беларускія гісторыкі падрыхтавалі і абагульняючыя працы па гісторыі палітычных партый Беларусі: «Политические партии и политическая полиция», «Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции» (В 3 частях), «Становление и крушение однопартийной системы в СССР. 1917 – 1991. Совместное российско-белорусское исследование» (В 2 частях), «Палітычныя партыі Беларусі». У іх раскрыты працэс нараджэння і развіцця палітычных партый беларускай нацыянальнай арыентацыі, прааналізаваны ў шырокім гістарычным кантэксце палітычная стратэгія і тактыка як агульнарасійскіх, так і нацыянальных партый у Беларусі ў перыяд трох расійскіх рэвалюцый і гады грамадзянскай вайны, паказаны станаўленне і крушэнне аднапартыйнай сістэмы ў БССР.

У першыя дзесяцігоддзі XX ст. велізарны ўплыў на рэвалюцыйныя падзеі ў Расіі і, адпаведна, у Беларусі аказвалі неанародніцкія партыі. Гэты тып палітычных партый паводле сваёй арыентацыі меў шырокі як агульнарасійскі, так і нацыянальны спектр.

Гэтай тэматыцы прысвечана абагульняючае манаграфічнае даследаванне У.Я.Казлякова «Национальный вопрос и неонароднические партии». У манаграфіі раскрыты пазіцыі неанародніцтва ў галіне вырашэння нацыянальных адносінаў, асэнсоўваюцца пошукі разнастайнымі неанародніцкімі партыямі шляхоў вырашэння нацыянальнага пытання, у тым ліку і ў Беларусі.

Усё сказанае сведчыць пра тое, што ў 90-я гады праблемы гісторыі палітычных партый распрацоўваліся вельмі актыўна, і гэта прынесла свае вынікі.

Перад гісторыкамі рэспублікі ў 90-я гады стаяла задача даследаваць развіццё культуры беларускага народа. Актуальнасць і недастатковая распрацаванасць праблемы гісторыі нацыянальнай культуры падштурхнулі беларускіх даследчыкаў да больш актыўнай распрацоўкі яе агульных і асобных пытанняў.

Першай, найбольш значнай у беларускай гістарыяграфіі абагульняючай працай па гэтай праблеме з'яўляецца манаграфія Л.Лыча і У.Навіцкага, прысвечаная гісторыі культуры беларускага на-

рода ад старажытных часоў да пачатку 90-х гадоў XX ст., якая вытрымала два выданні. Спалучаючы вынікі папярэдніх даследчыкаў з новымі архіўнымі і надрукаванымі матэрыяламі, аўтары асвяцілі асноўныя кірункі культурнага жыцця, абставіны, якія ў розныя гістарычныя перыяды станоўча альбо адмоўна ўплывалі на гэты працэс. Разам з тым, манаграфія не вычарпала навуковай і практычнай патрабавальнасці да больш глыбокага тэарэтычнага і метадалагічнага асвятлення важных пытанняў гісторыі культуры, неабходнасці іх удакладнення і пашырэння.

Важны ўклад у распрацоўку праблемы развіцця культуры Беларусі ўнесла С.Я.Куль-Сяльверстава. Гэтай праблематыцы яна прысвяціла сваю манаграфію «Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур. Фарміраванне культуры новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII–1820 гады)».

Некаторым пытанням гэтай праблемы, але шырокаму колу праблем нацыянальна-культурнага развіцця ў Беларусі, у тым ліку зараджэнню і распаўсюджанню беларускай нацыянальнай ідэі, асветы, моўнай палітыкі дзяржавы і інш. прысвечаны брашура і шматлікія артыкулы Л.Лыча. У межах даследавання пытанняў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, нацыянальна-культурнага руху ў 20-я гады працуюць В.Мазец і У.Ляхоўскі. Гэтай праблематыцы прысвечаны навуковыя працы і Н.М.Пурышавай, у якіх прасочваецца дзяржаўная палітыка ў сферы мастацкай культуры ў БССР у міжваенны перыяд (20 – 30-я гады). У сваіх працах яна выявіла барацьбу дзвюх тэндэнцый у дзяржаўнай палітыцы ў сферы духоўнага жыцця беларускага грамадства (20-я гады), раскрыла спецыфіку і супярэчнасці палітыкі, якая праводзілася ў Беларусі ў 20 – 30-я г.

У 90-я гады імкненне пераадолець ранейшыя спрошчаныя ўяўленні аб нацыянальна-культурным развіцці Беларусі ў міжваенны перыяд праявілася і ў іншых даследаваннях беларускіх гісторыкаў. Выкарыстоўваючы архіўныя матэрыялы, якія раней былі закрыты ў спецыяльных сховішчах, многія аўтары (Э.Б.Яршова, Р.П.Платоноў, У.М.Міхнюк, А.М.Гесь і інш.) з новых пазіцый паказалі неаднолькавасць нацыянальна-культурных працэсаў у БССР у 20 – 30-я гады, ахарактарызавалі ідэйна-палітычную барацьбу ў сферы культуры, раскрылі прыёмы барацьбы КП(б)Б з «нацыянал-дэмакратызмам».

Адной з асноўных праблем культуры Беларусі з'яўляецца гісторыя яе інтэлігенцыі. Падрыхтоўку навуковых кадраў, станаўленне і развіццё Беларускай Акадэміі навук разглядаюць у сваіх

працах У.М.Міхнюк, П.Ц.Петрыкаў, Г.В.Карзенка, М.У.Токараў, падрыхтоўку кадраў у вышэйшых навучальных і сярэдніх спецыяльных установах даследуе Н.У.Васілеўская. У цэлым трэба падкрэсліць даволі слабую распрацаванасць праблем гісторыі беларускай інтэлігенцыі і асабліва яе ролі ў развіцці беларускай культуры.

У другой палове 1990-х г. адбыліся істотныя змены ў ацэнцы савецкага перыяду гісторыі Беларусі. У навуковых даследаваннях асэнсоўваюцца вынікі гістарычнага развіцця беларускага народа, паказаны яго дасягненні за ўвесь перыяд існавання савецкай дзяржавы.

Савецкі перыяд нашай краіны ўвайшоў у гісторыю як першы вопыт будаўніцтва сацыялістычнага грамадства ў свеце. Традыцыйна гэты перыяд у савецкай гістарычнай навуцы разглядаўся пад уплывам фармацыйнага, класавага падыходу, які, несумненна, дазволіў гісторыкам атрымаць шэраг важных вынікаў, але грашыў прыметнай аднабаковасцю. Пры выключнай арыентацыі на класавы падыход немагчыма было даць гістарычна выверaную ацэнку падзеям, якія адбываліся ў СССР і Беларусі з 1917 г. да нашых дзён. У пачатку 90-х гадоў гэтыя абставіны выклікалі бурную дыскусію ў ходзе падрыхтоўкі як навуковых прац, так і падручнікаў па гісторыі Беларусі для сярэдняй і вышэйшай школ. Вытокі гэтай дыскусіі зыходзілі ад падзей 1991 – 1992 г., якія паклалі канец больш чым сямідзесяцігадоваму існаванню савецкага ладу. Крушэнне савецкай сістэмы, яго абставіны і прычыны непазбежна цягнуць за сабой у цяперашні час актыўную фазу дыскусій аб сацыялізме і праблемах рэвалюцыі як у Рэспубліцы Беларусь, так і ў краінах, якія ўваходзілі раней у склад СССР. Самі па сабе такія дыскусіі не з'яўляюцца, вядома, навуковымі (пераважна носяць палітычны характар), але моцна ўплываюць на пазіцыі гісторыкаў, іх бачанне гістарычных падзей, адносіны да асабістых канструкцый мінулага.

Вядома, што савецкая гістарыяграфія бясспрэчна абвясціла гісторыю рэвалюцыйнага руху Расіі і тры расійскія рэвалюцыі прадметам нацыянальнага гонару, а кастрычнік 1917 г. – Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыяй і галоўнай падзеяй XX стагоддзя не толькі айчыннай, але і сусветнай гісторыі. Адпаведна рэвалюцыя 1905 – 1907 г., нягледзячы на яе супярэчлівы характар і завяршэнне, вельмі пазітыўна ацэньвалася як «генеральная рэпетыцыя Вялікага Кастрычніка». У 90-я гады ацэнкі гэтых гістарычных падзеяў у беларускай гістарыяграфіі змянілі-

ся. Асобныя гісторыкі пачалі прыніжаць сацыяльна-палітычны статус Кастрычніцкай рэвалюцыі да «захопу ўлады бальшавікамі». У публікацыях асобных гісторыкаў (І.М.Ігнаценка, М.Я.Сямёнчык, У.Н.Сідарцоў, У.У.Мянькоўскі) і інш. сцвярджалася, што Кастрычнік 1917 г. з'яўляецца канчатковым пунктам пасляЛютаўскага дуалізму рэвалюцыйнага працэсу (ці новым этапам) Лютаўскай рэвалюцыі.

Безумоўна, потым гэтыя высновы ў беларускай гістарыяграфіі былі адкарэктаваныя. Абсалютная большасць гісторыкаў прызнала, што вынікам Кастрычніка 1917 г. было афармленне новага грамадска-палітычнага і эканамічнага ладу, які істотна адрозніваўся ад усіх да таго часу вядомых грамадскіх фармацый. Сам факт перадачы ўлады народнаму прадстаўніцтву і пераразмеркаванне ўласнасці (нацыяналізацыя зямлі і перадача яе на карысць сялян і інш.) дазволілі гісторыкам кваліфікаваць кастрычніцкія падзеі як сацыяльную рэвалюцыю, якая не толькі перавярнула Расію, але і наклала адбітак на ўсю гісторыю XX ст. У кастрычніку 1917 г. буржуазная лінія рэвалюцыі была захліснута народным паўстаннем, рэвалюцыя стала перамогай радыкальных элементаў працоўнага народа. Яна была абумоўлена не толькі нарастаннем радыкалізму значнай часткі рэвалюцыйнага лагера, але і сацыяльна-эканамічнымі, і палітычнымі супярэчнасцямі, якія абвастрыліся ў ходзе рэвалюцыі. Безумоўна, Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла перспектыву будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

Гісторыкі Рэспублікі Беларусь, як і іншых дзяржаў на тэрыторыі былога СССР, да нашага часу не маюць адзінага меркавання па гэтаму пытанню. Яны не знайшлі дакладнага вызначэння таго грамадскага ладу, які канчаткова склаўся ў СССР у 30-я г. і быў абвешчаны І.Сталіным сацыялізмам. Зразумела, яго асноўныя параметры відавочна не супадалі з тым, як уяўляў сабе сацыялістычнае грамадства К.Маркс, але ў той жа час яны істотна адрозніваліся ад дзяржаўна-манапалістычнага капіталізму ў краінах класічнай буржуазнай дэмакратыі Захаду і ад фашысцкай мадэлі таталітарызму ў Германіі.

У канцы 90-х гадоў замежныя і айчынныя гісторыкі пасля шматлікіх дыскусій прыйшлі да высновы аб тым, што грамадскі лад, які склаўся ў СССР і, адпаведна, у БССР быў адным з відаў дзяржаўнага сацыялізму. І хоць грамадская сістэма, якая склалася ў СССР у канцы 30-х г., і атрымала назву «сацыялізм», яна адпавядае сутнасці, паколькі адбылося абдзяржаўленне вытворчасці,

ліквідаванне прыватнай уласнасці. Па сутнасці сацыялізм быў дзяржаўным, а палітычная ўлада зрабілася адарванай ад большасці членаў грамадства, і яе функцыі ажыццяўляліся партыйна-дзяржаўнай наменклатурай. Ліквідаванне таварнай вытворчасці, рыначных адносін, парламентарнай дэмакратыі, прававой дзяржавы – на практыцы ўсё гэта пры «дзяржаўным сацыялізме» абярнулася пазбаўленнем эканамічных і палітычных свабод членаў грамадства, фарміраваннем адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Па сутнасці, як лічаць многія сучасныя беларускія гісторыкі і філосафы (Я.М.Бабосаў, Р.П.Платонаў, А.М.Сідарэвіч, М.С.Сташкевіч і інш.), гэта мадэль развіцця была выклікана рэвалюцыйнай (асабліва ваенна-камуністычнай) і шматвяковай расійскай традыцыяй, якая была звязана з гіпертрафіраванай роляй дзяржавы.

У выніку, несумненна, было пабудавана грамадства цалкам новага тыпу, дзе перапляліся рысы ўсіх вядомых грамадскіх фармацый, і якія нельга зразумець, калі аперыраваць традыцыйнымі сацыялагічнымі катэгорыямі. Яно так і не зрабілася грамадзянскім, хоць у ідэале рэвалюцыя павінна была вырашыць і гэтую задачу.

Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы, што адбыліся на Беларусі ў 90-я г., істотна паўплывалі на пашырэнне доступу гісторыкаў да дакументальных матэрыялаў і пашыралі магчымасці да больш поўнага і аб'ектыўнага адлюстравання падзей, звязаных з утварэннем беларускай дзяржаўнасці ў XX ст. У навуковых даследаваннях І.М.Ігнаценкі, В.А.Круталевіча, П.І.Брыгадзіна, У.Ф.Ладысева, Р.П.Платонава, М.С.Сташкевіча, У.Я.Казлякова, У.К.Коршука, В.Г.Мазеца і інш. аб'ектыўна раскрыты працэс зараджэння і развіцця беларускай дзяржаўнасці. У гэтых даследаваннях падкрэсліваецца, што ў ходзе рэвалюцыі 1917 г. вызначыліся два падыходы да разумення гістарычнага мінулага беларускага народа і, адпаведна, форм яго самавызначэння. Ва ўсіх гэтых даследаваннях праводзіцца аднолькавая думка: стварэнне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці адбывалася ў вострых сацыяльных сутыкненнях і патрасеннях, выкліканых рэвалюцыяй 1917 г. Менавіта гэта і перадвызначыла паражэнне тых палітычных сіл, якія намагаліся рэалізаваць ідэю стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) на ліберальна-дэмакратычнай аснове. У гэтым супрацьстаянні нараджалася і беларуская дзяржаўнасць на савецкай аснове.

1 студзеня 1919 г., як вядома, была абвешчана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР). За 70 гадоў свайго існавання ў складзе Савецкага Саюза Беларуская ССР пастулова

сабрала асноўную частку этнічнай тэрыторыі беларусаў («узбуйненне» БССР у 1924 і 1926 г., уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г.) і выканала дзяржаўна-палітычную і культурную ролю аб'яднання беларускай нацыі. Яна была першай рэальнай беларускай дзяржавай, на аснове якой і была абвешчана суверэнная Рэспубліка Беларусь.

Арыгінальным падыходам адрозніваецца даследаванне А.М. Сарокіна «На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917–1990-я гады)», у якімназіраюцца этапы аграрнай палітыкі ў Беларусі з 1917 г. да сённяшняга часу. Гэтыя падыходы аўтара да падзей, якія праходзілі ў беларускай вёсцы, праглядаюцца ў кожным раздзеле. У якасці доказу можна прывесці прыклады, якія тычацца праблем гістарыяграфіі, прававых асноў аграрнай палітыкі бальшавікоў, арэнды зямлі, калектывізацыі, калгаснай дэмакратыі, сутнасці і эвалюцыі зместу рэпрэсій, харчовай бяспекі, сучаснай аграрнай палітыкі кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь.

Неаднолькава беларуская навуковая грамадскасць сустрэла выхад манаграфіі М.П.Касцюка «Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі», якая вытрымала два выданні (першае выйшла на беларускай мове ў Мінску ў 2000 г., другое – на рускай мове ў Маскве ў 2002 г.). Яна выклікала бурную дыскусію ў навуковых беларускіх колах. Тым не менш, гэта першае навуковае выданне, у якім зроблены спробы раскрыць характар і сутнасць палітычнай сістэмы, якая сфарміравалася ў 20–50-я гады ў БССР. Аўтар імкнуўся паказаць як адмоўныя, так і станоўчыя бакі бальшавіцкай сістэмы ўлады на Беларусі, метады дасягнення гэтай уладай пастаўленых мэт, а таксама робіць спробы раскрыць пераадоленне з сярэдзіны 50-х гадоў некаторых праяў сталінізму і яго эвалюцыі ў аўтарытарны палітычны рэжым.

У 1990-я г. у беларускай гістарыяграфіі па-ранейшаму актуальнай заставалася і тэма другой сусветнай вайны. Галоўная ўвага засяроджвалася на праблемах і пытаннях, якія не атрымалі дастатковага асвятлення ў гістарычнай навуцы. Гэта тычылася асобных пытанняў функцыянавання акупацыйнага рэжыму, эканамічнай палітыкі нацысцкай Германіі ў Беларусі, праблемаў калабарацыі, укладу беларускай інтэлігенцыі ў супрацьстаянне фашызму, ролі праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла ў народным жыцці ў гады вайны, трагедыя мірнага насельніцтва, у тым ліку і яўрэйскага жыхарства, дзейнасці на тэрыторыі Беларусі польскай Арміі Краёвай. Гэта абумоўлена тым, што гэтая

праблематыка доўгі час фактычна знаходзілася пад забаронай. Але зусім неапраўдана ў гэты час была спынена праца па далейшаму паглыбленаму вывучэнню розных формаў супраціву мірнага насельніцтва нямецка-фашысцкім акупантам, асабліва антыфашысцкіх арганізацый у заходніх рэгіёнах Беларусі, баявой і палітычнай дзейнасці партызанскіх фармаванняў, асаблівасцяў партызанскай стратэгіі і тактыкі, пытанняў гуманітарных, культурных і матэрыяльных страт Беларусі ў апошнюю вайну. Улічваючы ўсё гэта, Інстытут гісторыі НАН Беларусі ў апошнія гады разгарнуў працу па стварэнні абагульняючага даследавання «Гісторыя Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны», у якім будуць усебакова адлюстраваны пытанні ўсенароднага змагання народа Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў.

17 – 18 мая 2000 г. у Мінску была праведзена міжнародная навуковая канферэнцыя «Гістарычныя каштоўнасці Перамогі над фашызмам і сучаснасць», у працы якой удзельнічалі і беларускія гісторыкі. У ёй таксама прымалі ўдзел і прадстаўнікі Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Украіны, Таджыкістана, Туркменістана і шэрагу арганізацый пры Выканкоме Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Канферэнцыя падвяла вынікі даследаванняў праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і вызначыла далейшыя перспектывы яе вывучэння. У прынятым звароце да народаў, заканадаўчых і выканаўчых органаў улады дзяржаў СНД удзельнікі канферэнцыі заявілі, што гегеманісцкія памкненні фашызму разбіліся аб моц, сяброўства, згуртаванасць і гераічныя справы народаў Савецкага Саюза і краін антыгітлераўскай кааліцыі. Менавіта ў гэтай заяве выражана сутнасць Перамогі над фашысцкай Германіяй. Канферэнцыя садзейнічала кансалідацыі гісторыкаў у іх барацьбе з фальсіфікатарамі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У апошнія гады актывізавалася даследчыцкая праца па вывучэнні сацыяльна-эканамічных і палітычных працэсаў, якія адбываліся ў Рэспубліцы Беларусь пасля распаду СССР. Аднак у апублікаваных навуковых даследаваннях, у тым ліку і ў вучэбнай літаратуры, аўтары толькі рэгістравалі асноўныя падзеі палітычнага жыцця новай, постсавецкай Рэспублікі Беларусь 1990-х гадоў, не спрабавалі выявіць ключавыя тэндэнцыі яе эканамічнага, палітычнага і сацыяльнага развіцця.

У сувязі з гэтым хацелася б выказаць надзею на тое, што новыя даследаванні па дадзенай праблематыцы, якія будуць падрыхтаваны ў бліжэйшы час, дапамогуць высветліць гэтыя і многія іншыя спрэчныя пытанні айчыннай гісторыі.

З вялікай упэўненасцю можна канстатаваць, што змены, якія адбываліся ў гістарычнай навуцы ў другой палове 1990-х г., ішлі ў кантэксце ўнутранай этнапалітычнай і этнакультурнай сітуацыі ў нашай краіне. Гэта прывяло да таго, што абсалютная большасць гісторыкаў, нягледзячы на актыўныя захады палітычнай апазіцыі выкарыстаць у сваіх мэтах айчынную гістарычную навуку, адкінула гэты шлях і ўнесла істотныя карэктывы ў сваіх даследаваннях. І хоць спрэчкі і дыскусіі па актуальных праблемах нацыянальнай гісторыі працягваюцца, тым не менш, у сферы гістарычнай навукі адбыліся істотныя пазітыўныя зрухі. Былі створаны новыя падручнікі і навучальныя дапаможнікі па гісторыі, аўтарамі якіх былі галоўным чынам навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, выкладчыкі Белдзяржуніверсітэта і іншых універсітэтаў краіны.

З 2001 г. Інстытут гісторыі НАН Беларусі і Беларускі дзяржаўны універсітэт як вядучыя навуковыя ўстановы краіны прыступілі да рэалізацыі дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў «Даследаванне гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі». Пры фармаванні гэтай праграмы ўзгаданыя ўстановы імкнуліся да шчыльнай каардынацыі, узгодненай і адзінай пазіцыі ў вырашэнні дыскусійных пытанняў айчыннай гісторыі, нягледзячы на шырокі спектр меркаванняў і думак пра іх у асяроддзі гісторыкаў, якія з'яўляюцца выканаўцамі канкрэтных тэм і заданняў. У рэалізацыі гэтай праграмы ўдзельнічае 271 чалавек, у тым ліку 29 дактароў навук, 126 кандыдатаў і 115 спецыялістаў без навуковых ступеняў.

Можна казаць пра тое, што зроблены важныя крокі ў справе кансалідацыі гісторыкаў Беларусі дзеля выканання гэтай дзяржаўнай праграмы. Было б надта смела сцвярджаць, што крызіс у айчыннай гістарыяграфіі канчаткова пройдзены. Але ўсё ж сучасныя тэндэнцыі яе развіцця даюць падставы для аптымізму, хоць прагназаваць, у якім кірунку будзе развівацца гэты працэс у далейшым, складана. Адказ на гэтае пытанне дасць сама гісторыя.

*А.Н.Нечухрин,*
*декан исторического факультета Учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»,*
*доктор исторических наук, профессор* *г. Гродно*

## РАЗВИТИЕ МЕТОДОЛОГИЧЕСКОЙ БАЗЫ ИСТОРИЧЕСКИХ ИССЛЕДОВАНИЙ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

Формирование национальной историографии в Республике Беларусь на рубеже XX-XXI в. отмечено интенсивными поисками в теоретико-методологической сфере. После отказа от марксистской парадигмы истории, что было связано с развалом СССР и крушением монопольной власти КПСС, историческая наука на постсоветском пространстве на какое-то время утратила методологические ориентиры. В своей основе марксистская историография отличалась идейной прочностью, способностью к эволюции и сама по себе не несла кризисных потенций. Из границ научного знания советскую историографию выводила конъюнктурная ориентация на идеологию и политику в условиях тоталитарного режима. Сказалась также длительная изоляция советской науки от мировой, недостаточная осведомленность отечественных ученых относительно достижений американской и европейской исторической мысли. Образовавшийся теоретический вакуум белорусские, как и российские, историки стали заполнять самыми разнообразными идеями и концепциями, заимствованными из арсенала не только современной западной науки, но и историографии второй половины XIX-начала XX в. Наблюдается интенсивное возрождение позитивистского понимания истории, традиционного для досоветской российской науки. Достигнутое в итоге «многообразие» на месте прежнего «единомыслия» вовсе не свидетельствует о существенном повышении научного уровня исследований. В ряде случаев отвергнутые марксистско-ленинские схемы оказались заменены не менее идеологизированными национальными, а методологическая база отдельных работ не выдерживает критики даже по критериям первого позитивизма. На современное состояние белорусской исторической науки значительно повлияло и ее прошлое провинциальное положение относительно центров исторических исследований и образования в рамках СССР. Таким образом, можно констатировать, что отечественная историография, как и историческая наука на всем пост-

советском пространстве, переживает в своем развитии сложный и противоречивый период, который можно охарактеризовать как кризисный.

В целом «кризис» является общенаучной категорией и вовсе не означает упадка либо деградации научного знания, но связан с переосмыслением коренных теоретико-методологических оснований исторической науки. В период кризиса наука меняет свои важные ориентиры, отказывается от одних фундаментальных концепций в пользу других, основательно пересматривает проблематику исследований, наличные результаты и оценки в изучении прошлого. Поскольку перед учеными встает вопрос о том, правильно ли они понимали прошлое, то в центре внимания оказываются вопросы методологии и теории познания.

Кризис охватывает не только постсоветскую историческую науку, но и мировую, о чем постоянно напоминают западные исследователи, однако, в разных исторических условиях он приобретает различное содержание и проявляется неодинаково. По своему характеру кризис отечественной историографии является теоретико-методологическим и связан с системным общественным кризисом. Споры в науке идут по ключевым теоретико-методологическим проблемам в контексте современных общественно-политических реалий. Они касаются отношения к материалистическому пониманию истории, соотношения между формационным и цивилизационным подходами, проблем общей исторической теории и т.д. В каждой постсоветской республике протекание кризиса имеет свои особенности, связанные с общественно-политической ситуацией, имеющимся научным потенциалом, открытостью к новым научным технологиям и т.д. В белорусской историографии в настоящее время сохраняется определенная ограниченность теоретико-методологической подготовки историков, недостаточное владение ими современными методами и методиками исторических исследований, слабая материальная база науки (в том числе издательская). На развитии исторических исследований негативно сказывается также неудовлетворительная встроенность отечественной науки в мировую систему, разрыв традиционных связей с Россией, Украиной и Литвой. Наблюдается диспропорция в подготовке специалистов по отдельным отраслям науки и перекос в проблематике научных исследований. Флагман отечественной науки – Институт истории Национальной Академии наук Республики Беларусь почти полностью сосредоточился на разработке белорусской проблематики. Центр тяжести в изучении тео-

рии и методологии истории, всеобщей истории и историографии в итоге переместился на соответствующие кафедры исторических факультетов вузов.

При всей остроте и очевидности проблем, стоящих перед нашей наукой, есть основание рассматривать наблюдаемый кризис как процесс обновления, а вопросы методологии и теории истории – определяющими на этом пути. Белорусские ученые предпринимают попытки реально оценить современное состояние своей науки и определить перспективы ее развития. Анализу общих моментов развития национальной белорусской историографии посвящены статьи академика М.П.Костюка и В.П.Грицкевича. В их работах рассматриваются трудности становления национальной историографии и дается авторское видение решения возникших проблем. Сущность кризисных явлений в современной историографии в целом, ведущиеся в ней дискуссии о соотношении формационного и цивилизационного подходов к истории раскрываются в публикациях В.С.Кошелева, Д.В.Карева и А.Н.Нечухрина и др.

Инициаторами разработки проблем теоретической историографии и методологии истории в Беларуси стали кафедра всеобщей истории Гродненского государственного университета имени Янки Купалы (ГрГУ) и кафедра источниковедения и новой и новейшей истории Белорусского государственного университета (БГУ). Совместными усилиями специалистов этих кафедр было подготовлено одно из первых на постсоветском пространстве учебное пособие по методологии истории, а также типовая учебная программа курса. В данной работе с учетом современных подходов рассматриваются вопросы специфики исторического познания, структура, принципы и методы исторических исследований. Пособие стало базовым в преподавании учебного курса на исторических факультетах не только в Беларуси, но и в некоторых вузах России. Развивая идеи, в нем заложенные, В.Н.Сидорцов опубликовал монографию «Методология исторического исследования (механизм творчества историка)» (Мн., 2000). В книге ученый раскрывает смену ориентиров современной исторической науки, усматривая ее в «антропологическом повороте» и непосредственно с ним связанным лингвистическим обращением к микроистории, появлением в историографии новых направлений (исторической информатики, психоистории, гендерной истории, устной, экологической и других). Ученый указывает на междисциплинарность современной мировой историографии, предопределенной

внедрением, наряду с интегрированными концепциями, новых подходов и методов, присущих социальным наукам. В.Н.Сидорцов ратует за активное применение в истории математических методов и информационных технологий в рамках общего процесса математизации и информатизации наук. В то же время им подчеркивается недостаточная подготовка отечественных историков в данной области. В монографии дана характеристика общелогических и общенаучных, специальных и инновационных методов исторического исследования, приведены конкретные примеры их внедрения в исторические работы. В настоящее время на выходе новая работа коллектива авторов – историков и философов из БГУ и ГрГУ, посвященная теории и методологии истории.

В целях распространения новых методов и повышения теоретико-методологической подготовки специалистов-историков по инициативе ученых БГУ в 2001 г. была проведена международная конференция «Теоретико-методологические проблемы исторического познания». Среди значимых работ, знакомящих белорусских историков с основными тенденциями в развитии исторических исследований за рубежом, следует отметить информационно-аналитический обзор «Современная мировая историческая наука» (Мн., 1996) и исследование О.М.Шутовой «На пути к истории людей: заметки по истории исторической мысли (конец XX века)» (Мн., 1999).

Широкое распространение среди белорусских ученых получает информационный подход, успешно апробированный в исторической науке Великобритании, Германии, Нидерландов и других стран. Он проявляется в проникновении в научно-исследовательскую работу и преподавание истории компьютерной техники и технологии – исторической информатики. В 1996 г. при активном участии коллектива кафедры источниковедения БГУ была создана Белорусская ассоциация «История и компьютер» как ветвь международной ассоциации с аналогичным названием. На ее счету регулярное проведение научных конференций, ряд публикаций (в том числе в «Информационном бюллетене Ассоциации «История и компьютер», издаваемом в Москве) и учебное пособие для исторических специальностей «Историческая информатика» (Мн., 1998).

Как уже отмечалось, для развития современной науки характерно взаимообогащение методами исследований. Наглядное доказательство тому дает образование на стыке истории и психологии психоистории с ее специфическими методами, позволяющи-

ми изучать «человека во времени» во всей сложности его взаимоотношений с окружающей средой. Психоистория направлена на выявление психической мотивации исторических процессов и создание психологической концепции личности в истории. В белорусской историографии активным пропагандистом и исследователем психоистории выступила О.М.Шутова, которая представила приоритетную работу «Психоистория: школы и методы» (Мн., 1997), положив тем самым начало новому направлению в отечественной истории. В своем труде О.М.Шутова дала анализ методологических оснований различных школ в американской психоистории. Автор раскрыла основные понятия психоистории, проблемы, которые данное направление решает, рассмотрела конкретные методы исследования, применяемые различными школами психоисториков. Особое место в работе уделено анализу концептуальных построений Ллойда де Моза – генератора идей данного направления. Исследованию психоистории в отечественной историографии способствовало создание Белорусской психоисторической ассоциации, которая определила своей задачей изучение, пропаганду и внедрение психоисторических методов в исследование и преподавание истории. При этом необходимо заметить, что о реальном внедрении методов психоистории в научную практику в отечественной историографии пока серьезно говорить не приходится. Кроме того, на наш взгляд, речь может идти только об использовании конкретных методов данного направления, поскольку принципиальные методологические установки теоретиков психоистории по своему содержанию направлены против исторической науки в традиционном понимании, и следование им способно лишь усугубить кризисную ситуацию.

Общенаучный метод аналогии применительно к историческому познанию стал предметом изучения в работе «Метод аналогии в историческом исследовании» (Брест, 2000) Б.М.Лепешко. Проблема метода аналогии в историческом исследовании имеет теоретическое и научно-практическое значение, поскольку позволяет обогатить теоретико-методологический арсенал исторической науки. Обращение ученого к творческому наследию как западных, так и российских крупнейших историков-концептуалистов позволило ему выявить «механизм» их эвристического поиска, в котором важную роль играл метод аналогии. В книге Б.М.Лепешко представлен первый комплексный анализ метода аналогии в историческом исследовании. Автор разработал классификацию аналогий и исследовал их функции в исторической практике. Ра-

бота опирается на обширный историографический материал: труды Э.Мейера, О.Шпенглера, А.Тойнби, Н.Я.Данилевского, В.И.Герье, Н.И.Кареева, М.М.Ковалевского, Р.Ю.Виппера и других. Б.М.Лепешко убедительно продемонстрировал, как использование метода аналогии позволило названным ученым приходить к достижению нового научно-продуктивного знания.

Известную активность в разработке методологических вопросов истории в Беларуси проявляют также А.Лобанов, Л.Е.Лойко, М.И.Матюшевская, Н.И.Миницкий, Я.И.Трещенок и другие. Однако при известном продвижении вперед отечественная теория и методология истории находятся лишь в начале пути. Речь пока идет не столько об оригинальных работах в этой сфере, сколько об усвоении опыта различных направлений и школ Запада.

В 90-е г. наблюдается оживление историографических и источниковедческих исследований, появление крупных теоретических работ, посвященных становлению отечественной исторической науки. Д.В.Карев в монографии «Белорусская историография конца XVIII – начала XX в. / Политика царизма и формирование исторической науки Беларуси» на богатом историографическом материале раскрыл условия и предпосылки формирования белорусской исторической науки, определил этапы и особенности ее развития, а также механизмы формирования исторической памяти белорусов. Много внимания ученый уделил отдельным персоналиям и краеведческим центрам, сформировавшимся на территории Беларуси. В работах А.Н.Нечухрина «Методологические основы российской историографии в 80-е г. XIX в. – 1917 г. (смена парадигм)» и «Философско-исторические воззрения Н.И.Кареева» сделан анализ теоретико-методологической базы российской дореволюционной историографии. Исследователь обосновал складывание в ее рамках в начале XX столетия течения «критического позитивизма». Особое внимание А.Н.Нечухрин уделил историческим воззрениям Р.Ю.Виппера и Н.И.Кареева, связям последнего с польской исторической наукой.

Заслуживает упоминания переизданная и дополненная книга Л.В.Алексеева «Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30 г. XX в.» (Мн., 1996). Автор отводит значительное место персоналиям, нередко безвестным деятелям, внесшим вклад в изучение родного края и его древностей. В центре работы XIX век, когда создавалась материальная база для изучения отечественной истории. Развитие науки в ту или иную эпоху автор тесно увязывает с современностью.

Нетрадиционной методологией исследования социальных конфликтов и крестьянской ментальности в Российской империи начала XX в. выделяется работа «Социальные конфликты и крестьянская ментальность в Российской империи начала XX века. Новые материалы, методы, результаты» (М., 1996) О.Г.Буховца. Исследователь представил свое видение кризиса исторического познания на современном этапе, раскрыв особенности его протекания как в постсоветских странах, так и на Западе. По его мнению, современная историография способна абсорбировать даже маргинальные течения и тем самым расширить собственный потенциал. Ученый выступает пропагандистом социальной истории и количественных методов исследования. Автору удалось выработать основы новой аграрной историко-социальной конфликтологии, а также создать модели политической ментальности крестьянства и по-новому интерпретировать социальные конфликты в деревне. Работа выполнена на базе архивных материалов и широкого внедрения количественных методов анализа исторического материала. О.Г.Буховцу удалось преодолеть многочисленные штампы советской историографии, касающиеся ментальности российского крестьянства и его революционной борьбы за землю и свои права. Территориальные рамки исследования включают семь губерний европейской части Российской империи, в том числе территорию Беларуси. Интерес вызывает вывод ученого о полном мотивационном самообеспечении борьбы крестьянства, ее фактической независимости от пропаганды и агитации политических партий. О.Г.Буховец представил оригинальные данные о динамике движения крестьянства против аграрной политики Столыпина и борьбе внутри самого крестьянства в указанный период. Следует, однако, подчеркнуть, что ряд выводов историка носит вероятностный характер, а также фиксирует реальное положение в российской деревне, не отвечая на вопрос, почему это происходило.

Среди обобщающих историографических исследований следует выделить работы В.И.Меньковского «Англо-американская советология: история, современность, академические ресурсы» (Мн., 2000) и «Власть и советское общество в 1930-е г.: англо-американская историография проблемы» (Мн., 2001), отличающиеся высоким теоретико-методологическим уровнем. Это первые в белорусской историографии серьезные обобщающие научные публикации по западной советологии. Автору удалось выделить этапы становления и развития англо-американских со-

ветологических исследований, проанализировать формирование и функционирование инфраструктуры академической советологии. Им дан анализ важнейших англо-американских советологических концепций, посвященных истории советского общества сталинского периода, а также объяснены причины смены методологических подходов к указанной проблеме. Автор продемонстрировал тесную связь методологических подходов к истории советского общества в англо-американской историографии с переменами в политической ситуации в мире.

Работы В.И.Меньковского значительно обогащают наши представления о развитии исторической науки, прежде всего в США. Кроме того, применяемая автором методология и накопленный историографический материал да.ют возможность раскрыть основные тенденции в изучении постсоветской историографии сталинизма, в значительной степени опирающейся на опыт развития англо-американской науки.

Среди историографических исследований, посвященных отдельным персоналиям, преобладают статьи библиографического и биографического жанра. Из монографических изданий следует назвать работу гродненского историка В.Н.Черепицы о жизни и творчестве М.О.Кояловского. Книга написана в жанре научной биографии и характеризуется полемичностью и эмоциональным отношением автора к своему герою. В.Н.Черепица ратует за восстановление исторической справедливости и непредвзятый подход в отношении к Кояловичу как ученому и общественному деятелю. Историограф раскрывает вклад нашего земляка в изучение прошлого Западной Беларуси, положительно оценивая его борьбу за соединение белорусов с «православно-русской цивилизацией». Теоретико-методологические представления Кояловича, его значение как историографа освещены недостаточно. Работа отличается идейной ангажированностью, обусловленной современной дискуссией о самоопределении белорусов. Ее автор последовательно отстаивает славянофильские и православные позиции. С той же целью, «чтобы не рвалась связь времен», В.Н.Черепица подготовил представляющие научный интерес сборники исторических очерков «Са скарбніцы кніжных паліц» (Мн., 1994), «Преодоление времени» (Мн., 1996), «...Дай нам руку в непогоду: Деятели русской культуры XIX – начала XX в. и Гродненщина» (Гродно, 1997), в которых раскрываются творческие биографии Е.Е.Замысловского, И.Л.Солоневича, В.З.Завитневича, Е.Ф.Орловского и других. Ряд творческих биографий исследователей XIX –

начала XX в., чьи имена связаны с Гродненщиной, представлен в очерках А.Н.Нечухрина «Историки Западной Беларуси. XIX – начало XX в.».

Среди авторов историографических, источниковедческих и археографических работ, посвященных белорусской тематике, активностью выделяются Э.Г.Иоффе, В.Н.Михнюк, М.Ф.Шумейко, З.З.Яцкевич, Е.Г.Андреева, К.А.Ревяко, А.М.Сувалов, Я.И.Трещенок, В.В.Швед, М.И.Матюшевская, М.Б.Ботвинник, А.Полипский, Г.А. и А.Г.Кохановские и другие.

Следует отметить вклад в изучение российской историографии ряда белорусских исследователей. Так, в работе гродненского ученого Т.Т.Кручковского изучены проблемы истории Польши в российской науке XIX – начала XX в., в исследовании Д.В.Карева дан научный портрет М.К.Любавского. Очевиден, однако, дефицит внимания отечественных историографов к наследию западноевропейской исторической мысли.

В области всеобщей истории фундаментальные исследования в белорусской науке первоначально уступали место статьям по частным проблемам либо прикладным работам в соответствии с потребностями народного образования. Из монографических трудов по древней истории необходимо отметить монографию В.А.Федосика «Киприан и античное христианство» (Мн., 1991).

По новейшей истории явно преобладает польская тематика. В ее рамках необходимо выделить работу Г.Г.Лазько «Перад патопам (Еўрапейская палітыка Польшчы. 1932 – 1939 г.)» (Мн., 2000). Актуальность данной темы исследования определяется важностью для Республики Беларусь глубокого знания истории Польши как нашего ближайшего геополитического соседа. Автору удалось преодолеть идеологические классовые догмы в оценке европейской политики Польши в 30-е годы, характерные для советской историографии. Его заслугой является рассмотрение межвоенной политики Польши в общем контексте польской истории, ее взаимоотношений с западным и восточным соседями, вековой борьбы польского народа за самоопределение и возрождение своей государственности.

Трагедия польского народа 1939 года представлена ученым как следствие противоречивой линии польских правительственных кругов, направленной на разрушение версальской системы, и результата польско-советского соперничества за преобладание в Центральной и Восточной Европе. Г.Г.Лазько учел менталитет польских властных кругов в разработке внешнеполитической ли-

нии государства. Отказавшись от классового подхода к изучению внешней политики Польши, автор исходил из признания существования «вечных интересов» любого государства. С этой точки зрения им рассмотрено положение Польши в системе международных отношений в межвоенный период, борьба польского государства за упрочение своего места в Европе и ее трагические результаты. В своей работе Г.Г.Лазько рассмотрел политику равновесия польского государства в начале 30-х годов и ее провал. Особое внимание он обратил на политику политического лавирования польского государства между СССР и Германией. Реконструкция европейской политики Польши в 1932-1939 годах в итоге представлена историком как закономерное звено кризиса и развала версальской системы в европейских отношениях в указанный период. Однако автор недостаточно раскрыл связь внешней политики польского государства с социально-экономическим положением в стране. В отдельных случаях историк прибегает к аргументации своих взглядов посредством не первоисточников, а ссылок на научную литературу.

Интерес представляет монография М.Э.Чесновского «Сістэмныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Польшча (1989-1999)» (Мн., 2000). Актуальность работы определяется значимостью изучения общественно-политических и социально-экономических процессов, произошедших в постсоциалистических странах Восточной Европы. Опыт Республики Польша в проведении государственных, экономических и общественных системных преобразований вызывает особый интерес, поскольку Польша явилась пионером в проведении рыночных реформ и в переходе к демократии. Польский опыт важен для изучения переходных процессов от «развитого социализма» к капитализму, эффективности реформ, в том числе, учета негативных факторов, сопровождающих данный процесс. Изучение системных преобразований в Польше может иметь определенное практическое значение для соответствующих реформ, проводимых в Республике Беларусь, реформационной политики в постсоциалистических странах в целом. Работа помогает предвидеть трудности и негативные факторы, сопутствующие реформам, и выработать конкретные рекомендации для практической государственной реформаторской политики.

Вряд ли можно согласиться полностью с тезисом автора о «типичности» польского опыта, поскольку Республика Польша получила серьезную экономическую и политическую помощь со стороны развитых стран Запада. Однако данное обстоятельство

не умаляет значения исследования польского опыта. Следует отметить, что это исследование является приоритетным не только для белорусской, но и для польской историографии. В работе показана взаимосвязь внутренней и внешней политики Республики Польша и сделан вывод о том, что Польше не удалось стать страной-форвардом в системе международных отношений. Представляется интересным вывод автора о том, что региональное и европейское значение Польши зависит от ее умения наладить взаимоотношения с восточными соседями, а также о том, что польская стратегия во внешней политике четко не очерчена на перспективу. Поскольку исследование посвящено изучению незавершенных процессов, то отдельные выводы и оценки не могут не содержать элемента гипотетичности. Но это качество отличает все труды по «текущей истории», и оно ни в коей мере не может повлиять на научную и практическую необходимость проведения подобных исследований.

В ряду работ по новейшей европейской истории стоит монография М.В.Стрельца «ФРГ и проблемы ограничения и сокращений вооружений в Европе (1949-1990 г.)» (Брест, 1997). Ее актуальность определяется значимостью политической стратегии ФРГ по проблемам разоружения в Европе. Автору удалось проанализировать роль Боннской республики в военной и политической стратегии НАТО в разработке концепций разоружения и контроля над вооружениями. Военно-политическая стратегия правящих кабинетов министров ФРГ представлена им в тесной связи с развитием внутриполитической ситуации ФРГ и позициями ведущих политических партий. Историк показал роль отдельных ведущих политических лидеров в разработке концепции разоружения и контроля над вооружениями ФРГ. Необходимо указать, что автору не хватает научной взвешенности в оценках при рассмотрении политически противоречивого материала. По всем рассматриваемым вопросам разоружения и сокращения ядерных разоружений в Европе М.В.Стрелец последовательно одобряет позицию боннских кабинетов министров на протяжении 40-80-х г. и осуждает политику СССР как милитаристскую и пропагандистскую, вводящую в заблуждение общественное мнение европейских стран. Политика СССР на территории стран Восточной Европы рассматривается им как оккупационная. Деятельность партии «Зелёных», как и антивоенного движения, ФРГ по вопросам разоружения однозначно оценивается исследователем как деструктивная на

внутриполитической арене. С точки зрения автора, партия «Зелёных» и антивоенное движение ФРГ «постоянно подыгрывали Востоку». Аналогичным образом М.В.Стрелец критикует те силы в СДПГ, которые выступали с критикой политики боннского кабинета министров в 70-80-е г. и требовали недопущения размещения американских ракет средней дальности на территории ФРГ.

В белорусской историографии редки публикации по истории США, Азии и Латинской Америки. В качестве исключения следует остановиться на работе И.Р.Чикаловой «Партии и власть в США и Великобритании: гендерная политика в 1970-1990-е годы» (Мн., 2000). Актуальность данной работы определяется тем, что с конца 60-х годов на Западе и с начала 90-х г. в России в историографии развивается новое направление, предметом которого стала история женщин. В современном виде оно представлено в виде «гендерной истории», активно развивающейся исторической дисциплины, привлекающей к себе все больше внимания. И.Р.Чикалова справедливо обращает внимание на проблемы места женщины в современном обществе, социальных и политических ролей, которые она выполняет. Сегодня не замечать эти проблемы, попытаться просто проигнорировать феминистское движение никому не удастся. Поэтому изучение истории феминизма, его роли в общественной жизни, опыта решения гендерных проблем в ведущих странах Запада – США и Великобритании – представляется во всех отношениях важным и поучительным. Подобные исследования имеют практическое значение для построения демократического государства и формирования гражданского общества в Беларуси.

В научном плане активно пропагандируемая И.Р.Чикаловой категория «гендер» представляется полезной, обогащающей арсенал социальных наук, позволяющей более глубоко разобраться в соотношении социальных ролей мужчин и женщин, причин функционирования неравенства полов и поиска путей преодоления последнего. Можно считать, что исследование историка открывает новое направление в отечественной историографии, связанное с разработкой проблем истории и теории западного феминистского движения, борьбы феминистских организаций за участие женщин во властных структурах и их взаимоотношений с политическими партиями и государством.

Интерес к гендерной проблематике в белорусской историографии выразился в образовании Минского центра гендерных

исследований. На его счету и счету И.Р.Чикаловой, руководителя центра, не только научные конференции, но и междисциплинарный альманах гендерных исследований «Иной взгляд+» и сборник научных статей «Женщины в истории: возможность быть увиденными» (Ч. 1-2. – Мн., 2002).

Свой вклад в повышение теоретико-методологического уровня исторических исследований в Беларуси вносит ряд республиканских научных журналов, публикуя статьи по методологии истории, историографии, источниковедению и архивоведению. В первую очередь это такие издания, как «Беларускі гістарычны часопіс» (с 1993 г.), «Беларускі гістарычны агляд» (с 1994 г.), «Гісторыя: праблемы выкладання» (с 1997 г.), «Архівы і справаводства» (с 1999 г.). Следует отметить, что многие белорусские историки в последние годы стали активно публиковаться в сборниках и журналах Республики Польша, участвовать в научных конференциях, проводимых польскими исследовательскими и учебными центрами.

Таким образом, можно сделать вывод о том, что при всех трудностях, стоящих на пути развития исторической науки в Республике Беларусь, очевидны и позитивные сдвиги в последнее десятилетие, что дает основание рассчитывать на ее успешную интеграцию в европейскую историографию в скором будущем.

*М.П. Касцюк,*
*акадэмік НАН Беларусі* *г. Мінск*

## РАЗВІЦЦЁ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ Ў БЕЛАРУСІ З КАНЦА 80-х г. ХХ ст.

Стан любой навукі, асабліва гуманітарнай, у многім вызначаецца сацыяльна-эканамічнымі і грамадска-палітычнымі ўмовамі, у якіх яна развіваецца. Савецкая ўлада на працягу дзесяцігоддзяў свайго існавання моцна рэгламентавала накіраванасць і змест навуковых даследаванняў. Усё, што не адпавядала афіцыйнаму курсу, падвяргалася адпаведнаму ўздзеянню. Таму паслабленне партыйна-дзяржаўнага кантролю ў сувязі з ажыццяўленнем палітыкі перабудовы ў 2-й палове 80-х гадоў пачало адбівацца і на навуковай сферы, у тым ліку на распрацоўках у галіне гісторыі.

Гэты працэс узмацніўся ў пачатку 90-х гадоў, асабліва ў сувязі з распадам сацыялістычнай сістэмы, СССР, прыпыненнем дзейнасці КПСС, узнікненнем на абшарах Савецкага Саюза суверэнных дзяржаў, у тым ліку Рэспублікі Беларусь.

Для гэтага часу характэрны некаторыя прынцыповыя змены, якія істотным чынам паўплывалі на стан і развіццё гістарычных даследаванняў, уключаючы гісторыю Беларусі. Спынілі дзейнасць навукова-даследчыя ўстановы гісторыка-партыйнага профілю і тыя, якія рыхтавалі партыйныя кадры. У Рэспубліцы Беларусь гэта Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Мінская вышэйшая партыйная школа. З другога боку, у акадэмічным Інстытуце гісторыі былі значна ўдакладнены напрамкі навуковых даследаванняў і адпаведна ўдасканалена структура. Такога кшталту змены адбываліся на гістарычных факультэтах вышэйшых навучальных устаноў, а таксама іншых ВНУ, дзе гісторыка-партыйныя кафедры былі перапрафіляваны, як і адпаведныя навучальныя курсы.

У пачатку 90-х гадоў была створана, ва ўстановленым парадку зарэгістравана, а затым і перарэгістравана Асацыяцыя гісторыкаў Беларусі. Пазней быў арганізаваны Нацыянальны камітэт гісторыкаў Рэспублікі Беларусь. У 1995 годзе ён упершыню меў прадстаўніцтва на XVIII Міжнародным кангрэсе гістарычных навук у канадскім горадзе Манрэалі, а праз два гады – у італьянскім Спалета афіцыйна прыняты ў гэтую самую аўтарытэтную міжнародную арганізацыю гісторыкаў.

Пашырыўся доступ даследчыкаў да архіўных фондаў, з'явіліся поўныя магчымасці працаваць з матэрыяламі, аб існаванні якіх абсалютная большасць гісторыкаў не ведала. Гэта грунтоўна паўплывала на змест і нават на напрамкі гістарычных даследаванняў, у першую чаргу па гісторыі Беларусі. Гаворачы абагулена, гэта вылілася ў тое, што непасрэдна гісторыя нашай Бацькаўшчыны была пастаўлена ў цэнтр навуковых распрацовак, а беларускі народ стаў суб'ектам гістарычных даследаванняў.

Такая пазіцыя гісторыкаў Беларусі (а гэта была іх абсалютная большасць) сустрэла ўсё нарастаўшае супраціўленне кансерватыўных сіл. Выразнай праявай гэтага было апублікаванне ў 1996 годзе ў рэспубліканскай дзяржаўнай прэсе калектыўнага ліста. Сярод яго аўтараў амаль не было гісторыкаў, затое меліся подпісы неаднаразовага алімпійскага чэмпіёна і іншых вядомых людзей Беларусі – артыстаў, прадстаўнікоў тэхнічных навук і г.д. У лісце прафесійныя гісторыкі абвінавачваліся ў адыходзе ад ранейшай канцэпцыі ў асвятленні гістарычнага працэсу.

Аднак, нягледзячы на цяжкасці, асноўныя творчыя сілы гісторыкаў настойліва працягвалі працаваць над паглыбленнем даследаванняў па ранейшых праблемах і над распрацоўкай новых тэмаў па гісторыі Беларусі. Меліся і нядрэнныя вынікі. У сярэдзіне 90-х гадоў выйшлі з друку 40-тысячным накладам «Нарысы гісторыі Беларусі» ў 2 частках. Яны з'явіліся выданнем новага пакалення гістарычнай літаратуры ў Рэспубліцы Беларусь. Актыўна выдавалі свае працы І.Ігнаценка, Я.Паўлаў, Р.Платонаў, А.Хацкевіч. Плённа сёння працуюць Г.Галенчанка, Л.Лыч, У.Навіцкі і многія іншыя прадстаўнікі беларускай гістарычнай навукі. У 2000 годзе, як вядома, пабачыў свет 1 том шасцітомнай «Гісторыі Беларусі». Завершана выданне буйной абагульняючай калектыўнай працы «Археалогія Беларусі» ў 4 тамах. Гэта – выдатны вынік дзейнасці археолагаў.

Абаронена значная колькасць доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па актуальных праблемах айчыннай гісторыі. Толькі ў савеце Інстытута гісторыі НАН Беларусі на працягу 1996 – 2000 г. 11 спашукальнікаў паспяхова абаранілі доктарскія і 33 – кандыдацкія дысертацыі. Актыўна вядзецца гэтая праца ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. Толькі ў апошнія гады дактарамі гістарычных навук сталі С.Куль-Сяльверстава, В.Швед, С.Марозава, некалькі раней – А.Краўцэвіч. Прыкладна 10 чалавек паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Такое выдатнае падмацаванне кадравага складу гісторыкаў Рэспублікі Беларусь дае падставу верыць у дынамічнае развіццё гістарычнай навукі на той аснове, якая створана з канца 80-х гадоў.

Гэтая аснова ўяўляе сабою шырокі спектр праблем, ступень навуковай распрацоўкі якіх, пашырэння і паглыблення ведаў не з'яўляецца аднолькавай. Гэта і зразумела. Найбольш значны прарыў аказаўся па тых праблемах, дзе гісторыкі змаглі працаваць з невядомымі ім дакументальнымі матэрыяламі, а таксама там, дзе раней нельга было сказаць болей, чым гэта вызначалася афіцыйна. Да такіх напрамкаў можна аднесці праблему этнагенеза беларусаў, гісторыю зараджэння і развіцця ў сярэднявечны беларускай дзяржаўнасці, ваенную гісторыю Беларусі, асабліва сярэднявечную. Цяпер у многім па-новаму асветлены падзеі на беларускай зямлі паўстанняў канца XVIII ст., 1830-1831 і 1863-1864 гадоў, працэс фарміравання беларускай нацыі, беларускага вызваленчага руху, хваляў нацыянальнага адраджэння XX ст. Пэўным чынам адлюстравана гісторыя беларускай дыяспары і шэраг іншых праблем.

Некаторыя тэмы падвергнуты грунтоўнаму пераасэнсаванню. Гэта – гісторыя раннесярэднявечных княстваў-дзяржаў на тэрыторыі Беларусі, характар Вялікага княства Літоўскага і роля ў ім беларускіх зямель, сутнасць бальшавіцкай улады, правядзенне калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Значна пашыраны і ўдакладнены нашыя ўяўленні аб культурным і рэлігійным жыцці ў Беларусі на працягу стагоддзяў, а таксама іншая тэматыка.

Некаторыя напрамкі гістарычных ведаў падвергліся меншай перапрацоўцы. Па іх адбывалася натуральнае пашырэнне і паглыбленне адпаведных уяўленняў. Сярод іх – матэрыяльная і духоўная культура старажытных плямён на розных археалагічных этапах, сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у перыяд Вялікага княства Літоўскага, у часы Рэчы Паспалітай, у складзе Расійскай імперыі і Савецкага Саюза, а таксама некаторыя іншыя.

Значыць, найбольш істотныя ўдакладненні, пераасэнсаванні і нават даследаванні па раней недастаткова распрацоўваемых тэмах зроблены за апошнія паўтара дзесятка гадоў менавіта па палітычнай гісторыі Беларусі. І гэта не выпадкова, таму што менавіта гэтыя гістарычныя даследаванні найбольш моцна кантраляваліся бальшавіцкай партыяй і савецкай уладай. Як вядома, у першую чаргу за вывучэнне палітычнай гісторыі Беларусі праследваліся У.Ігнатоўскі, М.Доўнар-Запольскі і іншыя гісторыкі, а іх працы былі, як вядома, доўгі час забаронены.

І ўсё ж значны рух наперад, які зроблены ў апошні перыяд беларускімі гісторыкамі па пашырэнні і паглыбленні асэнсавання гістарычнага працэсу, мінулага беларускага народа, яго сувязей з блізкімі і больш далёкімі дзяржавамі, займаемага ім месца ў Еўропе – усё гэта даводзіцца нярэдка рабіць, пераадольваючы інертнасць, старыя стэрэатыпы, а то і асабістыя разлікі асноўных аўтараў. На жаль, некаторыя прадстаўнікі беларускай гістарычнай навукі могуць паступіцца гістарычнай ісцінай, а яна для нас павінна быць вышэй за ўсё.

У апошні час некаторыя з такіх аўтараў спрабуюць засяродзіць увагу на пэўных тэмах з гісторыі Беларусі. Аднак трактоўка такіх падыходаў выклікае, мякка кажучы, здзіўленне. Пры гэтым характэрна і тое, што дадзеныя публікацыі змяшчаюцца часамі ў дзяржаўных выданнях, якія выходзяць значным накладам і маюць немалую колькасць чытачоў. На некаторыя з такіх падыходаў па пэўных гістарычных тэмах з мінулага беларускага народа я і хацеў звярнуць увагу паважаных удзельнікаў навуковай канферэнцыі.

Адно з такіх палажэнняў – ці мае беларуская дзяржаўнасць агульна-расійскія карані? Калі спецыялісты на гэтае пытанне даюць неадназначны адказ і выказваюць думку, што ў дадзеным выпадку яшчэ патрэбна немалая даследчыцкая праца па шэрагу аспектаў праблемы, дык для неспецыяліста ў адным з вышэйадзначаных выданняў адказ даволі катэгарычны. Працытую некаторыя сцвярджэнні ў гэтых адносінах: «Усе ўсходнія славяне спачатку складалі адзіную старажытнарускую народнасць у межах адзінай старажытнарускай дзяржавы – Кіеўскай Русі»; «Ідэя беларускай дзяржаўнасці мае агульнарускія карані, «восходит» да старажытнарускай дзяржаўнасці». Тут жа можа гаварыцца аб «агульнарускім паходжанні» беларускага народа. Падобнае цытаванне можна працягнуць.

Пры гэтым аўтара не засмучае, што катэгорыя народнасці адносіцца не да ранняга сярэднявечча, калі існавала старажытнаруская дзяржава – Кіеўская Русь, а да больш позняга часу. Нельга не заўважыць, што ў адзначаных цытатах вялікі націск робіцца на слова «адзіны» – адзіная народнасць, адзіная дзяржава і г.д.

Такая катэгарычнасць у любой навуцы, у тым ліку гістарычнай, як мы ведаем – рэч непрымальная. Ужо гэта само па сабе наводзіць на роздум аб зададзенасці такіх установак і аб пэўных мэтах тых, хто імкнецца іх давесці да чытача. У гэтых адносінах нашы калегі, расійскія гісторыкі, спецыялісты па раннефеадаль-

наму перыяду больш асцярожныя ў сваіх навуковых меркаваннях. У прыватнасці, яны лічаць, што працэс фарміравання старажытнарускай народнасці не быў завершаны.

Да гэтай тэматыкі прымыкае і тэма аб пачатках беларускай дзяржаўнасці. Як вядома, у савецкія часы на працягу дзесяцігоддзяў існавала катэгарычнае і безапеляцыйнае сцвярджэнне, што беларускі народ атрымаў дзяржаўнасць толькі ў выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі. Гэтым пастулатам фактычна цалкам адсякалася ўсялякае памкненне шукаць карані беларускай дзяржаўнасці ў ранейшай гісторыі беларускага народа. Аднак публікацыі спецыялістаў канца 80 – 90-х гадоў пераканаўча даказалі, што гэта не так, што ў часы Полацкага княства яно не толькі мела актыўныя ўзаемадзеянні з іншымі княствамі, у першую чаргу Кіеўскай Руссю, але і каля ста гадоў, як адзначаюць спецыялісты, з'яўлялася самастойным, маючы сваю княжацкую дынастыю, межы, войска, адпаведную структуру мясцовага кіравання, іншыя атрыбуты дзяржаўнасці.

Зыходзячы з гэтага, у прыамбуле да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года і той рэдакцыі, якая прынятая ў 1996 годзе, гаворыцца аб шматвяковай гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Такім чынам на самым высокім дзяржаўным узроўні, у асноўным Законе краіны – Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацавана дадзеная гістарычная рэальнасць. Аднак у той жа публікацыі, аб якой гаварылася вышэй, беларускія гісторыкі могуць абвінавачвацца ў намеры «удревнить» гісторыю беларускай дзяржаўнасці і пачаць яе з Полацкага княства, як быццам самастойнага, незалежнага ад старажытнага Кіева. Гэта робіцца насуперак таму, што ў публікацыях апошняга часу даволі выразна паказана не толькі ўзаемадзеянне Полацкага і Кіеўскага княстваў, пэўная залежнасць першага ад другога, але і тыя гістарычныя адрэзкі часу, калі Полацкая зямля выразна выступала як самастойная раннефеадальная дзяржава. Да таго ж, трэба прымаць да ўвагі факты і асаблівасці існавання Турава-Пінскага княства, Берасцейскай зямлі, іншых раннесярэднявечных дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі.

Адно з палажэнняў публікацый, аб якіх гаварылася вышэй, заключаецца ў пытанні: ці мае Рэспубліка Беларусь гістарычнае і юрыдычнае права лічыць сябе «наследницей и преемницей» Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага? Пры гэтым чамусьці ўзнікненне ВКЛ аднесена да другой паловы XIII ст., у той час як спецыялісты, гаворачы аб яго каранях, адносяць іх ужо да

40-х гадоў гэтага стагоддзя. Нам уяўляецца, што пастаноўка дадзенага пытання з'яўляецца нскарэктнай, таму што ў літаратуры апошняга дзесяцігоддзя даволі пераканаўча паказана роля беларускага фактара ў фарміраванні і функцыянаванні Вялікага княства Літоўскага. Гэта датычыць як значэння беларускіх зямель у эканамічным жыцці княства, фарміраванні яго ўнутранай і знешняй палітыкі, ролі прадстаўнікоў Беларусі ва ўладных структурах розных узроўняў і г.д. Канешне, больш дакладнае веданне гэтай праблемы з гісторыі беларускага народа яшчэ патрабуе далейшых даследаванняў, аднак, ужо цяпер відавочна, што Беларусь побач з Літвою ў першую чаргу з'яўляецца гістарычнай «наследницей и преемницей» Вялікага княства Літоўскага.

У адзначанай публікацыі Люблінская ўнія 1569 года, аб'яднанне Вялікага княства Літоўскага і Польшчы ў адну дзяржаву і ўтварэнне Рэчы Паспалітай расцэньваецца як трагічная старонка ў гісторыі нашага народа. Такі падыход з'яўляецца дастаткова аднабаковым. Канешне, знаходжанне беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай, асабліва ў другой частцы гэтага перыяду, было складаным для беларускага этнаса, як і для беларускага народа ў цэлым, асабліва ў сувязі з правядзеннем палітыкі паланізацыі. Аднак нельга не бачыць і іншых фактаў. У прыватнасці, вядома, што дзяржаўнасць Вялікага княства Літоўскага яшчэ захоўвалася ў многіх важных праяўленнях на працягу значнага часу – не менш стагоддзя. Амаль праз 20 гадоў пасля Люблінскай уніі быў прыняты, як вядома, трэці статут Вялікага княства Літоўскага. На аснове яго рэгулявалася жыццё на беларускіх землях не толькі ў перыяд знаходжання іх у складзе Рэчы Паспалітай, але нават тады, калі яны былі далучаны да Расійскай імперыі, да 1840 года. Амаль праз 30 гадоў пасля Люблінскай уніі была заключана Берасцейская царкоўная ўнія. У выніку на беларускіх землях узнікла і пачало шырока распаўсюджвацца ўніяцтва. Можна прывесці шэраг іншых фактаў, якія не даюць падстаў ацэньваць Люблінскую ўнію ў гісторыі беларускага народа толькі адназначна негатыўна.

Нельга не адзначыць адну акалічнасць, якая кідаецца ў вочы, калі гаворка ідзе аб вышэйзгаданых і некаторых іншых праблемах са старажытнай і сярэднявечнай гісторыі Беларусі. Там, дзе спецыялісты, якія працавалі над праблемамі дзесяткі гадоў і працягваюць імі займацца, нярэдка ў чымсьці сумняваюцца, дык для неспецыялістаў, якія зусім не вывучалі старажытных летапісаў, не валодаюць іншымі дакументальнымі матэрыяламі, у тым ліку

археалагічнымі, для іх па дадзеных складаных праблемах усё даўно «зразумела». Гэта таму, што ў іх ненавуковы падыход да праблем, яны кіруюцца ўстаноўкамі, узятымі з ранейшых часоў ці рэанімiраванымі цяпер. У гэтых адносінах я ўпэўнены, што нам трэба больш давяраць спецыялістам, прафесіяналам па дадзеных праблемах, многія з якіх усё жыццё іх вывучаюць.

Натуральна, што шэраг праблем з гісторыі Беларусі датычыць XX стагоддзя. У многім гэта звязана з Беларускай Народнай Рэспублікай, яе аб'яўленнем, дзейнасцю ўрада, яго імкненнем да ажыццяўлення пастаўленых мэтаў, намаганнямі па знешнепалітычнаму прызнанню і г.д. Даводзіцца канстатаваць, што гэтая гістарычная праблема надзвычай палітызавана ў нашыя дні. Гэта перашкаджае яе навуковаму асэнсаванню. Ды і некаторыя даследчыкі, як гаворыцца, падліваюць масла ў агонь. У гэтых адносінах нельга не сказаць, што сур'ёзны навуковец, аўтар вядомых кніг па гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў першыя гады савецкай улады доктар навук В.Круталевіч сцвярджае, што БНР не была дзяржаўным утварэннем нават «у марыянетачнай форме». Гэта паўторана і ў публікацыі, аб якой я гаварыў вышэй. Думаецца, што такое вызначэнне ненавуковае, яно мае выразную палітычную афарбоўку. У гістарычнай літаратуры правамерна адзначаецца, што важных атрыбутаў дзяржаўнасці БНР не мела. Сярод іх і адсутнасць мясцовых органаў дзяржаўнай улады, адпаведных воінскіх фарміраванняў, праваахоўных органаў і г.д. Ні ў якім разе нельга адобрыць сумнавядомую тэлеграму, пасланую германскаму кайзеру, якая была падпісана толькі часткай кіраўнікоў БНР і выклікала моцны раскол сярод іх. Аднак у той жа час нельга ігнараваць тыя надзвычай неспрыяльныя, нават экстрэмальныя ўмовы, нямецкую акупацыю, у якіх кіраўнікі БНР дамагаліся стварыць незалежную і вольную беларускую дзяржаву. Фактычна яны змагаліся за тое, што мы маем цяпер – за суверэнную Рэспубліку Беларусь. Зыходзячы хаця б з гэтых пасылак, мы не можам адназначна ацэньваць тое, што звязана з гісторыяй Беларускай Народнай Рэспублікі. На гэтай праблеме, як і на шэрагу іншых, выразна праяўляецца аб'ектыўнасць даследчыка.

З праблемай Беларускай Народнай Рэспублікі непасрэдна звязана ўсё тое, што датычыць утварэння Беларускай ССР. У той публікацыі, якую я маю на ўвазе і аб якой гаварылася вышэй, БССР расцэньваецца як беларуская нацыянальная дзяржаўнасць. З аднаго боку, гэта так. Можна пагадзіцца і з тым сцвярджэннем, што Беларуская ССР стваралася як плацдарм для наступлення савецкіх

войскаў у падтрымку сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Як мы ведаем, прыкладна ў гэтым кантэксце яшчэ ў савецкія часы выказваўся акадэмік І.Ігнаценка. Праўда, ён гаварыў, што ўтварэнне БССР, а затым Літбел мела на мэце стварэнне буфера паміж савецкай Расіяй і буржуазным светам. За гэта ён меў непрыемнасці і нават складанасці ў адносінах з партыйнымі ўладамі.

Можна пагадзіцца і са сцвярджэннем, што са стварэннем БССР карэнная нацыя ў адносінах мовы не атрымала ніякіх пераваг. У той жа час нельга не звярнуць увагу на той акцэнт, які робіць аўтар публікацыі ў афіцыйным выданні. Да прыкладу, БССР «стала першай рэальнай нацыянальнай дзяржавай», што ўтварэнне Беларускай ССР – гэта «першы вопыт беларускай дзяржаўнасці», «першая нацыянальная дзяржава беларусаў» і г.д. Такі моцны націск на першаснасць БССР у шмат якіх адносінах выклікае падазрэнні і нават сумненні. Аддаючы належнае факту стварэння БССР, нельга не ўлічваць, што гэта ўсё ж такі – своеасаблівая форма беларускай дзяржаўнасці. Яе своеасаблівасць заключаецца ў тым, што яна, як мы ведаем, была моцна абмежавана ў сваіх паўнамоцтвах, асабліва пасля стварэння Саюза ССР. Гэтая форма беларускай дзяржаўнасці была надзвычай моцна прывязана да цэнтра і моцна яму падпарадкаваная. Зыходзячы з гэтых і іншых фактараў, можна расцэньваць БССР не толькі як своеасаблівую, але і як абмежаваную дзяржаўнасць беларускага народа.

Хацеў бы сказаць аб некалькіх назіраннях, звязаных з распрацоўкай гісторыі беларускага народа ў савецкі перыяд. На жаль, у нас па-ранейшаму Лютаўская рэвалюцыя 1917 года знаходзіцца ў цяні Кастрычніцкай рэвалюцыі, а падзеі першай сусветнай вайны на Беларусі ў многім перакрываюцца гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны. Яе, несумненна, трэба паглыблена вывучаць, у тым ліку гераічны подзвіг народа, складанасць барацьбы і г.д. Можна адзначыць і зрухі ў вывучэнні адзначаных праблем. Па гісторыі Лютаўскай рэвалюцыі на Беларусі, як вядома, выдадзена манаграфічнае даследаванне акадэміка І.Ігнаценкі. Распрацоўваецца тэма, звязаная з параўнальным аналізам акупацыйных нямецкіх рэжымаў на Беларусі ў гады першай і другой сусветных войнаў. Тым не менш, гэтыя праблемы заслугоўваюць увагі з боку даследчыкаў.

Калі браць больш шырокі кантэкст, то нельга абвінавачваць даследчыкаў гісторыі Беларусі ў тым, што яны дамагаюцца гераізацыі пэўных гістарычных асоб. Уяўляецца, што гэта зусім натуральны працэс у нашай даследчыцкай працы. Аб'ектыўнасць пат-

рабуе аддаць належнае тым нашым прашчурам, якія пакінулі прыкметны след у гісторыі Бацькаўшчыны. Да прыкладу, калі мы знаходзімся на Гродзеншчыне, то нельга не ўспомніць Давыда Гарадзенскага, яго гераічнае змаганне з крыжакамі. Каму, як ні даследчыкам-гродзенцам, больш поўна раскрыць яго гераічныя подзвігі ў імя свабоды роднай зямлі.

Хто-небудзь ды і не праміне папракнуць нас, даследчыкаў, што мы імкнемся сфарміраваць прывабнае аблічча гісторыі Беларусі. А як жа інакш? Гэтае аблічча на працягу доўгага часу настолькі актыўна размывалася, што нельга не ставіць цяпер такую мэту і не імкнуцца яе дасягнуць. Думаю, што дадзеныя два аспекты дзейнасці гісторыкаў Беларусі – гэта выразна станоўчыя моманты. Іх неабходна расцэньваць як важкія напрамкі развіцця гісторыі Беларусі і іх, несумненна, трэба ўзмацняць.

У гэтых адносінах ніяк нельга пагадзіцца з думкай аб тым, што адбываецца, як быццам, выдзяленне этнанацыянальнага фактару ў якасці асноўнага крытэрыя гістарычных ведаў. Думаю, што гэта перабольшанне. Прысутнасць этнанацыянальных момантаў у гісторыі кожнага народа неабходна. Гэта мы пастаянна назіраем у нашых суседзяў, калег-гісторыкаў з Расійскай Федэрацыі, Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі і больш аддаленых дзяржаў. Этнанацыянальны фактар у даследаваннях гісторыкаў Беларусі ўяўляе сабою складальную частку палітычнай гісторыі, да якой цяпер пераважна звернута ўвага даследчыкаў.

Упэўнены, што нам неабходна гаварыць не столькі аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі, колькі аб нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі. Гэта значна шырэй, і, да таго ж, суверэнная краіна – Рэспубліка Беларусь мае патрэбу ў такім падыходзе і ў такіх даследаваннях.

Нам неабходна памятаць і аб тым, што ў самастойнай, незалежнай дзяржаве – Рэспубліцы Беларусь павінны весціся даследаванні і па ўсеагульнай гісторыі. Аднак адпаведна нашым магчымасцям патрэбна вызначыць іх асноўныя прыярытэтныя напрамкі.

Ва ўсіх нашых даследаваннях, як уяўляецца, павінна прысутнічаць зыходная пасылка аб тым, каб не ігнараваць, а выкарыстоўваць зробленае савецкай гістарыяграфіяй. Тым больш, што ў ёй надзвычай шырока прадстаўлены стваральны бок у дзейнасці савецкай улады.

Падсумоўваючы сказанае, можна канстатаваць: ёсць падставы гаварыць аб тым, што, нягледзячы на ўсе складанасці, за апош-

нія амаль паўтара дзесятка гадоў намаганнямі абсалютнай большасці гісторыкаў Рэспублікі Беларусь дасягнуты якасна новы ўзровень у развіцці беларускай гістарычнай навукі. Узровень навуковых ведаў, які мы маем цяпер, і тое, што мелі каля пятнаццаці гадоў таму, несумненна, моцна адрозніваецца. Ігнараваць гэты факт нельга, і тым больш няма падстаў гаварыць аб крызісе ў вывучэнні гісторыі Беларусі. Такое прырашчэнне гістарычных ведаў, і колькаснае, і якаснае, якое мае месца, ні ў якім разе нельга расцэньваць як крызіс. Тое, што ёсць розныя падыходы да шэрагу праблем ці тэм, і некаторыя гісторыкі стаяць на ранейшых пазіцыях, адлюстроўвае складанасць працэсу, але гэта не ёсць крызіс. Гэта – у цэлым рух наперад. У дадзеных адносінах ніхто чамусьці не гаварыў аб крызісе гістарычнай навукі ў савецкі час, калі ўсе былі на адной пазіцыі і ўсё здавалася абсалютна зразумелым. Аднак усё гэта было, як мы ведаем цяпер, надзвычай аднабаковым і ідэалагізаваным.

У заключэнне літаральна некалькі рэмарак. Хачу канстатаваць факт выхаду ў свет маёй манаграфіі «Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі» ў Маскве. Вучоны савет Інстытута Расійскай гісторыі Расійскай Акадэміі навук рэкамендаваў яе да друку. Яна выйшла пад грыфам гэтых навуковых устаноў. Такім чынам, расійскія калегі адобрылі канцэптуальныя падыходы, якія ўтрымліваюцца ў кнізе.

Нядаўна, дзякуючы тэлебачанню, мы былі сведкамі таго, як Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У.Пуцін у Байкальску сустракаўся з групай навукоўцаў. Гістарычную і ўсю гуманітарную навуку на ёй прадстаўляў член-карэспандэнт РАН, дырэктар Інстытута расійскай гісторыі А.Сахараў. Значыць, яго навуковыя падыходы і яго калег, кажучы па-руску, «восстребованы» вышэйшым дзяржаўным кіраўніцтвам Расіі. Хочацца выказаць спадзяванне, што такі падыход будзе ажыццёўлены і ў нас.

*У.Ф.Ладысеў,*
*доктар гістарычных навук, прафесар Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт» г. Мінск*

## ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ НА САВЕЦКАЙ АСНОВЕ

Беларуская дзяржаўнасць з прычыны склаўшыхся гістарычных абставін прайшла два этапы ў сваім станаўленні. Першы звязаны з абвяшчэннем Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасцю яе ўрадавых структур: Народнага Сакратарыята і Рады БНР. Тым самым пытанне аб праве беларускай нацыі на самавызначэнне было пастаўлена ў плоскасць яго практычнай рэалізацыі. Гэта было здзейснена ў снежні 1918 года ўтварэннем беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Трэба адзначыць, што ў беларускай гістарыяграфіі ўсталяваўся некалькі ідэалізаваны падыход да праблемы станаўлення беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Ён зводзіцца да спрошчанай фабулы, што як толькі тэрыторыя Беларусі была ачышчана ад войск кайзераўскай Германіі, ЦК РКП(б) у снежні 1918 года прыняў рашэнне аб стварэнні БССР. VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б) такое рашэнне падтрымала. Беларускімі гісторыкамі не звярталася ўвага на тое, што ў парадку дня канферэнцыі пытанне аб дзяржаўнасці Беларусі наогул не стаяла.

Наўрад таксама можна пагадзіцца з тэзісам, што БССР была створана «ў піку» існуючай БНР. Бо адразу ж узнікае пытанне, чаму БССР не была абвешчана адразу ж пасля заняцця Мінска войскамі Чырвонай Арміі 10 снежня 1918 года, а значна пазней.

Станаўленне дзяржаўнасці Беларусі на савецкай аснове адбывалася не менш складана і драматычна, чым БНР. Нягледзячы на прынятую 2 лістапада 1917 года «Дэкларацыю правоў народаў Расіі«, уладныя структуры РСФСР вясной-летам 1918 года не ішлі далей пазіцыі вобласці ў вырашэнні нацыянальнага пытання. Так адміністрацыйная камісія УЦВК РСФСР прапанавала на тэрыторыі былой царскай Расіі ліквідаваць усялякі нацыянальны падзел і стварыць, акрамя Маскоўскай, яшчэ тры вобласці (камуны): Заходнюю, Паўночную і Уральскую. Заходнюю вобласць меркавалася стварыць у складзе Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Чарнігаўскай, Віленскай і Ковенскай губерняў з абласным цэнтрам у Мінску.

Аднак уладныя структуры Расійскай Федэрацыі не маглі не лічыцца з пазіцыяй левага крыла нацыянальна-вызваленчага руху Беларусі: З.Жылуновічам, А Чарвяковым, І.Лагуном, Я.Дылам, Б.Тарашкевічам і інш., якія ў пачатку 1918 года склалі аснову Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкома), створанага ў адпаведнасці з дэкрэтам У.Леніна ад 31 студзеня 1918 года. Разам з беларускімі секцыямі РКП(б) Белнацком вёў палітычную і культурна-асветніцкую працу сярод беларусаў на тэрыторыі Савецкай Расіі. Менавіта пад уплывам гэтых арганізацый ідэя ўтварэння Беларускай Савецкай Рэспублікі набывала ўсё большую падтрымку.

Але імкненні да беларускай дзяржаўнасці нават на аўтаномных пачатках цалкам ігнараваліся кіраўніцтвам Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) і Аблвыкомзаха, якое знаходзілася ў Смаленску на працягу ўсяго 1918 года. Аблвыкомзах адмаўляў нават пачатковую форму нацыянальнай дзяржаўнасці Беларусі – абласную аўтаномію, прапанаваную Белнацкомам. Ідэі стварэння дзяржаўнасці проціпастаўляўся лозунг інтэрнацыянальнага адзінства працоўных Заходняй вобласці ў барацьбе з буржуазіяй. Таму ў другой палове 1918 года ўсё больш нарасталі непаразуменні паміж Паўночна-Заходнім абкомам РКП(б) з аднаго боку, Белнацкомам і беларускімі секцыямі РКП(б), з другога.

Аднак праблему дзяржаўнасці нельга правільна зразумець, толькі зыходзячы з унутраных фактараў і супярэчнасцяў. Яе неабходна разглядаць у кантэксце новай геапалітычнай сітуацыі ў Еўропе, што ўтварылася ў сувязі з паражэннем Германіі ў першай сусветнай вайне, і практычнымі спробамі кіраўніцтва Савецкай Расіі экспартаваць сацыялістычную рэвалюцыю ў краіны Еўропы, у першую чаргу ў Германію і Польшчу. Так, атрымаўшы першыя звесткі аб палітычным крызісе ў Германіі, Ленін 3 кастрычніка 1918 года пісаў: «Крызіс у Германіі толькі пачаўся. Ён закончыцца непазбежным пераходам палітычнай улады ў рукі германскага пралетарыяту... Цяпер нават самыя асепленыя з рабочых розных краін убачаць, як правільна рабілі бальшавікі, усю тактыку будаваўшы на падтрымцы сусветнай пралетарскай рэвалюцыі і не баючыся прыносіць розныя найцяжэйшыя ахвяры» (У.І.Ленін. Поўны збор твораў. Т. 37. – С. 97–98).

Не выпадкова, што ў тэлеграме Леніна галоўнакамандуючаму Вацэцісу ад 29 лістапада 1918 года падкрэслівалася, што з рухам нашых войск на Захад і Украіну неабходна ўсяляк падтрымліваць часовыя савецкія ўрады Латвіі, Эстляндыі, Украіны і Літвы.

Як бачна, аб Беларусі тут гаворкі няма. І гэта не выпадкова.

У сувязі са стаўкай савецкага кіраўніцтва на перамогу пралетарскай рэвалюцыі ў Цэнтральнай Еўропе Беларусь разглядалася як своеасаблівы калідор, праз які ідзе найбольш прамы шлях па аказанні ваеннай дапамогі пралетарыяту Германіі і Польшчы. Становіцца зразумелым, чаму перадача немцамі Мінска савецкім уладам 10 снежня не прывяла да абвяшчэння Беларускай савецкай рэспублікі. У выдадзеным у гэты дзень загадзе Мінскага губрэўкома «члены Рады БНР і яе агенты падлягалі арышту і неадкладнай перадачы ў рукі Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта» (Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918–июль 1920): Сб. документов и материалов. – Мн., 1961).

Варта адзначыць і тое, што ў прынятай 2 снежня пастанове Паўночна-Заходняга абласнога камітэта, РКП(б) аб скліканні 27 снежня 1918 г. у Смаленску VI чарговай абласной партыйнай канферэнцыі пытання абвяшчэння Беларускай савецкай рэспублікі не значылася. Некалькі пазней Мінскі губрэўком 13 снежня ў тэлеграме старшыні УЦВК РСФСР і сакратару ЦК РКП(б) Я.Свярдлову прапанаваў уключыць у парадак дня абласной партыйнай канферэнцыі пытанне аб утварэнні Беларускай савецкай рэспублікі. Але тэлеграма засталася без адказу.

Нігілістычная пазіцыя цэнтральнага савецкага кіраўніцтва і функцыянераў Заходняй вобласці ў адносінах да дзяржаўнасці Беларусі выклікала занепакоенасць Белнацкома і беларускіх секцый РКП(б). На канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б), якая праходзіла ў Маскве 21–23 снежня, было прызнана неабходным стварыць Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі, абрана Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б) з ліку прыхільнікаў тэрміновага стварэння беларускай дзяржаўнасці ў складзе 5 чалавек на чале з З.Жылуновічам. Цэнтральнаму бюро даручалася склікаць пасля VI Паўночна-Заходняй канферэнцыі Усебеларускі з'езд камуністаў і стварыць нацыянальны партыйны цэнтр.

Прынятыя канферэнцыяй дакументы фактычна паставілі ЦК РКП(б) перад неабходнасцю тэрмінова вырашыць праблему беларускай дзяржаўнасці. Да таго ж разлік Леніна, што польская нацыянальная буржуазія не зможа пратрымацца пасля адыходу нямецкіх акупацыйных войскаў, не апраўдаўся. Было вырашана стварыць уздоўж заходняй мяжы Расіі своеасаблівы «санітарны кардон» з ліку прыбалтыйскіх рэспублік, створанай раней Украінскай рэспублікі, а таксама Беларускай савецкай рэспублікі.

24 снежня праблема дзяржаўнасці Беларусі разглядалася ў ЦК РКП(б). На сённяшні дзень застаецца нявырашаным пытан-

не, на якім узроўні прымалася рашэнне ў Цэнтральным камітэце. Аўтары нядаўна ўбачыўшага свет падручніка «Гісторыя Беларусі» (Ч. II. – Мн., 1998) памылкова сцвярджаюць аб адбыўшымся 24 снежня пленуме ЦК РКП(б). Дакументальнага пацвярджэння аб пасяджэнні ЦК РКП(б) 24 снежня сярод матэрыялаў пасяджэнняў ЦК РКП(б) за 1918 год таксама не выяўлена. Магчыма, старшыня Наркомнаца РСФСР І.Сталін у сваёй размове па тэлефоне з А.Мясніковым 25 снежня, спасылаючыся на рашэнне ЦК, выконваў асабістае ўказанне У.Леніна па беларускім пытанні.

У той жа дзень Сталін запрасіў да сябе на размову адказных супрацоўнікаў Белнацкома і беларускіх секцый РКП(б), у ходзе якой прапанаваў скласці спіс кандыдатаў на замяшчэнне пасад у Часовым рабоча-сялянскім урадзе Беларусі. Праз два дні, 27 снежня, Сталін правёў нараду ў Маскве з кіраўнікамі Паўночна-Заходняга абкома РКП(б) і Аблвыкомзаха Мясніковым і Калмановічам, на якой была акрэслена тэрыторыя Беларускай рэспублікі з пяці губерняў: Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай, а таксама вызначаны склад новага ўрада (старшыня і 15 членаў) і паўнамоцтвы рэспублікі.

На VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б), якая пачала работу 30 снежня ў Смаленску, у даклад А.Мяснікова па пытанні «Бягучы момант» быў уключаны пункт «Беларуская Савецкая Рэспубліка». Ён змяшчаў прапанову «абвясціць Заходнюю Камуну самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікай». У якасці аргумента вылучаўся міжнародны фактар «замкнуць ланцуг самавызначыўшыхся ўтварэнняў» (Пратакол І з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. – Менск, 1934. – С. 13). Дэлегаты пагадзіліся з такой прапановай і без абмеркавання адзінагалосна прынялі яе пры пяці ўстрымаўшыхся. У пастанове аб тэрыторыі рэспублікі асноўным ядром яе лічыліся Мінская, Смаленская, Магілёўская, Віцебская і Гродзенская губерні з прылеглымі да іх мясцовасцямі суседніх губерняў, населеных пераважна беларусамі.

Аднак у гэтых межах ССРБ праіснавала толькі два тыдні. Паміж прыхільнікамі З.Жылуновіча і А.Мяснікова разгарнуліся вострыя спрэчкі ў сувязі з фарміраваннем Часовага ўрада рэспублікі. Канфлікт паміж імі асабіста ўладкоўваў Сталін, які меў намер прыехаць у Мінск у пачатку студзеня, але па прапанове ЦК РКП(б) быў адкамандзіраваны на Усходні фронт у сувязі са склаўшайся там крытычнай сітуацыяй. У тэлеграме да кіраўнікоў ССРБ раіў, што «праз 10 дзён буду ў Вас, паводзьце сябе спакойна і не біцеся, а то будзе дрэнна» (Расійскі цэнтр захоўвання і выву-

чэння дакументаў навейшай гісторыі (РЦЗ і ВДНГ). Ф. 3. Воп. 6. Спр. 4671, А. 1).

Аднак Сталін затрымаўся на фронце не на дзесяць, а больш чым на дваццаць дзён. У яго адсутнасць у Беларусь быў накіраваны ўпаўнаважаны ЦК РКП(б) і член Цэнтральнага Камітэта А.Іофэ з вялікімі паўнамоцтвамі. 16 студзеня 1919 года ЦК РКП(б) прыняў адмоўнае для беларускай дзяржаўнасці рашэнне забраць у толькі што створанай Беларускай Рэспублікі Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні і ўключыць іх у склад РСФСР, а Мінскую і Гродзенскую губерні аб'яднаць з Літоўскай ССР. На пасаду старшыні ЦВК будучай ЛітБел планаваўся непасрэдна А.Іофэ.

Адным з галоўных ініцыятараў утварэння ЛітБела старшыня УЦВК і сакратар ЦК РКП(б) Я.Свярдлоў у тэлеграме ад 30 студзеня ў ЦК КП Літвы як аб звяршыўшымся факце паведамляў, што на з'ездзе Саветаў Беларусі будзе вынесена рашэнне аб аб'яднанні Беларусі з Літвой. Таму прапаноўваў «літоўскім таварышам як можна хутчэй склікаць свой з'езд і правесці там тое ж рашэнне» (Свердлов Я.М. Избр. произв.: В 3 т. – М., 1960. – Т. 3. – С. 143).

Супраць штучнага дзялення этнічнай Беларусі пратэставалі не толькі група З.Жылуновіча, але А.Мяснікоў і яго прыхільнікі. Аб гэтым сведчыць пратакол пасяджэння Цэнтральнага бюро КП(б) Беларусі ад 22 студзеня, на якім прысутнічаў Іофэ. Усе 8 членаў Бюро адхілілі прапанову Іофэ аб падзеле тэрыторыі рэспублікі і вырашылі звярнуцца ў ЦК РКП(б) з просьбай перагледзець пытанне аб усходніх губернях Беларусі (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 1. А. 20-21)).

Таму Іофэ ў лісце Свярдлову ад 28 студзеня адзначыў, што абедзве групы нікуды не вартыя. Беларусы, ці група Жылуновіча – нацыяналісты, а Мяснікоў і яго прыхільнікі, хоць не нацыяналісты, але сепаратысты яшчэ горшай маркі. І раіў разагнаць іх, паслаць на працу куды-небудзь далей ад Беларусі.

Аднак ідэя дзяржаўнасці Беларусі знаходзіла ўсё больш сваіх прыхільнікаў і сярод савецка-партыйнага актыву былой Паўночна-Заходняй вобласці. Гэтыя настроі яскрава выявіліся на Мінскай губернскай партыйнай канферэнцыі, якая адбылася ў канцы студзеня 1919 года. У прынятай рэзалюцыі канферэнцыі за подпісамі членаў Бюро І.Рэйнгольда, Р.Найдзенкава і В.Кнорына выказваўся недавер прадстаўніку ЦК РКП(б) Іофэ, змяшчалася патрабаванне адклікаць яго з Беларусі. Сур'ёзныя папрокі ў адміністрыраванні былі зроблены і ў адрас Свярдлова.

Такая пазіцыя савецка-партыйнага кіраўніцтва Беларускай рэспублікі выклікала сур'ёзную заклапочанасць у ЦК РКП(б). Урэгуляванне канфлікту было ўскладзена на Сталіна, які ад імя Цэнтральнага камітэта РКП(б) адобрыў дзейнасць Іофэ ў Беларусі і патрабаваў ад членаў Цэнтральнага бюро КПБ(б), падпісаўшых рэзалюцыю, перагледзець свае пазіцыі. У той жа час у тэлефанаграме савецкаму ўраду Літвы паведамляў, што на кандыдатуры Іофэ на пасаду старшыні ЦВК Літбела «не настойваем, няхай будзе Ціхоўскі».

Невыпадкова, што ў працы I Усебеларускага з'езда Саветаў 2–3 лютага 1919 года непасрэдна ўдзельнічаў Свярдлоў. У дакладзе асноўны акцэнт ён зрабіў на ахапіўшую краіны Еўропы, на думку дакладчыка, сусветную пралетарскую рэвалюцыю і неабходнасць адзінства ў гэтых умовах пралетарыята Беларусі, Літвы і Расіі. З'езд Саветаў прадубліраваў прынятае раней у Маскве рашэнне аб утварэнні Літоўска-Беларускай савецкай Рэспублікі. 27 лютага 1919 года ў Вільні на аб'яднаным пасяджэнні ЦВК Літоўскай і Беларускай ССР было прынята рашэнне аб аб'яднанні рэспублік Літвы і Беларусі.

З утварэннем гэтай штучнай дзяржаўнасці як бы здымалася з павесткі дня пытанне аб правамернасці далучэння этнічных беларускіх зямель да РСФСР.

У склад новага ўрада ЛітБела З.Жылуновіч не ўвайшоў, бо ў пачатку лютага быў накіраваны на журналісцкую працу ў Харкаў. А.Мяснікоў у маі 1919 года быў камандзіраваны на Усходні фронт у рангу камандуючага Паволжскім фронтам. Яшчэ больш трагічна склаўся лёс Рыгора Паўлавіча Найдзенкава, які на I Усебеларускім з'ездзе Саветаў быў абраны членам ЦВК БССР і яго Прэзідыўма, а ў сакавіку – членам ЦК КП(б)ЛіБ. У маі 1919 года, паводле пастановы ЦВК ЛітБела, ён быў арыштаваны Вярхоўным рэвалюцыйным трыбуналам ЦВК ЛітБела па абвінавачванні ў тым, што выдаваў сябе за члена РСДРП з 1906 года, адказныя пасады ў Заходняй вобласці выкарыстоўваў для сваёй выгады, і быў расстраляны.

Такі сумны вынік першапачатковага этапа стварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Тагачаснаму савецкаму і партыйнаму актыву Беларусі быў дадзены прадметны ўрок пралетарскага інтэрнацыяналізму. Ён наклаў свой адмоўны адбітак на пазіцыю кіраўнікоў Мінскага губрэўкома ў ліпені 1920 года, калі ў другі раз вырашалася пытанне аб абвяшчэнні ССРБ і яе тэрыторыі, што таксама атрымала скажонае асвятленне ў беларускай гістарыяграфіі.

З вызваленнем 11 ліпеня 1920 года Мінска, а затым большай часткі тэрыторыі Беларусі ад польскіх войск склаліся аб'ектыўныя перадумовы для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці. Для падрыхтоўкі дэкларацыі аб абвяшчэнні ў другі раз беларускай дзяржаўнасці была створана камісія. У склад яе ўвайшлі 4 прадстаўнікі ад БПС-Р (Я.Белькевіч, П.Бердннік, У.Мамонька і М.Пашковіч), 2 – ад КП(б)Б ЛіБ (А.Чарвякоў і В.Кнорын), ад БКА – У.Ігнатоўскі, ад Бунда – А.Вайнштэйн. На першым сходзе камісіі былі пастаўлены ў парадак дня наступныя пытанні:

1. Беларусь і яе межы.

2. Адносіны да суседзяў.

3. Дзяржаўна-палітычны лад Беларусі.

4. Зямельная, эканамічная і вайсковая справы.

Галоўнае разыходжанне БПС-Р з пазіцыяй камуністаў было па пытанні аб межах Беларусі. Прадстаўнікі БПС-Р настойвалі, каб у акце абвяшчэння незалежнасці Беларусі быў акрэслены прынцып этнічнага самавызначэння. Аднак прадстаўнік камуністаў В.Кнорын адказаў, што яны «не могуць дапусціць, каб Смаленская, Магілёўская і Віцебская губерні адышлі да Беларусі, таму што жывуць там рускія людзі і што там няма беларусаў («Бюлетэнь заграцічнай групы Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. – 1926. – № 3-4 (студз.–сак.). – С.4–15). Прадстаўнікі БПС-Р афіцыйна заявілі, што пад такой Дэкларацыяй аб аб'яўленні незалежнасці ССРБ яны сваіх подпісаў не паставяць, а таксама адмовіліся ўвайсці ў склад Часовага рэвалюцыйнага камітэта.

ЦК КП(б)Б ЛіБ выказаўся за разрыў адносін з беларускімі эсэрамі. Далейшая гістарычная рэчаіснасць паказала шкоднасць такой палітычнай лініі. Ва ўмовах, калі пачаліся перамовы ў Рызе паміж Расійскай і Польскай дэлегацыямі аб умовах прэлімінарнага мірнага дагавору, патрэбна была лінія на аб'яднанне палітычных сіл, якія адстойвалі тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі.

Таму не выпадкова беларуская нацыя і яе этнічная тэрыторыя аказалася раздзеленай на доўгі час на тры часткі. Як суверэнная дзяржава Беларуская рэспубліка існавала пасля другога абвяшчэння ў межах толькі 6 паветаў былой Мінскай губерні (Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, часткова Мінскі і Слуцкі) былой Мінскай губерні. Яе плошча складала 52,4 тыс. кв. км, а насельніцтва – 1 544 000 чалавек.

*В.І.Галубовіч,*
*прафесар, загадчык кафедры эканамічнай гісторыі Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт»;*

*З.В.Шыбека,*
*прафесар кафедры эканамічнай гісторыі Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт»* *г. Мінск*

# ЭКАНАМІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ Ў БЕЛАРУСІ: ВЫНІКІ РАЗВІЦЦЯ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Вядома, што ў Беларусі існуе эканамічная гісторыя, але, акрамя спецыялістаў, мала каму вядома, што гэта такое па сваёй сутнасці. Выдадзены, праўда, адпаведныя дапаможнікі, але яны чытаюцца пераважна студэнтамі. Таму і ўзнікла неабходнасць напісаць гэты навуковы артыкул, каб больш дакладна вызначыць месца эканамічнай гісторыі на навуковай прасторы, паказаць асноўныя этапы яе станаўлення і ролю ў грамадстве.

Эканамічная гісторыя належыць да гуманітарных навук і вывучае развіццё гаспадарчай дзейнасці людзей, вынікі іх дзейнасці і фактары, што ўплываюць на гэту дзейнасць. Прадметамі зацікаўленасці гісторыка-эканаміста з'яўляюцца паходжанне і развіццё розных тыпаў гаспадаркі, а таксама эканамічныя трасфармацыі, якія адбываюцца ў канкрэтных сацыяльна-гістарычных умовах.

Эканамічная гісторыя зарадзілася на сумежжы дзвюх навук – эканомікі і гісторыі. Спачатку гісторыка-эканамічныя апісанні праводзіліся ў рамках эканамічных даследаванняў, якія імкліва развіваліся ў краінах Заходняй Еўропы ад канца XVIII ст. у сувязі з бурным эканамічным прагрэсам. Затым, пасля з'яўлення ў другой палове XIX ст. дзяржаўнай статыстыкі, сталі пашырацца эканамічныя сюжэты ў рамках гістарычных даследаванняў. Інтэграцыя адзначаных фрагментаў эканомікі і гісторыі ў эканамічную гісторыю як асобную навуку адбылася ў пачатку XX ст. Якраз тады ў еўрапейскіх універсітэтах ствараліся кафедры эканамічнай гісторыі і ўзнік шэраг навуковых гісторыка-эканамічных часопісаў: нямецкі «Квартальнік па сацыяльнай і эканамічнай гісторыі» (1903), французскі «Агляд сацыяльнай і эканамічнай гісторыі» (1913), галандскі «Гісторыка-эканамічны штогоднік» (1915),

англійскі «Агляд эканамічнай гісторыі» (1927), амерыканскі «Часопіс эканамічнай і дзелавой гісторыі» (1927) і інш.

Эканамічная гісторыя мае шмат агульнага як з эканомікай (эканамічнай тэорыяй), так і з гісторыяй і ў той жа час выразна ад іх адрозніваецца. Калі эканоміка даследуе эканамічныя заканамернасці, то эканамічная гісторыя – канкрэтна-гістарычны вопыт гаспадарчага развіцця. Калі гісторыя разглядае эканоміку ў якасці аднаго з прадметаў свайго вывучэння, то эканамічная гісторыя вывучае толькі эканоміку. Гэта навука мае інтэграцыйны характар, паслугоўваецца матэматыка-статыстычнымі і пераважна гістарычнымі метадамі даследавання, а таму ўваходзіць у сістэму гістарычных навук.

Эканамічная гісторыя дзеліцца на айчынную і замежную. З 1960 г. дзейнічае Міжнародная асацыяцыя гісторыкаў-эканамістаў, рэгулярна праводзяцца міжнародныя кангрэсы і канферэнцыі, ствараюцца спецыяльныя даследчыцкія цэнтры (Еўрапейская асацыяцыя па банкаўскай гісторыі, Еўрапейская асацыяцыя гісторыі бізнесу). Эканамічная гісторыя выкладаецца ва ўсіх эканамічных універсітэтах свету.

У Беларусі асновы эканамічнай гісторыі закладзены ў працах знакамітага гісторыка М.В.Доўнар-Запольскага (1867-1934). Яе далейшае станаўленне знаходзілася пад моцным уплывам расійскай, а потым савецкай дзяржаўнай дактрыны. У царскі перыяд, з 1863 г., Беларусь не мела ВНУ. Выкладанне эканамічнай гісторыі пачалося ў 1921 г. на факультэце грамадскіх навук БДУ, дзе рыхтаваліся кадры эканамістаў вышэйшай кваліфікацыі. Адначасова са стварэннем у 1933 г. Беларускага інстытута народнай гаспадаркі (БІНГ) уводзіўся і курс эканамічнай гісторыі. Адпаведная кафедра там узнікла ў 1968 г. Выкладаўся курс гісторыі народнай гаспадаркі СССР, краін сацыялізму і капіталізму. Эканамічная гісторыя Беларусі спецыяльна не вывучалася, але з другой паловы 60-х гадоў выкладчыкі мелі магчымасць рэкамендаваць студэнтам у якасці дадатковай літаратуры «Экономическую историю БССР» пад рэдакцыяй А.І.Сідарэнкі (Мн., 1966) або «Экономическую историю БССР» пад рэдакцыяй К.І.Шабуні і С.Н.Малініна (Мн., 1969). Супрацоўнікі кафедры займаліся вывучэннем праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця савецкай Беларусі (В.Р.Гняўко, В.А.Мілаванаў, Б.Ф.Нікановіч). У 1988 г. кафедру ліквідавалі, гэтаксама, як і ўсе аналагічныя кафедры эканамічных ВНУ былога Савецкага Саюза. Аднак вынікам дзейнасці той кафедры стала вылучэнне эканамічнай гісторыі ў якасці са-

мастойнай навучальнай дысцыпліны. Можа, па гэтай прычыне яе выкладанне ў БІНГ не прыпынялася. Секцыя эканамічнай гісторыі была створана ў складзе кафедры размяшчэння вытворчых сіл. Некалькі выкладчыкаў чыталі на большасці факультэтаў курс «Гісторыя народнай гаспадаркі СССР і замежных краін», а таксама спецкурс «Гісторыя народнай гаспадаркі Беларусі».

Ведамасная раздзеленасць эканамічнай гісторыі не спрыяла яе самасцвярджэнню і развіццю. Калі выкладчыцкая дзейнасць гісторыкаў-эканамістаў канцэнтравалася ў БІНГ, то навуковая – пераважна ў АН БССР. Спецыяльныя даследаванні праводзіліся ў Беларусі з 1959 г., калі ў акадэмічным Інстытуце эканомікі, які працаваў з 1931 г., арганізаваўся сектар эканамічнай гісторыі. У аснову вывучэння развіцця народнай гаспадаркі Беларусі быў пакладзены агульнапрыняты тады фармацыйны падыход. У 1937 г. у свет выйшла кніга М.Г.Матусевіча і С.Н.Малініна «Асноўныя этапы развіцця прамысловасці БССР». Яна стала першай навуковай працай, выдадзенай у Беларусі ў галіне эканамічнай гісторыі. Класічным выданнем эканамістаў-гісторыкаў лічыцца кніга «Экономика Белоруссии в эпоху империализма: 1900-1917» (Мн., 1963). У далейшым творчы акадэмічны калектыў выдаў шэраг прац, прысвечаных гісторыі эканамічнага развіцця Беларусі ў гады савецкай улады. А калі гэтая праца была завершана, сектар у 1981 г. зачынілі. Выпуск падобных адна на адну кніг пра гісторыю савецкай эканомікі траціў сэнс. Тым не менш, вынікам дзейнасці сектара было вылучэнне эканамічнай гісторыі ў якасці самастойнай акадэмічнай навукі. Вядомымі спецыялістамі гэтай навукі сталі М.Ф.Болбас, З.І.Геаргідзэ, В.А.Мілаванаў, Л.М.Міхневіч, В.І.Дрыц і інш.

Пасля ліквідацыі спецыяльных кафедры і сектара даследаванні ў галіне эканамічнай гісторыі працягваліся ў індывідуальным парадку. Аднак далейшы ход развіцця краіны паказаў неабходнасць узнаўлення арганізацыйных структур. Вядучая роля ў наладжванні выкладання і даследавання эканамічнай гісторыі перайшла да створанай у 1991 г. кафедры эканамічнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта (БДЭУ). Пад кіраўніцтвам і навуковай рэдакцыяй загадчыка кафедры прафесара В.І.Галубовіча ў сціслыя тэрміны былі напісаны і надрукаваны неабходныя дапаможнікі. Першы выдадзены ў снежні 1992 года пад назвай «Эканамічная гісторыя Беларусі 1917 – 1992 г.», а праз год – наступны, ужо паўнавартасны, які ахоплівае эканамічную

гісторыю Беларусі са старажытных часоў да сучаснасці – «Эканамічная гісторыя Беларусі» (Мн., 1993). У 1996 і 1999 гадах ажыццёўлены яго другое і трэцяе перавыданні. Апошняя, чацвёртая версія падручніка (дапрацаваная і дапоўненая) надрукавана ў 2001 г. на рускай мове. З 1995 г. кафедра прыступіла да працы над рускамоўным дапаможнікам «Эканамічная гісторыя замежных краін». У тым жа годзе ён быў не толькі напісаны, але і выдадзены. Другое выданне з'явілася ў 1998 г. Дапаможнік атрымаў грыф Міністэрства агульнай і прафесійнай адукацыі Расійскай Федэрацыі, а таму набыў шырокую вядомасць на ўсёй постсавецкай прасторы. Праграма параўнаўчага вывучэння эканамічнай гісторыі Беларусі і эканамічнай гісторыі замежных краін распрацавана і ажыццяўляецца ў Беларусі толькі ў БДЭУ.

Там жа створаны шэраг аўтарскіх дапаможнікаў па спецыяльных праблемах: «Эканамічны стан, побыт і гандаль старажытнай Беларусі (IX–XIII ст.)» В.І.Галубовіча (Мн., 1997), «История туризма» Г.Ф.Шапавала (Мн., 1999), «Промышленность Беларуси в XX столетии» А.М.Сасіма (Мн., 2001), «История развития денежно-кредитной системы Беларуси» Ю.Л.Грузіцкага (Мн., 2002). Вынікі працы выкладчыкаў у распрацоўцы методыкі выкладання гісторыі эканамічных рэформаў знайшлі адлюстраванне ў двух навукова-метадычных зборніках («З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі». Вып. І. Мн., 1994; Вып. 2. Мн., 1998). Навукова-метадычныя даследаванні ўсё больш дапаўняюцца спецыяльна навуковымі. Асабліва мэтанакіравана ў рамках эканамічнай гісторыі працуе моладзь. Спецыяльнасць выкладчыка эканамічнай гісторыі здабываецца цаной уласных намаганняў і сістэматычнай самаадукацыі, бо нідзе адпаведных спецыялістаў у Беларусі не рыхтуюць.

Значны ўклад у станаўленне эканамічнай гісторыі Беларусі ўнеслі ўласна гісторыкі, якія спецыялізаваліся на сацыяльна-эканамічнай праблематыцы: З.Е.Абезгауз, Л.В.Аляксееў, Х.Ю. Бейлькін, А.П.Белязо, М.А.Бяспалая, В.Ф.Голубеў, А.П.Грыцкевіч, П.Р.Казлоўскі, З.Ю.Капыскі, Л.П.Ліпінскі, П.Ф.Лысенка, Л.М.Лыч, А.М.Люты, І.Я.Марчанка, В.І.Мялешка, І.В.Палуян, В.П.Панюціч, В.І.Пічэта, М.Т.Раманоўскі, Э.М.Савіцкі, А.М.Сарокін, У.Сосна, М.Ф.Спірыдонаў, М.М.Улашчык, К.І.Шабуня, Г.В.Штыхаў, З.В.Шыбека і інш.

У 2000 г. у Інстытуце экономікі НАН Беларусі створаны сектар гісторыі эканамічных вучэнняў на чале з доктарам эканаміч-

ных навук В.М.Бусько. Гэта падзея сведчыць пра адыход акадэмічнага інстытута ад праблематыкі эканамічнай гісторыі і набліжэнне да тэматыкі эканамічнай тэорыі (эканомікі). Новая навуковая плынь – гісторыя эканамічных вучэнняў – займае прамежкавае становішча паміж эканамічнай тэорыяй і эканамічнай гісторыяй, але ўсё ж уваходзіць у сістэму эканамічных навук.

У сувязі з пераходам Беларусі да рыначных адносінаў перад эканамічнай гісторыяй паўсталі задачы асэнсавання катэгорый рыначнай эканомікі, праблем узаемасувязі эканомікі і палітыкі, міжнароднага вопыту эканамічнага развіцця, ролі і месца краіны ў сусветнай эканоміцы, а таксама задачы выбару канкрэтных мер павышэння эфектыўнасці ўласнай эканомікі, якасці эканамічнага прагнозу, экалагічнай небяспекі і сацыяльна-эканамічнай салідарнасці беларускага грамадства. Пры гэтым прыярытэтнае значэнне мае комплексны разгляд вывучаемых праблем. Узрастае роля эканамічнай гісторыі і як выкладчыцкай дысцыпліны. Яна закладвае адпаведную эрудыцыю будучых эканамістаў і тым спрыяе іх прафесійнаму росту.

Тым не менш, грамадска-карысны патэнцыял маладой навукі выкарыстоўваецца ў Беларусі яшчэ далёка не поўна. Не існуе спецыялізаванай аспірантуры, не створаны спецыяльныя навуковыя цэнтры, не арганізоўваюцца адпаведныя навуковыя канферэнцыі. На гістарычных факультэтах нашых ВНУ чытаюцца самыя разнастайныя спецкурсы, толькі не па эканамічнай гісторыі. З улікам актуалізацыі праблем эканомікі ў сучасным жыцці эканамічная гісторыя заслугоўвае больш сур`ёзнай увагі.

*І.І.Коўкель,*
*прафесар кафедры гісторыі Беларусі*
*Установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны*
*універсітэт імя Янкі Купалы»* *г. Гродна*

# БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ І ПРАБЛЕМЫ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў XX ст. У СУЧАСНАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Ідэалам, канчатковай мэтай усіх нацыянальных рухаў, праз якія прайшлі амаль усе народы свету, з'яўляецца стварэнне самастойных суверэнных незалежных дзяржаў. Толькі з дасягненнем гэтай мэты кожная нацыя становіцца гаспадаром на сваёй зямлі, атрымлівае магчымасць арганізаваць вытворчую і духоўную дзейнасць людзей на сваёй тэрыторыі ў інтарэсах грамадства. Не быў выключэннем у гэтым плане і беларускі нацыянальны рух, які значна актывізаваўся ў пачатку XX стагоддзя, асабліва пасля перамогі Лютаўскай (1917 г.) рэвалюцыі ў Расіі.

Але дасягнуць канчатковай мэты – стварыць самастойную, незалежную і суверэнную дзяржаву – беларускі народ змог толькі ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, калі Вярхоўны Савет БССР 27 ліпеня 1990 г. прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі. Гэты дзень быў абвешчаны Днём незалежнасці, бо менавіта тады Вярхоўны Савет зацвердзіў паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі, самастойнасць і незалежнасць у знешніх зносінах.

Пасля жнівеньскіх (1991 г.) падзей у Маскве, Вярхоўны Савет БССР прыняў шэраг законаў і пастаноў, якія грунтоўна замацавалі суверэнітэт Беларусі. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце быў нададзены статус Канстытуцыйнага закона. Зменена была і назва дзяржавы. Яна стала называцца Рэспубліка Беларусь. Пазней абвешчаныя незалежнасць і суверэнітэт былі заканадаўча замацаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынятай 15 сакавіка 1994 г.

Шлях да суверэнітэту і незалежнасці Беларусі быў доўгім і складаным. Спачатку на гэтым шляху былі спробы стварэння беларускай дзяржаўнасці на дэмакратычнай аснове, якая пачала фарміравацца ў Расіі пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Ініцыятарамі стварэння дзяржаўнасці на гэтай аснове былі дзеячы беларускіх палітычных партый і арганізацый на тэрыторыі Беларусі. Яны складалі асноўнае ядро беларускага нацыянальнага руху.

Але ажыццявіць свае намеры беларускім дзеячам у той час не ўдалося. Асноўнымі прычынамі правалу гэтых спробаў былі: нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці асноўнай масы насельніцтва Беларусі, яго імкненне ў першую чаргу вырашыць сацыяльныя праблемы, якія актыўна ўзяліся рэалізаваць бальшавікі, як толькі прыйшлі да ўлады ў выніку перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У якасці адной з прычын правалу стварэння беларускай дзяржаўнасці на дэмакратычнай аснове было і тое, што лідэры беларускага руху імкнуліся аб'яднаць пад нацыяльным сцягам усе сацыяльныя слаі насельніцтва, у тым ліку буйных землеўласнікаў, чые інтарэсы карэнным чынам разыходзіліся з яго асноўнай масай.

Адсутнасць падтрымкі шырокіх народных масаў падштурхнула лідэраў беларускага нацыянальнага руху шукаць дапамогі ў дасягненні сваіх мэтаў у акупантаў – спачатку ў кайзераўскай Германіі, а пасля Польшчы. Але гэта канчаткова дэскрыдытавала беларускі нацыянальны рух, і ён ужо не мог аказаць істотнага ўплыву на фармаванне беларускай дзяржаўнасці. Адзіна магчымым варыянтам рэалізацыі гэтай задачы было стварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове, што і было ажыццёўлена ў студзені-лютым 1919 г., калі была абвешчана БССР, пасля вызвалення беларускіх зямель ад нямецкіх акупантаў. БССР праіснавала больш за 70 гадоў, з іх 68 у складзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, і толькі з яго распадам спыніла сваё існаванне.

Як бачна з вышэйсказанага, працэс фармавання і станаўлення беларускай дзяржаўнасці быў цяжкім і складаным. Цяжкім і складаным з'яўляецца і сучаснае становішча Рэспублікі Беларусь. Яна робіць першыя крокі ў рэалізацыі суверэнітэту і сваёй незалежнасці. Каб яны сталі рэальным фактам, іх патрэбна напоўніць канкрэтным зместам. Зрабіць гэта можна будзе, толькі абапіраючыся на гістарычны вопыт, на глыбокі навуковы аналіз падзей, якія адбываюцца, каб не дапусціць пралікаў і памылак, якія мелі ўжо месца ў нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве. Абагульненне гэтага вопыту павінны зрабіць гісторыкі і прававеды.

У гэтым кірунку беларускімі гісторыкамі і прававедамі ўжо зроблена шмат – напісана вялікая колькасць навуковых артыкулаў, шэраг манаграфій, абаронены кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Але задавальняцца дасягнутым нельга, бо яшчэ многія пытанні гэтай надзвычай актуальнай праблемы або яшчэ не закраналіся наогул даследчыкамі, або вывучаны павярхоўна. Каб вызначыць іх, высветліць, што зроблена, што патрабуе больш паг-

лыбленага вывучэння, патрэбна правесці скрупулёзны гістарыяграфічны аналіз, вызначыць праблемы, якія патрабуюць далейшага вывучэння.

У рамках адведзенага мне часу прааналізаваць усю літаратуру па праблеме практычна немагчыма, і, тым не менш, я паспрабую, хоць у агульным плане, даць ацэнку дасягнутага, абазначыць праблемы, якія засталіся па-за ўвагай даследчыкаў або яшчэ вывучаны недастаткова.

Каб зрабіць гэта было лягчэй, спачатку вызначым асноўныя этапы ў развіцці беларускай гістарыяграфіі па праблеме. Гэта значна аблегчыць вырашэнне пастаўленай мэты.

У беларускай гістарыяграфіі па гісторыі беларускага нацыянальнага руху і праблемах фармавання дзяржаўнасці Беларусі (іх нельга разглядаць паасобна) можна вызначыць тры асноўныя перыяды, або этапы. Гэта:

1) 1917 г. – канец 20-х – пачатак 30-х гадоў;

2) пачатак 30-х гадоў – канец 80-х;

3) канец 80-х – пачатак 90-х гадоў – да нашых дзён.

На першым этапе важкі ўклад у распрацоўку праблемы ўнеслі вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху: А.Луцкевіч, А.Станкевіч, У.Гадлеўскі, Я.Варонка, К.Езавітаў, А.Цвікевіч, П.Крычэўскі, М.Краўцоў, Т.Грыб, Я.Канчар, Ф.Турук, А.Бурбіс і інш. Іх працы змяшчаюць каштоўны фактычны матэрыял аб узнікненні і дзейнасці першых беларускіх палітычных партый, іх ідэалогіі, палітыцы і тактыцы на тым ці іншым этапе гістарычнага развіцця, аб першым Усебеларускім з'ездзе, абвяшчэнні БНР, дзейнасці Рады і ўрадаў БНР, іх супрацоўніцтве з нямецкімі і польскімі акупантамі і па іншых пытаннях. Напісаныя непасрэднымі ўдзельнікамі падзей, яны дазваляюць сучасным даследчыкам супастаўляць розныя пункты погляду, падыходы і меркаванні, ацэнкі ў дачыненні да праблемы стварэння беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX стагоддзя.

Аднак публікацыі вышэйназваных аўтараў грашаць празмернай рамантычнай узнёсласцю, эмацыянальнасцю, пераацэнкай сваіх магчымасцей, спробамі выдаць жадаемае за сапраўднае і г.д. Да іх патрэбна ставіцца крытычна, супастаўляць і параўноўваць прыведзеныя факты з архіўнымі матэрыяламі і іншымі дакументальнымі крыніцамі.

Такога ж падыходу патрабуюць і публікацыі таго часу лідэраў другога крыла беларускага нацыянальнага руху – радыкальнага: Дз.Ф.Жылуновіча, А.Р.Чарвякова і інш. У іх таксама закра-

наліся праблемы ўзнікнення і развіцця беларускага нацыянальнага руху, фарміравання ў ім радыкальнага напрамку, разглядаліся пытанні арганізацыі і дзейнасці Беларускага нацыянальнага камісарыяту, беларускіх камуністычных секцый, іх ролі ў падрыхтоўцы і абвяшчэнні БССР.

Некаторыя звесткі па праблеме нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі ў 1917 – 1920 г. утрымліваюцца і ў працах тагачасных беларускіх камуністычных лідэраў А.Ф.Мяснікова, В.Г.Кнорына і інш., якія публікаваліся ў той час.

Спрабавалі разабрацца з гэтай праблемай у 20-я гады і беларускія прававеды. У 1929 г. у першым нумары працаў кафедры сучаснага права АН БССР быў апублікаваны артыкул Г.Парэчына «Ідэя беларускай дзяржаўнасці перад утварэннем Савецкай Беларусі». Аўтар спрабаваў прасачыць узнікненне і развіццё беларускай нацыянальна-дзяржаўнай ідэі на працягу XIX – першай чвэрці XX стагоддзяў, звяртаючы асаблівую ўвагу на складаныя і супярэчлівыя падзеі 1917 – 1920 г.

Аналіз публікацый 1917 – канца 1920-х гадоў сведчыць, што ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе існаваў плюралізм думак, мірнае суіснаванне розных школ і напрамкаў даследаванняў, што спрыяла ўсебаковаму вывучэнню гісторыі. Але такое становішча назіралася нядоўга – да пачатку 30-х гадоў. У гэты час разгарнулася актыўная барацьба супраць «правага ўхілу» і «нацыянал-дэмакратызму», у гістарычнай навуцы ўсталявалася адзіная марксісцкая метадалогія. У гэтых умовах беларускі нацыянальны рух, беларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі, спробы стварэння беларускай дзяржаўнасці на дэмакратычнай аснове сталі разглядацца толькі як варожыя марксізму, дыктатуры пралетарыяту, як асноўныя праціўнікі бальшавікоў. Менавіта такі падыход быў характэрны для публікацый Д.Дудкова, А.Кіржніца, А.Зюзькова, С.Валкавыскага і інш.

У другой палове 30 – 1950-я гады тэмы, звязаныя з распрацоўкай гісторыі беларускага нацыянальнага руху, стварэння беларускай дзяржаўнасці на дэмакратычнай аснове, практычна знаходзіліся пад забаронай. У гэты час выйшлі з друку толькі дзве манаграфічныя працы Н.В.Каменскай, прысвечаныя гісторыі ўтварэння БССР. У іх галоўная ўвага надавалася кастрычніцкім падзеям 1917 г. і ўсталяванню Савецкай улады ў Беларусі, у меншай ступені даследавалася нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва. Названыя работы насілі не навуковы, а прапагандысцкі характар і не ўтрымлівалі спасылак на дакументальныя крыніцы.

Становішча змянілася пасля XX з'езда КПСС. У канцы 50-х, 60-80-я гады ўзмацніўся акцэнт на навуковым вывучэнні мінулага, у тым ліку гісторыі нацыянальных рухаў і палітычных партый, праблем беларускага нацыянальнага руху і беларускай дзяржаўнасці. Гэтыя праблемы знайшлі адлюстраванне ў кандыдацкіх дысертацыях Е.Ф.Саўчук, В.П.Засінца, Э.А.Ліпецкага, І.І.Коўкеля, доктарскай дысертацыі В.А.Круталевіча, публікацыях А.П. Грыцкевіча, І.М.Ігнаценкі, С.З.Пачаніна, В.А.Круталевіча, У.Ф. Ладысева, М.С.Сташкевіча, І.І.Коўкеля і інш. У іх даследаваннях і публікацыях на аснове багатага дакументальнага матэрыялу разглядаліся праблемы гісторыі беларускага нацыянальнага руху, фармавання і дзейнасці беларускіх палітычных партый і арганізацый, іх стратэгія, палітыка і тактыка, станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці.

З усіх вышэйпералічаных аўтараў асобна хацелася б вылзеліць В.А.Круталевіча і М.С.Сташкевіча, якія ўнеслі найбольш значны ўклад у распрацоўку разглядаемых праблем. В.А.Круталевіч першым паказаў у сваіх публікацыях панараму развіцця беларускага нацыянальнага руху ў 1917 – 1919 г., раскрыў працэс фармавання беларускай дзяржаўнасці ў гэты перыяд. Яго публікацыі характарызуюцца неардынарным падыходам, глыбокім навуковым узроўнем, шырокім выкарыстаннем архіўных крыніц, перыядычнага друку таго часу. М.С.Сташкевічу належыць роля першаадкрывальніка ў беларускай гістарыяграфіі грамадскіх рухаў і палітычных партый. Гэта яго публікацыі і ў першую чаргу манаграфіі даюць магчымасць уявіць усю палітру грамадска-палітычнага руху ў Беларусі ў першай чвэрці XX стагоддзя, гісторыю агульнарасійскіх, беларускіх, яўрэйскіх і польскіх палітычных партый, якія дзейнічалі ў Беларусі ў гэты час, высветліць іх ролю, якую яны адыгралі ў станаўленні і развіцці беларускай дзяржаўнасці.

Даследчыкаў гэтага перыяду, да якіх належу і я, сёння крытыкуюць за аднабаковы падыход у асвятленні падзей, празмерную запартызаванасць і г.д. Так, гэтую крытыку можна прызнаць слушнай, бо працы пісаліся ў той час, калі КПСС была кіруючай партыяй, дамінавалі адзіная марксісцка-ленінская метадалогія і класавы падыход да ацэнкі гістарычных падзей. Не было свабоднага доступу і да закрытых архіваў. Даследчыкі не маглі карыстацца імі ў сваіх даследаваннях.

Але перад крытыкамі я хацеў бы паставіць пытанне – ці можам і ці маем мы права цалкам адмаўляцца ад класавага падыхо-

ду і марксісцкай метадалогіі, у аснове якой ляжыць гэты падыход. Жыццё сёння нас арыентуе якраз на іншае, і бліжэйшы час пакажа, на каго нам арыентавацца: на празмерных багацеяў, якія шляхам падману і іншых маніпуляцый нажылі на горы народным мільярды, ці на тых, каго абрабавалі і хто апынуўся на грані выжывання.

У канцы 80 – пачатку 90-х гадоў наступіў трэці этап у гістарыяграфіі гісторыі беларускага нацыянальнага руху, станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці. У гэты час перад даследчыкамі адкрылася магчымасць шырокага доступу да архіўных матэрыялаў, асабліва тых, якія знаходзіліся на спецзахаванні, нават да архіваў КДБ, пачалі публікавацца працы дзеячоў беларускага нацыянальнага руху, якія раней знаходзіліся пад забаронай. Гэта спрыяльна паўплывала на актывізацыю навуковых даследаванняў. У сувязі з гэтымі пераменамі ў апошні час з'явіўся шэраг кандыдацкіх дысертацый: С.С.Рудовіча, М.В.Цубы, А.Д.Тогулевай, Н.А. Глушаковай, В.Г.Мазца, Т.Я.Паўлавай, М.В.Гудава, А.Г.Багдановіч і інш., у якіх даследуюцца праблемы ўзнікнення і дзейнасці беларускіх палітычных партый і арганізацый, станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці: абвяшчэнне БНР, яе міжнародная дзейнасць, удзел беларускіх палітычных партый і арганізацый ва ўзброенай барацьбе супраць Савецкай улады і партыі бальшавікоў, шэраг іншых пытанняў.

Паколькі гэтыя праблемы актыўна дыскутаваліся ў перыядычным друку і сярод грамадскасці, то яны сталі таксама і тэмамі манаграфічных даследаванняў, навуковых артыкулаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца як ужо вядомыя гісторыкі, так і маладыя, якія прыйшлі ў навуку ў апошні час. Сярод іх неабходна назваць В.А.Круталевіча, М.С.Сташкевіча, І.М.Ігнаценка, Ю.П.Смірнова, Р.П.Платонава, А.П.Грыцкевіча, У.М.Міхнюка, У.Ф.Ладысева, П.І.Брыгадзіна, І.І.Коўкеля, С.С.Рудовіча, Н.І.Стужынскую і іншых.

Актывізавалася ў гэты час і публікацыя дакументальных крыніц. У.М.Міхнюк, М.С.Сташкевіч, А.Ф.Хацкевіч разам і паасобку з У.У.Адамушкам, Э.А.Ліпецкім, А.М.Гесь, А.І.Валахавічам і іншымі даследчыкамі і архівістамі апублікавалі шэраг дакументальных матэрыялаў, звязаных з допытамі арыштаваных дзеячоў беларускага нацыянальнага руху ў 30 – 40-я гады: В.Ластоўскага, А.Смоліча, Я.Лёсіка, Б.Тарашкевіча, С.Рак-Міхайлоўскага, А.Луцкевіча, А.Сокала-Култыкоўскага, У.Пракулевіча, К.Езавітава і іншых. Гэта дае гісторыкам магчымасць глыбей зразумець эпоху, больш грунтоўна падысці да асвятлення гісторыі беларускага нацыянальнага руху, станаўлення беларускай дзяржаўнасці.

Вялікае значэнне для даследчыкаў маюць і публікацыі дакументаў, знойдзеных у архівах Беларусі, Літвы, Расійскай Федэрацыі, а таксама апублікаваных раней у эміграцыйных выданнях. Гэта датычыць пратаколаў Першага Усебеларускага з'езда, матэрыялаў Слуцкага паўстання, палітычнай нарады ў Празе ў верасні 1921 г., палітычнай нарады ў Берліне ў кастрычніку 1925 г. і інш. У гэтым вялікая заслуга рэдакцыі часопіса «Спадчына», якая шмат зрабіла ў гэтым кірунку. Тое ж самае хочацца сказаць і ў адрас С.Шупы, а таксама тых, хто дапамагаў яму ажыццявіць праект выдання віленскага архіва БНР. Я добра знаёмы з матэрыяламі 582 фонда архіва Літвы, бо працаваў з імі на працягу двух гадоў (у 1973 і 1974 г.). Тады яны знаходзіліся на сакрэтным захоўванні, і толькі некаторыя даследчыкі мелі магчымасць з імі азнаёміцца. Цяпер, дзякуючы публікацыі матэрыялаў фонда, імі могуць карыстацца многія даследчыкі.

Пошук і публікацыя новых матэрыялаў далі магчымасць гісторыкам падрыхтаваць і апублікаваць шэраг грунтоўных манаграфій, у якіх па-новаму разглядаюцца многія праблемы беларускага нацыянальнага руху, нацыянальнага будаўніцтва. Сярод гэтых работ у першую чаргу хацелася б назваць манаграфіі В.А. Круталевіча: «На путях национального самоопределения (БНР-БССР-РБ)» (Мн., 1995) і «История Беларуси: становление национальной державности (1917 - 1922 г.)» (Мн., 1999), за якія ён атрымаў Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь, а таксама калектыўныя працы, выдадзеныя ў Гомелі маскоўскімі, мінскімі і гомельскімі гісторыкамі ў 90-я гады. Гэта: «Октябрь 1917 г. и судьбы политической оппозиции: В 3 частях» (Гомель, 1993) и «Становление и крушение однопартийной системы в СССР» (Гомель, 1995) пад рэдакцыяй М.Э.Энціна і пры непасрэдным удзеле М.С.Сташкевіча. Сярод гэтых публікацый нельга абмінуць манаграфіі У.Ф.Ладысева і П.І.Брыгадзіна «На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917 - 1920 г.)», калектыўную працу У.К.Коршука, Р.П.Платонава, І.Ф.Раманоўскага, Е.Г.Багдановіч «Государственность Беларуси: проблемы формирования в программах политических партий», а таксама невялікую па аб'ёме працу А.М.Рэзніка «К вопросу о государственности БНР, или Так была ли БНР государством?». Гэтыя публікацыі даюць магчымасць паставіць кропкі над многімі ідэалагічна вострымі і спрэчнымі пытаннямі станаўлення і фарміравання беларускай дзяржаўнасці. Шмат цікавай інфармацыі ўтрымліваюць таксама манаграфіі С.С.Рудовіча і Н.І.Стужынскай.

Вось сцісла аб тым, як складаюцца справы ў беларускай гістарыяграфіі па праблемах гісторыі беларускага нацыянальнага руху і фармавання беларускай дзяржаўнасці. Вядома, што ў гэтым паведамленні я не змог ахапіць усе праблемы і не змог назваць многіх публікацый, якія заслугоўваюць увагі. Іх больш за тысячу, і няхай даруюць мне аўтары тых, што я не назваў. Зробім гэта ў наступны раз, можа, у асобнай манаграфіі. Сёння мне хацелася б некалькі слоў сказаць яшчэ і аб польскай, беларускай эмігранцкай і замежнай гістарыяграфіях па праблеме. Пачнем з польскай. Яе можна падзяліць на тры асноўныя этапы: даваенную, пасляваенную (часоў ПНР) і сучасную. З даваенных польскіх гісторыкаў праблемамі беларускага нацыянальнага руху, стварэння беларускай дзяржаўнасці, становішча беларусаў у складзе II Рэчы Паспалітай актыўна займаліся Л.Васілеўскі, К.Сракоўскі, Я.Ахота, П.Трайдэнскі, С.Віслоух, С.Ельскі, З.Урбаньскі і інш. У іх працах змяшчаецца шмат цікавага матэрыялу, і аб іх патрэбна ведаць сучасным беларускім даследчыкам. Артыкул па гэтай праблеме мною надрукаваны ў матэрыялах навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю Інстытута гісторыі НАН Беларусі, якая праходзіла ў Мінску 6-7 кастрычніка 1999 г.

З пасляваенных польскіх гісторыкаў, якія ўнеслі важкі ўклад у распрацоўку праблем беларускага нацыянальнага руху, беларуска-польскіх узаемаадносін, асабліва палітыкі Польшчы ў адносінах да Беларусі ў 1918 – 1925 г., патрэбна назваць у першую чаргу А.Бергман, В.Гастынску, А.Дзяругу, Р.Вапіньскага, Е.Куманецкага, П.Ласоўскага, Ю.Левандоўскага, А.Юзвенку і інш. Іх працы напісаны на багатай дакументальнай аснове і ўтрымліваюць шмат цікавых звестак для беларускіх гісторыкаў.

Нямала пішуць аб беларуска-польскіх узаемаадносінах напярэдадні і ў час польска-савецкай вайны, а таксама ў міжваенны перыяд сучасныя польскія гісторыкі: К.Гамулка, А.Глагоўская, Ю.Героўская-Калаур, З.Карпус, А.Латышонак, Г.Лукомскі, М.Мароз, Е.Рэзмер, Я.Юркевіч і інш. Без іх прац сёння таксама не можа абысціся ні адзін гісторык, які ўсур'ёз займаецца даследаваннем праблем гісторыі беларускага нацыянальнага руху, станаўлення беларускай дзяржаўнасці.

Цікавяцца беларускай праблематыкай, звязанай з гісторыяй сваіх краін, таксама нашы паўночныя і паўднёвыя суседзі – украінцы, літоўцы і латышы. Сярод іх хацелася б асобна выдзеліць маладога таленавітага латышскага гісторыка Э.Якабсона, які ча-

ста прыязджае да нас на канферэнцыі і публікуе цікавыя матэрыялы па беларуска-латвійскіх узаемаадносінах у 1919 - 1921 г.

Гістарыяграфічны агляд па праблемах гісторыі беларускага нацыянальнага руху і нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва быў бы далёка няпоўным, калі б мы нічога не сказалі аб працах беларускай пасляваеннай эміграцыі. Многія з іх ужо дарослымі пакінулі радзіму ў сувязі з тым, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны актыўна супрацоўнічалі з гітлераўскімі акупантамі, а другія выехалі на Захад з сваімі бацькамі, там атрымалі вышэйшую адукацыю, актыўна ўключыліся ў антысавецкую барацьбу разам з прадстаўнікамі старэйшага пакалення. Але стварыць штосьці фундаментальнае ў навуковым плане па гісторыі Беларусі і, у прыватнасці, па гісторыі беларускага нацыянальнага руху, станаўленню беларускай дзяржаўнасці яны не змаглі. На гэта былі аб'ектыўныя прычыны. Беларускія эмігранцкія гісторыкі былі адарваны ад архіўных матэрыялаў, не мелі яны доступу да іншых дакументальных крыніц. У сваіх працах яны спасылаліся ў лепшым выпадку на публікацыі былых лідэраў беларускага нацыянальнага руху, газетныя публікацыі часоў Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, якія былі самі далёкімі ад аб'ектыўнасці. Таму і працы, створаныя эмігрантамі, носяць не навуковы, а больш прапагандысцкі характар, не пазбаўлены палітычнай прадузятасці, уплываў ідэалогіі «халоднай вайны». Навуковая каштоўнасць іх невысокая.

Прыкладна такую ж ацэнку можна даць і публікацыям замежных саветолагаў, прысвечаным гісторыі Беларусі, ажыццяўленню савецкай нацыянальнай палітыкі ў ёй, фармаванню беларускай дзяржаўнасці. Яны грашаць тымі ж недахопамі, што і публікацыі беларускай эміграцыі.

Як бачна з гістарыяграфічнага агляду, у беларускай айчыннай і замежнай гістарыяграфіі ўжо накоплена вялікая колькасць прац па самых розных аспектах гісторыі беларускага нацыянальнага руху, станаўленню беларускай дзяржаўнасці. Некаторыя пытанні вывучаны ўжо даволі грунтоўна. Гэта датычыць раскрыцця перадумоў зараджэння беларускага нацыянальнага руху, перарастання яго з культурна-асветніцкага кірунку ў палітычную барацьбу, узнікнення і дзейнасці першых беларускіх палітычных партый і арганізацый, іх дзейнасці ў гады першай рускай рэвалюцыі, у перыяд паміж першай і другой рэвалюцыямі ў Расіі, вясной і летам 1917 г., ва ўмовах Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай

рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі. Даволі грунтоўна даследаваны таксама арганізацыйныя асновы, ідэалагічныя платформы, стратэгія, палітыка і тактыка асноўных беларускіх палітычных партый і арганізацый як у часы апошніх рэвалюцый у Расіі, так і ў гады грамадзянскай вайны. Раскрыты таксама і спробы лідэраў беларускага руху стварыць нацыянальную дзяржаўнасць, спачатку ва ўмовах нямецкай, а пасля і польскай акупацыі. Але не ўсе нюансы палітыкі Рады і ўрадаў БНР у гэты час вядомы даследчыкам. Многія і найбольш каштоўныя дакументы па гэтай праблеме былі вывезены Міколам Абрамчыкам з Прагі ў Парыж пасля смерці Васіля Захаркі. Не закраналі пакуль што даследчыкі і праблем легітымнасці фармавання Выканкома Усебеларускага з'езда, яго Рады, правамернасці фарміравання ўрадаў БНР, дзейнасці Рады БНР і іншых пытанняў. Гэта толькі некалькі праблем, якія патрабуюць далейшай распрацоўкі. А іх значна больш. Патрэбен больш глыбокі і грунтоўны гістарыяграфічны аналіз.

# СЕКЦЫЯ 1

# НАВУКОВА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ І МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ РАЗВІЦЦЯ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ

*М.А.Ермолицкий* *г. Минск*

## МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ИЗУЧЕНИЯ ИСТОРИИ МОДЕРНА В СОВРЕМЕННОЙ ИСТОРИЧЕСКОЙ НАУКЕ

Современная мировая историческая наука находится в состоянии определенного кризиса, нашедшего своё выражение в печально знаменитом тезисе американского историка Ф.Фукуямы о «конце истории». Основной аргумент Фукуямы, согласно которому с провалом «реального социализма ... человеческое общество в социальных формах буржуазного общества собственников хотя и можно улучшить, но нельзя преодолеть», противоречит элементарной логике исторического процесса не случайно, что подобная телеология истории подводила и антиподов буржуазного общества – марксистских историков с их тезисом «предистории» и коммунизмом как «венцом истории».

Отражением методологического кризиса исторической науки является, как минимум, временная неудача двух наиболее известных подходов к анализу исторического процесса – сначала формационного, а сейчас и цивилизационного. Не случайно свою попытку создать новую периодизацию истории сам её автор в следующей своей книге квалифицировал как «авантюру».

Методологический кризис науки – в целом нормальное явление, свойственное любой науке, особенно сейчас – на этапе перехода к новой «постнеоклассической науке». Началось и становление новой исторической науки, называемой на Западе «большой историей», а в России – универсальным эволюционизмом. Однако ощутимые результаты эти подходы принесут, видимо, не

очень скоро. А исследование истории не должно прекращаться. Поэтому, на наш взгляд, представляют интерес такие методологические подходы, которые позволяют уже сегодня более продуктивно, чем ранее, анализировать исторический процесс, обладая значительной объяснительной способностью и потенциалом консенсуса среди историков. К тому же, будучи междисциплинарными, они применяются чаще всего к изучению истории общества разных стран и народов. История общества как целого и есть основной предмет их изучения. В частности, речь идёт о методологическом подходе, названном их авторами историческим «коридором действия», накладываемым на методологию периодизации истории, известную как «предмодерн, модерн и постмодерн».

Рассмотрим подробнее два эти элемента данного варианта методологии исторического познания. Начнём с модерна, поскольку его основные элементы – индустриализация, урбанизация и современная семья – либо уже присущи, либо будут характерны в той или иной степени и форме каждому современному (модерному) обществу.

Наиболее приемлемо, на наш взгляд, социологическое определение модерна, данное известным немецким социологом К.Офоре. С его точки зрения, модерн состоит из двух исторических процессов, соединённых друг с другом: «Первый процесс состоит из разделения актёров, организаций и социальных подсистем в отношении других подсистем – процесс, который в теоретической литературе обозначается такими понятиями, как обособление, высвобождение, образование, автономизация, самозаконность и другие. Первый процесс проявляется в трёх характерных для модерна признаках, а именно: в расширении выбора, специализации и функциональной дифференциации при доминации целерациональных действий актёров в общественных подсистемах (экономике, политике, науке, культуре, семье и др.).

Рассмотрим это на примере индустриализации, с началом которой и начинается история модерна. Индустриализация проходит в своём развитии несколько этапов: а) жёсткое производство (один станок – одна деталь, исторические замки – от индустриальной революции до начала XX в.); б) негибкое массовое производство (фордизм) – конвейерное производство, датируемое 60 – 70-ми годами XX в.; в) гибкое производство (постфордизм) – робототехника, компьютеризация, заданные качества продукта. В сумме с другими элементами развития (упомянем дополнительно только элемент трудовых отношений – переход от тейлоризма к

участию в принятии решений всех членов организации) этот процесс привёл к невиданному ранее росту производства и потреблению материальных благ.

Второй процесс – оборотная сторона модернизации – связан с потерей традиционных ограничений выбора индивидуальных действий, которая предлагает индивидам и большую безопасность ожиданий, и индивидуальные риски. Возникающие вместе с тем проблемы координации решаются в трёх основных «местах»: «государстве» (политика), «рынке» (отношения обмена) и «сообществе» (кормосоздающие общественные отношения). Конечно, здесь встают вопросы границ модерна и начала постмодерна, которые пока остаются открытыми, но, в любом случае, историческое исследование этой «оси» развития является, на наш взгляд, более плодотворным, чем идентификация общественно-исторических формаций либо цивилизаций, а по большому счёту и не противоречит им.

Второй элемент рассматриваемой концепции – теория исторического «коридора действия», которая, на наш взгляд, может иметь роль тонического метода в историческом исследовании, позволяющего довольно быстро распознавать основы проведения именно данного, а не иного реализованного варианта исторических событий.

По мнению авторов указанного подхода, в каждый данный момент общественная структура является результатом прошлых селективных решений. В конкретных, заранее найденных отношениях историческими актёрами принимаются решения, которые элиминируют альтернативы будущего развития и из которых следуют «натиски» для будущего развития (т.е., исторические «коридоры действий»), но эти действия не являются однозначно детерминированными. Исходя из понятия «коридоры действий», Б.Бланке устанавливает между границами системы, которые отдаются всеобщей структурой регуляции отношений политики и экономики на основе собственности, с одной стороны, и более конкретной «границей деятельности», которая устанавливается отношениями классов и конфликтов.

В «коридоре действий», который определяется на основе относящихся к структуре прошлых экономических, социальных и политических решений и событий, в конкретно-исторических условиях социальные противоречия могут обостряться так, что провоцируют переход к новой формации общества и тем самым к новому, качественно изменившемуся «коридору действия». При

этом, как полагает Й.Хоформан, нет никакого автоматизма в направлении «общественного прогресса». К примеру, буржуазно-капиталистическое общество вовсе не обязательно связано с демократически-политической формой регуляции, но представляет собой «лишь определенный коридор для всех форм регуляции, внутри которого демократические и авторитарные формы в равной мере представляют собой функциональные элементы политического регулирования».

Таким образом, «коридор действий» в истории является в каждый данный момент результатом предшествующих политических действий и общественных структур и исходным моментом будущих действий и структур. При его анализе важно обращать внимание на данный тип производства (тип аккумуляции капитала, технологии «трудовые отношения»), социальную структуру, ведущие политические блоки и их «селективные решения», а также на общую и политическую культуру. Такой подход может быть использован, на наш взгляд, разными историческими школами, а его научная коммуникация на основе корректного дискурса может дать исторической науке немало положительных результатов.

*С.П. Рамазанов* *г. Волжский*

## ЦЕННОСТНОЕ ОТНОШЕНИЕ К ИСТОРИИ И ПРОБЛЕМА МЕТОДОЛОГИЧЕСКОГО СИНТЕЗА

Опыт развития методологии в XX в. демонстрировал трудности методологического синтеза, связанные с выдвижением и трансформацией ценностного отношения как принципа исторического познания. Вместе с тем, постановка вопроса об организации постижения прошлого на базе ценностного отношения явилась первой реальной попыткой синтеза методологических принципов исторического исследования.

По сути дела, до рубежа XVIII-XIX в. историческая наука не имела собственной методологической основы развития, ориентируясь на принципы естествознания и философии. Осмысление специфики исторического познания было начато формулированием идей историзма. Однако на протяжении почти всего XIX в. принцип историзма оставался фактически единственным собственно историческим методологическим принципом. Принцип

ценностного отношения возник в баденской школе неокантианства из стремления обосновать практику немецкого историзма. При этом ценностное отношение существенно дополняло и ограничивало идеи историзма.

Пытаясь обосновать понимание истории как «науки о культуре» в широком смысле этого слова, лидеры баденской школы неокантианства В.Виндельбанд и Г.Риккерт усматривали задачу историка в описании индивидуальных фактов прошлого, имеющих отношение к культурным ценностям. Вместе с тем, стремясь преодолеть известный релятивизм немецкого историзма, Виндельбанд и Риккерт утверждали, что ценности как критерии выбора исторических фактов имеют вневременную трансцендентную природу и не связаны с субъективной психологической оценкой. При этом Г.Риккерт подвергал резкой критике марксистскую интерпретацию процесса исторического познания, которая трактовалась им как чрезвычайно узкий ценностный подход. Философ полагал, что выдвижение марксизма в качестве наиболее существенной хозяйственной стороны жизни общества привело к тому, что «вся культура в высшем смысле стала... только «отражением». Таким образом, – заключает он, – здесь возникает почти что платоновский идеализм с той разницей, что на место идеалов головы и сердца стали идеалы желудка; этим была добыта точка зрения, с которой все историческое развитие человечества необходимо должно рассматриваться как борьба за место у корыта».

В самом деле, предпринятая в марксистской методологии попытка соединить идеи историзма с целостным осмыслением исторического процесса не привела к позитивным результатам, поскольку такое соединение осуществлялось на основе его подчинения субъективно-групповому ценностно-оценочному подходу, именуемому принципом партийности. С этих позиций история фактически подчинялась идеологии и политике и по существу не могла рассматриваться как научная дисциплина.

В то же время нарастающая критика представлений Виндельбанда и Риккерта о природе ценностей как со стороны их противников, так и со стороны сторонников неокантианского течения вела к утверждению в исторической мысли положения о субъективности ценностного отношения. Американский исторический презентизм, как и марксизм, говорил о необходимости открытого подчинения истории обслуживанию политических интересов.

Начиная с 1950 – 1960-х г. проблема участия ценностного отношения к исследовательской работе историка вновь выступа-

ет на первый план в методологических дискуссиях как на Западе, так и в Советском Союзе. В своем стремлении возродить престиж истории как научной дисциплины представители «новой истории» в различных её модификациях – экономической, социальной, структурной и др. – ставили задачи максимального сближения истории и естествознания по методам и целям и, вместе с тем, – устранения или всемерного ограничения ценностных оценок применительно к историографической практике. И в марксистской исторической мысли в 1960 –1970-е г. наряду с попытками расширить партийный подход, дополнив его различными видами аксиологического отношения, также наблюдалось стремление историков элиминировать ценностные оценки из своей исследовательской работы. Так, крупный советский историк А.З.Манфред писал: «Моральные оценки, всегда субъективные и спорные, вряд ли должны быть привносимы в историческую науку».

Безусловно, «новая научная история» много сделала для укрепления связи истории с другими науками, для развития междисциплинарного синтеза и приближения исторической науки к целостному осмыслению прошлого. Однако пренебрежительное отношение к ценностному подходу вело к выхолащиванию из исторического процесса человеческого содержания и, в конечном итоге, игнорированию принципа историзма. Попытки же преодолеть аксиологические оценки в историческом исследовании зачастую оказывались только благими намерениями.

Постмодернизм в дискуссии о месте аксиологического отношения в историческом познании в известном смысле завершает круг, когда история вновь объявляется «наукой о культуре», а современные культурные ценности, по сути, служат критериями отбора и понимания исторических фактов, ибо прошлое вне отношения к настоящему для него вообще теряет смысл. При этом, подобно неокантианству, постмодерн также отделяет оценки от ценностного отношения. Так, крупный теоретик постмодернизма в исторической мысли Ф.Анкерсмит выступает против оправдания или осуждения чего-либо и разделяет мнение, что «современный идеал образования является не предписывающим, а описывающим».

Вместе с тем, выдвижение постмодерном на передний план эстетической составляющей ценностного отношения вело к утверждению стиля в качестве основного содержания в работе историка, к деконструкции каузальности, к рассуждению о «лоскутности» современной цивилизации. Таким образом, историописа-

У Іпацьеўскім летапісе Кобрын паўстае як даўно існуючы ў складзе Валынскай зямлі. Але ўзнік ён значна раней, прыкладна напрыканцы VII ст. У гэтыя часы тут пасяліліся ўсходнеславянскія плямёны дулебаў, якіх з поўдня выціснулі качэўнікі – авары (обры). Яны заснавалі рыбацкае селішча. Дарэчы, археолагі мяркуюць, што менавіта адсюль пачалося заснаванне славянамі сучаснай Беларусі. З цягам часу дулебы распаліся на два плямёны: бужан і валынян.

Да сённяшняга часу дасканала не высветлена паходжанне назвы горада Кобрын. На думку многіх даследчыкаў, праследаванне дулебаў аварцамі-обрамі лягло ў аснову назвы горада (качэўнік – «обрын»). Аб гэтым сведчаць і назвы вёсак Обрына і Обрава непадалёк ад Целехан, Обрына ў Карэліцкім раёне і іншых мясцовасцях Беларусі. Магчыма, і горад спачатку меў назву «Обрын», альбо «Обрынь», а літара «К» была далучана з цягам часу: «ісці к Обрыну?» Некаторыя вучоныя прытрымліваюцца меркавання, што ў аснову назвы пакладзена кельцкае імя Кобрунус, альбо Кобрун. Другія звязваюць паходжанне назвы са старажытнаславянскім імем Кобр. Мяркуюць, што ён стаяў на чале рыбацкага селішча, якое з цягам часу пераўтварылася ў горад.

Так ці інакш, а назвы, маючыя адзіны корань з назвай «Кобрын», сустракаюцца на Украіне, у Расіі, нават на Урале.

Назва горада дала і назву невялічкай рэчцы, якая працякае праз Кобрын – Кобрынка. Што тычыцца ракі Мухавец, на беразе якой вырас Кобрын, то назва яе паходзіць ад злучэння дзвюх рэчак: Муха і Вец, якія выцякаюць з Пружанскага раёна.

У канцы X ст. землі валынян і бужан аб'ядналіся ва Уладзіміра-Валынскае княства, якое было ўключана ў склад Кіеўскай Русі. У канцы XII ст. гэтае княства распалася на шэраг удзелаў, але неўзабаве Раман Мсціслававіч аб'ядноўвае гэтыя ўдзелы ў магутнае Галіцка-Валынскае княства. Менавіта па загадзе Рамана ў Кобрыне быў пабудаваны замак, што паспрыяла ўзвышэнню горада. У XIII ст. Кобрын становіцца гандлёва-рамесным цэнтрам дзякуючы свайму выгаднаму геаграфічнаму месцазнаходжанню. Справа ў тым, што горад стаяў на знакамітым гандлёвым водным шляху: Вісла-Буг-Мухавец-Піна-Прыпяць-Днепр.

У перыяд утварэння Вялікага княства Літоўскага пры праўленні вялікага князя Гедыміна Кобрын і навакольныя землі былі далучаны да ВКЛ. Напрыканцы XIV ст. правілі горадам нашчадкі вялікага князя Альгерда. Так, адзін з іх, Раман Фёдаравіч, з 1387

г. стаў афіцыйна звацца князем Кобрынскім. Такім чынам, з канца XIV ст. Кобрынская зямля набывае статус княства.

У другой палове XV ст. у склад Кобрынскага княства ўваходзілі два мястэчкі – Дабучын, які пазней стаў называцца Пружанамі, і Гарадзец. Тэрыторыя падзялялася на воласці: Кобрынскую, Чэрэвачыцкую, Вежыцкую, Дабучынскую, Блудзенскую Грушоўскую і Гарадзецкую.

Існаванне Кобрынскага княства спынілася са смерцю апошняй княгіні кобрынскай Ганны Сямёнаўны ў 1518 г. З 1519 г. Кобрын з прылягаючымі да яго землямі па загадзе караля Сігізмунда I Старога становіцца староствам.

Сёння Кобрын – цэнтр Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У горадзе выпрабляецца разнастайная прамысловая прадукцыя. Кобрын – важны вузел шашэйных і чыгуначных шляхоў. Рака Мухавец, на якой ён стаіць, – складальная частка Днепра-Бугскага воднага шляху. Яна падзяляе горад на паўднёвы і паўночны раёны. Кобрын займае плошчу ў 26,31 кв.км з насельніцтвам крыху больш за 52 тыс. чалавек.

*А.Л. Паўлікава* *г. Магілёў*

## ЗАРАДЖЭННЕ І РАЗВІЦЦЁ ПРЫСВОЙВАЮЧАЙ ГАСПАДАРКІ НА ПАДСТАВЕ ПРЫЛАД ПРАЦЫ

У вучоных пакуль што няма адзінага падыходу да пытання аб стаўленні і фазах развіцця першабытнаабшчыннай гаспадаркі. Але не аспрэчваецца тая думка, што найбольш значнымі этапамі ў гэтай эвалюцыі, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі, з'явіліся прысвойваючая і вытворчая гаспадаркі. Гаспадарчая дзейнасць людзей ажыццяўлялася з дапамогай прылад працы, і гэтыя прылады пастаянна ўдасканальваліся. Змены тут праходзілі на 2 кірунках: па-першае, прылады працы станавіліся разнастайнымі, спецыялізаванымі, і, па-другое, пашыраліся іх прадукцыйныя, вытворчыя магчымасці. Гэтаму спрыяла паляпшэнне тэхнікі апрацоўкі сыравіны ці матэрыялу, з якога яны выпрабляліся і, у прыватнасці, крэмню. Перыяд прысвойваючай гаспадаркі прыпадае на эпохі палеаліту і мезаліту. Аснову гаспадаркі ў гэты час складалі збіральніцтва, паляўнічы промысел і рыбалоўства. Збіральніцтва не патрабавала практычна ніякіх складаных прылад працы.

Хорошая система народного воспитания есть богатое древо, в котором с самого корня до последних листьев всё одним благотворным соком оживляется».

*И.В.Суздалева* *г. Минск*

## МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ПОДХОДЫ АНАЛИЗА ГОСУДАРСТВЕННОЙ РЕГИОНАЛЬНОЙ ПОЛИТИКИ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

Решение социально-экономических проблем Республики Беларусь неразрывно связано с осуществлением научно обоснованной региональной политики. В связи с этим встает вопрос о выработке основ государственной региональной политики в теоретическом плане.

Проблемы региональной политики исследует регионология – наука (научное направление), изучающая закономерности системного, политического, экономического, экологического, социологического, духовного функционирования и развития территориальных социумов (общностей людей), формы и методы регулирования этих процессов. В рамках этого нового направления региональная политика рассматривается как комплекс государственных мер, регулирующих социально-экономическое развитие той или иной территории.

Содержание региональной политики составляют следующие основные и необходимые компоненты: цели и задачи, субъекты, объекты, принципы, методы и инструменты воздействия на регионы. Развитие данного вида политики осуществляется за счет количественных и качественных изменений, происходящих как в составе, так и во взаимосвязях основных компонентов, а также через изменение форм воздействия на регионы. В настоящее время региональная политика является одним из важных и относительно самостоятельных направлений государственного регулирования в большинстве стран с развитой экономикой.

Объектами региональной политики являются самые разные территориальные образования. Чаще всего таковыми являются регионы – определенные территории страны или нескольких соседних стран с более или менее однородными природными условиями, характерной направленностью развития производительных сил, со сложившейся материально-технической и социальной

инфраструктурой, совокупностью своеобразия социально-политических условий. Регионы рассматриваются не только как часть пространства, но и как часть сообщества (локального, национального, международного), проживающего и осуществляющего хозяйственную деятельность в границах этого пространства.

Основными субъектами региональной политики являются органы государственной власти. В соответствии с этим выделяют следующие виды и формы региональной политики:

- региональная политика органов власти: а) государственная (национальная, центральная или федеральная); б) наднациональная или межгосударственная; в) субнациональная;

- региональная политика других институциональных единиц (предприятий, союзов, ассоциаций и т.д.).

Среди основных целей и задач региональной политики к наиболее общим, присущим большинству стран, относятся: сохранение целостности и единства государства, достижение и поддержка государственных и региональных интересов, сокращение региональных различий в уровне жизни населения, создание относительно равных жизненных шансов для всех граждан страны независимо от места проживания и трудовой деятельности.

Современную региональную политику можно определить как систему намерений и действий по формированию и реализации интересов государства по отношению к регионам и реализации интересов государства по отношению к регионам и интересов самих регионов.

Региональная политика направлена на развитие региона. Главным критерием управления является развитие различных сфер функционирования региона. Под управлением регионом понимается выбор вектора управляющих воздействий, направленного на достижение цели и являющегося результатом взаимодействия органов и руководства производственными единицами региона.

В научной литературе приводятся следующие принципы региональной политики:

- децентрализация, предоставление значительной самостоятельности территориям;

- выработка собственных стратегий экономического развития на основе использования собственных ресурсов, потенциала, обменов с другими территориями, согласование стратегии отдельной территории с целями национального масштаба;

- согласование и координация экономических целей и политик регионов, оказание помощи при реализации целевых программ;

- выравнивание уровня экономического развития территорий.

Государственное регулирование территориального развития ничем не отличается от других регулятивных действий. Можно выделить следующие основные принципы:

- обоснование неизбежности этого регулирования;
- его легитимность;
- региональная инициатива и региональное исполнение;
- конкретно-целевой характер;
- учет отдельных и сопряженных результатов;
- установление временных границ;
- адекватность реакций регионов на государственную поддержку;
- системная обоснованность с учетом всех видов и методов поддержки данного региона;
- ответственность и контроль.

Региональная политика может анализироваться в трех взаимосвязанных аспектах: методологическом, организационном и практическом. Методология региональной политики – это теория их основания (или мотивы), методы и парадигмы.

Теории региональной политики (или теории регионального развития) в идеале должны объяснять механизмы регионального развития, выявлять его закономерности и факторы, прогнозировать тенденции и, в конечном счете, давать научное обоснование мер по его регулированию.

Большое значение для региональной политики имеет выбор оснований (или мотивов). Эти основания вытекают из общественной оценки наблюдаемых тенденций и результатов регионального развития. Тем самым задаются общая ориентация и стратегические цели региональной политики. Основания (мотивы, причины) проведения рыночной региональной политики могут быть экономическими, социальными и политическими.

Экономические основания подчеркивают необходимость дополнения «свободных» рыночных сил государственным регулированием развития в целях более полного использования факторов (ресурсов) производства, притока ресурсов в наиболее динамичные регионы, способные в максимальной степени ускорить рост национальной экономики, и т.п. Социальные основания региональной политики непосредственно вытекают из таких принципов демократического общества, как социальная справедливость и равноправие граждан. Соответственно, региональная политика должна быть направлена на выравнивание

межрегиональных различий в доходах населения, уровне безработицы, социальной инфраструктуре, коммуникациях, состоянии окружающей среды и т.п. Все большее значение приобретают политические основания региональной политики, которые можно условно разделить на национальные и прагматические. Национальные основания отражают естественное для каждого государства стремление обеспечить свою внешнюю безопасность и территориальную целостность. Прагматические же основания подразумевают использование региональной политики как средства политической борьбы между различными политическими силами.

Методы осуществления региональной политики довольно многочисленны и постоянно меняются. Реальные возможности региональной политики зависят от:

- уровня богатства страны;
- уровня социально-экономического развития;
- господствующих политико-экономических и социально-экономических доктрин;
- внутренних проблем и т.д.

Управление регионом осуществляется:

- средствами экономической политики (реформы, дотации на реализацию целевых программ);
- качественными методами (изменения в налоговой системе, экономических структурах);
- количественными методами (формирование на основе статистического анализа целей развития, выбор стратегии, оценки сценариев развития).

Взятые в единстве теории, основания и методы региональной политики образуют доминирующую в течение определенного периода парадигму (которая, в свою очередь, может иметь форму тех или иных доктрин или концепций). Развитие методологии региональной политики – не что иное, как процесс смены этих парадигм под воздействием новых знаний о региональном развитии, меняющихся общественных оценок его тенденций, изменений экономической и политической ситуации и т.д.

Рыночная модель региональной политики в своем развитии прошла через несколько методологических парадигм. Сущность первой из них – парадигмы неотложной помощи кризисным регионам, доминировавшей в период с конца 20-х по 40-е годы, – сводилась к слабо структурированным эмпирическим попыткам центрального правительства облегчить положение отдельных регионов, оказавшихся по тем или иным причинам в глубоком эко-

номическом и социальном кризисе. В период стабильного экономического развития 50-х – начала 70-х годов на смену ей пришла парадигма межрегионального перераспределения экономического роста. Сущность её составляли левая политическая идеология с ориентациями на более равномерное региональное развитие, теории несбалансированного роста, расцвет ориентированных на бизнес методов. Вступление в середине 70-х годов западной экономики в период кризисного развития, принципиальные изменения в механизмах территориальной организации хозяйства, усиление правой политической идеологии обусловили переход к парадигме реструктуризации регионов, доминировавшей на Западе на протяжении 80-х годов. Её главными признаками стали опора на неоклассические и технологические теории, ориентация на экономические основания и максимальное использование внутреннего потенциала каждого региона, развитие «инновационной» инфраструктуры, подготовка квалифицированного персонала, поддержка малого и среднего бизнеса.

В начале 90-х годов появились признаки новой парадигмы рыночной модели региональной политики – регионального саморазвития, ориентированной на более полный учет интересов территориальных сообществ, возложение ответственности за развитие регионов на местные власти, использование человеческого капитала, опору преимущественно на местную инициативу, а не на заданные сверху программы, взаимную координацию деятельности центральных и местных властей и т.д.

Анализ проведения региональной политики в странах с рыночной экономикой позволяет наметить основные направления трансформации территориального планирования в рыночную региональную политику и оценить возможность использования опыта развитых стран Запада. Другое дело, что методология региональной политики находится в постоянном развитии. В связи с этим вопросы формирования и реализации региональной политики, разумеется, не сводятся к решению чисто методологических проблем. Однако попытки обойти или оставить их разработку на лучшее время вряд ли можно считать продуктивными. Что же касается практических (прикладных) аспектов региональной политики, то каждая страна должна идти здесь своим путем.

Предполагается, что самыми благоприятными условиями для комплексного и сбалансированного регионального развития обладают небольшие, относительно компактные государства, имеющие, как правило, значительный опыт в этой сфере и отвечающие основным требованиям:

- наличие однородных природных условий, что позволяет более четко определить специализацию, обеспечить экономическую целостность хозяйства;

- относительная компактность территории;

- развитое многоотраслевое хозяйство, способное решать важные задачи социально-экономического развития;

- относительная экономическая обособленность и завершенность воспроизводящего процесса.

Республика Беларусь почти идеально отвечает вышеназванным характеристикам как субъект реализации самостоятельной региональной политики. До распада СССР ни одна из союзных республик не имела самостоятельной государственной региональной политики. С началом процесса суверенизации национально-государственных образований, входивших в Советский Союз, в Беларуси несколько активизировался поиск собственных средств и методов государственного регулирования развития внутриреспубликанских регионов. Однако после обретения суверенитета органы власти Республики Беларусь существенно ослабили внимание к вопросам увязки общегосударственных и региональных интересов. В связи с этим встает вопрос о выработке концепции государственной региональной политики, в основу которой должна быть положена региональная научная методология.

*М.Н.Бяспамятных* *г. Гродна*

## ФЕНОМЕН КУЛЬТУРНАГА ПЛЮРАЛІЗМУ І СУЧАСНАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСТВА

Праблема ідэнтыфікацыі грамадства з пункту гледжання існуючай у ім полікультурнай сітуацыі ўяўляецца надзённай. У сучасным свеце 90 % дзяржаваў развіваюцца на этнічна гетэрагеннай падставе. Этнакультурная гетэрагеннасць абумоўлена двума асноўнымі фактарамі. Першы з пэўнай доляй умоўнасці магчыма акрэсліць як «натуральна-гістарычны». Ён звязаны з традыцыйным суіснаваннем у межах адзінага топасу дзвюх або болей этнічных групаў (валоны, фламандцы і немцы ў Бельгіі; англічане, валійцы і шатландцы ў Злучаным Каралеўстве; касцільцы, каталонцы, галісійцы, баскі ў Іспаніі; не з'яўляецца выключэннем з гэтага шэрагу і Беларусь).

Другі фактар, які прадвызначае стан поліэтнічнасці, звязаны з міграцыйнымі плынямі апошніх дзесяцігоддзяў, якія прывялі да істотных зменаў у этнакультурнай структуры насельніцтва. Працэс глабалізацыі і такія яго складнікі, як пашырэнне міжнароднага бізнесу, перамяшчэнне працоўнай сілы, таксама, як і міжнародныя канфлікты, змянілі аблічча краінаў Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Узнікла невядомая дагэтуль катэгорыя «новых еўрапейцаў», якая складаецца з пакістанцаў, туркаў, арабаў і г.д. Паводле дадзеных Міжнароднай арганізацыі працы, у канцы XX ст. больш за 120 мільёнаў чалавек жылі па-за межамі краінаў свайго нараджэння. У глабальным маштабе гэтыя працэсы выглядаюць наступным чынам: з 1990 па 1995 г. у ЗША іміграваліі 971 тыс. чалавек, у краіны Заходняй Еўропы – 739 тыс.; адначасова з краінаў Азіі эміграваліі 1,366 млн, з Лацінскай Амерыкі і краінаў Карыбскага басейна – 392 тыс. чалавек. Дарэчы падаць некаторыя дадзеныя аб колькасці мігрантаў па асобных краінах (у мільёнах чалавек): ЗША – 19,6; Германія – 5,0; Канада – 4,3; Саудаўская Аравія – 4,3; Аўстралія – 4,0; Вялікабрытанія – 3,7 і да т.п. У суседняй з Беларуссю Польшчай афіцыйна зарэгістраваны 1,350 млн мігрантаў.

Гэтыя працэсы ствараюць новую этнакультурную сітуацыю, якая патрабуе не толькі апісання, але грунтоўнага аналізу. Незалежна ад таго, ці выклікана этнакультурная гетэрагеннасць міграцыйнымі плынямі, ці склалася натуральным шляхам гістарычна, яна стварае праблему, сутнасць якой заключаецца ў неабходнасці дакладнага самавызначэння этнічнай большасці ў дачыненні да меншасцяў, і таму вымагае канцэптуальнага падыходу. Яго распрацоўка дала б магчымасць стварыць пэўны ўніверсальны метад аналізу, прыдатны для асэнсавання сітуацый у канкрэтных грамадствах, у тым ліку і беларускім.

Перадумовай тэарэтычнага асэнсавання шматкультурнасці з'яўляецца прызнанне той відавочнай рэаліі, што ўнутраная сітуацыя ў полікультурных грамадствах вар'іруецца ў залежнасці ад: а) асаблівасцей іх этнічнай структуры і шляхоў яе фарміравання; б) характару ўзаемаадносін паміж этнасамі; в) стаўлення да поліэтнічнасці з боку ўлады, асабліва ў тых выпадках, калі апошняя выказвае інтарэсы этнічнай большасці. Вызначаныя аспекты арганічна спалучаюцца паміж сабою і ў сваёй сукупнасці даюць падставу для тыпалагізацыі грамадстваў з пункту гледжання існуючых у іх міжэтнічных стасункаў. Існуе непасрэдная залежнасць паміж тыпам гэтых стасункаў і характарам улады, між іншым, асаблівасцямі развіцця дэмакратыі і стану грамадства (які можа вагацца ад таталітарнай да грамадзянскай супольнасці).

Сучасная этналогія прызнае, што праблема аналізу полікультурных грамадстваў яшчэ вымагае свайго тэарэтычнага асэнсавання. Прыкладам, Ж.Сімпсан, аналізуючы паняцце этнакультурнага плюралізму, характарызуе яго як «цьмянае» [2, p. 461]. Тым не менш, ёсць плённыя спробы вызначэння тыпаў грамадстваў на падставе аналізу іх этнічнай структуры і міжэтнічных стасункаў. Варта падкрэсліць, што істотны крок наперад на гэтым кірунку ў параўнанні з тымі мадэлямі, што дамінавалі ў 1980-я гады («асіміляцыя», «плавільны кацёл», «плюралізм»), зроблены сучаснай польскай этнасацыялогіяй. Так, А.Садоўскі вылучае наступныя тыпы супольнасцяў: «культурна гомагенныя», «культурна гетэрагенныя», «плюралістычныя» і «палікультурныя». Адпаведным чынам ажыццяўляецца тыпалагізацыя палітыкі дзяржавы (і большасці) у дачыненні да меншасці, таксама, як і «дзеянняў меншасці» ў дачыненні да большасці [3, s. 20, 22-23]. У працах К.Крыштофэка змяшчаецца мадэльнае бачанне тыпалогіі міжэтнічных стасункаў. Г.Бабіньскі прапануе параўнальную мадэль «старога» і «новага» этнакультурнага памежжа. Ёсць і іншыя варыянты тэарэтычнага мадэлявання шматкультурных грамадстваў. У сваёй сукупнасці яны ствараюць падставу для першаснага аналізу этнакультурнай сітуацыі ў Беларусі.

Аб тым, што беларускае грамадства вымагае асэнсавання сваёй этнакультурнай сітуацыі, сведчаць наступныя дадзеныя, якія характарызуюць яго як гетэрагенную супольнасць. Паводле першага нацыянальнага перапісу насельніцтва краіны (1999 г.), яе склад вызначаюць беларусы (81,2 %), рускія (11,4 %), палякі (3,9 %), украінцы (2,4 %), яўрэі (0,3 %), татары, цыгане, літоўцы (па 0,1 %) ды прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў. Разам з тым, прыходзіцца канстатаваць, што этнакультурны плюралізм Беларусі не стаўся аб'ектам адпаведнага аналізу. Яго наспеласць выклікана неабходнасцю, па-першае, асэнсавання ўласнага гістарычнага досведу суіснавання і самазахавання розных культур на тэрыторыі Беларусі, па-другое, больш дакладнага і абгрунтаванага вызначэння палітыкі ў дачыненні да шматкультурнасці; па-трэцяе, сучаснымі еўрапейскімі і глабальнымі рэаліямі, у якіх шматкультурнасць займае адмысловае месца; па-чацвёртае, тым, што ва ўсялякай шматэтнічнай супольнасці імпліцытна змяшчаецца значна большая пагроза канфлікту, чым у монаэтнічнай.

Канстатацыя факту поліэтнічнасці грамадства з'яўляецца першым крокам на шляху яго аналізу, які ў прынцыпе, на наш погляд, павінен змяшчаць тры базавыя аспекты: *структурны* (эт-

накультурны склад грамадства, яго марфалогія); *функцыянальны* (характар міжкультурных зносінаў, стасункі паміж «большасцю» і «меншасцямі»); *палітычны* (кіраванне сітуацыяй полікультуралізму з боку дзяржавы). Аналіз сітуацыі ў грамадстве ў рэчышчы кожнага з вызначаных аспектаў патрабуе адпаведнай метадалогіі і катэгарыяльнага апарату.

Базавымі паняццямі структурнага аналізу грамадства з'яўляюцца паняцці гомагеннасці («аднароднасці») і гетэрагеннасці («разнароднасці»). Варта зазначыць, што ў сучасных індустрыяльных і постіндустрыяльных грамадствах цалкам гомагеннае, гэта значыць, культурна аднароднае асяроддзе «ў чыстым выглядзе», практычна адсутнічае, а само паняцце гомагеннасці, хутчэй, уяўляе сабою абстракцыю, чым апісвае рэальную сацыяльную сітуацыю. Аднак само гэтае паняцце мае істотнае значэнне ў даследніцкім працэсе, паколькі аказваецца як бы «адпраўным пунктам» на шляху вывучэння рэальных грамадстваў рознай ступені складанасці. Увядзенне паняццяў гомагеннага і гетэрагеннага грамадстваў уздымае праблему крытэрыяў іх размежавання, якая пакуль што не атрымала сваёй спецыфікацыі. Яе вырашэнне мы бачым у магчымасцях такога сацыялагічнага індыкатара, як каэфіцыент шматнацыянальнасці (або каэфіцыент Джунусава), які прапанаваны быў яшчэ ў 1980-я гады. На падставе яго значэнняў магчыма вылучэнне зон вышэйшага, сярэдняга, нізкага і ніжэйшага ўзроўняў міжэтнічных зносінаў. Як бачна з вынікаў перапісу насельніцтва, беларускае грамадства належыць да этнічна гетэрагенных, узровень міжэтнічных зносінаў у якім імкнецца да сярэдніх значэнняў.

Для характарыстыкі гетэрагенных грамадстаў ужываецца шэраг наступных аднапарадкавых катэгорый: «мульцікультуралізм», «полікультуралізм», «поліэтнічнасць», «культурны палімарфізм», «этнічная мазаічнасць», «культурны плюралізм». Звычайна гэтымі паняццямі карыстаюцца не толькі як аднапарадкавымі, але як сінанімічнымі, паколькі яны характарызуюць грамадствы, для якіх уласцівая этнакультурная неаднароднасць. Найбольш адэкватным і прынятым у этнасацыялогіі паняццем для апісання гэтай сітуацыі з'яўляецца паняцце мульцікультуралізма (якому лепей за ўсё адпавядае беларускі тэрмін «шматкультурнасць»). Апошняе вызначаецца як такі стан, пры якім дзве або большая колькасць этнакультурных груп суіснуюць у гармоніі, захоўваючы пры гэтым сваю ідэнтычнасць. Сапраўды, «хоць усе грамадствы маюць уласную культуру, здараецца, што адно гра-

мадства можа ўтрымліваць некалькі дастаткова розных культур, што часта азначаецца паняццем мульцікультуралізма» [6, p. 39]. Асобным выпадкам этнакультурнай гетэрагеннасці з'яўляецца памежжа – феномен, які ў апошнія гады прыцягвае ўвагу даследчыкаў з розных галінаў гуманітарных ведаў. У адпаведнасці з сучаснымі падыходамі памежны рэгіён вызначаецца ў трох аспектах: топасным (як тэрыторыя, на якой складваецца пэўны тып суіснавання дзвюх або болей этнакультурных групаў), функцыянальным (на памежжы рэалізуюцца розныя формы ўзаемадзеяння паміж іх прадстаўнікамі); асобасным (на памежжы кшталтуецца спецыфічны тып асобы, якая адначасова належыць да розных культураў [7].

З пункту гледжання гэтых характарыстык Беларусь уяўляе сабою, па-першае, гетэрагенную, шматкультурную супольнасць, у якой колькасна дамінуе тытульная нацыя; па-другое, своеасаблівы памежны рэгіён. У ім спалучаюцца ўнутраныя этнічныя межы (асабліва на захадзе краіны) паміж беларускім і польскім этнічнымі масівамі з анклавамі літоўскай, татарскай і іншых меншасцяў. Разам з тым Беларусь магчыма разглядаць як цывілізацыйнае (усходняя, праваслаўная – заходняя, каталіцкая цывілізацыі) і геапалітычнае памежжа.

Функцыянальны аналіз шматкультурнага грамадства змяшчае два аспекты. Прадметам такога аналізу з'яўляюцца ўзаемныя стасункі «большасці» і «меншасцяў», якія якасна адрозніваюцца ў сувязі з рознымі статусамі іх суб'ектаў. Пазіцыя большасці можа вагацца ад імкнення да монакультурнасці грамадства (што, у сваю чаргу, звязана з асцярогай перад магчымай цэнтрабежнасцю меншасцяў, імкненнем да яе нейтралізацыі і захавання такім шляхам цэласнасці дзяржавы) да прызнання за меншасцямі права на культурную самабытнасць, іх падтрымку і ўсталяванне стасункаў з імі на партнёрскай падставе. Важнейшымі паняццямі гэтага аспекту разгляду з'яўляюцца: этнацыд (фізічнае вынішчэнне меншасці); *этнічная чыстка* (прымусовае высяленне меншасці); гетаізацыя (якая звычайна грунтуецца на браку грамадзянскіх правоў меншасці і яе тэрытарыяльным і інстытуцыянальным адасабленні ад большасці); прымусовая *асіміляцыя* (якая ідэалагічна, псіхалагічна і нярэдка юрыдычна звязана з прыніжэннем большасцю культуры меншасці, увогуле з яе негатыўным трактаваннем); *інтэграцыя* меншасці ў структуры большасці (меншасць засвойвае культурныя нормы большасці, але не прысвойвае іх); этнакультурны плюралізм. У прынцыпе гэты шэраг на сацыялагічным узроўні адлюстроўвае аксіялагічны кантыніум (неталеран-

тнасць – прызнанне права да рознасці – стаўленне да рознасці як да пазітыўнай каштоўнасці)

Экстрапаляцыя гэтага катэгарыяльнага раду на этнакультурную сітуацыю ў Беларусі патрабуе вызначэння паняццяў «большасці» і «меншасці». Нам падаецца, што змест паняццяў этнічнай большасці (якой з'яўляюцца беларусы) і этнакультурнай большасці ў рэспубліцы не супадаюць. Гэтая выснова грунтуецца на выніках перапісаў насельніцтва і сацыялагічных даследаванняў, якія даюць уяўленне аб ступені ўжытку беларускай мовы як важнейшага культурнага феномена і этнічнай мяжы. Так, больш за 80 % беларусаў краіны прызнаюць роднай беларускую мову і толькі 14 % – рускую. Аднак па-беларуску ў хаце гавораць 41 % беларусаў, па-руску – каля 60. Калі ж узяць усё насельніцтва краіны, то ў хаце па-беларуску гаворыць 36,7 і па-руску – 62,8 %. У Мінску гэтыя лічбы складаюць, адпаведна, 12,9 і 86,9 %. Такім чынам, магчыма канстатаваць наяўнасць двух тыпаў стасункаў большасці да меншасцяў: у адным выпадку гэта стасункі беларусаў да іншых народаў краіны; у другім – стасунак рускамоўнай большасці краіны да яе беларускамоўнай часткі, якая колькасна і статусна (нягледзячы на фармальнае дзвюмоўе) складае меншасць. У такім рэчышчы праблема міжкультурных стасункаў у Беларусі ў айчыннай літаратуры пакуль што не ўздымалася і таму патрабуе далейшага асэнсавання. Але беручы пад увагу тое, што інстытуцыянальныя структуры дзяржавы (адукацыя, сродкі масавай інфармацыі і г.д.) функцыянуюць на рускамоўнай падставе, да таго ж руская мова дамінуе ў сферы грамадскага побыту, ёсць падставы да меркавання аб перавазе ў сённяшнім беларускім грамадстве асіміляцыйных тэндэнцый над партнёрскімі стасункамі, у выніку чаго само існаванне беларускамоўнай меншасці з цягам часу можа аказацца пад знакам пытання.

Аналіз пазіцый меншасцяў адносна большасці выражаецца ў катэгорыях *латэізацыі* (утойвання) ідэнтычнасці; *сегрэгацыі* (самаізаляцыі); *маргіналізацыі*; *асіміляцыі* і *інтэграцыі* (як двух шляхоў прыстасавання да культурных узораў большасці; у першым выпадку меншасць прысвойвае ўзоры большасці, у другім засвойвае, захоўваючы ўласныя); *акамадацыі* (зліццё меншасці з большасцю праз шлюбныя стасункі); свабоднай *эксплікацыі* меншасцю сваёй культуры; *культурнага партнёрства* як падставы да стварэння плюралістычнага грамадства. Гэтыя катэгорыі адлюстроўваюць спектр сітуацый меншасцяў, якія могуць вагацца ад канфармізму да нонканфармізму. У сучасным беларускім гра-

мадстве пераважаюць асіміляцыя і інтэграцыя, хоць сустракаюцца і іншыя праявы функцыянальнага аспекту яго гетэрагеннасці, якія патрабуюць далейшага даследавання. У 1970-1980-я г. перапісы насельніцтва выкрылі працэсы латэізацыі і дэлатэізацыі ідэнтычнасці палякаў. Адной са своеасаблівых тэндэнцый з'яўляецца *культурны рэвівалізм*, які праяўляецца ў прысваенні беларусамі, якія належаць да рускамоўнай большасці, беларускай нацыянальнай культуры і мовы. Ён працягваецца ў своеасаблівай *інверсіі акультурацыі*, г.зн. у добраахвотным прысвойванні і распрацоўцы беларускай культуры як культуры меншасці небеларусамі.

Структурны і функцыянальны аспекты аналізу шматкультурнага грамадства даюць падставу для тыпалагічнага аналізу кіравання ім з боку дзяржавы. Істотнае значэнне тут мае асэнсаванне катэгорыі «*культурны плюралізм*». Нярэдка гэтае паняцце ўжываецца як сінонім гетэрагеннасці, або ў значэнні антытэзы асіміляцыі. Ж.Сімпсан лічыць, што плюралізм адлюстроўвае іншы ўзровень грамадскай дыферэнцыяцыі, чым гетэрагеннасць. Калі паняцце гетэрагеннасці апісвае множнасць сацыякультурных кампанентаў, якія аб'яднаныя адзінай сістэмай сацыяльных інстытутаў, то плюралізм апісвае сітуацыю множнасці культурных анклаваў, кожны з якіх мае сваю сетку інстытутаў. Гаворка ідзе аб такіх інстытутах, як рэлігія, адукацыя, сістэмы сваяцтва, культурныя і палітычныя арганізацыі. Зразумела, што функцыянаванне такіх інстытутаў залежыць не толькі ад пазіцыі большасці, але ад пазіцыі дзяржавы і ўлады, якія ствараюць палітычныя і юрыдычная ўмовы іх функцыянавання і партнёрства. На Беларусі створаны пэўныя падставы для развіцця плюралістычнага грамадства. Існаванне культурных таварыстваў, этнаканфесійных груп, элементаў нацыянальнай адукацыі выражае тэндэнцыі на шляху інстытуцыяналізацыі этнічных культур. Аднак сапраўдны плюралізм на Беларусі будзе вызначацца тым, наколькі ўдасцца захаваць беларускамоўнае асяроддзе ва ўмовах рускамоўнага атачэння і развіваць роўныя партнёрскія стасункі паміж дзвюма групамі грамадства.

*А.М.Пяткевіч* *г. Гродна*

## ПРАБЛЕМЫ ПЕРЫЯДЫЗАЦЫІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Гісторыя беларускай культуры да апошняга часу не вывучалася як самастойная галіна беларусазнаўства. Таму яе перыядызацыя, натуральна, не выпрацавалася ў больш-менш стабільным выглядзе і прадстаўлена толькі ў асобных навучальных праграмах, культуралагічных і мастацтвазнаўчых даследаваннях. Свая перыядызацыя адносна склалася ў працах па гісторыі беларускай літаратуры, тэатра, архітэктуры, асветы, і дыктуецца яна шмат у чым спецыфічнымі асаблівасцямі функцыянавання гэтых складнікаў культуры. Пры выпрацоўцы ж перыядызацыі развіцця культуры як цэласнага комплексу каштоўнасцяў патрэбен падыход, які б дазваляў лучыць усе складнікі ў сістэму і адпаведна выдзяляць этапы яе руху.

Найбольш надзейным такім падыходам з'яўляецца гістарычны, г.зн., што класіфікацыя перыядаў развіцця культуры вызначаецца гістарычным размежаваннем такога развіцця. Інакш кажучы, перыядызацыя ўласна гістарычнага працэсу дыктуе тут перыядызацыю руху культуры. Аднак гэты прынцып не з'яўляецца універсальным і не можа стаць панацэяй пры высвятленні этапаў развіцця нацыянальнай культуры, пошуку межаў такіх этапаў. Таму што гістарычная рэальнасць, як вядома, на многа шырэйшая за рэальнасць культуры. І многія гістарыятворчыя фактары (сацыяльныя, эканамічныя, палітычныя, ваенныя), што выходзяць за рамкі культурнага поля, вельмі значныя, а то і вызначальныя для перыядызацыі гісторыі Беларусі. Але не заўсёды яны стасуюцца тут з этапнымі з'явамі і працэсамі беларускай культуры. Такім чынам, гэты прынцып перыядызацыі, які можна назваць гістарычным, павінен падмацоўвацца і ўдакладняцца іншымі.

У прыватнасці, істотнае значэнне ў культуралагічнай перыядызацыі мае развіццё мастацкіх стыляў. Змены стыляў адлюстроўваюць якасныя зрухі ў светаадчуванні грамадства і дазваляюць паказаць, акрамя ўсяго іншага, развіццё беларускай культуры ў кантэксце сусветнай. Бо культура беларускага народа прайшла ўсе тыя духоўна-эстэтычныя этапы (акрамя антычнасці), якія зведалі еўрапейскія культуры (раманская традыцыя, готыка, барока, класіцызм, рамантызм, рэалізм, мадэрнізм). Пры гэтым добра высвятляюцца спецыфічныя асаблівасці нацыянальнай культуры, бо

тыя ці іншыя стылёвыя этапы мелі ў Беларусі адметную гісторыю і ўзровень функцыянавання.

Але мастацка-стылёвы прынцып перыядызацыі прыдатны толькі для мастацкай культуры і не можа дзейнічаць пры вывучэнні іншых, немастацкіх галін культуры – навукі, рэлігіі, адукацыі, права, друку. Таму неабходна ўлічваць таксама іх своеасаблівыя заканамернасці ў кантэксце духоўнага развіцця грамадства, нацыі.

У цэлым найбольш аптымальным для стварэння перыядызацыі гісторыі нацыянальнай культуры з'яўляецца спалучэнне розных прынцыпаў, паводле якіх расчляняецца шлях культуры. Дасягнуць гэтай задачы складана, і ў практычных распрацоўках перыядызацыі на першы план выступае нейкі адзін прынцып – часцей – гістарычнага размежавання матэрыялу.

Гэтым прынцыпам кіраваліся Л.Лыч і У.Навіцкі, аўтары навучальнага дапаможніка для студэнтаў «Гісторыя культуры Беларусі» (1996). Увесь гістарычна-культурны працэс яны раздзялілі на дзевяць перыядаў – старажытнай Беларусі, Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, чатыры перыяды савецкага часу і сучасны этап. Такое размеркаванне, праўда, не зусім прапарцыянальнае паводле структуры. Працягласць і духоўная значнасць сярэднявечча, Рэнесанса, новага часу, якія займаюць у гісторыі беларускай культуры дзесяць стагоддзяў і ўціснуты ў рамкі чатырох перыядаў, ніяк тыпалагічна не суадносяцца з чатырма перыядамі культуры савецкага часу, які налічвае 70 гадоў. У гэтай пэўнай нелагічнасці перыядызацыі трэба бачыць не столькі даніну колішнім нормам перыядызацыі (асабліва ў гістарычнай навуцы), колькі нераспрацаванасць (нават на фактычным узроўні) беларускай культуры даўніх эпох.

У навучальнай праграме па гісторыі беларускай культуры, выдадзенай Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы ў 1994 г. (складальнік А.Пяткевіч), таксама выкарыстаны гістарычны прынцып. Матэрыял раскладзены на восем перыядаў, з іх савецкаму часу адведзены толькі два перыяды – даваенны і паваенны, што варта лічыць апраўданым у сэнсе змястоўнай прапарцыянальнасці структуры. У гэтай праграме асобна вылучаны перыяд 1902-1921 г., які складальнік называе перыядам «нацыянальнага адраджэння». Мэтазгоднасць яго дыктуецца прынцыповымі якаснымі зменамі, што адбываліся ў гэты час на нацыянальнай грамадска-культурнай ніве і паспрыялі бурнаму ўздыму беларусазнаўчай навукі, беларускай літаратуры, тэатра, школы, друку.

У гродзенскай праграме ёсць яшчэ раздзел «Культура Заходняй Беларусі (20-30-я г.)». Гэта вельмі адметная старонка духоўнага жыцця народа ва ўмовах польскай дзяржавы. І самастойнасць такога перыяду ў гісторыі беларускай культуры не выклікае сумненняў. Між тым ён не ўпісаўся ў перыядызацыю аўтараў «Гісторыі культуры Беларусі», і ў выніку адпаведны матэрыял апынуўся па-за межамі навучальнага дапаможніка.

Увогуле ж перыядызацыі і ў згаданай праграме Гродзенскага універсітэта, і ў «Гісторыі культуры Беларусі» прынцыпова блізкія: аўтары-складальнікі кіруюцца перш за ўсё спосабам паэтапнага гістарычнага дзялення працэсу культурнага жыцця. Змены этапаў вызначаюцца тут зменамі дзяржаўнасці на тэрыторыі краю і адпаведнымі зменамі афіцыйнай унутранай палітыкі і ідэалогіі, што вызначылі шмат у чым характар і напрамкі развіцця культуры. Не выпадкова гэтыя этапы маюць і канкрэтныя храналагічныя рамкі.

Па іншым шляху стварэння перыядызацыі ідзе складальнік навучальнай праграмы па гісторыі культуры Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы і гуманітарнай адукацыі Э.Дарашэвіч (1994 г.). Большасць з дванаццаці распрацаваных ім перыядаў ён не датуе, размываючы ў значнай меры гістарычны прынцып перыядызацыі. Дакладней, складальнік стараецца спалучаць гэты прынцып з тымі падыходамі, якія высвятляюць час дзейнасці пэўных мастацкіх ідэй, стыляў, культурных рухаў у Беларусі. А каб такое спалучэнне адбылося, разглядае той ці іншы перыяд двойчы, толькі з розных пунктаў гледжання. Атрымліваюцца два перыяды развіцця культуры на матэрыялах аднаго перыяду гістарычнага жыцця. Напрыклад, выдзяляецца раздзел «Культура Беларусі падчас Вялікага княства Літоўскага». Наступным ідзе раздзел «Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі», хоць там і тут дзейнічае культура адзінага, рэнесанснага тыпу, і гістарычна яна не падзяляецца. Ці яшчэ: раздзел «Культура Контррэфармацыі і барока» змяняецца раздзелам «Культура эпохі Асветніцтва». Складальнік не зважае на тую акалічнасць, што беларускае барока мела свой позні перыяд (г.зв. віленскае барока) і развівалася ў другой палове XVIII ст., у час Асветніцтва. Такім чынам адзін этап перыядызацыі накладваецца на другі. Ігнараванне ў гэтай праграме гістарычнага прынцыпу нараджае такі, напрыклад, раздзел, як «Айчынная вайна і яе адлюстраванне ў творах культуры». Тут ужо маем справу нават не з перыядызацыяй, а з тэматычным кірункам культурнага жыцця неакрэсленага

часу. Усё ж перыядызацыя гісторыі культуры Беларусі, падрыхтаваная Э.Дарашэвічам, мае і свае пазітыўныя бакі, бо арыентуе ў цэлым на вывучэнне культурных з'яў і працэсаў у іх спецыфічнасці і самакаштоўнасці.

З другога боку, абсалютызацыя гістарычнага прынцыпу, уцісканне працэсаў культурна-мастацкага жыцця ў строга вызначаныя грамадска-гістарычнымі падзеямі межы, звужэнне гэтых межаў, тым больш храналагічная адвольнасць іх вядуць да спрашчэння законаў быцця культуры ў грамадстве, да яе сацыяльнай схематызацыі. Прэтэнзіі такога кшталту можна прад'явіць да калектыўнага даследавання «Гісторыя беларускага мастацтва» ў шасці тамах, выдадзенага ў 1987 – 1994 г. Шэраг раздзелаў у гэтай працы, асабліва датычных новага і найноўшага часоў, абазначаны толькі храналагічна. Назвы ж раздзелаў, якія б змяшчалі крытэрыі вычлянення пэўных перыядаў, не даюцца. Такім чынам аўтары вызваляюць сябе ад паслядоўнай навуковай, г.зн. аргументаванай сістэмы перыядызацыі, прадстаўляючы чытачу права трактаваць на свой лад прычыны выдзялення таго ці іншага этапу развіцця беларускага мастацтва. Напрыклад, у другім томе гэтага выдання матэрыял дзеліцца на наступныя раздзелы: «Мастацтва канца XVI-першай паловы XVII стагоддзя», затым – «Мастацтва другой паловы XVII – пачатку XVIII стагоддзя», урэшце – «Мастацтва XVIII стагоддзя», якое ніяк не расчляняецца. На якой падставе зроблена такая перыядызацыя, пра гэта можна меркаваць па-рознаму. Між тым адзінае і цэласнае вызначэнне адметнасці таго ці іншага перыяду (даецца звычайна ў назве-загалоўку) дапамагае глыбейшаму разуменню культурна-мастацкага працэсу, спасціжэнню яго сутнаснага пачатку на кожным этапе развіцця.

Увогуле ж распрацоўка перыядызацыі гісторыі беларускай культуры – справа, якая патрабуе калектыўных намаганняў даследчыкаў, абмену думкамі, дыскутавання. У гэтай сувязі і прапануецца варыянт такой перыядызацыі.

*Ю.У.Несцяровіч* *г. Мінск*

# ДЫФЭРЭНЦАВАНЫ ПОГЛЯД НА ФАКТ У ГІСТАРЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ

У апошні час узрастаюць патрабаванні навуковых экспертаў, метадолагаў навукі да выканання метадалагічных аспектаў даследавання. Разам з тым эксперты і метадолагі, якія аналізуюць гістарычныя даследаванні, адзначаюць, што значная частка іх недастаткова нагружана высновамі, абгрунтаваннямі фактаў, доказамі палажэнняў. Гісторыкі іншы раз не адрозніваюць факты і канцэптуальныя палажэнні. Здаецца, што на першы погляд гэта проста. Але гэта не проста і для метадолагаў, паколькі пытанні вызначэння фактаў і канцэпцый, структуры гістарычных ведаў застаюцца недастаткова распрацаванымі. Гэтая абставіна не знімае праблемы павышэння метадалагічнай падрыхтоўкі гісторыкаў, якая на сённяшні дзень, мабыць, адстае ад метадалагічнай падрыхтоўкі ў шмат іншых навуковых дысцыплінах.

Мы лічым, што лагічная структура вынікаў гістарычнага даследавання адрозніваецца і даволі значна ад лагічнай структуры вынікаў даследавання ў іншых навуках (не беручы ў разгляд ужытковыя дысцыпліны), ва ўсякім разе, яна бясспрэчна адрозніваецца ад лагічнай структуры прыродазнаўчага даследавання.

Схематычна структуру прыродазнаўчага даследавання адлюструем так: факты – гіпотэзы – законы – тэорыя. Тэорыя – гэта сістэма ведаў, базавымі кампанентамі якой з'яўляюцца гіпотэзы і законы. Прыклад факта (ці свярджэння пра факт) у квантавай фізіцы: атам у полі цяжару звязды распаўсюджвае святло, частата якога менш, чым атам у дадзенай спектральнай лініі на Зямлі. Прыклад гіпотэзы: рэчыва выпраменьваецца квантамі. Прыклад закона: пэўнае размеркаванне спектральнай шчыльнасці энергіі выпраменьвання абсалютна чорнага цела (выражаецца ў матэматычнай форме).

Лагічная структура вынікаў гістарычнага даследавання наступная: факты – канцэпцыі. У выніку гістарычнага даследавання не ствараюцца тэорыі. Ствараецца канцэпцыя (або сукупнасць канцэпцый) або пераглядаюцца, прырошчваюцца пэўныя палажэнні канцэпцыі. Здагадкі і дапушчэнні шырока выкарыстоўваюцца ў гістарычным даследаванні, але яны – сродак, а не вынік даследавання. А гіпотэзай лічацца ідэі, якія маюць статус вынікаў даследавання, ведаў.

Канцэпцыі, якія ствараюцца ў канкрэтна-гістарычных даследаваннях, датычацца канкрэтных падзей. У іншых навуках, калі ствараюцца канцэпцыі, то адносна класаў з'яў. Факты ў гістарычным даследаванні, нават калі яны не звязаны з пэўнай канцэпцыяй, могуць быць верагодныя. Канцэптпалажэнні гістарычнага даследавання, калі яны не падмацаваны фактамі, памылковыя.

Калі коратка сфармуляваць, што лічыцца ў філасофіі навуцы фактамі, то факты – гэта або вынікі назірання, або шырэй – вынікі ўжывання эмпірычных метадаў даследавання, або вынікі, якія падлягаюць верыфікацыі. Разам з тым факты – гэта веды, якія адпавядаюць рэчаіснаму становішчу спраў. У сучаснай філасофіі навукі асноўнымі пунктамі гледжання на прыроду факта замацаваліся фактуалізм і тэарэтызм, паводле якіх факты, адпаведна, зусім не звязаны з тэорыяй, і цесна звязаны з ёю.

На наш погляд, у канкрэтна-гістарычным даследаванні атрымліваюцца сцвярджэнні, якія нельга адназначна аднесці да фактаў або да канцэптуальных палажэнняў. Напр., сцвярджэнне пра тое, што Маскоўская дзяржава ў 1656 г. пачала ваенныя дзеянні з ВКЛ, маючы неспрыяльныя для яе ваенна-палітычныя абставіны. Яно выражае факт, бо адпавядае рэчаіснаму становішчу спраў, хоць і не канкрэтнаму (з іншага боку, яно выражае факт, калі адпавядае рэчаіснаму становішчу спраў, г.зн. калі яно сапраўднае). Але гэта становішча зусім дапушчальна лічыць і выразам пэўнай гістарычнай канцэпцыі ці канцэптуальным палажэннем, бо тое, што выражаецца ім, не з'яўляецца вынікам назірання, іншых эмпірычных метадаў даследавання, не верыфікуецца з дапамогай эмпірычных сродкаў.

У прыродазнаўчых навуках немагчымы сцвярджэнні, якія дапусціма лічыць як выразамі фактаў (інакш – фактамі), так і выразамі часткі тэорыі. А ў раздзелах і галінах гістарычнай навукі дапушчальна лічыць некаторыя канцэптпалажэнні фактамі.

Справа ўскладняецца тым, што можна выдзяляць розныя тыпы фактаў, тыпалогія можа праясніць метадалагічны статус паняцця факта. Абмяжуемся тыпалогіяй фактаў гістарычнага даследавання, паколькі нас апошняе і цікавіць. У залежнасці ад адносін фактаў да канцэптуальных ведаў належыць выдзяляць даследчагістарычныя факты (якія звязаны з канцэпцыямі) і гістарычныя факты (веды, якія выражаюць рэчаісныя палажэнні спраў, але не звязаны з канцэпцыяй). У залежнасці ад зместу фактаў належыць дапускаць рэканструкцыі, храналагічныя факты і г.д. У залежнасці ад ступені працы выдзяляем эмпірычныя і неэмпірычныя факты

(факты, пры ўстанаўленні якіх, акрамя ўлічвання непасрэдных дадзеных крыніц, выкарыстоўваюцца вынікі інтэрпрэтацыі, абагульненні іх).

Апошняе дзяленне патлумачым на прыкладзе. Дадзеныя археалагічных раскопак, судмедэкспертыз, вывучэння матэрыяльных крыніц – рэчаў (адзення людзей, гільз і інш.), успамінаў удзельнікаў падзей, дазваляюць устанавіць факты забойства людзей карнымі органамі ў лясным масіве Курапаты ў перадваенны час. Сцвярджэнні пра калібр куль, якія траплялі ў людзей, пра колькасць знойдзеных трупаў, пра рэчы, якія маюцца ў магілках, – гэта сцвярджэнні пра эмпірычныя факты. Неэмпірычныя факты – гэта ўстаноўленая колькасць забітых у лясным масіве за пэўны час, прозвішчы асоб, назвы ўстаноў, па загадах якіх ажыццяўляўся растрэл жыхароў, вытворцы рэчаў. Да канцэптуальных палажэнняў адносяцца сцвярджэнні пра тое, чаму праводзіліся растрэлы.

Распрацоўкі метадалогіі гісторыі, у тым ліку і распрацоўкі пра сувязь фактаў і канцэпцый у гістарычных даследаваннях, дыферэнцаваны погляд на факт у гістарычных даследаваннях не дапамагаюць непасрэдна правядзенню даследаванняў, затое спрыяюць метадалагічна выразнай і строгай пабудове даследавання.

*С.У. Данскіх* *г. Гродна*

## АД ГІСТАРЫЧНАГА КРАЯЗНАЎСТВА ДА РЭГІЯНАЛІСТЫКІ: ЭЎРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ І МЕТАДАЛАГІЧНЫ ПАДМУРАК

Бурнае развіццё краязнаўчых даследаванняў стала прыкметнай з'явай апошняга дзесяцігоддзя. З аднаго боку, гэта выклікана дзяржаўнай праграмай па выданні раённых гістарычна-дакументальных кніг «Памяць». З другога боку, адлюстроўвае грамадскую тэндэнцыю да асэнсавання «сваіх» каранёў, да даследавання «родных» мясцін ці асоб. На жаль, большасці краязнаўчых даследаванняў не хапае канцэптуальнасці. Гэта агульная праблема сучаснай беларускай гістарыяграфіі, якая грунтуецца на выключна эмпірычным, факталагічным падыходзе. Сучасныя гісторыкі-краязнаўцы, у лепшым выпадку, лічаць, што механічнае назапашванне ўсё новых і новых фактаў раней ці пазней аўтаматычна прывядзе да пераходу гэтых ведаў на якасна новы – тэарэтычны ўзро-

вень. Часам можна пачуць і такія думкі, што гістарычныя даследаванні ўвогуле не патрабуюць ніякіх канцэптуальных высноваў – маўляў, сабраў факты, размеркаваў іх храналагічна, згрупаваў тэматычна – вось і гістарычнае даследаванне. Між іншым, прынцыпова адмова ад тэарэтычнага асэнсавання – гэта таксама своеасаблівы канцэптуальны падмурак. Любая навукова-даследчая праца заўжды грунтуецца на пэўных тэарэтычных прынцыпах. Праблема ў тым, каб гэтыя канцэптуальныя высновы былі добра асэнсаванымі і зразумелымі для самаго даследчыка, а не адсунутыя ім у цемру пасвядомасці. Таму няхай паважаны чытач выбачыць аўтара за «завумныя» ўводзіны, але без тлумачэння тэарэтычных прынцыпаў даследавання сапраўдная навуковая праца з'яўляецца толькі прэзентацыяй аўтарскай эрудыцыі.

Беларускае гістарычнае краязнаўства на сённяшні дзень выпрацавала два метадалагічныя падыходы да даследавання лакальнай гісторыі. Першы з іх можна ўмоўна акрэсліць як савецкі. Ён знайшоў яскравае адлюстраванне ў навукова-папулярнай серыі «Гарады Беларусі», якая выдавалася напрыканцы 80-х г. XX ст. Усе працы гэтай серыі грунтаваліся на прынцыпе аналагічнасці і паралелізму макрагісторыі, альбо гісторыі Беларусі ў цэлым, і мікрагісторыі, альбо гісторыі канкрэтных беларускіх гарадоў. Пакінем у спакоі панаваўшы тады ў гістарычнай навуцы фармацыйны падыход. Больш важна падкрэсліць, што любы макрааналіз у гісторыі (у тым ліку і фармацыйны падыход) імкнецца знайсці і вылучыць пэўныя комплексы прычын і вынікаў, у межах якіх існуе кожны гістарычны факт. Паасобку гістарычныя факты з'яўляюцца бессэнсоўнымі. Гэтыя «каузальныя рады», па тэрміналогіі М.Вэбера, надаюць макрагісторыі статус навукі. Але як быць з мікрагісторыяй – полем дзейнасці гістарычнага краязнаўства – дзе неабавязкова кожная вялікая падзея пакідае след у гісторыі той ці іншай мясцовасці? Кожны краязнаўца ведае, што заўжды існуюць пэўныя перыяды лакальнай гісторыі, амаль не забяспечаныя крыніцамі, гэтымі сховішчамі «неабвержаных фактаў».

Каб не парушыць цэласнасць прычынна-выніковых ланцужкоў, аўтары канца 80-х г. XX ст. запоўнілі свае працы схемамі, узятымі з агульнай гісторыі Беларусі. Гэта было лагічна непазбежным і тэарэтычна абгрунтаваным паводле прынцыпу аналагічнасці і паралелізму дзяржаўна-нацыянальнай і лакальнай гісторыі. Але гэта было грубай памылкай. Той факт, што любая «Вялікая гісторыя» фармальна складаецца з сумы лакальных гісторый, не сведчыць аб іх якаснай тоеснасці. Яшчэ антычная дыялектыка

ведала, што якасці, уласцівыя часткам пэўнага цэлага, могуць адсутнічаць у цэлым. І наадварот, характарыстыкі цэлага звычайна не ўласцівыя яго часткам, калі яны ўзяты паасобку. Напрыклад, для беларускай гісторыі XVII-XVIII ст. самаўладдзе магнатаў выклікала феадальную анархію і прычынілася да заняпаду і гібелі Рэчы Паспалітай як дзяржавы. Але гэты ж самы магнацкі сепаратызм абумовіў росквіт шэрагу беларускіх гарадоў – магнацкіх рэзідэнцый. Дастаткова нагадаць Нясвіж Радзівілаў, Слонім Агінскіх, Ружаны Сапегаў. Іншы прыклад – бурнае чыгуначнае будаўніцтва на мяжы XIX-XX ст. Яно садзейнічала гаспадарчаму развіццю Беларусі, дэмаграфічнаму руху і росту нацыянальнай свядомасці. Але, з другога боку, яно выклікала паступовы заняпад тых беларускіх гарадоў, якія не былі непасрэдна закрануты «чыгуначнай ліхаманкай»: Навагрудка, Ашмянаў ці Нясвіжа, які зараз наўрад ці хто рызыкне назваць «маленькім Парыжам». Такім чынам, прынцып паралелізму і аналагічнасці макра- і мікрагісторыі тэарэтычна беспадстаўны. Хутчэй наадварот, кожная лакальная гісторыя ў значнай ступені існуе ў форме выключэння з правілаў «Вялікай гісторыі».

Краязнаўцы 90-х г. XX ст. адмовіліся ад распрацовак сваіх папярэднікаў, у якіх яны бачылі адсутнасць канкрэтнага фактапагічнага матэрыялу па гісторыі той ці іншай мясцовасці і злоўжыванне агульнавядомымі схемамі з гісторыі Беларусі. Але на шляху пераадолення гэтых памылак краязнаўцы 90-х г. XX ст. пайшлі не ўперад, а ў адваротным кірунку. Гэтак з'явіўся другі метадалагічны падыход да лакальнай гісторыі. Ідэалам гістарычна-краязнаўчай працы стала лічыцца сярэднявечнае летапісанне. Запанаваў чыста храналагічны прынцып – сабраць як мага больш фактычны матэрыял і выкласці яго па гадах. Храналагічны прынцып знешне здаецца найбольш аб'ектыўным і непрадузятым, але ён з'яўляецца самым ненавуковым. Колькасць абаротаў Зямлі вакол Сонца ніяк не суадносіцца з сутнасцю гістарычных падзей. Самая поўная храналогія гісторыі нейкага паселішча не дае разумення яго гісторыі. Для сярэднявечнага храніста часовае з'яўлялася недасканальным адбіткам адвечнага, а разнастайныя штогадовыя падзеі асэнсоўваліся ў спалучэнні з метафізічным светам хрысціянскіх ідэалаў. Менавіта ў гэтым канцэптуальная моц і структурная дакладнасць летапісаў, а не ў штогадовым пераліку падзей. Але хто з сучасных даследчыкаў мае такую моцную веру, каб распачаць дыялог з адвечным? Таму постсавецкае краязнаўства замест стварэння вобраза блізкай і зразумелай роднай гісто-

В патриотическом воспитании особенно помогает формированию чувств гордости за мужество и героизм исторический материал, посвященный жизни и борьбе молодежи, сверстникам сегодняшних девушек и юношей. Только в рядах белорусских партизан сражались 25 тысяч юношей и девчат моложе 18 лет. Важно при этом использовать правдивый материал, говоря о том, что годы борьбы явились суровым испытанием политических, моральных и боевых качеств белорусской молодежи. Большой духовный подъем, способность к самопожертвованию, бескорыстность и преданность Родине были характерными чертами поведения большинства белорусских юношей и девушек в годы суровых испытаний. Но сегодня, когда идет переоценка выводов, попытка бескомпромиссного освещения прошлого, нельзя отказываться от правды, которая свидетельствует, что часть молодежи поддалась развернутой фашистской пропаганде, особенно в первый год войны, добровольно выезжала на работу в рейх, участвовала в коллаборационистском движении. Это неизбежная часть военного времени, отсутствие жизненного опыта, политической зрелости. Многие из них стали жертвами обмана и насилия со стороны властей оккупационного режима.

Использование исторического материала времен Великой Отечественной войны на территории Белоруссии в патриотическом воспитании детей и молодежи предполагает обязательный учет возрастных психолого-педагогических особенностей детства. У младших школьников доминируют наглядно-образное, наглядно-предметное мышление, игровая деятельность, высокий эмо-

циональный заряд, поэтому данный материал необходимо подавать в формах Праздника Победы, когда основной акцент делается на победителей, на героизм, конкурсов рисунков и поделок, устных журналов «Орден моего деда», выставок семейных реликвий, фотографий, экскурсий в музеи.

Подросткам свойственны стремление к самопознанию, самовыражению, самоубеждению, желание демонстрировать свои способности, повышение интеллектуальной активности, желание все анализировать, подвергать сомнению. В этом возрасте эффективными формами проведения внеклассных воспитательных дел могут быть клубы, игры-доказательства («война на скамье подсудимых», «суд над жестокостью»), беседы с ветеранами, конкурсы сочинений («Мир не видел таких злодеяний», «Никто не забыт, ничто не забыто», «Поклонимся великим тем годам»), викторины «Что я знаю о войне?», операции «Салют ветеранам», конкурсы на лучшее исполнение песен и стихов о войне.

Старшеклассники пытаются разобраться в социальной, политической и культурной жизни. Происходит формирование убеждений, системы социальных и моральных ценностей, появляется тяга к путешествиям, знакомству с новым, ранее неизведанным. Следует активно привлекать соответствующие цели и возрасту формы воспитательного воздействия: диспуты «А может, не было войны?», «Можно ли обойтись без насилия?» «Что такое патриотизм?», путешествия по местам боевой славы, читательские конференции, экскурсии в театры, кинозалы, просмотр документальных и художественных фильмов о военных событиях тех лет, уроки мужества, вахты памяти, научные конференции о «белых пятнах» истории войны, викторины, вечера вопросов и ответов, акции милосердия старикам. В этом возрасте появляется повышенный интерес к всевозможным юношеским неформальным объединениям. Грамотная работа по разъяснению антигуманного действия и противоестественной позиции некоторых организаций, привлечение убедительного, захватывающего исторического материала героического военного времени Великой Отечественной войны поможет молодёжи правильно сориентироваться в выборе кумиров, грамотной мировоззренческой позиции, гуманного поведения.

Сегодня происходит смена персонажей, кумиров, героев искусства. Их сменили антисоциальные персонажи и герои потребления – мафиози, рекетиры, киллеры, наркоманы, проститутки и т.д. На смену просветительско-познавательной, морально-воспи-

тательной функции культуры приходит развлекательная. Это, в свою очередь, приводит к разрушению традиционных культурных эталонов, подмене их суррогатами деликвентной субкультуры. Под угрозой универсальные для большинства культур ценности – уважение к личности, ее правам и свободам, уважение старших, признание безусловной ценности человеческой жизни. Одним из выходов из этой ситуации является активное и продуманное использование исторического героического материала Великой Отечественной войны на территории Белоруссии в воспитании духовных качеств молодежи республики.

# СЕКЦЫЯ 2

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў СТАРАЖЫТНАСЦІ І СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ

*С.П.Віцязь* *г.Мінск*

## БАЛТЫЙСКІ ВЕКТАР У ПРАЦЭСАХ ФАРМІРАВАННЯ РАННЕСЯРЭДНЕВЯКОВАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

На пачатку XXI ст. праблема нараджэння дзяржаўнасці тэрыторыі Беларусі застаецца адной з нявысветленых, нягледзячы на яе відавочную значнасць. Галоўную складанасць для даследчыкаў прадстаўляе надзвычайная абмежаванасць гістарычных крыніц, перш за ўсё пісьмовых. Гэта прымушае выходзіць за традыцыйныя межы пошуку і выконваць рэканструкцыі, абапіраючыся ў большай ступені на археалагічныя, а таксама лінгвістычныя крыніцы. Але іх назапашванне і наступнае сістэмнае абагульненне, зыходзячы з аб'ектыўных падстаў, адбываецца даволі павольна, што стрымлівае даследчы працэс. Адпаведна набывае вагу задача фарміравання новых канцэптуальных напрамкаў, якія паспрыялі б канцэнтрацыі рэсурсаў і іх выніковасці. Згодна з выкладзеным прапануецца варыянт такога кірунку.

Вядома, што ў характарыстыцы працэсаў фарміравання феадальных адносін і дзяржаваўтварэння цэнтральнае месца займаюць паселішчы гарадскога тыпу. Гэта катэгорыя рэчаіснасці мае комплексны змест, які адлюстроўвае сацыяльнае, эканамічнае і культурнае развіццё грамадства. Для тэрыторыі Беларусі эвалюцыя гарадоў, згодна з пісьмовымі крыніцамі (у большасці пацверджанымі археалагічна) прадстаўлена выразнай колькаснай прапорцыяй [Ляўко В., 2000. – С. 255 – 256]: IX – X ст. – 3 адз., XI ст. – плюс 13 адз., XII ст. – плюс 18 адз. Іх картаграфаванне выяўляе 2 этапы развіцця: XI ст. – канцэнтрацыя ў паўночна-ўсходнім

і паўднёва-заходнім рэгіёнах (акцэнт на Заходнедзвінскі і Прыпяцка-Бугскі водныя транспартныя шляхі (далей – шляхі)), XII ст. – канцэнтрацыя ў паўднёва-ўсходнім рэгіёне (акцэнт на Дняпроўскі шлях). Тыя шляхі ўваходзілі ў рускую транспартную сістэму «з варагаў у грэкі», варыянт скандынаўскага Austrveqr. Магчыма меркаваць, што вылучаная храналагічная тэндэнцыя – рух з поўначы на поўдзень – адпавядае дамінуючаму напрамку мясцовых сацыяльных уплываў.

Між тым, згодна з археалагічнымі крыніцамі, вядома яшчэ 9 гарадскіх паселішчаў (колькасць суадносная з летапіснай), якія ўзніклі ў IX – XI ст. [Ляўко В., 2000. – С. 250; Археалогія і нумізматыка, 1993. – С. 117, 157, 238, 419, 451, 517, 537, 575; Іоў А.В., Вяргей В.С, 1993]. Іх картаграфаванне выяўляе новую карціну – канцэнтрацыю ў заходнім рэгіёне (акцэнт на Нёманска – Прыпяцкі і Заходнедзвінскі шляхі (уключаючы Швянтойю)). Гэта тэндэнцыя ў адносінах да вышэйназванай мае іншы характар – рух з захаду на ўсход. Сумарны вектар вызначаных тэндэнцый мае кірунак з паўночнага захаду, які ўмоўна можна назваць «балтыйскім».

Археалагічны матэрыял шэрагу з вышэйадзначаных паселішчаў прэзентуе скандынаўскія знаходкі, што сведчыць аб «варажскім» удзеле ў іх фарміраванні і адлюстравана ў публікацыях [Археалогія і нумізматыка, 1993. – С. 117, 238, 419, 451, 575; Іоў А.В., Вяргей В.С., 1993; Гуревич Ф.Д., 1990; Зверуго Я.Г., 1989; Дучыц Л., 1997]. Таго ж роду звесткі вылучаны і ў пісьмовых крыніцах [Дучыц Л., 1997; Дернович С., 2000]. Сам факт выхаду скандынаваў за межы сваёй радзімы абумоўлены своеасаблівасцю строю таго грамадства, што пабуджала пэўныя слаі насельніцтва развітацца з ім і «шукаць шчасця» ў іншых краях. Таму варагі маглі разлічваць толькі на сябе і вымушаны былі «майстраваць на ўсе рукі» – і мараком, і салдатам, і рабаўнікоМ, і гандляром. Менавіта іх сацыяльная «ўсяяднасць» і неабачлівая актыўнасць паслужылі моцным каталізатарам працэсаў феадалізацыі старажытнарускага гістарычнага ўсходнеславянскага грамадства, паколькі мясцовая акруга строга ўтрымлівалася ў межах радавога права. У сувязі з гэтым узгадаем горад Герцыке (на тэрыторыі Латвіі, заснаваны ў X ст.), які традыцыйна лічыўся прыкладам славянскай каланізацыі [Гурын М., Штыхаў Г., 2000]. Між тым, назва горада паходзіць ад скандынаўскага gerzkr, што значыць «купец» (менавіта – «гандляр у краіне Gardr» (г. зн. – на Русі)) [Успенский Ф.Б., 2002] і відавочна сведчыць аб спецыфіцы паходжання паселішча.

Значнасць удзелу скандынаваў у разглядаемых сацыяльных працэсах выразна праяўляе тэрытарыяльная і храналагічная карэляцыя:

- рух варагаў па землях Старажытнай Русі: сярэдзіна IX ст. – пачатак XII ст. [Лебедев Г.С., 1985];

- існаванне дзяржаўнага ўтварэння «Кіеўская Русь»: канец IX ст. – пачатак XII ст.,

- росквіт большасці з вышэйназваных гарадоў: XI – XII ст. [Археалогія і нумізматыка, 1993. – С. 117, 238, 419, 451, 517, 575; Іоў А.В, Вяргей В.С, 1993].

Неабходна падкрэсліць пэўную своеасаблівасць у ацэнцы гэтых падзей. Так, скандынаўскі рух шырока прадстаўлены ў расійскай гістарыяграфіі і адлюстроўвае яго пераважна ў адносінах да тэрыторыі Расіі. Між тым, спецыфіка тэрыторыі Беларусі дагэтуль закраналася недастаткова. Прычыны таму меліся розныя, пачынаючы ад палітычных (т. зв. «нарманская праблема», нарэшце зачыненая [Клейн Л.С., 1999]) да крыніцазнаўчых (колькасць тапанімічных узгадак па тэрыторыі Беларусі ў скандынаўскіх гістарычных крыніцах адносна невялікая, што будзе абмеркавана ніжэй). У выніку даследчыкамі разглядаецца ў якасці галоўнага для Усходняй Еўропы кірунак варажскага руху з поўначы на поўдзень (і таксама звязаны з ім Азіяцкі кірунак з поўначы на ўсход, па Волзе). Пры тым адпраўным пунктам лічыцца паселішча Ладага, а галоўным шляхам – Волхаўска-Дняпроўскі, што паўнаважна сцвярджаецца пісьмовымі і археалагічнымі крыніцамі. Як адзначалася вышэй, гэты напрамак (поўнач –поўдзень) таксама прасочваецца па летапісных звестках аб гарадах тэрыторыі Беларусі IX – XII ст.

Але названы пачатковы пункт Ладага мае сваю прагісторыю. Так, Ладага была заснавана ў сярэдзіне VIII ст. змешаным насельніцтвам, у якім яскрава прадстаўлены варажскі элемент. З першай паловы IX ст. ім пачаў засвойвацца шлях па Волхаву і з другой паловы IX ст. – шлях па Дняпру [Седов В.В., 1999]. Між тым, вызначанаму варажскаму кірунку «поўнач – поўдзень» папярэднічаў кірунак «захад – усход» уздоўж узбярэжжа Балтыкі. Так, задоўга да Ладагі, у сярэдзіне VII ст. скандынавы заснавалі аналагічны пункт Гробіне на куршскай зямлі, і пазней распаўсюдзілі шэраг паселішчаў па тэрыторыях Латвіі, Літвы і Эстоніі з мэтай абслугоўвання шляхоў па Балтыцы, Заходняй Дзвіне і Нёману [Nerman B., 1958; Sturms E., 1949; Радыньш А., 1996]. На мяжы VII – VIII ст. і таксама з удзелам скандынаваў быў заснаваны вы-

бітны для эканамічнага развіцця Балтыі пункт на зямлі прусаў – Труса, функцыі якога з сярэдзіны IX ст. пераняў пункт Кауп (Калінінградская вобласць Расіі) [Кулаков В.И., 1996].

Дарэчы, неабходна зазначыць, што кантакты скандынаваў з прусамі мелі ўстойлівы і сістэматычны характар, і змешаныя паселішчы ўтвараліся імі яшчэ з пачатку эры [Kulakov V., 2000; Витязь С.П., Кулаков В.И., Медведев А.М., 2000], таму надыход эпохі вікінгаў для Усходняй Балтыі меў не столькі рэвалюцыйны, колькі эвалюцыйны характар. У выніку мясцовы варыянт руху вікінгаў атрымаў абгрунтаванае вызначэнне «балтыйскага» [Кулаков В.И., 1999]. Сярод яго галоўных рысаў – адносна стрыманы акцэнт ваеннай экспансіі і захопу зямель, побач з перавагай службовых і гандлёвых узаемаадносін. І ў далейшым, з пераходам варагаў з зямель Усходняй Балтыі да Старажытнай Русі, такая спецыфіка захоўвалася, што вылучаецца асабліва выразна ў параўнанні з заходнееўрапейскім варыянтам, рэзка канфрантацыйным.

Такая маштабная і ўражваючая з'ява вызначаецца комплексам сацыякультурных падстаў, што накіравала даследчыка старажытнасцей вікінгаў Г.С.Лебедзева прапанаваць гіпотэзу аб існаванні ў VIII – XI ст. Балтыйскага субрэгіёну, падтрыманую даследчыкам прускіх старажытнасцей У.І.Кулаковым. Таму магчыма выказаць меркаванне, што землі Усходняй Балтыі не ўспрымаліся скандынавамі як «чужыя» – гэта быў, у вялікай ступені, роднасны для іх асяродак, які меў, да таго ж, рэлігійны (язычніцкі) аўтарытэт. Выказанае можа паслужыць тлумачэннем таго, што звесткі аб мясцовых падзеях сцісла адлюстраваны ў скандынаўскай фальклорнай традыцыі, паколькі тая носіць гераічны характар і мала фіксуе «хатнія» справы.

У адносінах да тэрыторыі Беларусі адзначаны субрэгіён мае грунтоўныя эканамічныя параметры, менавіта – насычаны і ўстойлівы тавараварот у перыяд ранняга сярэдневякоўя [Іоў А.В., Вяргей В.С., 1993; Гуревич Ф.Д., 1990; Зверуго Я.Г., 1989; Фомин А.В.,1982; Сергеева З.М., 1981; Зоценко В.М., 1983], прычым у IX – XI ст. – найперш па Нёманска – Прыпяцка –Дняпроўскаму шляху і ў меншай ступені – па Заходнедзвінскаму шляху [Булкин В.А., Зоценко В.Н., 1990].

Выказаныя палажэнні выкрываюць значную ролю балтыйскага вектара ў працэсах дзяржаваўтварэння на тэрыторыі Беларусі, у пэўнай ступені мяняюць уяўленні аб іх змесце і заклікаюць да правядзення паглыбленага комплекснага вывучэння названага вектара, скіраванага да старажытнай Прусіі [Витязь С.П., 1996].

*Г.М. Семянчук* *г. Гродна*

# ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ПРАЦЭСЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ у IX-XIII ст.

Як сцвярджае ўкраінскі даследчык Рыгор Піўтарак, паўстанне асобных усходнеславянскіх народаў адбывалася не ў выніку падзелу так званай «старажытнарускай народнасці» на тры часткі, а спосабам кансалідацыі некалькіх суседніх блізкаэтнічных славянскіх груповак у кампактныя культурна-этнаграфічныя масы, якія ў выніку іх цеснай кансалідацыі ўтварылі ўкраінскі, беларускі і расійскі народы. Гэты працэс быў аб'ектыўны і не паўстаў у выніку феадальнай раздробленасці ў XI-XIII ст., як лічаць большасць даследчыкаў, а быў толькі стымуляваны ёю. Пачатак беларускага народа непасрэдна звязаны з славянскай каланізацыяй сённяшняй тэрыторыі Беларусі, якая пачалася, паводле археалагічных дадзеных, не раней, чым у VI-VII ст., таму сцвярджэнне, што Кіеўская Русь была калыскай трох усходнеславянскіх народаў, не мае рэальных навуковых падстаў.

Важнае значэнне для этнагенезу ўсходнеславянскіх народаў увогуле і для фармавання беларускага народа і яго мовы ў прыватнасці меў той факт, што славяне рассяліліся на абшарах Усходняй Еўропы сярод мясцовага насельніцтва. Картаграфія старажытных археалагічных помнікаў сведчыць аб тым, што геаграфічны арэал балцкіх паселішчаў ва Усходняй Еўропе папярэднічаў славянам на тэрыторыі сучаснай Беларусі (уся сучасная паўночная і цэнтральная Расія на той час была заселена фіна-угорскімі плямёнамі). Менавіта гэта садзейнічала таму, што балцкі субстрат стаўся асновай у будучым стварэнні тутэйшых этнічных папуляцый, што выразна адлюстравалася ў тапаніміцы і антрапалагічным вобліку насельніцтва. Асіміляцыя славянаў і балтаў была двухбаковай, але пераважала славянства. У розных мясцовасцях цяжка было адрозніць славян ад балтаў. З паўстаннем у IX-X ст. сталых умацаваных паселішчаў з адміністрацыйнымі функцыямі (Полацк, Віцебск, Менск, Тураў) славянізацыя тутэйшых людзей у большасці раёнаў Беларусі ўзмацнілася. У выніку славяна-балцкай інтэграцыі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, у басейне Дняпра, Заходняй Дзвіны, Прыпяці сфармаваліся новыя этнічныя супольнасці, якія ў гістарычных крыніцах называюцца дрыгавічы, радзімічы, полацкія і смаленскія крывічы. У культуры і мове гэтых народаў змяшаліся славянскія і балцкія элементы. Гэта былі

ўжо этнічныя групы новай якасці, у якіх пераважалі славянскія рысы.

Паўстанне сучасных усходнеславянскіх моў было цесна звязана з гісторыяй адпаведных саюзаў плямёнаў. Гэтыя саюзы плямёнаў у раннім сярэднявеччы характарызуюцца пэўнымі этнічнымі, культурнымі і дыялектычнымі асаблівасцямі, якіх яны не згубілі, калі знаходзіліся ў складзе Кіеўскай Русі, таму што поўнага аб'яднання саюзаў плямёнаў у так званую «старажытнарускую народнасць» не адбылося. З гэтага пункту гледжання на тэрыторыі Беларусі ў IX-X ст. вылучыліся аднолькавыя па паходжанню дзве вялікія этна-пляменныя групы. Адна – паўднёва-заходняя – цягнулася да Палесся і была цесна звязана з нашчадкамі дрыгавічоў, радзімічаў, драўлян і валынян, другая – паўночна-ўсходняя, якая ахоплівала крывіцкі саюз плямёнаў.

Важна вызначыць, чым было племя ў перыяд паўстання першых дзяржаў на тэрыторыі Усходняй Еўропы (і нават Цэнтральнай і Заходняй). Рэйнард Вэнскус і Бенедыкт Зентара пераканаўча абгрунтавалі думку, што плямёны былі палітычнымі арганізмамі, якія складаліся з рознародных і зменлівых элементаў, згрупаваных вакол рода, які захоўваў свядомасць і пляменную традыцыю. Гэтая свядомасць складалася: з веры ў супольнае паходжанне, культа гераічнага мінулага, пляменнай рэлігіі, звычаёвага права, убрання і звычаяў. Яшчэ далей пайшоў Пётр Борань: «... *пляменная рэчаіснасць не трактуецца як лад, але як грамадства. Племя разумеецца як свайго роду ідэнтыфікацыйная супольнасць, характэрная для грамадства, у якім сувязі не маюць інстытуцыянальнага паходжання, а ствараюцца на працягу існавання супольнасці і маюць перад усім характар свядомасны. Аналіз дадзеных крыніцаў схіляе да прызнання з'явы акрэсленай назвай «племя» за грамадскую катэгорыю (з непарыўнымі традыцыйнымі сувязямі, якія злучаюць групу людзей), а не за лад, супрацьпастаўленне дзяржаве. Такое паняцце племя больш блізкае да паняцця народа ці народнасці, таксама, як структур, кшталтаваных свядомаснымі чыннікамі. Племя, як і народ, існуе незалежна ад улады, якая для дзяржавы ёсць элементам канстытуцыйным».*

Усходнеславянскія летапісы ўзгадваюць 14-15 этнічных груп з тэрыторыі Усходняй Еўропы: паляне, драўляне, северане, дрыгавічы, радзімічы, вяцічы, улічы, ціверцы, харваты, валыняне, бужане, дулебы, крывічы, палачане. Драўляне апошні раз узгадваюцца ў 1136 г., крывічы існуюць да 1162 г., дрыгавічы – да 1149 г., радзімічы – да 1169 г., вяцічы – да 1197 г. Нават назва паляне,

якая, на думку большасці даследчыкаў, знікае пасля 944 г., пры глыбейшым прачытанні летапісаў ужывалася да часоў Нестара, магчымага аўтара «Аповесці мінулых гадоў». Пішучы аб Кіі, заснавальніку Кіева, і яго братах, Нестар адзначае «бяху мужи мудри и смыслени, нарицахуся поляне, от них же есть поляне в Киеве и до сего дня». Падобны зварот «и ныне» сустракаем у Нестара ў выпадку апісання розных звычаяў у розных усходнеславянскіх плямёнаў. Гэнрых Пашкевіч лічыў, што племенная тэрміналогія функцыянавала на тэрыторыі Кіеўскай Русі яшчэ доўга пасля Нестара і з'яўляецца сведчаннем пэўнай этнічнай і культурнай незалежнасці. Інфармацыю аб плямёнах ва ўступе да «Аповесці» можна аднесці да XI – пачатку XII ст., калі Нестар пісаў свой твор. Апошняе меркаванне пацвярджаюць шматлікія археалагічныя дадзеныя.

Лінгвісты лічаць, што ў перыяд перад заснаваннем Кіева і ў часы Кіеўскай Русі на яе тэрыторыі існавалі галоўныя дыялекты, якія па сутнасці былі асобнымі мовамі – галіцкай, карпацкай, палескай, крывіцкай, славенскай і дыялектны кангламерат верхняга басейна Волгі і сярэдняга Акі. Больш таго, ніводная з дзвюх літаратурных моў у Кіеўскай Русі не кансалідавала жыхароў, паколькі абедзве (як царкоўнаславянская, так і старажытнаруская) мелі мала агульнага з народна-размоўнай мовай ва ўсіх дыялектных арэалах. Варта падкрэсліць, што гэтымі літаратурнымі мовамі простыя людзі не гаварылі. Гэта была прэрагатыва нешматлікіх адукаваных людзей, якія ў адносінах да ўсіх жыхароў складалі малы працэнт. Прычынай таго з'яўляецца факт, што ў сярэднявечны мовай адукацыі ў Кіеўскай Русі была царкоўнаславянская, а хрысціянства ў XI – XIII ст. не было яшчэ агульнай рэлігіяй сельскага насельніцтва, якое дамінавала. Хрысціянства доўгі час не было галоўным чыннікам кансалідацыі, паколькі яшчэ не ўкаранілася на вёсцы ў дамангольскі перыяд.

Найлепшым аргументам супраць існавання адзінай старажытнарускай мовы з'яўляецца мова берасцяных грамат. Выдатны мовазнаўца, спецыяліст па берасцяных граматах прафесар А.Залізняк пасля дакладнага і грунтоўнага аналізу мовы берасцяных грамат прыходзіць да высновы, што старажытнанаўгародскі дыялект ёсць асобным славянскім дыялектам, паўстанне яго асаблівасцяў адбылося ў праславянскую эпоху. Больш таго, А.Залізняк адзначае: «*Калі б існавала незалежная старажытнанаўгародская дзяржава надалей, гэты працэс (моўнай кансалідацыі заходніх (старажытнапскоўскі-паўночнакрывіцкі) і ўсходніх (ільменьска-сла-*

*венскіх) дыялектаў мусіў прывесці да фармавання асобнай усходнеславянскай мовы, падобнай да беларускай і ўкраінскай. Такім чынам, з гістарычна-лінгвістычнага пункту гледжання, у XI-XV ст. сукупнасць мясцовых ідэомаў Наўгародскай зямлі стварала некалькі дыялектаў, развіццё якіх у асобную мову было перарванае пасля страты незалежнасці Ноўгарада Вялікага і далучэння Наўгародскай зямлі да Маскоўскай дзяржавы».*

Услед за С.Токаравым і С.Аруцюнавым варта адзначыць адну з уласцівасцяў феадальных сярэднявечных народнасцяў. У адрозненне ад класічных антычных «дэмасаў», дзе рабы былі чужаземцамі, феадальная народнасць стваралася з аўтахтоннага сельскага насельніцтва. Уласна яна нясла ў сабе галоўныя этнічныя рысы, этнічную свядомасць, этнічную спецыфіку. Этнічная культура раннефеадальных народнасцяў – гэта перад усім народная культура. Вышэйшы феадальны слой у значнай меры быў дээтнізаваны і касмапалітычны, таму мовай вярхушкі доўгі час былі не народныя дыялекты, але незразумелыя насельніцтву мёртвыя мовы: у Заходняй Еўропе – лацінская, ва Усходняй Еўропе і на Балканах – царкоўна-славянская, у Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі – санскрыт.

У перыяд феадальнай раздробленасці на тэрыторыі Усходняй Еўропы (сяр. XII – сяр. XIII ст.) новыя незалежныя княствы аб'ядноўваліся ў асобныя групы, у якіх складваліся эканамічныя, палітычныя, вайсковыя і культурныя адносіны. Такія групы стваралі: 1) Наўгародская і Пскоўская землі; 2) Уладзіміра-Суздальскае, Разанскае, Мурамскае княствы; 3) Кіеўскае, Чарнігаўскае, Северскае, Пераяслаўскае княствы; 4) Галіцкае і Валынскае; 5) Полацкае, Смаленскае, Тураўскае княствы і дробныя Наднёманскія княствы. У гэтых групах можна заўважыць не толькі контуры папярэдніх незалежных этнічна-моўных рэгіёнаў, але і будучых усходнеславянскіх народаў. Для этнагенезу беларусаў мае значэнне пятая група княстваў. Кансалідацыйныя працэсы сярод гэтай групы княстваў адлюстроўваюць палітычныя і гандлёвыя сувязі пачатку XIII ст. (1210, 1212, 1229 г.) паміж Полацкам, Смаленскам і Віцебскам, з аднаго боку, і Рыгай, Ганзай і Готландам, з другога. Мовазнаўцы ў тэкстах так званай Смаленскай граматы 1229 г. і шэрагу полацкіх грамат другой паловы XIII ст. заўважаюць, што побач з агульнымі ўсходнеславянскімі (і царкоўнаславянскімі) моўнымі асаблівасцямі назіраюцца з'явы, якія сведчаць аб фармаванні беларускай мовы – «аканне» і «яканне», «дзеканне і цэканне», зацвярдзенне «Ш», «ШЧ» і «Р», фрыкатыўны гук «Г», зме-

на «Л» на «Ў» у пэўных пазіцыях, прыстаўныя зычныя і іншыя рысы.

Наступным значным крокам, які прыспешыў этнічную і культурную кансалідацыю жыхароў розных рэгіёнаў сучаснай Беларусі, было стварэнне ў сярэдзіне XIII ст. на тэрыторыі беларускага Панямоння поліэтнічнай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага. У гэтую дзяржаву на працягу першых ста гадоў існавання ўвайшлі ўсе этнічна беларускія ў сучасным сэнсе землі. Але этнічная гісторыя жыхароў ВКЛ – асобная тэма.

*Н.В.Козловская* *г. Гродно*

## АКТУАЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ ИЗУЧЕНИЯ ИСТОРИИ ШЛЯХТЫ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО: К ПОСТАНОВКЕ ПРОБЛЕМЫ

В отечественной историографии последнего десятилетия шляхетская тематика по праву занимает одно из ведущих мест. Этот факт не может не внушать оптимизма, что в ближайшие годы в белорусской науке появятся обобщающие исследования по истории шляхты белорусских земель Великого княжества Литовского, ибо в данном вопросе мы на порядок отстаём от польских, украинских и литовских коллег.

В этой связи считаю необходимым заострить внимание на узловых проблемах истории шляхты, требующих дальнейших исследований с привлечением широкого комплекса как опубликованных, так и архивных источников.

1. Формирование шляхетского сословия. Корни складывающегося сословия ведут к боярству Полоцкого, Туровского, Смоленского княжеств, а также к литовскому боярству. Вопрос же о взаимоотношениях между Гедиминовичами и Рюриковичами, о политических контактах и о культурно-религиозном влиянии (а этот факт, я думаю, бесспорен) этих двух групп друг на друга фактически не исследован, равно, как и роль боярского элемента в процессе становления шляхетства (частично эти вопросы затронуты в многочисленных статьях А.П.Грицкевича).

Большое влияние на формирование элиты ВКЛ оказывали процессы угасания, или, другими словами, вымирания, старых боярских фамилий на протяжении XIV-XV веков, а в XVI веке, напротив – старых литовских фамилий. Так, например, Любарт

Гедиминович после смерти последнего владимирско-волынского князя Андрея Юрьевича, на дочери которого он был женат, становится волынским князем. Сам Ольгерд, женившись на Марии Ярославовне, единственной наследнице витебского князя Ярослава Васильевича, после смерти последнего становится в 1320 г. витебским князем.

В свою очередь, на протяжении XVI в. с политической сцены сошли представители старых литовских фамилий Кезгайлов, Гаштольдов и других.

В 28 книге записей Литовской Метрики под 1542 г. внесена запись о кончине в данный период многих панов рад. В документе, в частности, упоминаются: Заберазинский Ян Янович, с 1531 г. воевода троцкий – скончался в 1538 г.; воевода виленский, канцлер Гаштольд Ольбрахт Мартинович – умер в 1539 г.; Немирович Андрей Якубович, воевода киевский (с 1514 г.) – умер в 1541 г.; Радзивилл Юрий Николаевич, с 1531 г. гетман наивысший, одновременно каштелян виленский, маршалок надворный – умер в 1541 г.; Радзивилл Ян Николаевич, староста бельский и жамоитский (с 1535 г.) – скончался в 1542 г.

И в этом же документе содержится запись о назначениях на освободившиеся вакансии. Виленским воеводой становится Глебович Ян Юрьевич (происходил, возможно, от бояр Смоленской или Полоцкой земли?), до этого был воеводой полоцким, а с 1546 г. – канцлером ВКЛ. Троцким воеводой становится Гаштольд Станислав Ольбрахт (последний из рода, умер в 1542 г., до этого был воеводой новогрудским). Жамоитским старостой становится Янович Матей Войтехович, который в это же время был воеводой витебским и маршалком (Литовская Метрика. 1522-1552 г. – Минск, 2000. – Кн. 28 Записей. – Док. № 95).

Документ под № 102 за этот же 1542 год свидетельствует о новых назначениях. Полоцкое воеводство (с 24 мая 1542 г.) получает Давойна Станислав Станиславович. Остикович Григорий Григорьевич, происходящий из литовского боярства, получает Новогрудское воеводство, а Носиловский Войтех Юрьевич – Витебское.

2. Актуальным является вопрос о взаимоотношениях католической шляхты с православным боярством и княжеской аристократией. В исторической науке утвердилось мнение, что возможности участия православных князей в политической жизни ВКЛ были ограничены ещё с 1413 г. Однако М.К.Любавский справедливо заметил, что в то время не было постоянных окладов для

членов рады, тогда как государственная деятельность зачастую требовала предварительной затраты немалых собственных средств. Поэтому исполнение обязанностей панов рад было под силу лишь весьма состоятельным фамилиям. В подтверждение этого можно привести запись, содержащуюся в Volumina legum, о том, что Ян Кароль Ходкевич, воевода виленский, гетман ВКЛ представил в скарб коронный лист о своих затратах во время Инфляндской войны, за что ему была выплачена соответствующая компенсация из коронной и великокняжеской казны, соответственно (Volumina legum. Т. 3, 1609-1640. – Петербург, 1859. – С. 208).

Следует признать, что литовская знать намного превосходила князей по размерам землевладения, а стало быть, по могуществу и влиянию. Поэтому князьям же приходилось довольствоваться второстепенными ролями (Кром М. Православные князья в ВКЛ в начале XVI в. К вопросу о социальной базе восстания Глинских //Отечественная история. – 1992. – № 4. – С. 147). Те же из них, которые по своему богатству и влиянию стояли вровень с литовскими панами, занимали высшие государственные посты. Показательна в этом плане карьера князя К.И Острожского, который с 1511 по 1522 г. являлся виленским каштеляном, а с 1522 – 1530 г. – воеводой троцким.

3. Унии Великого княжества Литовского с Польшей. Несмотря на обширную историографию вопроса, данная проблема нуждается в дальнейших научных исследованиях, особенно что касается Люблинской унии и её влияния на шляхту княжества. С данной проблемой непосредственно связан вопрос полонизации шляхты княжества.

Как нам видится, политическая элита ВКЛ рассматривала унию с Польшей прежде всего как акт дипломатический, нежели реальный союз двух государств, от которого в случае надобности (или ненадобности?) можно отказаться или использовать в качестве аргумента, средства давления при решении спорных вопросов.

Одним из свидетельств этого является III Литовский Статут, статьи которого шли вразрез со статьями Унии 1569 г. В политических реалиях, по крайней мере, второй половины XVI – XVII в., приоритет в большинстве случаев отдавался статьям Статута 1588 г.

Шляхта, магнаты княжества достаточно ревностно относились и к своим должностям, и к земельным владениям, поэтому делиться ими с чужеземцами, в том числе и поляками, жителями собственно Короны, не желали. Причём в подавляющем числе

случаев под «чужеземцами» как раз поляков и подразумевали, о чём убедительно свидетельствуют сеймовые инструкции.

Нельзя не вспомнить конфликт 1591 – 1600 г., касающийся виленского бискупства. Сигизмунд III назначил на должность бискупа виленского Бернарда Матиевского, а Ежи Радзивилла – бискупом краковским. Тем самым на важнейшую церковную должность в Литве назначался поляк, а в Польше – литвин. Однако это решение вызвало продолжительный спор и негодование, прежде всего, с литовской стороны, которая в данном случае опиралась на Литовский Статут. В конечном итоге дело разрешилось само собой: в 1600 г. Ежи Радзивилл скончался. Матиевский был назначен краковским бискупом, а Бенедикт Война (? – 1615), уроженец ВКЛ, становится бискупом виленским.

Оценить однозначно данные факты как проявления «литовского сепаратизма» или как «литовского патриотизма» весьма сложно. Этот вопрос остаётся открытым и нуждается в уточнении терминологии.

Что же касается процессов «полонизации», то бесспорно, что они имели место, их нельзя недооценивать, но и переоценивать тоже не следует. Глубина данных явлений во многом зависела от уровня экономической состоятельности и политических возможностей шляхты. Вполне естественно, что после заключения унии 1569 г. политические, экономические контакты, культурное сотрудничество между ВКЛ и Короной значительно укрепились. Польский язык получает широкое распространение, усиливается влияние католической церкви. Однако мелкая и средняя шляхта, которая составляла значительную часть сословия, жила, как правило, в сельской местности, сливаясь в данном случае и по уровню жизни, и по уровню образованности с крестьянством. На противоположном полюсе стояли представители магнатерии, люди весьма образованные для своего времени, обучавшиеся в иностранных университетах, легко поддающиеся иностранным веяниям, в том числе и польским.

Данная проблема нуждается в дальнейших исследованиях.

4. Нельзя не отметить тот факт, что в многовековой истории шляхетства основное внимание исследователей сконцентрировано на событиях XVI в., в то время как из поля зрения историков выпали XIV – XV в. – начальный период истории шляхты, и XIX – XX в. – один из самых драматических и героических, с нашей точки зрения, периодов истории шляхты, период коренных изменений в мировосприятии шляхетством окружающей действитель-

ности и своего места в ней, формирования новых целей и идеалов. Слабо изучена и история шляхты княжества на протяжении XVII – XVIII в., где нужно отметить, прежде всего, труды по военной истории Г.Сагановича и работы Г.Прибытки, посвящённые борьбе магнатских группировок в указанный период.

*А.К. Краўцэвіч* *г. Гродна*

## ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ Ў ЭТНАГЕНЕЗЕ БЕЛАРУСАЎ

Беларуская гістарычная навука на працягу амаль усяго існавання БССР не магла даследаваць Вялікае княства Літоўскае (далей ВКЛ). Гісторыя дзяржаўнага ўтварэння, у межах якога Беларусь знаходзілася больш за палову тысячагоддзя, складаючы пры гэтым яго асноўную частку, у БССР была негалосна забароненая. Паводле афіцыйнай савецкай канцэпцыі гісторыі Беларусі, спрадвечным імкненнем беларускага народа было ўз'яднанне з народам рускім у адзінай, натуральна, расейскай дзяржаве, таму прысутнасць ВКЛ як з'явы ў беларускай гісторыі была непатрэбнай. Гэтая дзяржава абвяшчалася творам літоўскіх феадалаў, якія захапілі і далучылі да яе беларускія землі. Утварэнне беларускага народа тлумачылася як вынік адарвання заходнерускіх земляў ад адзінай тэрытарыяльна-культурнай прасторы старажытнай Русі. Такім чынам, у савецкай гістарыяграфіі ўтварэнне беларускага народа прадстаўлялася наступствам негатыўнай з'явы, менавіта, замежнай інтэрвенцыі, праз што і сам працэс этнагенезу беларусаў атрымліваў негатыўнае адценне. Затое злучэнне з расейскім народам выглядала як аднаўленне гістарычнай справядлівасці, як вяртанне да агульных каранёў.

З навуковага пункту гледжання, згаданыя палажэнні савецкай гістарыяграфіі з'яўляюцца ідэалагічнай спекуляцыяй на ніве гісторыі. Раней ці пазней такія спекуляцыі выкрываюцца ў працэсе навуковага даследавання. Каб гэтага пазбегнуць, на гісторыю ВКЛ увялі негалосную забарону. Дазвалялася вывучаць толькі эканамічную гісторыю XIV - XVIII ст., галоўным чынам, дзейнасць сялянства і, у меншай ступені, гараджанаў. За ўвесь час функцыянавання беларускай гістарычнай навукі была выдадзеная толькі адна манаграфія, прысвечаная палітычнай гісторыі ВКЛ, ды і тая выйшла ў 1998 г., ужо пасля знікнення БССР.

Зразумела, што ў такой сітуацыі ніяк не мог даследавацца і ўплыў ВКЛ на этнагенез беларусаў. Аднак нават савецкая гістарыяграфія не адмаўляла існаванне такога ўплыву, хоць і надавала яму негатыўнае адценне. Прызнаючы храналагічную збежнасць завяршэння «фармавання беларускай народнасці» (XIV – XVII ст.) з часам знаходжання беларускіх земляў у складзе ВКЛ, савецкая гістарыяграфія негатыўна ацэньвала ролю гэтай дзяржаўнай арганізацыі «літоўскіх феадалаў» у этнагенезе беларусаў. Аднак практыка гістарычнага працэсу паказала нешта іншае, менавіта што «пад сацыяльным і нацыянальным прыгнётам літоўскіх і польскіх феадалаў» беларускі этнас сфармаваўся, а ў складзе дзяржавы «братняга рускага народа», наадварот, падвергся дэнацыяналізацыі.

Тая ж гістарычная практыка сведчыць, што ў сярэднявеччы і ў новым часе менавіта дзяржаўныя арганізацыі адыгралі галоўную ролю ў фармаванні сучасных еўрапейскіх народаў. Этнічная аснова, на якой будавалася дзяржаўнае жыццё (мова, культура, звычаёвае права і інш.) станавілася дамінуючай і шматэтнічныя еўрапейскія дзяржавы паступова пераўтвараліся ў монаэтнічныя. У Брытаніі англа-саксонская дзяржава прывяла да асіміляцыі мясцовых кельтаў. Моцная дзяржава з цэнтрам у Іль-дэ-Франс злучыла кангламерат рознаэтнічных тэрыторыяў і прычынілася да паўстання адзінага французскага народа.

Этнічная арганізацыя, таксама, як і дзяржаўная, прызваныя выконваць адную і тую ж асноўную функцыю, менавіта арганізацыю жыццядзейнасці буйных чалавечых супольнасцяў. Дзяржава – больш позняя па часу ўзнікнення арганізацыя і выконвае названую функцыю больш эфектыўна. З гэтай прычыны пры перасячэнні ці канфлікце этнічных і дзяржаўных структураў перамогу атрымліваюць апошнія. Прыкладаў таму мноства. Найбліжэйшы да нас – канфлікт паміж расейскай дзяржаўнай і беларускай этнічнай структурамі ў т.зв. Паўночна-Заходнім краі прычыніўся да глыбокага крызісу беларускага этнасу і паставіў пад знакам пытання яго існаванне.

Як выглядалі ўзаемаадносіны паміж дзяржаўнай арганізацыяй ВКЛ і беларускімі этнічнымі структурамі? Адказ на гэтае пытанне і ёсць вывучэннем ролі ВКЛ у этнагенезе беларусаў. Асноўны кірунак надзвычай аб'ёмнай гістарыяграфіі гэтай дзяржавы (у тым ліку і нешматлікай беларускай) складае выяўленне і сцвярджэнне канфлікту паміж летувіскай дзяржавай і беларускім народам. Толькі ў апошняе дзесяцігоддзе гэты падыход актыўна кры-

тыкуецца на Беларусі, і можна казаць пра яго неактуальнасць у нашай краіне. Сучасныя беларускія гісторыкі (прынамсі, спецыялісты па ВКЛ) разглядаюць узаемаадносіны ВКЛ – беларускі этнас не як канфлікт, а як супрацоўніцтва. Якія ў іх ёсць падставы для гэтага?

1. Не выпадае казаць, што ініцыятыва стварэння ВКЛ належала выключна літоўскім плямёнам, продкам сённяшніх летувісаў. Дзяржава стваралася ў балта-славянскай кантактнай зоне – гістарычнай Літве (Наваградчына, Віленшчына, Гарадзеншчына, частка Меншчыны). Беларускія насельнікі гэтай зоны прымалі актыўны ўдзел у працэсе дзяржаваўтварэння.

2. Палітычная арганізацыя ВКЛ злучыла ў адно цэлае некалькі гістарычных вобласцяў будучай Беларусі: Падняпроўе, Паддзвінне і Панямонне. Даследчыкі звярнулі ўвагу на значнае супадзенне палітычных межаў ВКЛ і этнічных межаў беларускага арэалу.

3. Асноўная этнічная аснова дзяржаўнай арганізацыі была беларускай (дзяржаўная мова, сістэма права і большасць насельніцтва).

4. У працэсе дзейнасці дзяржаўнай арганізацыі гэтая этнічная аснова ўзмацнялася, напрыклад, прадстаўнікі арыстакратыі балцкага паходжання славянізоўваліся, і ў XVI ст. і «русінская мова» запанавала «... не толькі як дзяржаўная і афіцыйная мова (як, напрыклад, лацінская ў сярэднявечнай Польшчы), але як мова хатняя і сямейная ў колах магнацкіх, а потым баярскіх».

5. За час існавання ВКЛ беларуска-летувіская кантактная зона паступова перасоўвалася на паўночны захад углыб балцкай тэрыторыі. Г.зн. летувіскія тэрыторыі беларузаваліся, і дзяржава гэтаму па меншай меры не перашкаджала. У XIX ст. летувіска-беларуская этнічная мяжа знаходзілася на паўночным захадзе ад Вільні.

Ад часу ўтварэння ВКЛ і амаль да канца XVI ст. беларуская мова і культура перажывалі перыяд поўнавартаснага жыцця, калі гэтая культура ахоплівала ўсе пласты насельніцтва ад сялянаў да вялікіх князёў.

Варта таксама зазначыць, што ў апошнія два стагоддзі існавання ВКЛ меў месца крызіс беларускай культуры. Менавіта ад Люблінскай уніі ВКЛ з Польскім каралеўствам, калі пачынаецца добраахвотная паланізацыя эліты ВКЛ, дзяржаўная структура перастае спрыяць развіццю беларускага этнасу. Пасля ліквідацыі дзяржавы і захопу Беларусі Расейскай імперыяй на паланізацыю наклалася татальная русіфікацыя, і крызіс беларускага этнасу яшчэ

паглыбіўся. Беларуская культура ўсё больш замыкалася ў сялянскім асяроддзі, якое выступіла кансервантам яе падставовых элементаў.

Тым не менш, нават пасля страты беларускай культурай дамінуючай пазіцыі ў краіне працягвалася беларусізацыя летувісаўвяскоўцаў. Гэтая сялянская беларусізацыя ва ўмовах адсутнасці падтрымкі з боку якой-небудзь дзяржаўнай арганізацыі выглядае як феномен і заслугоўвае спецыяльнага вывучэння.

На нашу думку, менавіта перыяд супрацоўніцтва ВКЛ і беларускай культуры («залаты век» – палова XIII – XVI ст.) стварыў «запас трываласці» этнасу, якога хапіла, каб дажыць да навейшага часу, распачаць беларускі нацыянальна-вызваленчы рух і ў пачатку XX ст. пазмагацца за ўласную дзяржаўнасць.

*У.А. Падалінскі* *г. Мінск*

## ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ Ў ПАЛІТЫЧНЫМ КРЫЗІСЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ 1587 – 1589 г.

Падчас трэцяга бескаралеўя федэратыўная Рэч Паспалітая (РП) апынулася ў стане сур'ёзнага палітычнага крызісу, які адлюстраваў усю складанасць стасункаў як паміж рознымі палітычнымі групоўкамі ўнутры краіны, так і паміж двума суб'ектамі федэрацыі – Вялікім княствам Літоўскім (ВКЛ) і Каралеўствам Польскім (КП).

Пасля смерці караля і вялікага князя Стэфана Баторыя 12 снежня 1586 года ў Гародні арцыбіскуп гнезненскі (першая асоба ў Рэчы Паспалітай падчас бескаралеўя) Станіслаў Карнкоўскі прызначыў пачатак канвакацыйнага сойма на 2 лютага 1587 года. Першы з'езд сенатараў і нешматлікіх прадстаўнікоў шляхецтва ВКЛ адбыўся на пачатку студзеня 1587 года ў Гародні. Прысутныя пастанавілі склікаць галоўны з'езд Княства 29 студзеня ў Вільні, а таксама не прызналі дзейнасць універсалаў, выдадзеных праз арцыбіскупа гнезненскага, і выказалі пажаданне аб адтэрміноўцы канвакацыйнага сойму на 12 лютага.

Такім чынам, 29 студзеня 1587 года на галоўны з'езд сабраліся паны-рада і павятовыя паслы ВКЛ. На з'ездзе былі зацверджаны надзвычайныя, каптуровыя суды, якія замянялі земскія, гродскія і падкаморскія суды на час бескаралеўя. 30 студзеня была ўхвалена інструкцыя для вялікакняжацкіх паслоў на канвакацыйны сойм,

у якой дэпутатам даручалася дамагацца: зацвярджэння канфедэрацыі 1573 года аб свабодзе веравызнання, далучэння да ВКЛ Інфлянтаў цалкам, пастановы аб скліканні вальных соймаў пачаргова то ў Кароне, то ў Княстве, і каб гаспадар кожны трэці год жыў у ВКЛ, надання ўсіх земскіх і дворных пасадаў у Княстве толькі літвінам. У інструкцыі заклікалі паслоў пільна імкнуцца заключыць з Вялікім княствам Маскоўскім (ВКМ) або ўнію, або вечны мір. Звярталі ўвагу, што намінаванне новага караля і вялікага князя павінна прайсці роўна і вольна, без парушэння ўмоў Люблінскай уніі, як гэта было падчас абрання Стэфана Баторыя. Папярэджвалі польскі бок, што ў выпадку парушэння правоў і вольнасцяў Княства прадстаўнікі ВКЛ увогуле не прыедуць на элекцыю. Прапаноўвалі таксама забараніць прысутнасць іншаземцаў пры гаспадарскім двары. Адзін з артыкулаў інструкцыі прадпісваў паслам забяспечыць прыняцце новага Статута на канвакацыі і зацвярджэнне яго на каранацыі. З галоўнага з'езду Вялікага княства Літоўскага на канвакацыйны сойм у Варшаву накіравалі дэлегацыю, у склад якой уваходзілі трокскі ваявода Ян Глябовіч, кашталян смаленскі Багдан Сапега, падканцлер ВКЛ Леў Сапега і прадстаўнікі шляхты.

На канвакацыйным сойме, аднак, пажаданні літвінаў у большасці не былі выкананы, што выклікала незадаволенасць сярод палітычнай эліты ВКЛ, хоць частка вялікакняжацкіх паслоў на чале з Янам Глябовічам усё ж такі падпісалі пастановы сойму. Элекцыйны сойм быў прызначаны на 30 жніўня 1587 года.

Ужо з лютага 1587 года палітычныя сілы Княства распачалі кантакты з прэтэндэнтамі на пасад Рэчы Паспалітай. Асабістыя пасланцы Габсбургаў (імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Рудольфа II і эрцгерцага Максімільяна) сустракаліся з кашталянам трокскім Мікалаем Крыштофам Радзівілам Сіроткай, які разам са сваім братам віленскім біскупам Юрыем Радзівілам стаў самым уплывовым іх прыхільнікам у ВКЛ. Аднак большасць магнатаў Княства яшчэ не вызначылася з кандыдатам. Сярод шляхты ВКЛ набыла папулярнасць ідэя ўніі з ВКМ, і, адпаведна, расла падтрымка вялікага князя маскоўскага Фёдара Іванавіча як прэтэндэнта на пасаду новага гаспадара РП. У Каралеўстве значную падтрымку меў шведскі каралевіч Жыгімонт, сын караля Швецыі Юхана III і дачкі Жыгімонта I Старога Катажыны, на чыім баку выступілі сястра Жыгімонта II Аўгуста каралева Ганна і канцлер КП Ян Замойскі. Зацяты сапернік Я.Замойскага надворны мар-

шалак Анджэй Збароўскі і значная частка шляхецтва Вялікай Польшчы схіляліся ў бок габсбургскай кандыдатуры.

15 сакавіка ў Навагрудку адбыўся чарговы галоўны з'езд ВКЛ, на якім вяліся перамовы з маскоўскімі пасламі аб вечным міры і магчымасці будучай элекцыі Фёдара Іванавіча. Да вялікага князя маскоўскага было накіравана пасольства на чале з трокскім падкаморым Багданам Агінскім з умовамі, якія Фёдар Іванавіч павінен выканаць, каб яго падтрымала Княства, а ўжо ў траўні ў Вільню прыехала пасольства з Масквы.

Тым часам ваявода віленскі і гетман польны ВКЛ Крыштоф Радзівіл Пярун (фактычна першая асоба ў дзяржаве) склікаў галоўны соймік Княства, які меўся выпрацаваць агульную пазіцыю ліцвінаў на элекцыі, на 1 чэрвеня 1587 года ў Ваўкавыску. Аднак у Ваўкавыску адзінасці поглядаў не было. Мікалай Крыштоф і Юры Радзівілы агітавалі за кандыдата ад Габсбургаў. Праўда, дасягнуць сваёй мэты ім не ўдалося. Значную папулярнасць на сойміку меў маскоўскі прэтэндэнт. А частка сенатараў увогуле прапаноўвала не ехаць у Варшаву і не браць удзел у элекцыі, бо падчас канвакацыйнага сойму польскі бок парушыў правы і вольнасці ВКЛ. У выніку галоўны соймік Княства прыняў 15 чэрвеня ўхвалу, у якой пацвердзіў увядзенне на час бескаралеўя каптуровых судоў, таксама адзначыў, што рэдагаванне Статута і паправа Трыбунала былі адкладзены да элекцыі як «справы ўласныя, аднаму народу літоўскаму і рускаму належачыя». Далей вызначалася, што ліцвіны самастойна будуць абмяркоўваць і прымаць усе рэчы, звязаныя з карэктурай свайго права, толькі пасля гэтага абяруць новага гаспадара, якому ўсе папраўы аддадуць на прысягу падчас будучай каранацыі. Акрамя таго, з'езд пастанавіў, што ў выпадку парушэння на элекцыі правоў і вольнасцяў ВКЛ будзе скліканы надзвычайны з'езд у Берасці дзеля абмеркавання становішча, а татары, аселыя ў Княстве, пад пагрозаю страты маёмасці павінны будуць прыехаць пад Варшаву, каб збройна бараніць сваю дзяржаву ад усялякіх небяспечнасцяў. З'езд заклікаў ваяводу віленскага і гетмана польнага ВКЛ Крыштофа Радзівіла абавязкова прысутнічаць на элекцыі дзеля абароны правоў Княства. Канчатковае рашэнне наконт падтрымкі таго ці іншага кандыдата было вырашана прыняць непасрэдна на элекцыйным сойме.

Элекцыйны сойм пачаўся ў Варшаве 30 чэрвеня 1587 года. Дэлегаты ВКЛ не бралі ўдзел у супольных нарадах і ўсё абмяркоўвалі на сваіх асобных пасяджэннях. Партыі Збароўскага і Замойскага імкнуліся перацягнуць на свой бок ліцвінаў. Значных поспе-

хаў у гэтым дасягнулі прыхільнікі канцлера КП Яна Замойскага. Яны здолелі загітаваць на падтрымку Жыгімонта такіх сенатараў ВКЛ, як віленскага ваяводу Крыштофа Радзівіла, трокскага ваяводу Яна Глябовіча, біскупа жамойцкага Мельхіёра Гедройця, старосту жамойцкага Яна Кішку, маршалка земскага Альбрыхта Радзівіла, падскарбія земскага Тэадора Скуміна-Тышкевіча, ваяводу менскага Мікалая Сапегу і падканцлера Льва Сапегу. Аднак доўгія і напружаныя спрэчкі вакол асобы будучага гаспадара Рэчы Паспалітай прывялі да расколу палітычнай эліты дзяржавы. 19 жніўня 1587 года частка прадстаўнікоў Каралеўства без згоды на гэта паслоў ВКЛ і значнай часткі палякаў абвясціла каралём і вялікім князем шведскага каралевіча Жыгімонта. Другая частка палякаў, а таксама Мікалай Крыштоф і Юры Радзівіл, але без згоды ўсіх літвінаў, 22 жніўня абрала на пасад РП эрцгерцага Максімільяна. Прадстаўнікі Княства і частка польскіх сенатараў і паслоў склалі 25 жніўня пратэстацыю наконт расколу элекцыі і не прызналі ніводнага кандыдата за новага гаспадара РП. Перад тым, як пакінуць Варшаву, літвіны 24 жніўня асобна, бо палякі не пажадалі да гэтага далучыцца, заключылі з Княствам Маскоўскім перамір'е на 15 гадоў. Рэч Паспалітая апынулася на мяжы распаду і грамадзянскай вайны.

У пачатку кастрычніка 1587 года Максімільян разам са сваім войскам уступіў на тэрыторыю Рэчы Паспалітай і рушыў на Кракаў. Эрцгерцаг накіраваў у Княства свайго асабістага пасланніка, стольніка ВКЛ Аляксандра Пронскага, прасіў праз яго падтрымкі. Аднак прыхільнікаў сваіх ён, прынамсі, у Княстве, пачаў страчваць. Хоць у лістах і кашталян трокскі Мікалай Радзівіл, і біскуп віленскі Юры Радзівіл выказвалі сваю падтрымку эрцгерцагу, аднак, ваенных атрадаў яму на дапамогу не выслалі. Яшчэ 1 верасня віленскі ваявода Крыштоф Радзівіл у сваім універсале склікаў павятовыя соймікі на 18 верасня, а галоўны з'езд ВКЛ – на 2 кастрычніка ў Вільні. Гэты з'езд звярнуўся да польскага боку і абодвух прэтэндэнтаў. У заяве гаварылася, што элекцыю не прызналі не толькі паслы Княства, але і значная частка шляхты Каралеўства, вялікакняжацкая шляхта не збіралася прызнаваць гаспадара, навязанага ім сілай, таму маюць права ўвогуле скасаваць унію. Таксама быў прызначаны ў Вільні яшчэ адзін галоўны з'езд на 8 лістапада 1587 года.

Галоўны з'езд пастанавіў і надалей не прызнаваць ні Жыгімонта, ні Максімільяна за гаспадароў Рэчы Паспалітай. З гэтага з'езду да ўсіх станаў КП і да абодвух кандыдатаў было накірава-

на пасольства, якое складалася з 5 сенатараў і 21 шляхціца. Прадстаўнікамі сената былі Крыштоф Радзівіл, Мікалай Крыштоф і Юры Радзівіл (якія ўжо не агітавалі за Максімільяна), Мікалай Радзівіл (ваявода наваградскі) і Ян Глябовіч (глава прыхільнікаў Жыгімонта). Для гэтага пасольства з'езд прыняў спецыяльную інструкцыю з умовамі, на якіх Княства гатова было прызнаць аднаго з двух кандыдатаў за свайго вялікага князя. Такім чынам, каб быць прызнаным з боку ВКЛ, прэтэндэнт павінен сваёй прысягай зацвердзіць: захаванне ўсіх правоў і вольнасцяў Княства, прыняцце новай рэдакцыі Статута, паправы ў Трыбунале, перамір'е з ВКМ; прасілі таксама не пераследаваць тых, хто выступіў супраць на элекцыі, вырашыць пытанне з Інфлянтамі, раздаваць усе вакантныя пасады толькі літвінам (на той час у ВКЛ вакантнымі было 5 сенатарскіх урадаў, у тым ліку канцлерскі, віленскае кашталянства, а таксама пасада гетмана земскага) і г.д. Аднак пасольства гэтае сустрэлася толькі са шведскім каралевічам, а ад сенатараў у ім былі прадстаўлены толькі прыхільнікі Жыгімонта – Ян Глябовіч і Леў Сапега.

Каранацыйны сойм распачаўся 10 снежня 1587 года ў Кракаве. Афіцыйная дэлегацыя Княства прыехала на каранацыю толькі 8 студзеня 1588 г., хоць неафіцыйна ў Кракаве ўжо прысутнічалі Мельхіёр Гедройць, Ян Кішка, кашталян жамойцкі Мікалай Тальвош, Мікалай Сапега і чашнік ВКЛ Ян Пац. Узначальвалі дэлегацыю ваявода трокскі Ян Глябовіч і падканцлер Княства Леў Сапега ад сенатараў, а ад шляхты – Бенедзікт Война, Дзмітры Халецкі і іншыя. 11 студзеня дэлегаты Княства павіталі Жыгімонта, каранаванага ўжо 27 снежня, хоць і не прызнавалі яго гаспадаром. Нарады паміж прадстаўнікамі ВКЛ і Жыгімонтам III распачаліся 20 студзеня. Літвіны жадалі зацвярджэння перамір'я на 15 гадоў з Княствам Маскоўскім, якое яны заключылі на элекцыйным сойме, перадачу Інфлянтаў пад уладу Княства і зацвярджэння новай рэдакцыі Статута ВКЛ. Дасягнуць прыняцця такіх умоў было надзвычай цяжка. Жыгімонт III не хацеў выключэння Рэчы Паспалітай з барацьбы паміж Швецыяй і ВКМ, а польскія сенатары і паслы мелі свае планы ў дачыненні да Інфлянцкай зямлі, таксама не жадалі яны прыняцця новага Статута Княства, бо бачылі ў ім абмежаванне сваіх правоў. Усё ж такі, складанае знешне- і ўнутрыпалітычнае становішча Рэчы Паспалітай прымусіла Жыгімонта III, палякаў і літвінаў пайсці на кампраміс. Пытанне аб прыналежнасці Інфлянтаў было адкладзена да наступнага вальнага сойма, новы гаспадар 27 студзеня зацвердзіў перамір'е з ВКМ

на 15 гадоў і новы Статут ВКЛ, а 28 студзеня 1588 года прысягнуў на захаванне правоў і вольнасцяў Княства, а вялікакняжацкая дэлегацыя прызнала яго каралём і вялікім князем. Аднак у соймавыя канстытуцыі пастанова аб новай рэдакцыі Статута ВКЛ не патрапіла з-за апазіцыі польскага боку, які імкнуўся такім чынам паставіць пад сумнеў законнасць новага зводу законаў Княства. Тое, што на каранацыйным сойме літвіны сутыкнуліся ў сваіх справах з супраціўленнем польскага боку, пацвярджае і ліст падканцлера ВКЛ Льва Сапегі да ваяводы віленскага і гетмана польнага Крыштофа Радзівіла ад 31 студзеня 1588 года. У сваім лісце Л.Сапега распавядае, што калі 27 студзеня каля восьмай гадзіны ўвечары на сойм прыйшла вестка аб перамозе Яна Замойскага над войскамі Максімільяна і захопе эрцгерцага ў палон, то палякі вельмі заганарыліся гэтым. Яны сталіся фанабэрыстымі ў дачыненні да літвінаў і заяўлялі, што калі б гэтая навіна прыйшла ім перад прысягай Жыгімонта III, то не дазволілі б Княству ні новага Статута, ні міра з Маскоўскім Княствам, ні права на валоданне паловай Інфлянцкай зямлі.

Пасля сваёй каранацыі Жыгімонт III склікаў з'езды сенатараў Малой Польшчы ў Пятркове, Вялікай Польшчы ў Любліне і Княства ў Берасці. Такім чынам новы гаспадар Рэчы Паспалітай імкнуўся ўлагодзіць супярэчнасці, якія засталіся пасля яго каранацыі, з палітычнымі элітамі сваёй дзяржавы. І хоць з'езд у Берасці, які пачаўся 28 лістапада 1588 года, не зняў усіх супярэчнасцяў, напрыклад, у справе падзелу Інфлянтаў паміж ВКЛ і КП, але ўласны ўдзел Жыгімонта III Вазы ў гэтых трох з'ездах забяспечыў шлях да будучай пацыфікацыі на вальным сойме РП 1589 года. Вальны сойм адмяніў жорсткія захады каранацыйнага сойма супраць тых, хто падтрымаў эрцгерцага Максімільяна, была абвешчана амаль поўная амністыя праціўнікам абрання Жыгімонта III на пасад Рэчы Паспалітай.

Такім чынам, крызіс 1587–1589 гадоў яскрава паказаў асобнасць Вялікага княства Літоўскага ад Каралеўства Польскага ў дзяржаўным жыцці федэрацыі. Кіраўнічая эліта ВКЛ падчас усяго перыяду бескаралеўя не ўцягвалася ва ўнутрыпольскія канфлікты, а вяла самастойную палітычную гульню з мэтай забеспячэння ўласных знешне- і ўнутрыпалітычных інтарэсаў. Прычым, пры розных поглядах на асобу будучага гаспадара Рэчы Паспалітай, усе палітычныя сілы Княства былі адзіныя ў абароне агульнадзяржаўных прыярытэтаў ВКЛ. Заключэнне перамір'я з Вялікім княствам Маскоўскім на 15 гадоў, якое здымала самую галоўную

знешнюю небяспеку для ВКЛ, і зацвярджэнне новага Статута, які юрыдычна ўмацаваў самастойнасць Княства як суб'екта федэрацыі, былі галоўнымі дасягненнямі арыстакратыі беларуска-літоўскай дзяржавы ў часе трэцяга бескаралеўя ў Рэчы Паспалітай.

*А.І. Шаланда* *г. Гродна*

## ПАГАНСКІЯ ВЫТОКІ КЛЕЙНАВЫХ ГЕРБАЎ ШЛЯХТЫ ВКЛ

На старажытных беларускіх землях, як і ўвогуле на ўсёй Русі, здаўна існаваў шырока распаўсюджаны звычай змяшчаць на розных прадметах і рэчах *«знамёны»* ці знакі ў выглядзе крыжоў, стрэлаў, рысак і іх спалучэнняў. Іх прастата была абумоўлена практычнымі патрэбамі, бо ў бортніцтве падобныя знакі лёгка выразаліся або вырубаліся на дрэве, у ганчарстве – выціскаліся на гліне, у жывёлагадоўлі – выпякаліся на скуры. У залежнасці ад спосабу, якім яны выраблялiся, *«знамёны»*-знакі часта называліся *«рэзамі»*, *«рубяжамі»* або *«пятнамі»*. Верагодна, што менавіта аб іх згадваў чарнарызец Храбр, калі пісаў (канец IX–пачатак X ст.): *«Прежде убо словене неймеаху писменъ, ну чертами и резанми гадааху погани сущи»*. Назва *«клейны»* замацавалася за знакамі даволі позна і была запазычана з геральдыкі, дзе выкарыстоўваўся блізкі да яе тэрмін *«кляйнот»*.

Паводле беларускага даследчыка Анатоля Цітова, прычынай з'яўлення знакаў-клейнаў была неабходнасць ідэнтыфікацыі ўладальнікаў пазначанай маёмасці, у тым ліку і зямельнай, падкрэсленне іх уласніцкіх правоў на яе. Паходжанне іх дакладна не высветлена – адныя даследчыкі лічылі падобныя знакі літарамі кірыліцы, глаголіцы або лацініцы, другія, сярод якіх і шэраг сучасных беларускіх гісторыкаў, – германскімі ці нарманскімі рунамі. Адначасова выказвалася думка, што знакі ўяўлялі сабой схематычныя, геаметрызаваныя формы рэалістычных выяў жывёл, якія некалі былі татэмамі родаў. У сувязі з гэтым некаторыя з гісторыкаў схільны бачыць у знаках-трызубах Рурыкавічаў выяву сокала. Аднак слабасць згаданых меркаванняў у тым, што, па-першае, уся разнастайнасць знакаў-клейнаў не ўпісваецца ў нейкі канкрэтны алфавіт, па-другое, яны часта маглі спалучацца з рэалістычнымі выявамі, прычым адным з прыкладаў такога спалучэння з'яўляецца выява трызуба Рурыкавічаў з ...сокалам і ружай.

Знакі-клейны па сваім характары спачатку былі родавымі, потым – сямейнымі і, нарэшце, асабістымі. Лічыцца, што апошняя фаза наступіла толькі ў XV ст. Аднак параўнанне шматлікіх клейнаў на так званых *«драгічынскіх»* пломбах, якія датуюцца XII–XIV ст., а таксама знакаў княжацкай дынастыі Рурыкавічаў X–XI ст., сведчыць аб больш раннім з'яўленні асабістых знакаў-клейнаў. Лагічна дапусціць, што яны з'явіліся разам са з'яўленнем у славян прыватнай уласнасці, калі ўзнікла патрэба, ва ўмовах адсутнасці пісьменнасці, у яе пазначэнні. У такім выпадку знакі-клейны маюць такое ж самае паходжанне, што і крыжыкі замест подпісу ў пазнейшыя *«пісьменныя»* часы.

Знакі-клейны на Русі мелі даволі высокі прававы статус, аб чым сведчаць згадкі аб *«пятнах»* і *«знамёнах»* у *«Рускай Праўдзе»*. Паводле аднаго з артыкулаў гэтага старэйшага зборніка законаў: *«Аже [кто] разнаменаеть борть, то 12 гривен...»*. Як з яго вынікае, замах на ўладальніцкі знак прыроўніваўся замаху на прыватную ўласнасць. Распазнаўчаўласніцкі характар знакаў-клейнаў, абараняемых законам, спрыяў іх шырокаму выкарыстанню на розных прадметах і рэчах, у тым ліку на манетах, пячатках і пломбах. Распаўсюджанне на Русі пісьменнасці ў форме кірыліцы ператварыла знакі ў своеасаблівую сімволіку, якая добра ўпісалася ў новыя культурныя рэаліі. Больш таго, самыя літары паслужылі асновай для новых знакаў. Як сведчаць *«драгічынскія»* пломбы, часам кляйно і літара выкарыстоўваліся разам. Відавочна, што апошняя выконвала ў падобных выпадках ролю ініцыяла, дапамагаючы знаку ў выкананні яго галоўнай функцыі – ідэнтыфікацыі асобы ўласніка.

У X–XIII ст. у старажытных рускіх княствах на тэрыторыі сучаснай Беларусі (Полацкае, Віцебскае, Менскае, Гарадзенскае і інш.) панавалі прадстаўнікі розных галін княжацкай дынастыі Рурыкавічаў. Яны карысталіся шматлікімі варыянтамі трызубаў і двухзубаў, характар змен якіх дазваляе прасачыць іх эвалюцыю. Пры параўнанні трызубаў полацкіх Ізяславічаў звяртае на сябе ўвагу такая акалічнасць, як знікненне ніжняй часткі знака князя Ізяслава Уладзіміравіча ў яго нашчадкаў. Акрамя гэтага, трэба адзначыць два тыпы трызубаў: без крыжа (галіна ад Барыса-Рагвалода) і з крыжам (галіна ад Глеба Менскага). У сувязі з гэтым трызубец з папярочкай, якая злучае зубцы ва ўнутранай яго частцы, на пломбе, знойдзенай у Віцебску, хутчэй за ўсё, належаў не нейкаму невядомаму наўгародскаму пасадніку Канстанціну, як лічыцца сёння, а вядомаму з крыніцаў полацкаму і віцебскаму князю Канстанціну Бязрукаму (канец XIII ст.).

Прыняцце хрысціянства Руссю з Візантыі (988 г.) не магло не адбіцца на выглядзе трызубаў і двухзубаў Рурыкавічаў. Аб гэтым сведчыць з'яўленне ў знаках-клейнах крыжоў. На беларускіх землях гэты працэс распачаўся ўжо ў XI ст.

Баярства старажытных рускіх княстваў таксама карысталася асабістымі знакамі-клейнамі. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць так званых *«драгічынскіх»* пломбаў. На жаль, ідэнтыфікацыя іх амаль што немагчыма, бо звесткі аб асабовым складзе баярства старажытных рускіх княстваў, і асабліва тых, што былі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, вельмі бедныя і нераспрацаваныя. У крыніцах, якія асвячаюць падзеі XI–XIII ст. у Полацкім, Тураўскім, Смаленскім княствах або ў Берасцейскай зямлі, баяры згадваюцца эпізадычна і толькі з імя – Эсцін, Вадзіла, Ціт, Плос, часам з прозвішчам, утвораным ад назвы горада – Пракоп Палачанін, і зусім рэдка – з імя і імя па бацьку –Жыраслаў Яванкавіч. Тым не менш, нават такі кароткі пералік імёнаў сведчыць, што баярства на беларускіх землях складалася з трох асноўных этнічных групаў: рускага (Ціт, Пракоп, Жыраслаў), літоўскага (Вадзіла, верагодна, Плос) і варажскага, ці нарманскага (Эсцін). Апошняя акалічнасць можа сведчыць на карысць рунічнага паходжання нейкай часткі знакаў-клейнаў.

У канцы XII–XIII ст. на беларускіх землях узмацніліся заходнееўрапейскія культурныя ўплывы, у тым ліку і геральдычныя. Апошнія былі звязаныя са з'яўленнем нямецкага рыцарства ў Лівоніі і Прусіі. Актыўныя дзеянні тэўтонцаў у Прусіі прывялі да таго, што яна з 1230 па 1283 г. была цалкам заваявана. Лагічным працягам для агрэсіі лічыліся землі паганскай Літвы і праваслаўнай Русі, што паскорыла іх аб'яднанне ў рамках новага дзяржаўнага ўтварэння – Вялікага княства Літоўскага і Рускага.

Знаёмства з геральдыкай і сфрагістыкай сваіх заходніх суседзяў, асабліва Тэўтонскага Ордэна, спрыяла складванню ў ВКЛ у другой палове XIII–XIV ст. уласных геральдычных эмблем заходнееўрапейскага ўзору. Да заходніх эмблематычных запазычанняў трэба аднесці шырока распаўсюджаныя ў сфрагістыцы феадальных вярхоў ВКЛ свецкія (партрэтныя) выявы князя на троне, на кані і пешага, выявы льва і асобна ўзятага шчыта. Аднак моцны ўплыў унутры ВКЛ культуры рускіх зямель таксама адбіўся на пячатках феадалаў літоўскага і жамойцкага паходжання, пра што сведчаць не толькі рускія кірылічныя надпісы, але і напячаткавыя выявы клейнавага і ўсходневізантыйскага тыпаў.

З'яўленне першых гербаў у ВКЛ было непасрэдна звязана са знешнепалітычнымі падзеямі канца XIV ст., а менавіта з заключэннем у 1385 г. Крэўскай уніі. Аб'яднанне ВКЛ і Польшчы пад уладай караля Уладзіслава II Ягайлы (1386–1434) спрыяла ўзмацненню заходніх геральдычных уплываў. Працэс збліжэння ВКЛ і Польшчы, распачаты ў 1385 г. у Крэве і замацаваны Віленска-Радамскай уніяй 1401 г., адкрыў шлях да фармавання мясцовага шляхецкага саслоўя на ўзор польскага. Непасрэдныя кантакты паміж польскай шляхтай і баярствам ВКЛ, якія адбываліся падчас сумесных акцый – палітычных і вайсковых – спрыялі знаёмству апошніх з прававым статусам, звычаямі, культурай і геральдыкай польскага рыцарства.

У 1413 г. у Горадлі падчас падпісання чарговай уніі паміж ВКЛ і Польшчай наданне на польскі лад шляхецкіх правоў баярам-католікам з Літвы і Жамойці было замацавана прыняццем апошнімі польскіх шляхецкіх гербаў. Паводле Гарадзельскага прывілею, 47 польскіх шляхецкіх родаў прынялі да сваіх гербаў 47 літоўскіх і жамойцкіх баяраў, прыняўшых каталіцтва, і тым самым здзейснілі акт адопцыі апошніх у свае геральдычныя роды.

Польскія шляхецкія гербы бліжэй пазнаёмілі беларускіх і літоўскіх князёў і баяраў з заходнімі геральдычнымі правіламі і ўзорамі, прынеслі з сабой усе тыя характэрныя асаблівасці, якія былі ўласцівыя польскай геральдыцы. Паводле А.Цітова, Гарадзельскі прывілей замацаваў пазіцыі класічнай геральдыкі ў ВКЛ і ўнёс новы струмень у працэсы гербатворчасці на беларускіх і літоўскіх землях. Важнай акалічнасцю было тое, што польскія гербавыя выявы, нададзеныя ў 1413 г., адносіліся да двух тыпаў: заходнееўрапейскага і клейнавага. Такія гербы, як *«Ліс»*, *«Абданк»*, *«Багорыя»* і іншыя, уяўлялі сабой геральдычна апрацаваныя напячаткавыя знакі-клейны. Іх адрозненнем ад напячаткавых знакаў і выяў баярства ВКЛ была толькі геральдычная форма. У сувязі з гэтым пасля Гарадзельскага сойма ў ВКЛ паскараецца працэс геральдызацыі, на першай стадыі якога адбывалася змяшчэнне мясцовага эмблематычнага матэрыялу на геральдычных тарчах з далейшым геральдычным афармленнем праз далучэнне гелмаў, кляйнотаў, карон і намётаў. У аснове геральдызацыі ляжала тое, што функцыянальна пячаткі з клейнамі і выявамі ўсіх астатніх князёў і баяраў ВКЛ адпавядалі пячаткам з польскімі гербамі, адаптаваных у Горадлі. Па сутнасці, на базе пячаткі, якая стала выконваць функцыю юрыдычнага ідэнтыфікатара асобы, напячаткавы клейнавы знак ці выява аб'ектыўна прыраўноўваўся да

гербавай выявы. Каб яна сапраўды стала гербам, дастаткова было пакласці яе на геральдычную тарчу. Такім чынам, клейнавым гербам з'яўляецца знак-кляйно родапачынальніка, аформлены паводле геральдычных правілаў і перадаваемы ў спадчыну ў сям'і па прамой лініі. У сувязі з гэтым для клейнавых гербаў характэрны дзве супрацьлеглыя з'явы: спадчыннасць і зменлівасць клейнавых гербавых выяў у пабочных галінах. Варта адзначыць, што ў 20–30-я г. XV ст. працэс геральдызацыі ахапіў у асноўным праваслаўных князёў і баяраў ВКЛ, што было выклікана дыскрымінацыйнымі пунктамі Гарадзельскага прывілея 1413 г.

У выніку працэсу геральдызацыі, які ў другой палове XV–першай палове XVI ст. ахапіў напячаткавыя знакі-клейны і выявы беларускіх і літоўскіх князёў і баяраў, з'явілася вялікая колькасць клейнавых гербаў, якія склалі аснову шляхецкай геральдыкі ВКЛ. Ф.Пекасіньскі тлумачыў гэтую з'яву тым, што «...*ruch kolonizacyjny szlachty małopolskiej na Ruś rozpoczął się już za czasów króla Kazimirza Wielkiego, to jest w chwili, kiedy prawidła heraldyki zachodnio-europejskiej poczęły do nas witać*». На нашу думку, уплыў польскай шляхецкай каланізацыі на распаўсюджанне клейнавых гербаў у ВКЛ тут яўна перабольшаны. Усё было куды прасцей – геральдычныя веды і правілы з Захаду (у тым ліку і праз Польшчу) дасягнулі беларускіх і літоўскіх зямель значна пазней, чым польскіх – у канцы XIV–першай палове XV ст., а таму і працэс геральдызацыі тут быў запознены. У Расію (праз ВКЛ) яны патрапілі яшчэ пазней – у канцы XVII–пачатку XVIII ст.

У другой палове XVI–першай палове XVII ст. геральдызацыя ў ВКЛ уступіла ў стадыю далейшага ўдасканалення клейнавых гербаў. Яна ўключала ў сябе далучэнне такіх дадатковых атрыбутаў герба, як гелм, карона, кляйнот і намёт. Пры гэтым строгі парадак падобнай геральдызацыі адсутнічаў – далучаліся або адразу ўсе элементы, або, што было часцей, з пэўнымі адхіленнямі (без кароны, намёта ці кляйнота). Усе клейнавыя гербы шляхты ВКЛ можна падзяліць на чатыры асноўныя тыпы: 1) крыжовы, 2) стрэлавы, 3) крыжастрэлавы, 4) падстававы.

Першы крыжовы тып клейнавых гербаў уключае ў сябе ўсе шматлікія варыяцыі крыжоў на самых розных клейнавых асновах. Сярод асноўных варыянтаў клейнавых гербавых крыжоў вылучаюцца: а) просты, чатырохканцовы, б) падвойны, шасціканцовы, в) патройны, васьміканцовы, г) палутарны, пяціканцовы, д) няпоўны, ці ўсечаны, трохканцовы, е) раздзёрты, ж) касы (накшталт «*Андрэеўскага*»), з) свастыка.




Тып І/а:
Герб Багдана Сямёнавіча Скіпарава, зямяніна Гарадзенскага павета, 1543.



Тып ІІ/а:
Герб Міхала Яцыніча, падсудка земскага Слонімскага, 1594.




Тып ІІІ/а:
Герб Адама Паўла Макаровіча, паборцы земскага Гарадзенскага павета, 1674.




Тып IV/г:
Герб Грыгора Пугача, дзяржаўцы Супрасльскага манастыру, 1610.

Стрэлавы тып клейнавых гербаў складаўся з гербавых знакаў-клейнаў, у аснове якіх дакладна прасочваецца страла. Сярод іх можна вылучыць такія два асноўныя віды, як простыя (з адным вастрыём) і складаныя (з двума і больш вастрыямі), якія ў сваю чаргу, падзяляюцца на: а) поўныя, б) няпоўныя, в) раздзёртыя.

Прамежкавы стан паміж крыжовымі і стрэлавымі клейнавымі гербамі займае крыжастрэлавы тып. Ужо з назвы вынікае, што ў яго аснове ляжыць спалучэнне крыжа і стралы. Крыжастрэлы як найбольш папулярны сярод шляхты ВКЛ тып гербавых клейнавых выяў сустракаюцца ў самых розных камбінацыях і варыянтах. Сярод іх трэба вылучыць: а) поўныя, б) няпоўныя, в) раздзёртыя.

Да падстававага тыпу клейнавых гербаў адносяцца ўсе знакі-клейны, якія не ўтрымліваюць у сабе крыжоў і стрэлаў. Адначасова яны з'яўляюцца тымі клейнавымі падставамі ці асновамі, на якіх змяшчаліся ўсе тры вышэйзгаданыя тыпы гербавых знакаў. Гэта найбольш шматлікая група гербавых клейнавых выяў і настолькі разнастайная, што наўрад ці можа быць абмежавана нейкімі рамкамі. Зыходзячы з іх вонкавага падабенства на нейкі прадмет, сімвал ці эмблему, да найбольш распаўсюджаных падстававых клейнавых гербаў трэба аднесці: а) літарападобныя, у аснове якіх – літары кірыліцы ці лацініцы, або знакі, падобныя на іх, б) калюмнападобныя, уяўляючыя сабой розныя варыянты трызубаў і двухзубаў, в) геаметрычныя, накшталт кола, дугі, трохкутніка ці чатырохкутніка, г) урубападобныя, якія выйшлі з насечак і ўяўлялі сабой розныя па колькасці і свайму напрамку крэскі, і іншыя. Яны маглі выкарыстоўвацца як у чыстым выглядзе, так і ў розных спалучэннях паміж сабой.

У другой палове XVI–першай палове XVII ст., як сведчыць аналіз гербаў шляхты ВКЛ, клейнавая геральдыка дасягнула свайго найвышэйшага росквіту. Галоўным матэрыялам для яе паслужылі знакі-клейны, якія склаліся яшчэ ў паганскі непісьменны і хрысціянскі пісьменны часы. У сувязі з гэтым клейнавыя гербы можна разглядаць як вынік сінтэзу ў канцы XIV–першай палове XVI ст. заходнееўрапейскіх геральдычных уплываў і мясцовага эмблематычнага матэрыялу.

*Валерый Шэйфер* *г. Гродна*

## УЗАЕМААДНОСІНЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XV – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XVI ст. У АЦЭНЦЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Праблема ўзаемаадносін Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы даволі складаная і з'яўляецца адной з частак гісторыі міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе. З другой паловы XV ст. Маскоўскае Вялікае княства набывае адчувальную моц. У канцы XV ст. пачынаецца серыя маскоўска-літоўскіх войнаў, у выніку якіх ВКЛ страціла прыкладна чвэрць сваёй тэрыторыі і становішча гегемона ва ўсходнеславянскім рэгіёне [37, с.176]. Зразумела, гэтыя падзеі мелі вялікі ўплыў на лёсы Беларусі, Расіі, у цэлым Усходняй Еўропы і не маглі не знайсці адлюстравання на старонках прац гісторыкаў, публіцыстаў, літаратараў.

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі цікавасць да гэтага пытання ўнікла ў першыя перабудовачныя гады і набыла асаблівую актуальнасць у пачатку 90-х г. пасля прыняцця Дэкларацыі аб незалежнасці Беларусі. Сярод першых публікацый папулярнага характару, прысвечаных або звязаных з ёй, варта назваць артыкулы Генадзя Сагановіча, Міхася Ткачова, Анатоля Грыцкевіча і інш. Характэрнай іх рысай быў разгляд пытання з пункту гледжання суб'ектнай гісторыі Беларусі. Агульны настрой беларускай гістарыяграфіі пачатку 90-х гадоў адлюстроўвае шэраг артыкулаў у зборніку «100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі» [12; 42–4; 51; 69; 70].

Першым спецыяльным, хоць і навукова-папулярным, даследаваннем, звязаным з тэмай маскоўска-літоўскіх узаемаадносінаў, стала праца Генадзя Сагановіча «Айчыну сваю баронячы», вы-

дадзеная ў 1992 г. у серыі «Нашы славутыя землякі» [52], у якой падзеі разглядаюцца ў кантэксце жыцця і дзейнасці князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага. Супрацьстаянне Масквы і Вільні бачыцца аўтарам як абарона Вялікага княства Літоўскага ад экспансіі ўсходняга суседа. Паводле Сагановіча, паражэнне на р.Ведрашы ў 1501 г. «... сталася тым зломам, які пазначыў пачатак новых часоў у супрацьстаянні дзвюх найбуйнейшых дзяржаў Усходняй Еўропы». Бітва пад Оршай, на думку аўтара, абараніла суверэнітэт краіны [53, с. 31, 24, 44]. Гэтай праблематыцы прысвечаны і шэраг іншых прац даследчыка [52 – 61].

Вывучэннем праблемы маскоўска-літоўскіх узаемаадносінаў займаўся таксама Анатоль Грыцкевіч. Гэта тэма закранута ў яго артыкулах, прысвечаных палітычнаму становішчу ВКЛ у часы Ф. Скарыны, гісторыі геапалітыкі Беларусі, Аршанскай бітве ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» і ў «Беларускай энцыклапедыі». У асноўных ацэнках даследчык згаджаецца з поглядамі Сагановіча [15 –22].

Адносіны паміж Масквой і Вільняй мелі значны розгалас у іншых краінах. Міжнародным аспектам гэтай праблемы прысвечаны даследаванні Уладзіміра Канановіча, Алега Дзярновіча, Барыса Сідарэнкі [30–33, 24, 25, 65–67].

Кандыдацкая дысертацыя Уладзіміра Канановіча стала першым спецыяльным навуковым даследаваннем у галіне маскоўска-літоўскіх і маскоўска-крымскіх узаемаадносінаў у дадзены перыяд [31]. Аўтар падкрэслівае, што «асноўнай праблемай у палітычных дачыненнях Вільні і Масквы напрыканцы XV і ў пачатку XVI ст. з'яўлялася т.зв. «спадчына Рурыкавічаў», пад якой разумеліся землі, якія ў X – XII ст. уваходзілі ў сістэму княстваў Русі. У 80-я г. XX ст. старая сістэма міжнародных адносінаў ва Усходняй Еўропе, заснаваная на гегемоніі ВКЛ, была зруйнавана. «Новы у гэтым рэгіёне парадак грунтаваўся на супрацьстаянні Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскай дзяржавы пры актыўным умяшанні Крымскага ханства і іншых дзяржаў у іх справы». Галоўным для дыпламатыі ВКЛ у тыя часы было захаваць status-quo, для маскоўскай жа – абгрунтаваць далучэнне зямель [30, с.114, л. 13; 31, с. 14].

Артыкулы А. Дзярновіча распавядаюць пра ролю апостальскай сталіцы ў маскоўска-літоўскіх узаемаадносінах і працэс стварэння «вялікай антыягелонаўскай кааліцыі ў XVI ст.» [24;25]. Даследчык адзначае, што «апостальскую сталіцу не магло не турбаваць адцягненне сіл свайго патэнцыяльнага саюзніка па

антыасманскай кааліцыі – ВКЛ – на барацьбу з Маскоўскай дзяржавай. Акрамя таго, існавалі пэўныя надзеі і на ўдзел у кааліцыі самой Масквы». Менавіта таму ў Рыме спрабавалі прымірыць гэтыя дзве дзяржавы. Габсбургская імперыя і Масква ў канцы XV – першай і амаль палове другога дзесяцігоддзя XVI ст. з'яўляліся саюзнікамі. Гэтая кааліцыя рэальна склалася да 1514 г. Акрамя Масквы і Імперыі, у яе ўваходзілі яшчэ пяць краін: Данія, Брандэнбург, Валахія, Саксонія і Тэўтонскі ордэн. Накіравана яна была супраць Кароны Польскай і ВКЛ [25, с. 269, 270; 24, с. 173].

Б. Сідарэнка даследуе ролю Магілёва ў сістэме ўзаемаадносінаў ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы, Старадубскую вайну (1534 – 1537г.), дыпламатыю Вялікага княства Літоўскага дадзенага перыяду [65-67]. Як і Уладзімір Канановіч, ён лічыць, што «аб'ядначая палітыка Івана III істотна змяніла геапалітычнае становішча ва Усходняй Еўропе. Па прычыне актывізацыі Масквы ў пачатку XVI ст. адбываецца канчатковае перамяшчэнне знешнепалітычных акцэнтаў ВКЛ на ўсход. Таму асноўнымі задачамі Вялікага княства ў гэтым кірунку былі: вяртанне захопленых Маскоўскай дзяржавай зямель і прадухіленне далейшых захопаў [67, с. 31].

Усяго за перыяд з 1500 па 1537 г. ВКЛ і Маскоўская дзяржава абмяняліся больш за 50 пасольствамі і візітамі дыпламатаў [67, с.42–43]. Даследчык лічыць, што маскоўска-літоўскія войны значна паўплывалі на ўсё грамадска-палітычнае жыццё Магілёва. Да пачатку XVI ст. з адноснай глыбінкі ён ператвараецца ў прымежны горад. Мірныя перадышкі выкарыстоўваліся вельмі прадуктыўна. У Магілёве хутка ішло будаўніцтва новага замка, якое было скончана да 1526 г. [65, с. 45; 66, с. 38].

Адным з важнейшых пунктаў маскоўска-літоўскіх узаемаадносінаў быў Смаленск. Аўтар артыкула, прысвечанага гэтай праблеме, Ігар Царык прыйшоў да высновы, што прычына ўпартага супраціўлення смалянаў маскоўскаму войску крылася ў выніках этнастваральных працэсаў на землях ВКЛ, калі насельніцтва дэферэнцыявала сваю пазіцыю ў адносінах да ўлады ў катэгорыях – «свая» – «чужая». Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца пазіцыя смаленскага праваслаўнага епіскапа Варсанофія, які арганізаваў змову ў горадзе супраць маскоўскага намесніка і паведаміў аб ёй гетману найвышэйшаму ВКЛ К. Астрожскаму са згодай адчыніць яго войску гарадскую браму [75, с. 42, 43, 46].

Даволі шмат публікацый (у тым ліку папулярнага і прапагандысцкага характару) закранаюць адну з важнейшых падзей мас-

коўска-літоўскіх войнаў – Аршанскую бітву 1514 г. Гэта артыкулы Г.Сагановіча, А.П. Грыцкевіча, Л.Міхайлоўскай, В.Баранава, Л.Прывалава, М.Купавы, А.Класкоўскага, А.Трусава, У.Арлова і інш.[1-5, 8, 18, 20, 22, 26, 36, 39, 40, 45, 46, 50, 52, 60, 62, 72-74]. Не лічачы магчымым гаварыць пра кожны з іх, трэба сказаць, што некаторыя з іх з'явіліся сродкам выказвання сваёй палітычнай пазіцыі праз адносіны да Аршанскай бітвы і не маюць значнай навуковай вартасці.

Пытанне пра становішча маскоўскіх вязняў, якія апынуліся ў ВКЛ пасля Аршанскай бітвы, разгледзеў у сваім артыкуле М.К. Кошалеў [37]. Адзначаецца, што вязні размяшчаліся па гарадах ВКЛ, найбольш радавітых адсылалі ў Польшчу, Чэхію і г.д. Іх наяўнасць у Вялікім Княстве была «казырнай картай» у перамовах з Маскоўскай дзяржавай аб вяртанні захопленых той земляў [37, с. 178, 182] і г.д.

Ролю Крымскага ханства і Клецкай бітвы ва ўзаемаадносінах ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы вывучалі Віктар Літвін, Васіль Воронін, Андрэй Блінец [9, 41, 6].

Самай адчувальнай паразай для крымчакоў была Клецкая бітва ў жніўні 1506 г. Па гэтай прычыне яна выклікае асаблівую ўвагу даследчыкаў. Напрыклад, В.Літвін лічыць, што гэтая бітва паклала канец буйным паходам татараў на Літву [41, с. 19]. Даследчык падрабязна апісаў ход бітвы і яе прычыны. А. Блінец паспрабаваў удакладніць яе дэталі. Літвін сцвярджае, што яна адбылася на паўночнай ускраіне сучаснага Клецка не 6, а 5 жніўня 1506 г., прыводзіць схему. Колькасць татарскага войска, якое прымала ўдзел у дадзеным набезе, вызначана ім як 7-8 тыс., 5 тыс. з іх маглі ўдзельнічаць у Клецкай бітве [6, с. 28-31]. В. Воронін апублікаваў малавядомую крыніцу, якая датычыцца Клецкай бітвы: ліст Міхала Глінскага да вармійскага біскупа Лукаша Ватцэнродэ і пасланне польскага караля і вялікага князя літоўскага Аляксандра Казіміравіча да жыхароў г. Гданьска [9].

Праблему нацыянальнай і канфесійнай ідэнтыфікацыі насельніцтва ВКЛ разглядаюць Георгій Галенчанка, Павел Лойка [11, 42].

Вызначэнню прававога становішча праваслаўнай царквы ў ВКЛ у XV – XVI ст. прысвечаны артыкул А.Р.Дзянісавай [23]. Аўтарка гаворыць, што на працягу XV і сярэдзіны XVI ст., нягледзячы на пашырэнне сферы ўплываў каталіцтва, тон у грамадскім жыцці ідэалогіі, культуры задавала праваслаўная царква. Аднак прэстыж яе значна знізіўся ў выніку злоўжыванняў патра-

нацкім правам. Вінаватыя ў гэтым, з аднаго боку, правячыя колы ВКЛ, якія ставілі на пасады нават свецкіх асоб і асоб іншага веравызнання, а з другога – праваслаўнае духавенства, якое скарыстоўвала гэтыя злоўжыванні [23, с. 7-9].

Серыю артыкулаў, прысвечаную вялікім князям літоўскім, напісаў У.Старасценка [68-70]. Гісторыі роду Глінскіх і мецяжу Міхала Глінскага прысвяціў свой артыкул Вячаслаў Насевіч [48]. Змене межаў Беларусі на працягу ўсёй гісторыі прысвяцілі сваю працу Леў Казлоў і Анатоль Цітоў [29]. Пытанне маскоўска-літоўскіх узаемаадносінаў закранаецца і ў працы Уладзіміра Арлова «Таямніцы Полацкай гісторыі» [2]. Гістарыяграфіі гісторыі ВКЛ прысвечаны артыкулы Дзмітрыя Карава [34, 35], Валерыя Бобышава і Алега Яноўскага [7]. Сяргей Салей прысвяціў свой артыкул пытанням усходняга і паўднёвага кірунку знешняй палітыкі ВКЛ [63, 64]. Дадзеная праблема не магла застацца па-за ўвагай і абагульняючых прац. Напрыклад, аўтары «Нарысаў па гісторыі Беларусі» лічаць войны гэтага перыяду паміж дзяржавамі «агрэсіяй усходняга суседа пад ідэалагічным вэлюмам далучэння праваслаўнага насельніцтва да аданаверцаў, вяртання да былога адзінства Кіеўскай Русі» [47, с. 130].У першай частцы навучальнага дапаможніка для ВНУ 1998 г. выдання па гісторыі Беларусі яны разглядаюцца як барацьба двух цэнтраў аб'яднання ўсходнеславянскіх земляў, якія «не маглі не сутыкнуцца». І ў гэтым супрацьстаянні Маскоўская дзяржава аказалася мацнейшай [14, с. 117]. У асноўных момантах з гэтым згаджаюцца аўтары «Гісторыі Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён» І.І. Коўкель і Э.С. Ярмусік [27] і калектыў гродзенскіх аўтараў 1 ч. навучальнага дапаможніка па гісторыі Беларусі, у якім разглядаемыя праблемы раскрыты найбольш поўна [13].

Мікола Ермаловіч у сваёй апошняй кнізе «Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае» таксама закранаў гэтую тэму. Ён вызначаў дзеянні маскоўскага боку як агрэсію. Аўтар даволі падрабязна апісаў падзеі войнаў паміж дзяржавамі і спробы заключыць мірныя дамовы. Па яго меркаванні, часам, які пазначыў перавагу Масквы, быў час вялікага князя Аляксандра [27, с. 275, 276].

Філасофскія праблемы маскоўска-літоўскага супрацьстаяння разглядае Сямён Падокшын. Ён лічыць, што «самадзяржаўна-вялікадзяржаўная ідэалогія вызначыла гістарычную практыку Расіі, яе ўнутраную і знешнюю палітыку, у тым ліку і адносіны з ВКЛ. Усе войны, якія вяла Руская дзяржава супраць Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, уся дзяржаўна-царкоўная палі-

тыка, у тым ліку адносіны да ўніі, яе культурныя сувязі з Захадам і г.д. былі абумоўлены прынцыпамі гэтай ідэалогіі...» [49, с. 25, 29-32].

Такім чынам, сучасная беларуская гістарыяграфія маскоўска-літоўскіх узаемаадносінаў даволі разнастайная. Важна, што тэма звярнула на сябе ўвагу прафесійных гісторыкаў. Гэта павінна дазволіць адысці ад перабольшаных і палярызаваных ацэнак і выпрацаваць навуковы погляд на гэтую праблему.

*Р.Б.Гагуа* *г. Пинск*

## ИСТОЧНИКИ СРАЖЕНИЯ ПРИ ГРЮНВАЛЬДЕ

Грюнвальдская битва, значение которой в истории Беларуси трудно переоценить, нашла отражение во многих хрониках, созданных в средневековой Европе. Большей частью их авторы ограничивались лаконичными записками, констатирующими факт сражения и его результат. Ярким примером такого сообщения является записка от 1410 г. в Торуньской хронике, из которой мы узнаем, что «в тот же год (в праздник Рассеяния Апостолов) произошел бой, и наши пруссы бежали и погибли наши, и пали господин магистр, маршал, великий комтур, казначей и цвет всего Ордена. Немногие выбились из строя, и из них некоторые схвачены, многие же из них, кроме тех, о которых уже говорилось, обратились в бегство. После этого король через несколько дней к Мальборку двинулся со всей своей армией и в день Святого Якуба под Мальборком стал». Даже письма Ягеллы, написанные непосредственно по Грюнвальду, не дают нам каких-либо существенных сведений о произошедшем. В письме к своей жене от 16 июля 1410 г. король сообщил только результат битвы и описал эпизод с двумя мечами, присланными ему и Витовту крестоносцами. Некоторыми хронистами приводятся данные по численности войск, участвовавших в сражении, о потерях с той либо другой стороны, порой откровенно фантастические. Например, продолжатель любекской хроники Детмара исчисляет польско-литовскую армию в 5 млн человек. Магдебургская шеффенская хроника сообщает, что общее количество павших в битве составило 630 тыс. воинов. Ложность таких сведений вполне очевидна. В то же время, наряду с подобными краткими сообщениями общего характера, было создано несколько обширных описаний сражения, которые на

данный момент являются основными источниками для его изучения. Прежде всего, это «Хроника конфликта», созданная в 1410 году в коронной канцелярии Ягеллы кем-то из непосредственных участников описываемых событий (польские историки считают, что авторами могли являться Збигнев Олесьницки или Миколай Тромба) и основанная как на документальном материале, так и на собственных наблюдениях. Полная версия хроники не сохранилась, но до наших дней дошел ее сокращенный вариант, написанный неизвестным лицом в первой половине XV века при подготовке речи по поводу годовщины победы при Грюнвальде. Короткая редакция содержит информацию о передвижениях польско-литовских сил в Пруссии от 24 июня 1410 г. до битвы включительно и краткое описание военных действий до осени 1410 г. Недостатком источника являются риторические приукрашивания, пропольские тенденции с превознесением роли Ягеллы при подаче материала и довольно неполное описание сражения. Впрочем, они не умаляют его ценности для исследования ввиду большого содержания фактографического материала.

Наиболее полное описание битвы среди хроник, созданных в орденских кругах, дает продолжение хроники Яна вон Поссильге, впрочем, также весьма поверхностное. В то же время некоторые эпизоды этот источник описывает иначе, чем другие. Кроме того, данные продолжателя Поссильге, лишенные риторических приукрашиваний и ярко выраженных проорденских тенденций в изложении, позволяют нам критически рассмотреть некоторые сообщения славянских источников, что существенно повышает ценность хроники для изучения грюнвальдских событий.

Наконец, наиболее объемный материал по сражению дает нам «История Польши» Яна Длугоша – обширный труд, созданный между 1455 и 1480 г. Длугош, родившийся через 5 лет после Грюнвальда, при написании глав, относящихся к битве и событиям того времени, широко использовал рассказы и воспоминания ее непосредственных участников, в частности, своего отца, а также дяди Бартоша, который являлся капелланом Ягеллы во время боя. Будучи с 1436 по 1455 г. краковским каноником и доверенным лицом Збигнева Олесьницкого, в этот период фактически управлявшего государством, Ян Длугош получил доступ к архивным документам коронной канцелярии, на которые опирался при создании своих трудов. Кроме того, в распоряжении его имелся полный не дошедший до нас вариант «Хроники конфликта». Существует также версия, что Длугош использовал при написании «Истории»

записи, составленные им под диктовку Олесьницкого. Как мы видим, в руках сего автора находился богатейший фактический материал, позволявший ему создать весьма подробную картину интересующего нас сражения. Однако Длугош, как и другие хронисты средневековья, не дает исчерпывающих пояснений относительно самой битвы. Посвятив ее описанию довольно много места, он при этом не указывает точное расположение армий на местности, не дает удовлетворительного описания тактики и хода боя. Данные, приводимые Длугошем о численности войск и потерях, не могут соответствовать действительности. В изложении событий наблюдается излишняя тенденциозность, вызванная патриотизмом автора, а также их провиденциально-мистическая трактовка, что вполне понятно, если учесть, что Длугош являлся лицом духовным. Все же данная версия является самым подробным и полным из ныне существующих описаний и, следовательно, и самым ценным.

Что касается непосредственных источников по изучению истории Великого княжества Литовского, то сведения о Грюнвальдской битве содержат «Хроника Литовская и Жмойтская», а также «Хроника Быховца». Первая из них, собственно, не дает нам каких-либо заслуживающих внимания данных относительно сражения, хотя некоторые, как профессиональные исследователи, так и популяризаторы истории, некритично относясь к указанному источнику, опираются на него в своих изысканиях, принимая на веру сообщения весьма сомнительного характера. Записка же из «Хроники Быховца» получила различную оценку в историографии. К примеру, известный польский историк Марьян Бискуп отнесся к ней довольно критически. В то же время многие исследователи, в т.ч. и профессор Стефан Кучиньский, в своих работах приняли некоторые данные источника, например, о наличии «волчьих ям» перед боевым построением тевтонских рыцарей. Несмотря на чрезмерное превознесение роли литовской стороны в победе при Грюнвальде, «Хроника Быховца» дает нам, пожалуй, единственную более-менее заслуживающую доверия трактовку сражения, созданную летописцем из Великого княжества Литовского. Это обстоятельство, с точки зрения автора, уже само по себе является поводом, из-за которого нельзя полностью игнорировать сведения указанного источника, сославшись на недостатки и поверхностность, присущие ему в изложении материала.

Существует также ряд источников, которые проливают свет на отдельные аспекты интересующего нас вопроса. Изданная в

1958 г. польским ученым Гурским «Banderia Pruthenorum» Яна Длугоша описывает хоругви крестоносцев, захваченные во время Грюнвальдского боя. Даны описания знамен, сведения о том, кому они принадлежали, кто возглавлял хоругвь, указаны рыцари, несшие их; количественный состав некоторых из отрядов Ордена. Работа снабжена точными цветными рисунками каждого знамени, сделанными по просьбе Длугоша краковским художником Станиславом Дуринком.

Записка от 1417 г. из хроники Эльблонга сообщает нам точное число павших в битве жителей города, что может быть использовано при подсчетах численности и потерь крестоносцев.

Совершенно по-новому позволяют взглянуть на некоторые проблемы сражения манускрипты, имеющие отношение к военному искусству данной эпохи. Так, отлично от принятой в историографии трактовки позволяет взглянуть на организацию хоругви рукописный документ, хранящийся в Главном архиве древних актов в Варшаве, согласно которому господарь Петр Арон обязался актом от 29 июня 1456 г. оказать помощь Казимиру Ягелончику, а именно выставить «400 копий, т.е., 400 вооруженных копьями всадников» (quadringenta hastas seu quadringentos in hastis equites armatos). Большинство из таких документов не опубликованы и ждут своего исследователя.

Данные о числе и происхождении наемных рыцарей со стороны Ордена содержит «Книга выплат», изданная в 1988 г. С.Экдалем.

Все же, несмотря на огромное количество письменных свидетельств о сражении, картина событий 15 июля 1410 г. до конца не выяснена. Недостатки источников не позволяют нам дать однозначный ответ на ряд важных вопросов, что вызвало множество споров в историографии, которые длятся по сей день. Фактически разрешить эти споры без привлечения каких-то новых, неизвестных пока материалов, не представляется возможным. Поэтому относительно деталей битвы историки могут пока лишь строить гипотезы, по-разному интерпретируя источники, опираясь на более ранние исследования и проводя аналогии с иными событиями из истории средневекового военного дела, но в то же время, не утверждая ничего точно и не выходя за рамки того, что их трактовка – только одна из версий, обладающая той или иной степенью вероятности.

І.А.Марзалюк г. Магілёў

# ДА ПЫТАННЯ АБ ПЕРЫЯДЫЗАЦЫІ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ ПРАЦЭСАЎ НА ЗЕМЛЯХ БЕЛАРУСІ ў IX – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст.

Праблема перыядызацыі гісторыі Беларусі дадзенага перыяду да сённяшняга дня з'яўляецца прадметам даволі вострай навуковай дыскусіі. Мы паспрабуем выкласці сваё бачанне гэтай праблемы, абапіраючыся на вывучэнне трансфармацый у сацыякультурных працэсах, якія адбываліся ў акрэслены храналагічны перыяд на беларускіх землях.

*Перыяд славяна-скандынаўскага сінтэзу* на абшарах Усходняй Еўропы, землях будучай Беларусі, Украіны і Расіі. Яго можна датаваць IX-X ст. Важнейшыя прыкметы гэтага перыяду: узнікненне дзяржаўнай арганізацыі на землях усходніх славян, фармаванне новых сацыякультурных узораў, знайшоўшых адлюстраванне ў «дружыннай» культуры, якая выразна кантраставала з этнічнай, «вясковай» культурай крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў, змены ў пахавальнай абраднасці – масавы пераход пад уплывам новых элітарных узораў да пахаванняў у курганах, спробы уніфікацыі лакальных племянных язычніцкіх культаў і стварэнне агульнаславянскага язычніцкага пантэону (рэформа вялікага князя кіеўскага Уладзіміра).

*Перыяд візантыйска-ўсходнеславянскага сінтэзу.* За кропку адліку пры вылучэнні дадзенага перыяду бярэцца пачатак хрысціянізацыі нашых земляў па «грэцкаму», праваслаўнаму ўзору. Рэзкая змена сацыякультурных рэалій адбываецца толькі пасля Крэўскай уніі. Менавіта апошняя падзея мусіць быць важнейшай храналагічнай цэнзурай, якая завяршае гэты этап беларускай гісторыі. Для яго характэрны наступныя прыкметы: хрысціянізацыя беларускіх земляў і распаўсюджванне ў сувязі з гэтым кніжнасці і пісьменнасці, узнікненне «высокай» гарадской культуры і мастацтва, зыходнымі архетыпамі для якіх у той час былі візантыйскія ўзоры, знаёмства з візантыйскай канцэпцыяй дзяржаўнай улады. Праўда, аднаасобная, самадзяржаўная ўлада на ўсходнеславянскіх землях у той час не стала рэальнасцю. Улада князя была абмежавана вечам і дружынаю, якія істотна ўплывалі на важнейшыя рашэнні ў галіне ўнутранай і знешняй палітыкі. Тады ж на нашых землях афармляецца «дзяржаўны феадалізм», пабудаваны на ўяўленнях аб вярхоўнай уласнасці князя на ўсю дзяржаўную зямлю.

Як Бог з'яўляецца вярхоўным гаспадаром створанага Сусвета, гэтак і князь з'яўляецца адзіным легітымным вярхоўным уласнікам па праву нараджэння аддадзенай пад яго апеку зямлі. Галоўным элементам княжацкага права і ў эпоху Кіеўскай Русі, і ў ВКЛ заставалася суверэннасць землеўладання ўдзельнага князя-дынаста. У сваім удзеле ўдзельны князь-дынаст карыстаўся правам ўстававодства, абвяшчэння сваіх распараджэнняў, жалаваных грамат сваім падданым, надання ім земляў пад акрэсленымі ўмовамі службы, устанаўлення незалежна ад дзяржавы падаткаў, павіннасцяў і г.д. Князь меў права суда над сваімі падданымі да смяротнай кары ўключна. Удзельны князь-дынаст выступаў як поўны суверэн свайго валодання, з якім ён мог выйсці са складу дзяржавы. У адрозненне ад яго службовы ўдзел, як і вотчына, знаходзіўся ў сферы вярхоўнага права Вялікага князя Літоўскага і адчужэнню са складу дзяржавы не падлягаў. У гэты час няма падставаў казаць аб афармленні баярскіх імунітэтаў і пра наданне апошнім права безумоўнага распараджэння зямельнай уласнасцю, атрыманай за службу. Як вядома, падобныя ўзоры дзяржаўнай арганізацыі грамадства, пасля стварэння ВКЛ, на яе «першым», «дакрэўскім», этапе існавання распаўсюдзіліся і на ўласна балцкія землі дзяржавы.

Неабходна падкрэсліць тую акалічнасць, што ўжо ў той час нашы землі былі адкрытыя і да рэцэпцыі элементаў заходнееўрапейскай, «лацінскай» культуры. Праўда, тое ж самае можна казаць і аб астатніх землях дамангольскай Кіеўскай Русі. «Лацінянаў» (прынамсі, да XIII ст.) на масавым узроўні не трактавалі за іншаверцаў.

Аднак зыходныя, фармаўтвараючыя ўзоры сацыякультурнай традыцыі былі, безумоўна, звязаныя з візантыйскім культурным колам.

*Вестэрнізацыя беларускай сацыякультурнай традыцыі.* Новы перыяд беларускай гісторыі бярэ свой адлік ад лёсаноснай для беларускіх і літоўскіх земляў падзеі – Крэўскай уніі. Менавіта гэты факт нашай гісторыі самым істотным чынам спрычыніўся да вестэрнізацыі ВКЛ. Праз наданне прывілеяў спачатку каталіцкай, а потым і праваслаўнай знаці дзяржавы аформіліся феадальныя імунітэты ў класічным, еўрапейскім сэнсе гэтага слова, сфармаваўся шляхецкі стан. У сярэдзіне – другой палове XV ст. афармляецца адзіны «палітычны народ» ВКЛ. У гэты ж час адбываецца фармаванне мяшчанскага саслоўя праз наданне гарадскім абшчынам магдэбургскага права. Матэрыяльная культура бела-

рускіх гарадоў таксама набывае выразна вестэрнізаваны характар. Пад уплывам вышэйазначаных працэсаў атрымлівае распаўсюджванне канцэпцыя саслоўна-станавай манархіі, якая змяняе ўяўленні аб дзяржаве як патрыманіяльнай уласнасці вялікага князя. Ідэал «хрысціянскага ўладара» непарыўна звязваецца з гарантаваным захаваннем апошнім правоў і вольнасцяў магнатам, шляхце і гарадам.

*Ранні Новы час.* У XVI – першай палове XVII ст. беларускае грамадства максімальна наблізілася да каштоўнасцей Новага Часу. У гарадах фармуецца новая працоўная этыка, грошам надаецца статус самадастатковай вартасці. Ліхвярства ў XVI ст. пачынаюць практыкаваць не толькі гараджане, але і духоўныя асобы і шляхта. Занятак ліхвярствам шляхціца, згодна з 3 Статутам, не пазбаўляў апошняга шляхецтва, пры ўмове адпраўлення ім земскай службы. Жабрацтва пачынае трактавацца як справа дапушчальная толькі пры страце чалавекам працаздольнасці.

Гэты перыяд стаў часам як канчатковага афармлення інстытута шляхецкіх «залатых вольнасцяў», так і поўнага засваення беларускім мяшчанствам прававой канцэпцыі «bohum commune». Важнейшымі адзнакамі XVI ст. з'яўляюцца рэлігійная талерантнасць ды мірнае суіснаванне праваслаўных, пратэстантаў і католікаў. Аднак нарастаўшыя працэсы канфесіяналізацыі і контррэфармацыі спрычыніліся да парушэння канфесійнай раўнавагі і ў выніку рэалізацыі Берасцейскай царкоўнай уніі прывялі да вострага рэлігійнага канфлікту ў беларускім грамадстве. Але не Берасцейская царкоўная ўнія, па нашым перакананні, мусіць быць храналагічнай цэнзурай для вызначэння канца гэтага перыяду. Праваслаўная эліта, як дарэчы, і пратэстанцкая, у першай палове XVII ст. мела магчымасць адстойваць свае інтарэсы на дзяржаўным узроўні і дамагацца адчувальных перамог. Толькі другая палова XVII ст. замацавала поўную перамогу Контррэфармацыі і пераўтварыла Рэч Паспалітую ў каталіцкую дзяржаву ў поўным сэнсе слова праз татальную прававую дыскрымінацыю некаталіцкага насельніцтва.

Кардынальныя змены адбываліся і ў этнічнай самаідэнтыфікацыі беларускай эліты. Менавіта ў XVI – першай палове XVII ст. адбываецца насычэнне тэрміна «русін» этнічным зместам, выпрацоўваюцца новыя крытэрыі самаідэнтычнасці, сярод якіх важнейшымі становяцца мова і этнічнае паходжанне – «парода», «кроў», а не рэлігійная прыналежнасць. Аднак этнасацыяльная катастрофа 1654–1667 г., татальная паланізацыя шляхты і знікнен-

не беларускага ўрбаністычнага асяроддзя, а разам з ім нацыянальнага трэцяга саслоўя спынілі гэты працэс і ператварылі старабеларускі этнас у этнас з непаўнавартаснай сацыяльнай структурай.

*Л.Л.Орепук* *г. Минск*

## ГОРОДСКОЕ УПРАВЛЕНИЕ СРЕДНЕВЕКОВОЙ БЕЛОРУССИИ

Управление в городах является органичной частью всей сложной системы государственного управления.

Институт управления не нов для Белоруссии. Первые демократические формы управления действовали уже в XV-XVI веках в Великом княжестве Литовском, в состав которого входили белорусские земли. Государственное управление в городах Великого княжества Литовского сочеталось с городским управлением на основе магдебургского права и самоуправлением.

Грамоты на магдебургское право в Великом княжестве Литовском жаловались великим князем («господарем»). Правовое содержание таких грамот было различно. Белорусские города получили «большие привилеи», согласно которым разрешалось иметь в городе ратушу, магазины, казну, где находились все городские доходы, распоряжаться весами и мерами, строить мельницы, бани. Другие привилеи были пожалованы «небольшим городским поселениям», где мещане освобождались от ряда повинностей, которые они несли сообща с крестьянами.

Введение магдебургского права в белорусских городах позволило установить одну и ту же организацию власти, одних и тех же органов, ее образующих – войта, бурмистров, радцев, лавников. Грамоты на магдебургское право определяли правовое положение органов власти, суда, их компетенцию. Во главе городской власти стоял войт, назначаемый на эту должность великим князем пожизненно. В некоторых городах мещане из своей среды избирали войта, чья кандидатура также утверждалась великим князем.

Городской войт занимался вопросами общего управления делами, следил за поддержанием порядка в городе, сбором средств в государственную и местную казну и на общегородские нужды, осуществлял правосудие. Войт являлся апелляционной инстанцией на решения суда магистрата.

При войте действовал выборный из мещан административный и судебный орган городского управления – магистрат, состоявший из радцев, бурмистров, лавников. Бурмистры и радцы избирались в раду, лавники – в лаву. Рада как административный и распорядительный орган наблюдала за ведением торговли, изготовлением и продажей продуктов пекарями, мясниками, солодовниками. Рада устанавливала цены на хлеб, меры веса зерна на рынке при продаже, осуществляла сбор налогов и поборов, организацию выборов и отчетности городского управления, ведала городскими доходами и земельными участками, устанавливала нормы и правила внутригородской жизни, назначала и освобождала мещан от выполнения тех или иных обязанностей в качестве должностных лиц.

Мещане Белоруссии расширили городское управление, образовав выборный контрольно-совещательный орган в виде комиссии «посполитых». «Посполитые» избирались ежегодно из средних, в основном, слоев горожан ратушной юрисдикции. В их обязанность вменялось следить за правильным использованием городских средств, вместе с радой выносить решения по различным вопросам городской жизни.

Общие собрания мещан (сейм, вече, копа) также продолжали оказывать определенное влияние на решение общегосударственных дел. На таких собраниях заслушивались отчеты бурмистров о расходовании городских денег, готовились жалобы и челобитные центральной власти, выносились постановления о сборе средств на городские нужды, высказывались требования о смещении тех или иных лиц, замены государственного управления, занимались расследованием и рассмотрением уголовных дел.

Горожане в XV-XVI в. занимались преимущественно производственной и торговой деятельностью. Возрастающая конкуренция ремесленников, купцов в условиях узкого внутреннего рынка, совершенствование профессиональных навыков, злоупотребления со стороны местных и государственных органов власти и управления заставляли ремесленников и купцов монополизировать свою деятельность в пределах своего города, для чего они объединялись в цеха, братства, гильдии.

Деятельность цехов, братств регулировалась грамотами на магдебургское право и уставами, которые дополнялись грамотами, привилеями государственной власти, решениями городского управления.

Грамоты на магдебургское право закрепляли право на производственную, торговую деятельность; право проводить ярмарки; виды, размер налогов, пошлин, уплачиваемых в государственную и местную казну.

В уставах закреплялись система органов управления, порядок избрания или назначения руководящих должностных лиц, взаимоотношения его членов, цехов, братств с городским управлением, производство и сбыт продукции, качество сырья и готовых изделий, технология, время и условия работы, правила приема, процесс обучения и многое другое.

Юридическую силу уставы объединений в средние века приобретали после утверждения магистратом города, в котором образовывались цеха, братства, с занесением в городские книги. С конца XVI века каждый цех, братство добивались его утверждения королевской грамотой, а затем они уже регистрировались в городских книгах.

Великий князь создавал благоприятные условия для развития и увеличения цехов, братств как органов самоуправления мещан, так как мещане являлись основными налогоплательщиками. Увеличение дохода мещан приводило к увеличению количества и размера доходов в государственную и местную казну, улучшению экономического положения городов.

С возрастающей ролью городского управления было связано развитие городского права в писаных нормах Великого княжества Литовского.

Первые правовые нормы содержатся в жалованных великим князем грамотах на магдебургское право, которые, с одной стороны, были направлены на «преуспевание городов, умножение в них населения и увеличение их материального благосостояния», а, с другой, закрепляли особые права, обязанности, повинности, налоги, как сословия мещан, так и городов.

Дополняли грамоты на магдебургское право привилеи, выданные великим князем по просьбе магистрата города с целью развития города и привлечения новых жителей. 24 мая 1523 года король Сигизмунд выдал мещанам Полоцка грамоту об освобождении вновь поселившихся жителей от налогов и повинностей на 10 лет. Гродно подобная грамота была выдана в 1526, Дисне – в 1566 году.

Особую группу городского права составляли постановления, решения городского магистрата, в которых была закреплена вся городская жизнь: правила приема под городскую юрисдикцию,

занятия горожан, взаимоотношения с государственной властью и многое другое.

Нередко городам требовалась помощь великого князя от злоупотреблений, несправедливости со стороны государственных органов власти и управления, феодалов и зажиточных мещан. Большую группу документов составляют «челобитные» – жалобы великому князю, на которые великий князь давал охранные грамоты либо грамотами восстанавливал нарушенные права городов и мещан.

На протяжении XIV-XVI в. Великое княжество Литовское вело многочисленные войны, на которые требовались дополнительные средства, с одной стороны, и освобождение белорусских городов, пострадавших от военных действий и стихийных бедствий, от налогообложения, с другой. Так, например, господарь издал указ о сборе чрезвычайного налога на военные нужды с населения Минского повета: «который имеет два вола, то он должен уплатить 12 грошей, а у кого будет один вол, то от того 6 грошей, и у кого несколько волов, должен будет от каждого вола платить по 6 грошей, а от коня рабочего – 6 грошей». А мещане Берестья сроком на 10 лет по привилею господаря освобождались от «платы и службы и серебщизны, ординщины, капщины, воловщины, городовой работы и подводы и иных всех плат и доходов», из-за пожаров, чтобы город «к умноженью пришел».

С введением на территории Великого княжества Литовского единой нормативной базы – трех Статутов – усилилась роль государственных органов, произошло упорядочение структуры и компетенции органов власти и управления, были урегулированы права, свободы, обязанности, размеры и виды налогов для мещан.

Предоставление белорусским городам управления было, несомненно, признанием за ними определенной общественной силы, важной роли в государстве, так как произошел глубокий сдвиг в положении городов, расширились права мещан, их участие в решении городских дел. Первые демократические формы управления в Белоруссии в средние века способствовали зарождению, развитию и правовому оформлению городского права.

*Е.Г.Кудрицкая* *г. Брест*

# К ВОПРОСУ О ЗАКОНОМЕРНОСТЯХ ВОЗНИКНОВЕНИЯ УНИАТСТВА НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ

Проблема принятия униатства на белорусских землях отражена в литературе, однако, до сих пор ведутся споры как по поводу подготовки и проведения Берестейского собора 1596 года, так и последующего распространения на белорусских землях нового направления в христианстве. Этот вопрос гораздо шире и глубже, и для его объективного изучения следует в первую очередь обратить внимание на геополитическое положение Белоруссии, и именно с этой точки зрения попытаться переосмыслить данную проблему.

Сегодня ни один историк, философ, политолог да и просто здравомыслящий человек не станет оспаривать тот факт, что современные европейские нации, государства и культуры при всех нюансах в различии этих понятий общепринято определять как христианские. Действительно, именно христианское вероучение и мораль, вся система религиозных и нравственных ценностей была тем стабилизирующим и консолидирующим основанием, на котором сформировались ныне существующие народы – этносы, на котором строилась духовно-нравственная основа европейской культуры, базируются европейская цивилизация и государственность. Но христианство, имеющее двухтысячелетнюю историю, никогда не было единым. После падения Западной Римской империи в условиях раздробленности формирующихся европейских государств особое влияние в их жизни стали приобретать римские первосвященники (папы). Влияние папы в духовной сфере все больше распространялось на светскую жизнь. Они начали претендовать на светскую власть. Возрастание роли римских первосвященников в духовной и светской жизни послужило основанием к пересмотру роли римской церкви и возвеличиванию римского первосвященника. Папа стал рассматриваться как наместник Христа на земле, глава единой церкви, которому должны безоговорочно подчиняться все поместные церкви. Практически уже к концу первого тысячелетия Римская мировая держава поделилась на латинский Запад и греческий Восток, а затем в 1054 году, когда константинопольский патриарх Михаил Керулларий отказался признать притязания римского папы Льва IX на абсолютную единоличную власть, Вселенская церковь раскололась

окончательно на Западную и Восточную. Постепенно Запад начинает доминировать в государственно-правовом и военном отношениях, а Восток – в культурном. Соответственно, западная христианская церковь впитала в себя духовное своеобразие Запада, его рационализм, агрессивную авторитарность, индивидуализм. Эти особенности породили притязания западной церкви на светскую власть, схоластику, торговлю индульгенциями, догмат о папской непогрешимости [5, с.11]. Восточная церковь впитала в себя утонченную духовность эллинизма, интуитивизм и соборность. Она не знала схоластики, не пыталась утверждать веру рациональными доказательствами. Восточная церковь не распространяла духовный свет огнём и мечом, не знала монашеских орденов, крестовых походов и инквизиции.

Таким образом, при единстве основных догматов западное и восточное восприятие Бога и мира было существенно различным. К XI веку в Европе сформировались две родственные, но глубоко различные христианские цивилизации. И это различие нашло отражение в последующем развитии Западной и Восточной цивилизаций. Конечно, у каждой есть свои сильные и слабые стороны, они взаимодополняемы и интересны по-своему, но они разные.

Древняя Белоруссия занимала промежуточное положение между Западом и Востоком, поэтому в последующем своем развитии она испытывала двойное влияние. К XIII веку Полоцкая, Туровская и Смоленская епископии находились в церковной юрисдикции Киевских митрополитов, состоявших в молитвенном общении со Вселенским Константинопольским патриархом. Можно утверждать, что на данный момент Древняя Белоруссия являлась православной, даже учитывая более медленные темпы утверждения христианства в среде сельского населения.

Кревская уния нарушила монополию православной церкви. Сближение с католической Польшей, гибель Византийской империи в 1453 г. и ослабление Константинопольского патриархата, конфронтация с Москвой привели к усилению связей белорусских земель с западным католическим миром. Период 1385 –1387 г., когда Ягайло стал королем польским и великим князем литовским, можно считать временем смены политико-правового положения белорусских земель в ВКЛ. Согласно привилею 1387 г., православная знать, которая в большинстве своем происходила с белорусско-украинских земель, ставится в неровное экономическое положение по сравнению с землевладельцами католического вероисповедания. Последние получили неограниченные права

владения и распоряжения своим земельным имуществом (продавать, наследовать по частям и целиком), освобождались от ряда тяжелых государственных повинностей. На православных эти привилегии не распространялись. В процессе насильственного окатоличивания населения в Беларуси, Литве и Украине были образованы католические бискупские кафедры и костелы, а духовенство получило богатые пожертвования и много льгот. К середине XVI века католическая церковь при поддержке великих князей и феодалов–католиков укрепилась на современных северо-западных белорусских землях и в Литве, 13 католических парафий действовали в Гродненском повете, 20 – в Новогрудском, 16 – в Минском, 15 – в Волковысском, 7 – в Смоленском. Она развернула активную деятельность по окатоличиванию православного населения, привносила в ВКЛ элементы польской и преимущественно западноевропейской культуры. Характерно, что римская курия, поддерживая агрессивные планы польских феодалов и духовенства, не выделила бискупства в самостоятельную церковную провинцию с непосредственным подчинением Риму, а включила их в состав польской Гнезненской церковной провинции с подчинением новых бискупов польскому духовенству.

Дискриминация православных с конца XIV века начала нарушать внутреннее единство княжества и стала источником серии конфликтов: гражданская война 30-х годов XV века, выступление М.Глинского, промосковские настроения части феодалов. Ягайло, Витовт, Свидригайло, Александр хотели загладить антагонизм между православным и католическим населением при помощи Флорентийской унии 1439 года, однако, православные княжества не поддержали унию. Православная церковь по-прежнему занимает крепкие позиции в ВКЛ. В конце XIV – первой половине XVI века принята серия государственных актов, которые закрепили ее права и привилегии. В противостоянии православия и католицизма в землях ВКЛ в первой половине XVI века сложилось равновесие сил, которое нарушилось в сторону католического Запада только после Люблинской унии 1569 года, которая и завершила процесс фактического политического поглощения украинских и части белорусских земель.

К середине XVI века быстрому развитию римо-католицизма в Белоруссии была поставлена преграда реформационным движением. Наиболее широкое распространение в Беларуси получил кальвинизм. Его социальную базу составляли магнаты, шляхта, часть зажиточных горожан. Увлечение кальвинизмом приняло

столь широкие размеры, что только в Новогрудском воеводстве из 600 шляхетских православных и римо-католических фамилий лишь 16 остались в православии; остальные приняли кальвинизм. При содействии местной кальвинистской шляхты закрывались православные и католические храмы, проводилась секуляризация монастырских земель. Вместе с кальвинизмом в Беларуси появились антитринитарии. Их покровителем был потомок могущественного белорусского магнатского рода Ян Кишка. Под его руководством были созданы типографии в Лозках (Ошмянский повет), в Любче и Заславле. Наибольшего успеха антитринитарии добились в Новогрудском и Брестском воеводствах. На территории Белоруссии вели свою проповедническую деятельность изгнанные из России Феодосий Косой и поп Фома. Их общины существовали в Полоцке и Витебске. Реформация содействовала активизации культурной жизни, расширению гуманистических идей в белорусской культуре. Она привела к развитию в княжестве толерантности. Именно в это время развернулась большая духовно-просветительская работа Ф.Скорины, Иосифа и Ивана Солтанов, Александра и Григория Ходкевичей, кн. Острожских.

Однако широкое распространение реформационных учений вызывало опасение в Ватикане. Папский нунций Камедонии в марте 1564 г. сообщал в Рим: «Еретичная наглость и своевольство безгранично», «количество еретиков страшно возрастает», «почти ежедневно оскверняется какой-нибудь костел, еще некоторое время – и уже немногочисленная католическая церковь останется без папства». Именно этим объясняется приглашение в Польшу (1564), а затем в Вильно (1569) иезуитов, которые и повели решительную борьбу с Реформацией. Благодаря королевскому покровительству (особую силу они получили при Стефане Батории) иезуиты утвердились в крупнейших городах Речи Посполитой. Белоруссия застраивалась костелами и монастырями, в городах открывались иезуитские коллегии. Хорошо организованные, грамотные, умные, они сразу же завоевывали авторитет у определенной части зажиточных слоев населения и особенно у молодежи. Со времени Люблинской унии до конца XVI века иезуиты основали 8 монастырей. Двадцатилетняя деятельность иезуитов принесла свои плоды. Психологическая борьба против православия, политическая дискриминация верующих, постоянное вмешательство польских королей во внутреннюю жизнь православной церкви привели её к кризису, из которого она пыталась выйти

путем укрепления внутрицерковного порядка, усиления своих позиций в обществе, реформирования монашеской жизни. Однако политический и социальный статус восточной церкви оказался ниже, чем католической. Православная церковь была не в состоянии организовать надлежащую систему образования, подготовить кадры высококвалифицированного духовенства, развивать богословскую науку. Католический Запад оказался более приспособленным к христианскому кризису и к концу XVII века успешно его преодолел.

Таким образом, Люблинская уния, Реформация и контрреформация, завершение процесса формирования восточнославянских народностей, денационализация социальных верхов образовали новую геополитическую ситуацию в Восточной Европе и новую культурно-религиозную ситуацию на территории Белоруссии и Украины. Балансирование на протяжении столетий между Востоком и Западом делало унию неизбежной. В ней были заинтересованы три силы: Ватикан, намеревавшийся компенсировать потери своих позиций на время Реформации; руководящие круги Речи Посполитой, заинтересованные в укреплении государственной власти; определенные духовные и светские круги, видевшие в унии путь духовного возрождения белорусско-украинского общества. Сторонников унии привлекала жизнеспособность католического Запада, возможность присоединиться к его богатым интеллектуальным и культурным достижениям. Религиозное соглашение 1596 года было неизбежным, так как оно явилось итогом комплекса европейских религиозно-политических отношений между католическим Западом и православным Востоком. Белорусские и украинские земли на протяжении длительного периода развивались на границе двух религий, двух типов культур, двух идеологий и цивилизаций: православно-византийской и римско-католической, поэтому неудивительно, что именно здесь была заключена религиозная уния, воплотившая в себе идею единения католической и православной церквей.

*Д.У.Дук* *г. Наваполацк*

# ПОЛАЦКАЯ КЕРАМІЧНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ XIV – XVI ст.: УСХОДНІЯ І ЗАХОДНІЯ ЎПЛЫВЫ

Узровень развіцця сярэднявечнай матэрыяльнай культуры ў першую чаргу вызначае культурная прастора, у якой адбываецца яе фарміраванне, па-другое, ступень запазычанасцяў (навацыяў) і, па-трэцяе, наяўнасць своеасаблівасцяў (рэгіяналізмаў), якія характарызуюць мясцовую вытворчасць.

Гарадскую матэрыяльную культуру эпохі сталага Сярэднявечча ўмоўна можна падзяліць на два ўзроўні паводле варункаў, у якіх праходзіла кшталтаванне матэрыяльнай культуры і ўвасабленне ў яе розных мастацкіх форм. Першы – вышэйшы ўзровень, куды ўваходзяць рэчы, якія непасрэдна звязаны са шляхецкім саслоўным станам, яны адзначаюцца больш высокай ступенню выканання, і другі – ніжэйшы ўзровень, які склаўся пад ўздзеяннем густаў і магчымасцяў шэраговага насельніцтва, што ажыццяўляла свае памкненні праз вырабы масавай рамеснай вытворчасці як больш таннай і арыентаванай на задавальненне запатрабаванняў мяшчан.

Мы паспрабуем зрабіць аналіз развіцця масавай керамічнай вытворчасці познесярэднявечнага Полацка.

Кераміка, паводле прызначэння, падзяляецца на шэраг груп, з якіх вылучаюцца дзве галоўныя: архітэктурна-дэкаратыўная кераміка і посуд. Да пазначанай катэгорыі вырабаў цалкам дапасаваны падзел на вышэйшы і ніжэйшы ўзроўні паводле мастацкіх вартасцяў і прызначэння. Найбольш цікавым прадстаўляецца вывучэнне архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі, напрыклад, кафлі, якая з'яўляецца важнай гістарычнай крыніцай з пункту погляду функцыянальнага прызначэння і інфармацыйнасці змешчаных на ёй выяў. Натуральна, што вывучэнню полацкай кафлі прысвечаны працы шэрагу даследчыкаў, такіх, як А.Дзярновіч, Д.Дук, Ю.Заяц, Н.Здановіч, Л.Панічава, Р.Разенфельд і інш., асноўныя высновы якіх зводзяцца да наступнага.

Традыцыя вырабу кафлі была прынесена ў Полацк з нямецкіх земляў, і будаўніцтва кафляных печаў з гаршчковай кафлі ў Полацку пачалося раней, чым у Польшчы і іншых гарадах Вялікага княства Літоўскага. З XV ст. вядомы пласціны, якія адлюстроўваюць выразны ўплыў з боку народнасцяў Усходу, а з сярэдзіны XVI ст. пад уздзеяннем рэфармацыйных плыняў у Полацку вырабляецца «партрэтная» кафля.

Вытворчасць полацкай кафлі канца XVI-XVII ст. зазнала тыя ж змены і пераўтварэнні, якія характарызуюць заходне- і цэнтральнаеўрапейскае кафлярства. Традыцыя аздаблення пласцін развівалася пад уплывам заходнееўрапейскіх стыляў мастацтва: рэнесанса, маньерызма і барока. Аналіз малюнкаў паказвае, што многія матывы былі добра вядомы ў іншых гарадах Беларусі і Польшчы. Нярэдка падабенства настолькі відавочнае, што гэта дае падставы сцвярджаць аб адзінай традыцыі, якая склалася ў межах Рэчы Паспалітай. Тым часам ніводная з вядомых нам груп арнаментальных матываў ні тыпалагічна, ні тэхналагічна не зведала ўплыву з боку ўсходняй (маскоўскай) культуры. Усё гэта дазваляе аднесці полацкае кафлярства XIV-XVII ст. да сферы ўздзеяння заходне- і цэнтральнаеўрапейскага дэкаратыўнага мастацтва, і ў той жа час падкрэсліць вялікую ролю мясцовай рамеснай традыцыі.

Неабходна падкрэсліць, што спецыяльных даследаванняў, прысвечаных полацкаму керамічнаму посуду XIV-XVI ст., да гэтага часу не зроблена. Па выніках вывучэння полацкага кафлярства можа скласціся ўражанне, што развіццё ўсёй керамічнай вытворчасці ў Полацку ў XIV-XVI ст. адбывалася пераважна пад уздзеяннем рамесніцтва заходне- і цэнтральнаеўрапейскага рэгіёну. Каб пазбегнуць спрашчэння і схематызацыі ў падвядзенні высноў па пазначанай праблеме, неабходна адзначыць наступнае.

Кафлярства стала шырока распаўсюджаным толькі з канца XVI ст., калі ў будынках гарадскога насельніцтва (пераважна заможнай і сярэдняй шляхты) з'явіліся печы, зробленыя са сцянной (каробчатай) кафлі. З XVI ст. адбываюцца якасныя змены і ў тэхналогіі вытворчасці керамічнага посуду, звязаныя з распаўсюджваннем нажнога ганчарнага круга і шырокім выкарыстаннем паліў, г.зн. працэсы ўвасаблення заходне- і цэнтральнаеўрапейскіх культурных навацыяў у вытворчасці рэчаў штодзённага ўжытку гараджан. Паспрабуем адказаць на пытанне: у якім русле і ў рэчышчы ўздзеяння якой культурнай прасторы развівалася масавая вытворчасць полацкага посуду ў XIV-XVI ст.? У межах дадзенай працы прапануем аналіз, зроблены на падставе вывучэння гаршчкоў як асноўнай катэгорыі керамічнага матэрыялу.

З моманту вынаходніцтва гаршчкі сталі самым шматлікім відам посуду, іх функцыя звязана з гатаваннем і захоўваннем ежы.

Сярод групы непаліванага полацкага посуду XVI ст. яны складаюць каля 91 % (падлікі праведзены па дадзеных уласных раскопак у Полацку ў 2001 г.). У XVII-XVIII ст. колькасць гаршчкоў з

палівай і без складае адпаведна 2:1, у параўнанні з папярэднім перыядам яны прыкметна саступаюць іншым катэгорыям посуду, хоць працягваюць заставацца асноўнай групай усіх знаходак.

Значнае павелічэнне асартыменту керамічнай прадукцыі ў Полацку назіраецца з канца XVI ст. Гаршчкі першай паловы XVI ст. працягваюць выбляцца ў традыцыйнай для папярэдніх стагоддзяў тэхніцы спіральнага налепа на ручным ганчарным крузе. Донца такой керамікі мае сляды падсыпкі пяску. Калі ў непаліўной кераміцы заходняга рэгіёну XVI ст. – час росквіту керамічнай вытворчасці, якая характарызуецца зменамі ў складзе фармовачнай масы, больш якаснай апрацоўкай паверхні, то ў Полацку аналагічныя змены адбыліся ў апошняй чвэрці XVI ст., і галоўную прычыну гэтага можна бачыць у наступствах Інфлянцкай вайны. Нават у канцы XVI ст. большасць ужываных у побыце непаліваных гаршчкоў была выраблена на ручным ганчарным крузе.

Паводле формы і складу фармовачнай масы, усе гаршчкі XIV – першай паловы XVI ст. падзелены намі на шэраг тыпаў.

Гаршчкі тыпу I маюць адагнутае венца і пукатыя плечукі, нярэдка з рабром пры пераходзе ў шыйку. Дыяметр венцаў гаршчкоў – ад 16 да 26 см, чарапок шэры, порысты, без грубых уключэнняў.

Большасць гаршчкоў тыпу II маюць адагнутае пад вуглом 45° венца, высокую шыйку і плечук з палогім рабром. Асобным варыянтам можна лічыць гаршчкі з адагнутым гарызантальна венцам, а таксама гаршчкі з моцна адагнутым вонку венцам, пад якім прысутнічае наляпны валік. Сярод гэтага тыпу гаршчкоў сустракаюцца і белагліняныя, аналагічныя тым, што былі знойдзены пры даследаванні пабудовы першай паловы XVI ст. Памеры дыяметру венцаў – ад 15 да 32 см.

Гаршчкі тыпу I можна датаваць XIV ст., тыпу II – XV-пач. XVI ст.

Гаршчкі тыпу III маюць вертыкальна пастаўленую (прамую) шыйку, венца дыяметрам ад 16 да 22 см і гарызантальна размешчаны плечук.

Тып IV – гэта прататып распаўсюджанай у XVIII ст. формы гаршчкоў з адагнутай шыйкай і невыразным венцам аднолькавай таўшчыні са сценкамі і палогім рабром па плечуку. Гэты тып прадстаўлены тонкасценнымі гаршчкамі з порыстым чарапком з дамешкамі жарствы і пяску, дыяметр венцаў – ад 14 да 24 см. Каля 52 % венцаў гаршчкоў XIV-XV ст. утрымліваюць арнаментацыю ў выглядзе хваляў (з нахілам у левы бок), насечак і прамых гарызантальных палосак.




Мал. 1. Тыпалогія полацкіх гаршчкоў XIV–XVI ст. (1-39) і кераміка паўночна-заходняга рэгіёну Расіі (40–41).

Гаршчкі тыпу V-VI з'яўляюцца пераходнымі да рэнесанснай керамікі XVI ст. Яны захавалі істотныя прыкметы гаршчкоў XIV-XV ст. (грубае цеста, масіўнасць і аднолькавая таўшчыня сценак), але набылі новую форму (рабрыстасць па плечуку і акруглае. крыху патоўшчанае венца).

Частка полацкага посуду першай паловы XVI ст. фармавалася са светлых глін. Маюцца ўсе падставы для сцвярджэння аб мясцовай вытворчасці белаглінянага посуду з малажалезістых глін, тым больш што белагліняны посуд аднолькавай формы з чырвонагліняным знойдзены падчас даследаванняў культурных напластаванняў пасяленняў XVI – XVII ст. беларускага Падняпроўя і Панямоння.

Вялікі набор белаглінянага посуду знойдзены намі падчас даследавання пабудовы першай паловы XVI ст. на Вялікім пасадзе. Большасць гаршчкоў (сабрана 339 фрагментаў) выраблены з белай (каалінітавай) гліны з дабаўленнем невялікай колькасці сярэднезярністага пяску-рачніка (67 %), астатнія (33 %) – з чырвонай гліны, абпаленыя ў акісляльным (27 %) і аднаўленчым (6 %) асяроддзі. Паверхня белаглінянага посуду апрацавана ў тэхніцы т.зв. пятністага абварвання ў хлебным растворы. Плямы абвары на светлай паверхні маюць светла-карычневы ці крэмавы колер і фіксуюцца з абодвух бакоў сасудаў.

Шматлікі керамічны набор з пабудовы першай паловы XVI ст. дазволіў зрабіць тыпалогію гаршчкоў гэтага перыяду, да якой далучаны іншыя датаваныя фрагменты гаршчкоў, знойдзеныя ў розных частках горада.

Усе гаршчкі падзяляюцца паводле тэхналогіі абпалу і складу керамічнага цеста на чырвонагліняныя, шэрыя і белагліняныя.

Тып VII – гэта выключна белагліняныя абварныя гаршчкі, якія маюць дыяметр венца ад 24 да 28 см. Венца з валікападобным краем пастаўлена вертыкальна, гарчшкі маюць невысокую шыйку і палогае рабро. Керамічнае цеста з невялікімі дамешкамі сярэднезярністага пяску, чарапок порысты, трохслойны.

У гаршчках тыпу VIII назіраецца тэндэнцыя да павелічэння вышыні шыйкі, што пачынае назірацца ў некаторых гаршчкоў тыпу IX, венца становіцца больш масіўным, край яго адагнуты вонку, шыйка мае ўступ, некаторыя гаршчкі арнаментаваны па рабру хвалістым арнаментам. Дыяметр края венцаў гаршчкоў вагаецца ад 13 да 24 см. Большасць сасудаў – шэрагліняныя, маюць сляды акапчэння на знешняму, зрэдку – з унутранага боку, керамічнае цеста гэтых гаршчкоў утрымлівае дамешкі жарствы дыяметрам да 2 мм.

Да тыпу IX належыць большасць гаршчкоў акрэсленага перыяду. Гэтыя сасуды маюць аналагічныя тыпу VII прапорцыі, за выключэннем краю венца, якое ў гаршчкоў тыпу IX крыху адагнута вонку нярэдка ў форме карнізіка. Знойдзена як белагліняныя, так і шэрагліняныя гаршчкі, якія маюць дыяметр венца ад 13 да 26 см. Шыйка некаторых гаршчкоў пастаўлена амаль вертыкальна, што з'яўляецца працягам традыцыі вырабу гаршчкоў XV ст.

Захаваліся два гаршчкі поўнага профілю тыпу IX – белагліняны і шэрагліняны. Гэта прысадзістыя, шырокія сасуды, максімальнае пашырэнне прыходзіцца на верхнюю частку гаршчка – плечук, кароткая шыйка, пастаўленая крыху пад нахілам унутр (у першым выпадку) і вертыкальна (у другім) пазначана ўступамі з абодвух бакоў ад венца і плечука.

Гаршчкі тыпу X зроблены ў традыцыі XV ст., іх характэрнай рысай з'яўляецца наяўнасць рабра па плечуку і наляпнога валіка пад венцам.

Гаршчкі тыпу XI маюць высокую шыйку і востры край венца, які мае аднолькавую са сценкамі таўшчыню, прысутнічае арнаментацыя ў выглядзе хвалістага арнаменту па шыйцы. Край венцаў гаршчкоў тыпу XI прыстасаваны пад накрыўкі дыяметрам ад 19 да 28 см, большасць з іх – чырвонагліняныя, захаваўшыя сляды ад фармоўкі на ганчарным крузе ў выглядзе барознаў ад жарствы, паверхня іх бугрыстая, шэрахаватая, неахайна апрацаваная, з моцным нагарам, толькі некаторыя з іх старанна загладжаны і не ўтрымліваюць грубых дамешак.

Сценкі гаршчкоў тыпу VII-IX даволі тонкія, каля 0,5 см, тады як сценкі гаршчкоў тыпу XI больш масіўныя, таўшчынёй да 1,2 см. Большасць гаршчкоў мае груба апрацаваную паверхню, гэта тычыцца як белаглінянай, так і шэраглінянай керамікі з адной толькі розніцай – у керамічным цесце белаглінянай абварной керамікі адсутнічае жарства. Грубае цеста і дрэнна абпалены чарапок з'яўляюцца характэрнымі прыкметамі керамікі паўночнага рэгіёну Беларусі XIV-XV ст., па полацкіх матэрыялах можна адзначыць працяг гэтай познесярэднявечнай традыцыі ў канцы XV – першай трэці XVI ст. Гаршчкі тыпу VII-IX як асноўную групу можна датаваць другой чвэрцю XVI ст.

Большасць донцаў гаршчкоў першай паловы XVI ст. (87 %) захавала сляды падсыпкі сярэднезярністага пяску і жарствы (кварцу) дыяметрам да 0,4 см. Сценкі ў прыдоннай частцы адагнутыя пад вуглом каля 45° і маюць розную таўшчыню, ад 0,8 да 1,5 см, некаторыя донцы ўвагнутыя, з некалькімі канцэнтрычнымі акружнасцямі з унутранага боку. Памеры донцаў – ад 10 да 13 см.

Зазначым, што ў канцы XVI - пачатку XVII ст. паліваныя вырабы складалі 15,2 % з усёй групы керамічнага посуду ў адным раскопе, а сярод паліванага посуду гаршчкі прадстаўлены толькі 16,2 % знаходак. Факты сведчаць аб значнай перавазе ў гэты час непаліўнога посуду як найбольш практычнага і таннага. Таму не дзіўна, што паліваныя гаршчкі, функцыя якіх напрамую не звязана з неабходнасцю ўжывання палівы, раней канца XVI ст. у Полацку не фіксуюцца.

Неабходна звярнуць увагу на наступную акалічнасць: нідзе больш у Полацку не знойдзена такой колькасці белаглінянай керамікі ў адным раскопе. Па-другое, адны і тыя ж формы гаршчкоў з даследаванай намі пабудовы першай паловы XVI ст. выраблены з белай і чырвонай гліны з перавагай белаглінянай керамікі. Па-трэцяе, формы гаршчкоў з'яўляюцца тыповымі для полацкай керамікі XVI ст., што не дазваляе разглядаць белагліняны посуд як прывазны.

Узнікае пытанне: чаму з'явілася патрэба вырабляць посуд з белай гліны, радовішчы якой шырока не распаўсюджаны ў паўночным рэгіёне Беларусі? Можа быць толькі адно тлумачэнне: полацкі ганчар засвоіў і ўвасобіў у серыі сваіх вырабаў традыцыю, якую ён запазычыў у іншых землях. У першай палове XVI ст. белаглінянную кераміку масава выраблялі ў двух асноўных рэгіёнах, да якіх мог прычыніцца полацкі рамеснік: Масковія (Гжэль) і Польшча (з цэнтрам у Сандаміры, Ілжы і Кельцы). Першы рэгіён паходжання традыцыі вытворчасці полацкай белаглінянай керамікі вельмі верагодны, калі ўлічыць частыя памежныя войны Вялікага княства Літоўскага з Маскоўскім княствам у першай палове XVI ст. Полацкі рамеснік мог трапіць у маскоўскі палон ці апынуцца ў Масковіі ў выніку якіх-небудзь іншых абставін, і пасля вяртання ён мог пачаць вырабляць кераміку, у аснову фармовачнай масы якой была пакладзена белая гліна. На заходні «вектар» культурнай навацыі ўказваюць рэчы заходнееўрапейскага паходжання (фрагменты керамічных фляг і рынак), знойдзеныя разам з белаглінянымі гаршчкамі ў адной пабудове, аднак, гэтая акалічнасць можа толькі пацвердзіць факт шырокага ўжывання ў побыце палачан разнастайнай катэгорыі імпартных рэчаў, што было распаўсюджанай з'явай сярод гарадскога насельніцтва Беларусі.

Асобныя тыпы полацкіх гаршчкоў XV-XVI ст. маюць дакладныя аналогіі з керамікай Пскова, Арэшку, Таржка і Ноўгарада. Апроч таго, маецца шэраг рыс, якія збліжаюць полацкія

гаршчкі XIV-XVI ст. з маскоўскімі, а менавіта: 1) прысадзістасць сасудаў, максімальнае пашырэнне якіх прыходзіцца на верхнюю частку тулава; 2) наяўнасць прамога венца і амаль поўная адсутнасць шыйкі; 3) наяўнасць белаглінянай керамікі – па складзе фармовачнай масы і тэхналогіі абпалу белагліняная кераміка з Полацка найбольш блізкая менавіта да маскоўскай керамікі, яна вызначаецца тымі ж характарыстыкамі, што і маскоўскія сасуды (чарапок белы, тонкі, шарахаваты, цеста са значнымі дамешкамі пяску, значная частка сасудаў мае цёмную праслойку недастаткова пракаленай гліны.

Такім чынам, неабходна прызнаць, што калекцыя полацкага керамічнага посуду канца XV-XVI ст. мае прамыя аналогіі з помнікамі паўночна-заходняга рэгіёну Расіі (Пскоў, Ноўгарад). Пры супастаўленні форм полацкіх гаршчкоў з керамікай суседніх земляў нельга не звярнуць увагу на тую акалічнасць, што полацкія гаршчкі XIV-XVI ст. па прапорцыях і профілю венцаў усё ж больш падобныя на ўсходнюю (маскоўскую) кераміку, чым на заходнюю (польскую і нямецкую), а гэта азначае, што масавая вытворчасць полацкага керамічнага посуду XV-XVI ст. у цэлым працягвала развівацца на ўсходнеславянскай аснове.

Прыведзеныя дадзеныя не ставяць мэтай абсалютызацыю ступені роднасці полацкага дэкаратыўнага посуду з керамікай усходняга рэгіёну. У той ці іншай ступені кераміка XIV-XVI ст. паўночнага рэгіёну Беларусі мела падабенствы і з заходнееўрапейскім, і з прыбалтыйскім посудам. З канца XVI – пачатку XVII ст. пераважная большасць полацкіх начынняў па форме і прызначэнню ўжо мала чым адрозніваецца ад цэнтральна- і заходнееўрапейскай керамікі, узрастае асартымент посуду, які з гэтага часу не паддаецца падлічэнню.

Вывучэнне полацкай керамікі ранняга Новага часу вартае асобнага разгляду.

*А.А. Скеп'ян* *г. Мінск*

## РОЛЯ МЯШЧАНСТВА Ў ФАРМІРАВАННІ ГАРАДСКОЙ КУЛЬТУРЫ ПЕРАХОДНАГА ТЫПУ (XVI – XVIII ст.)

Гісторыя горада, яго сацыяльная і эканамічная структура, культурнае, рэлігійнае жыццё заўжды прыцягвалі ўвагу даследчыкаў. У феадальным грамадстве горад стаў не толькі месцам ган-

длю і рамеснай вытворчасці, але і цэнтрам, дзе адбываліся сацыяльна-эканамічныя, палітычныя пераўтварэнні, фарміраваліся і афармляліся культурныя з'явы і працэсы, развіццё якіх у значнай ступені і абумовіла асаблівасці беларускай гісторыі.

Да сярэдзіны XVI ст. гарадское насельніцтва вылучаецца ў асобнае саслоўе. Дзейнасць мяшчан, як на эканамічнай, так і на культурнай глебе парушае замкнёнасць асобных раёнаў краіны, спрыяе эканамічнай кансалідацыі, стварэнню ўнутранага рынку, фарміраванню ў межах Вялікага княства Літоўскага адзінай культуры і беларускай народнасці. Яны падрыхтавалі глебу для распаўсюджвання гуманістычнага і рэфармацыйнага руху ў краіне, хоць і не ў такой ступені, як у Германіі, Польшчы ці Чэхіі.

Нягледзячы на тое, што стварэнне гарадской культуры новага тыпу, засваенне агульнаеўрапейскіх традыцый стала магчыма дзякуючы трывалым эканамічным сувязям з гарадамі Польшчы, Германіі, Прыбалтыкі, беларускі горад здолеў захаваць свой воблік, арганічна засвойваючы еўрапейскія традыцыі ў галіне палітыкі, культуры, ідэалогіі.

Рэнесансная культура ў ВКЛ паўсюль насіла дваісты характар з прычыны своеасаблівасці арганізацыі дзяржаўнага ладу і вялікай ролі шляхецкай культуры. З другога боку, царкоўна-рэлігійная барацьба, якая ў канцы XVI стагоддзя амаль цалкам была перанесена ў гарады, значныя палітычныя абмежаванні, ускладзеныя на праваслаўнае насельніцтва, вымусілі гараджан узяць на сябе клопат не толькі пра абарону веры, але і пра адукацыю, кнігадрукаванне, стварэнне медыцынскіх установ і будаўніцтва як культавых, так і свецкіх будынкаў. Апошняе, у сваю чаргу, садзейнічала прыцягненню да працы вялікай колькасці мясцовых майстроў, што ўдала спалучылі ў архітэктуры рысы еўрапейскай традыцыі рэнесанса і барока з мясцовым дойлідствам.

На развіццё культурных працэсаў у гарадах аказалі ўплыў не толькі аб'ектыўныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы, але і мясцовая шляхта, пэўная колькасць якой жыла ў горадзе ці з'яўлялася заказчыкам мастацкіх твораў, стваральнікам моды на лад жыцця і такім чынам уплывала на звычкі вярхушкі горада. Асабліва гэты шляхецкі ўплыў ўзмацніўся з канца XVI ст., калі збяднелая шляхта стала масава перасяляцца ў гарады, не пакідаючы сваіх грамадскіх ідэалаў і ладу жыцця.

Значны ўплыў на асаблівасці фармавання гарадской культуры аказала гарадская палітыка цэнтральнай улады на дзяржаўныя гарады і ўладальнікаў – на прыватнаўласніцкія мястэчкі. Ся-

род іх былі і прывілеі на самакіраванне, што спрыяла з'яўленню заможнай часткі мяшчан – патрыцыяту, розныя правы і вольнасці, якія стымулявалі, між іншым, і развіццё культуры. Па падліках беларускіх даследчыкаў, колькасць патрыцыяту ад усіх мяшчан складала каля 5 %, а сярэдніх па дабрабыту мяшчан – 40-50 %. Такім чынам, мы бачым, што прыкладна палова гарадскіх жыхароў мела матэрыяльную магчымасць удзельнічаць у культурных працэсах і маёмасна падтрымліваць яе развіццё.

У той жа час на гарадскую культуру Беларусі значна паўплывалі ідэалогія эпохі Адраджэння і светапогляд, які яна прынесла. Нездарма адным з першых носьбітаў гэтай культуры стаў мешчанін Францыск Скарына. Прыкладам можа быць знакамітая віленская школа мастакоў і злотнікаў. Каралеўскія двары пачалі патрабаваць вялікую колькасць адукаваных людзей, якія выкарыстоўваліся як фінансавыя дарадчыкі, юрысты, аратары, дыпламаты, узрастала і роля заможнага мяшчанства, якое пераймала прыдворныя звычкі. На рэнесансную культуру шляхты накладваецца элітарная культура патрыцыяту з ідэалам арыгінальнасці, гармоніі, усебаковасці. Пачынае ствараццa грамадства, якое ўбачыла вялікія магчымасці атрымання багацця праз працу, хоць і не прыняла цалкам рэфармацыйную ідэалогію. Гэта і прывяло да росту цікаўнасці да традыцыі падтрымкі культуры сярод мяшчанства, асабліва патрыцыяту, буйных еўрапейскіх гарадоў.

Пад патрыцыятам разумелі заможныя гарадскія сем'і, якія за кошт заняцця пэўных пасад мелі перавагу над іншымі. Фактычна фармаванне патрыцыяту звязана з атрыманнем гарадамі магдэбургскага права, таму аўтаматычна да патрыцыяту мы можам аднесці бургграфа (калі гэта пасада мелася), райцаў, лаўнікаў, войта, бурмістраў, якія маглі займаць гэтыя пасады нават па спадчыне. Так, аналіз актавага матэрыялу дазваляе нам вылучыць у Полацку, Магілёве, Вільні, Гародне шэраг сямей, якія з пакалення ў пакаленне займалі вышэйшыя гарадскія пасады. Прыкладам могуць быць сем'і Мамонічаў (Вільня), Міхновічаў, Цыгановічаў, Спегальскіх у Полацку. Магдэбургскае права прадугледжвала, што ў склад гарадской рады, а значыць, і ў кола патрыцыяў маглі ўваходзіць толькі законнанароджаныя заможныя мяшчане, якія стала пражывалі ў горадзе.

Саперніцтва са шляхтай праяўлялася не толькі ў эканамічнай і палітычнай сферы, дзе барацьба з феадальнымі юрыдыкамі азначала барацьбу за існаванне мяшчанства як вольнага насельніцтва. У культурнай галіне сутыкненне інтарэсаў і традыцый шля-

хецкай і мяшчанскай культуры прасочваецца таксама даволі выразна. Для мешчаніна апека над справамі культуры была не толькі сродкам барацьбы за сваю веру і самаснасць, але і магчымасцю пацвердзіць свой сацыяльны статус у грамадстве. Ахвяраваць грошы на цэрквы, школы, друкарні, шпіталі, набыццё плацаў для патрэб брацтва маглі больш заможныя колы гарадскога насельніцтва.

Сцвердзіўшы сябе эканамічна, патрыцыят мусіў падмацаваць усведамленне неабходнасці свайго існавання, наканаванасці на гэтым свеце, што было абумоўлена ідэалогіяй Адраджэння. Мяшчанства відавочна пачынае цікавіцца культурай, справамі асветы і імкнецца да ажыццяўлення ідэала таннай царквы, характэрнага для ўсёй Еўропы ў тыя часы. Праявамі такіх памкненняў гарадскіх жыхароў і стала стварэнне вялікай колькасці праваслаўных брацтваў. Па традыцыі для брацтваў было характэрна некалькі кірункаў дзейнасці: арганізацыя цэркваў, школ і шпіталяў, складанне і выданне падручнікаў, літаратурная дзейнасць, ахова мясцовай мовы і яе ўдасканаленне.

Калі сярод шляхты на першае месца выходзіла індывідуальнасць, сваёй дзейнасцю шляхціц клапаціўся, перш наперш, пра сябе, то сярод мяшчанства, асабліва пэўных груп, дзейнічалі прынцыпы калектывізму, абумоўленыя арганізацыяй гарадскога жыцця. У якасці матыву падтрымкі культуры магло выступаць і жаданне атрымаць палітычную вагу (напрыклад, пры фундацыі шпіталя), што спрыяла захаванню кіруючай ролі ў гарадскім жыцці. Адчуванне агульнай прыналежнасці да адной групы насельніцтва спрыяла фармаванню пачуцця мясцовага патрыятызму і памкнення праславіць яго. Нярэдка гэта было матывам актыўнай падтрымкі культуры і яе творцаў.

Мецэнацкую дзейнасць менавіта гарадской рады можна акрэсліць пэўным чынам. Гэта была дзейнасць, скіраваная на захаванне правоў, прывілеяў горада, яго культурнай і рэлігійнай самасці. Матывы тут, хутчэй за ўсё, былі ўтылітарнымі, мецэнацтва з'яўлялася адным са сродкаў задавальнення патрэб горада і мяшчан з дапамогай уласнай інтэлігенцыі,ураднікаў, юрыстаў, лекараў, настаўнікаў, духоўных асоб. Іншымі словамі, мецэнацтва знаходзілася ў галіне інтарэсаў горада, было вынікам яго арганізацыйна-адміністрацыйных, культурных, асветніцкіх патрэб. Фактычна гэты інстытут падтрымкі культуры быў неабходны для развіцця навукі і мастацтва.

З розных відаў падтрымкі культуры ў мяшчанскім асяродку мы не знаходзім класічнага патранату над літаратарамі і навукоўцамі, характэрнага для Заходняй Еўропы і мясцовай шляхты. Прысутнічаюць пэўныя праявы мастацкага мецэнацтва ў выглядзе архітэктурных фундацый, а таксама ахвяраванняў для ўпрыгожвання храмаў. У адрозненне ад шляхецкіх форм апекі над культурай, дзе ўвага надавалася значным архітэктурным формам, такім, як заснаванне цэркваў ці будаўніцтва школ, шпіталяў, мяшчане ў асноўным фундуюць дробныя рэчы: капліцы, краты, убранне, кнігі, алтары, шаты, сукенкі, аправы на іконы, грошы на царкоўную музыку (набыццё аргана, музычных інструментаў, утрыманне капэлы), ювелірныя ўпрыгожванні, распяцці, ці апекуюць толькі над часткай царквы, што тлумачыцца іх матэрыяльнымі магчымасцямі.

Так, мешчанін віцебскі Трафім Субота сваім тэстаментам духоўным (1626) хату і ўсю маёмасць (тканіну, посуд, грошы) аддаў «на оправу» царквы Прышэсця Св.Духа ў Віцебску. Тым не менш, мы сустракаем і праявы чыстага мастацкага мецэнацтва, перанятага ад заходнееўрапейскіх каталіцкіх традыцый. У якасці прыкладу можна прывесці заказы скульптурных надмагілляў мяшчанамі, што захаваліся ў віленскіх касцёлах. Гэта надмагілле Паўла Янавіча Зносака, якое складалася з дзвюх постацей (1625), Андрэя Легартовіча (1647), паэта Яна Мручынскага (Таркватуса), выкананае Францішкам Кракаўчыкам (1640). Калекцыянаванне, хоць і не было шырока распаўсюджана сярод мяшчанства, але ўсё ж калі-нікалі сустракаецца. Звычайна аб'ектам збіральніцтва станавіліся карціны, іконы і кнігі. Так, ёсць звесткі, што хата Якава Фёдаравіча Хадыкі, полацкага райцы (пачатак XVII ст.) была ўпрыгожана карцінамі («на палатне карцін шаснаццаць»).

Узрастае цікаўнасць да кнігі. З другой паловы XVI ст. у хатнім ужытку мяшчан з'яўляюцца кнігі, а з пачатку XVII ст. ужо існуюць даволі значныя мяшчанскія кнігазборы. Тэстаменты фіксуюць як існаванне кніжных збораў, так і іх перадачу ў цэрквы, манастыры ці школы. Асабліва шмат успамінаў пра валоданне і збіранне мяшчанамі кніг захавалася ў тэстаментах XVII ст. (магчыма, з прычыны лепшай захаванасці крыніц). Так, у духоўным тэстаменце брэсцкага райцы Гурына Федаровіча (1624) пералічваецца ўжо некалькі дзесяткаў кніг духоўных, што перадаваліся розным цэрквам, у тым ліку дзве з іх былі выдадзены Скарынам. Інвентар бібліятэкі віленскага бурмістра Сцяпана Лябедыча ў 1649 г. налічваў 113 кніг, якія ацэньваліся ў 128 зл. 20 гр. Сярод іх было

96 выданняў на лацінскай мове (антычных аўтараў), траўнікі, слоўнікі, 17 кніг на «рускай мове», у тым ліку і Скарыны. Вялікімі бібліятэкамі валодалі мяшчане, што займаліся выкладчыцкай дзейнасцю, асабліва ў XVII ст. Прыкладам могуць служыць кнігазборы М.Сматрыцкага, Андрэя Дабжанскага, Саламона Рысінскага.

Літаратурнае мецэнацтва сярод мяшчан адсутнічае. Яны сутыкаюцца з гэтым кірункам мецэнацкай дзейнасці апасрэдавана – як аўтары, друкары, падмайстры і спажыўцы літаратурнай прадукцыі. Найбольшае распаўсюджанне, асабліва сярод гарадскога патрыцыяту, атрымаў навукова-асветніцкі кірунак мецэнацтва.

Шырокія кантакты са шляхтай, вялікакняжацкім дварам і з замежжам патрабавалі ўласнай інтэлігенцыі. Абарона прывілеяў і правоў, асабліва ў рэлігійнай галіне, вымушала шукаць юрыстаў, клопат пра здароўе мяшчан заахвочваў працу медыкаў. Рэлігійная сітуацыя і патрэба ў адукаваных людзях у краіне вымагалі стварэння і падтрымкі школ розных ступеняў.

Развіццё рамяства і гандлю, агульны рост горада патрабавалі ад рамесніка ведання пачаткаў навук, пісьма, без якіх немагчыма было авалоданне майстэрствам, вядзенне гандлёвых спраў. Праваслаўная царква, з нізкім узроўнем адукацыі большасці святароў, падначаленым праваым становішчам і забаронай манастырам навучаць у сабе дзяцей (як гэта было запісана ў статуце Супрасльскага манастыра 1510 г.: «а робят в монастыри не держати, ни на науку, ни на послугу не приймати») аказалася няздольнай пашырыць школьную адукацыю, вывесці яе за межы ведання малітваў і асноўных царкоўных абрадаў, якіх мешчаніну было ўжо недастаткова [11, с.24].

Мяшчане пасылалі сваіх сыноў на вучобу за мяжу, цешыліся навуковай і літаратурнай працай, выдавалі за ўласны кошт кніжкі, стваралі школы і запрашалі ў іх настаўнікаў. Мы маем дастатковую колькасць разнастайных пісьмовых помнікаў, якія сведчаць аб высокім узроўні адукаванасці мяшчан. Гэта так званыя «истоты», «духовницы» (достаменты) і іншыя. Нездарма адна з першых свецкіх школ была створана ў Вільні ў 1540 г. Абраамам Кульвай – мешчанінам па паходжанні. Пакравіцелем лютэранскай віленскай школы Яна Вінглера таксама з'яўляўся купец Мартшок.

Праваслаўныя брацтвы стварылі школы, на свае грошы ўтрымлівалі і вучняў, і настаўнікаў у Вільні, Магілёве, Брэсце, Мінску, Полацку. Часта яны былі стваральнікамі друкарань, што дазваляла падтрымліваць узровень ведаў і прапаганды веры на належным узроўні, аднак, практычная дзейнасць брацтваў патрабуе падрабязнага разгляду.

Такім чынам, носьбітамі культуры Рэнесанса і традыцый мецэнацтва, стваральнікамі гарадской свецкай культуры на тэрыторыі Беларусі выступаюць як самі апекуны культуры – шляхціцы, так і асобы, на якіх гэта дзейнасць накіравана – творцы-кліенты (у пераважнай большасці мяшчане), і іх роля не менш значная за ролю апекуноў. Гэта дазваляе нам разглядаць гарадское насельніцтва не толькі як складальную частку сацыяльнай структуры грамадства, але і як носьбіта культурных традыцый і працэсаў на беларускіх землях.

*І.В.Трошына* *г. Мінск*

## ШЛЯХЕЦКАЕ МЕЦЭНАЦТВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ у XVI-XVII ст.: ХАРАКТАР І НАПРАМКІ

Пад тэрмінам «мецэнацтва» разумеюцца розныя формы падтрымкі мастацкай і навуковай дзейнасці, стварэнне ўмоў, спрыяльных для яе развіцця. Паняцце «мецэнат» уключае таксама і рознага кшталту фундатарства і апекаванне.

Мецэнацтва як адзін з фактараў культурна-гістарычнага працэсу на беларускіх землях з'явілася пазней, чым у Еўропе. Мы можам гаварыць аб ім як аб сталай з`яве ў XV ст. Але, як адзначае Б.А.Лазука, некаторыя эпізадычныя праявы дабрачыннасці назіраюцца і ў XII ст. Росквіт мецэнацкай дзейнасці прыходзіцца на перыяд Рэфармацыі і Адраджэння. Узнікненне інстытута патраната трэба звязваць з тым часам, калі рэпрэзентатыўныя функцыі прадмета пачынаюць выходзіць на першы план у параўнанні з яго спажывецкімі якасцямі. Гэта патрабавала, па-першае, адпаведнага культурнага ўзроўню грамадства, а, па-другое, неабходнай ступені развіцця індывідуальнай самасвядомасці.

Мецэнацтва як з'ява мае два бакі: першы – гэта асоба мецэната, яго густы і прыхільнасці як заказчыка, і другі – непасрэдны выканаўца заказа. Заказчык меў выключнае ўздзеянне на працэс вытворчасці, выконваючы сацыяльны заказ на прадукты мастацтва. У гэтай ролі, у асноўным, выступала шляхецкае саслоўе. Яно па сваім складзе было неаднародным, утварала некалькі груп – вышэйшую (магнатэрыя), сярэднюю і дробную, то мэтазгодна разглядаць і вышэйазначаную дзейнасць у гэтым разрэзе.

Калі гаварыць аб магнатэрыі, то трэба заўважыць, што яе мецэнацтва было абумоўлена некалькімі акалічнасцямі.

1. Адукаванасць асобы, якая мела непасрэдны ўплыў на яе светапогляд.

2. Памкненне да дэманстрацыі велічы і багацця, г.зн. да рэпрэзентатыўнасці.

3. Элемент моды і арыентацыя на каралеўскі двор.

4. Ідэалогія сарматызма як характэрны элемент светаўспрымання шляхецкага саслоўя (характарызавалася кансерватызмам, саслоўнай замкнёнасцю, ідэяй выключнасці і абранасці).

Гэтыя фактары вызначылі характар і асноўныя напрамкі мецэнацкай дзейнасці.

Рэпрэзентатыўнасць праявілася, па-першае, у атаясамліванні каштоўнасці мастацкага твора з яго экзатычнасцю. Аб гэтым сведчыць існаванне ў XVII ст. так званых camerae raritatis (зборы, дзе разам з творамі мастацтва знаходзіліся і разнастайныя дзівы). Магнаты змагаліся паміж сабой у збіранні такіх калекцый. Акрамя таго, яны ўсялякімі сродкамі падкрэслівалі сваю дабрачыннасць. Так, Міхал Казімір Пац, заснаваўшы касцёл Пятра і Паўла ў Вільні, загадаў напісаць на фасадзе «Regina pacis funda nos in pace».

На характар магнацкага мецэнацтва ўплывала памкненне капіраваць формы падтрымкі культурнай дзейнасці, што выкарыстоўваліся пры двары вялікага князя. У XVI-XVII ст. будуюцца асобныя рэзідэнцыі, якія становяцца культурнымі цэнтрамі. Пры гэтых палацах існаваў пастаянны двор, у які ўваходзілі і дзеячы навукі, мастацтва і літаратуры.

Многія прадстаўнікі заможнай шляхты і магнацкіх сем'яў вучыліся ў замежных універсітэтах Нямеччыны, Італіі, Швейцарыі, Прусіі, Чэхіі і іншых. З Еўропы яны прывозілі новыя ідэі і светапоглядныя канцэпцыі, якія імкнуліся распаўсюдзіць і на беларускія землі. Так, ідэі рэфармацыі падтрымліваліся ў асноўным вядомымі беларускімі фаміліямі, сярод якіх першае месца займалі Радзівілы. Варта падкрэсліць, што барока на Беларусі з'явілася дзякуючы намаганням Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі, па загадзе якога быў пабудаваны касцёл Божага Цела ў Нясвіжы, першага з тыпу Іль Джэзу на Беларусі.

Такім чынам, можна вылучыць наступныя напрамкі мецэнацкай дзейнасці.

1. Кнігадрукаванне.

2. Патранат у галіне літаратуры і навукі.

3. Фундатарства рознага тыпу пабудоў.

Што тычыцца першага пункта, то трэба адзначыць той факт, што на Беларусі з другой паловы XVI ст. адкрылася каля 30 друкарняў. Многія з іх былі заснаваны прадстаўнікамі шляхецкага саслоўя: Берасцейская друкарня, адчыненая Мікалаем Радзівілам Чорным, Венграўская і Лоская друкарні Яна Кішкі і іншыя.

Мецэнацтва ў галіне літаратуры можна сустрэць ужо ў XV ст. Друкаванне кнігі патрабавала значных грашовых сродкаў. Бедны пісьменнік або публіцыст не меў магчымасці надрукаваць свой твор. Таму ён шукаў мецэната, які дапамагаў у гэтай справе. Як пісаў Цыпрыян Базылік: «...вельмі часта аўтар выймаў з-пад лавы свой твор і пісаў адпаведнае прысвячэнне асобе пана, а ён выймаў грошы на друк». Аднак часцей за ўсё пры магнацкіх дварах пражывалі пісьменнікі, якіх магнаты пастаянна апекавалі. Так, пры двары Радзівілаў дзейнічалі Ян Каханоўскі, Андрэй Рымша, Ян Радван, Бэніаш Будны і іншыя. Акрамя паэтаў, пры дварах працавалі і мастакі, якія прытрымліваліся розных напрамкаў жывапісу ў адпаведнасці з прыхільнасцямі магнатаў. Нясвіжская галіна Радзівілаў і Пацы калекцыянавалі творы італьянскага барока, біржанскія Радзівілы – галандскіх мастакоў. Гэтая арыентацыя была звязана з палітычнымі і рэлігійнымі поглядамі. Пацы выводзілі свае карані з Рыма. Біржанскія Радзівілы былі цесна звязаныя з пратэстанцкай Галандыяй.

На падставе шматлікіх крыніц можна меркаваць аб існаванні радавой традыцыі ў будаванні палацаў, культавых пабудоў і музеяў. Асабліва вылучаюцца ў гэтым Радзівілы, Пацы, Сапегі, Вішнявецкія, Алелькавічы-Слуцкія, Агінскія і Чартарыйскія.

У адрозненне ад магнатаў, сярэдняя і дробная шляхта не надавала вялікага значэння мецэнацкай дзейнасці. Прычыну гэтага трэба бачыць у эканамічных фактарах. Гэтыя слаі не мелі дастатковых сродкаў для збірання вялікіх калекцый і бібліятэк, будавання палацаў і цэркваў. У гэтым асяроддзі падмуркам любой дзейнасці быў сарматызм, аб якім гаварылася вышэй. Мецэнацтва праяўлялася ў стварэнні партрэтных галерэй продкаў і падараванняў царкве. Калі магнаты збіралі творы, у асноўным, замежных мастакоў, то гэтая частка карысталася паслугамі мясцовых майстроў. Такое мецэнацтва насіла прадстаўнічы характар і не прадугледжвала эстэтычных памкненняў.

Такім чынам, мецэнацтва як з'ява культурнага жыцця на беларускіх землях мела разнастайныя кірункі і змяняла свой характар, эвалюцыянізуючы ад простага збіральніцтва рарытэтаў да прафесійнага калекцыянавання. Яго напрамкі вызначаліся фак-

тарамі, якія грунтаваліся на індывідуальным светапоглядзе асобы. Мецэнацтва сярэдняй і дробнай шляхты мела пэўныя адрозненні ад магнацкай культурна-стымулюючай дзейнасці, што диктавалася становішчам гэтых слаёў у грамадстве. Агульнымі фактарамі былі, па-першае, ідэалогія сарматызма і, па-другое, рэпрэзентатыўнасць, якія характарызавалі ўсё шляхецкае саслоўе.

*В.Ф.Голубеў* *г. Мінск*

## АБШЧЫННЫ (КОПНЫ) СУД У СІСТЭМЕ СУДОВАГА ЛАДУ БЕЛАРУСІ XVI – XVIII ст.

Судовая сістэма, якая дзейнічала на тэрыторыі Беларусі ў XVI – XVIII ст., мела тыповыя рысы прававой сістэмы феадальнай эпохі. Яна ўключала ў сябе як саслоўныя суды для людзей шляхецкага стану, так і агульнасаслоўныя суды для ўсяго насельніцтва, заснаваныя на звычаёвым праве (а з канца XV ст. – і на пісаным праве). Дзейнічаў на працягу разглядаемага перыяду і старажытны суд грамады, ці копны суд, які адыгрываў важную ролю ў сістэме судовага ладу ВКЛ.

Суд грамады ўзнік у старажытныя часы і да з'яўлення пісанага права ў многім быў заснаваны на звычаёвым праве, традыцыі. Звычаёвае права адыгрывала значную ролю ў жыцці феадальнага грамадства, разам з тым, яно пастаянна эвалюцыянавала разам з развіццём дзяржаўных інстытутаў, змянялася, часта прыстасоўваючыся да абставін ці запатрабаванняў улады. Звычаёвае права рэгулявала жыццё сялянства, вызначала правілы і парадак дзейнасці службовых асоб сельскай адміністрацыі. Да выдання Статутаў ВКЛ звычаёвае права рэгулявала дзяржаўныя павіннасці насельніцтва і грамадска-прававыя, у тым ліку і судова-працэсуальныя адносіны. Пасля выдання Статута Вялікага княства Літоўскага 1529 г. звычаёваму праву стала адводзіцца толькі дапаможная роля ў рэгуляванні тых праваадносін, якія не былі прадугледжаны законам, што праяўлялася і ў функцыянаванні суда абшчыны. Але звычай працягваў займаць важнае месца ў жыцці «людзей простага стану», у тым ліку ў прававых дачыненнях. Найбольш паказальным у гэтым сэнсе з'яўляецца шырокае захаванне ў асяроддзі ў першую чаргу вясковага насельніцтва так званай традыцыі «старыны». Гэтая традыцыя распаўсюджвалася на самыя розныя сферы жыцця і разумелася менавіта як непарушнае звычаёвае права.

Шмат якія дакументы сведчаць пра тое, што напачатку суд грамады, копны суд не быў з`явай, характэрнай для ўсяго ВКЛ, але быў традыцыйным толькі для беларускіх зямель ВКЛ. І. Спрогіс адзначаў, што члены Віленскай археаграфічнай камісіі для падрыхтоўкі адмысловага тома, прысвечанага копным судам, апрацавалі каля 300 кніг гродскіх судоў (Брэсцкага, Вількамірскага, Ваўкавыскага, Гарадзенскага, Ковенскага, Лідскага, Мінскага, Мазырскага, Навагрудскага, Пінскага, Расіенскага, Слонімскага, Слуцкага, Трокскага і Упіцкага) за 1560 – 1699 г. І абсалютная большасць сведчанняў аб існаванні і дзейнасці копных судоў тычыцца менавіта тэрыторыі Беларусі. У матэрыялах Вількамірскага, Ковенскага, Расіенскага і Упіцкага гродскіх судоў увогуле не было знойдзена ніякіх звестак аб існаванні і дзейнасці на падсудных ім тэрыторыях копных судоў.

Суд грамады, па сведчанні шматлікіх звестак, прызнаваўся ўладай, а ў XVI ст. копны суд быў не толькі афіцыйна прызнаны, але і заканадаўча замацаваны дзяржавай у якасці аднаго з інстытутаў судовай сістэмы. Напрыклад, у Статуце ВКЛ 1588 г. пра гэты судовы інстытут заяўлялася так: «А на Руси и инде, где здавна копы бывали, там мают быти и тепер копы отправованы на старых коповищах тым обычаем, яко первей того бывало. А на тых теж местцах, где досель копы не бывали, таковым же порядком и поступком копы збираны и отправованы быти мають, яко ся и на Руси заховывало и заховуеть». Разам з тым, гэтая цытата сведчыць аб тым, што копны суд у першую чаргу быў характэрны для ўсходняга і цэнтральнага рэгіёнаў Беларусі.

Цікава, што пасля прыняцця ў Статуце 1588 г. вышэйзгаданай фармулёўкі ўлады пачалі вызначаць па ваяводствах пастаянныя месцы, дзе магла збірацца капа. Абавязкі па вызначэнні такіх месцаў ускладаліся Статутам на падкаморыяў: «А естли бы укривжоный злодейством хотел шкоды своее доходити копою, тогды вси в той околицы вокол на милю со всих чотырех сторон мають казати подданым своим на копу сходиться, а то ся маеть розумети вперед не тые местца, где досимест копы не бывали, *которые коповища кождый подкоморий в повете своем назначити* (выдзелена намі. – В.Г.) и села тых, хто ся там становити будеть, описати маеть.». Заўважым, што гэта рабілася і там, дзе «досель копы не бывали». Выяўленыя дакументы сведчаць, што норма, унесеная ў Статут 1588 г., на месцах выконвалася дакладна. Так, у 1590 г. гарадзенскім падкаморыем Грыгорыем Масальскім быў складзены спецыяльны дакумент, які рэгламентаваў правілы

склікання коп (са спасылкай на адпаведны артыкул Статута 1588 г.) і вызначаў месцы капавішчаў на тэрыторыі ўсяго павета. Менавіта ў 1590 г. трокскі падваявода князь Багдан Агінскі прызначыў месцы капавішчаў у Трокскім ваяводстве. На падставе гэтых звестак мы можам меркаваць з вялікай доляй верагоднасці аб тым, што дзяржава ў XVI ст. не толькі заканадаўча аформіла існаванне судоў грамады, але пэўным чынам пачала пашыраць іх дзейнасць на тэрыторыі ВКЛ. Лісты аб прызначэнні месцаў капавішчаў і ў Гродне і ў Троках у адпаведнасці са Статутам былі складзены мясцовымі падкаморымі. З гэтага часу капа, якая збіралася не на прызначаным уладамі месцы, магла лічыцца неправамоцнай. Так, у судовым квіце вознага Менскага ваяводства Станіслава Багданавіча Волка, унесенага ў судовую кнігу Менскага гродскага суда 25 студзеня 1599 г., адзначалася пра збіранне капы ў вёсцы Мацувічы маёнтка Лошыца. Пра адмоўную ацэнку гэтай падзеі ў тэксце выразна гавораць словы, пра тое, што капа «постановившисе моцно кгвалтом» у вёсцы «иж дей тут перед тым от стародавных веков николи не бывала». Праўда, у дадзеным выпадку рашэнне («прислуханье») капы не аспрэчвалася, пра што сведчыць тэкст квіту вознага.

Як паказвае вышэйзгаданы тэкст, копы збіраліся на спецыяльна прызначаных для гэтага месцах – капавішчах. У іх бралі ўдзел (і з'яўляліся, такім чынам, суддзямі) простыя сяляне («мужы») і кіраўнікі сялянскіх абшчын – старцы. На судзе грамады маглі ўдзельнічаць таксама прадстаўнікі іншых саслоўяў пры абавязковай прысутнасці ўпаўнаважаных земскіх судоў – возных альбо іншых прадстаўнікоў земскага ці гродскага суда (часцей за ўсё, гэта быў віж). Апошнія абавязкова ўносілі свае справаздачы («квіты») пра ўдзел у копным судзе для занясення ў кнігі земскіх ці гродскіх судоў. З гэтага часу рашэнне копнага суда набывала юрыдычную вартасць.

Нельга лічыць, што копныя суды былі судамі, прызначанымі толькі для сялянства. Канешне, суд грамады ў першую чаргу вырашаў пытанні, звязаныя з праблемамі «простых» жыхароў воласці, але ў шэрагу выпадкаў у якасці раўнапраўных суб'ектаў судовага працэсу маглі выступаць і селянін, і баярын, і шляхціц. Натуральна, што шляхта прымала ўдзел у судовых пасяджэннях капы толькі ў тых выпадках, калі разглядаемыя справы тычыліся іх непасрэдных інтарэсаў. Так, напрыклад, у кастрычніку 1625 г. «под час небеспеченьства от повестрыя у Брестью» ў кнігу Брэсцкага гродскага суда была ўнесена рэляцыя вознага Брэсцкага вая-

водства Аляксандра Лазавіцкага аб сходзе капы сялян вёсак Ходліна, Грушовай, Падзямсня, Каменя, Запронніцы, Мядзведзевіч, Зарэчча, Залесся, Бародзіч, Ліпавай і Турнай, у якім прыняў удзел пан Стэфан Нарушэвіч. Апошні «сам будучы особою своею поведил прычыну згромаженья тое копы», прызначанай знайсці яго прапаўшага слугу.

Падсуднасць спраў копнага суда была дастаткова шырокай. Па сутнасці, гэтыя суды маглі разглядаць любыя справы аб злачынствах, здзейсненых на падсуднай ім тэрыторыі ў радыусе прыблізна 2–3 мілі (15–20 км). Найчасцей капа разглядала справы аб крадзяжах, патравах, псаванні борцяў і забранні мёду з іх, бойках, рабаваннях на дарогах, маёмасных спрэчках сярод сялян, сварках і да т.п.

Судаводства мела дзве формы: звычайную і гвалтоўную. Звычайная капа збіралася па ініцыятыве зацікаўленых асоб у загадзя вызначаныя тэрміны, якія найчасцей прымяркоўваліся да рэлігійных святаў. Гвалтоўная капа збіралася ў выпадку забойства, падпалу, нападу, калі пацярпелы «падымаў гвалт».

Як ужо адзначалася, звычайная капа збіралася на пастаянных, здаўна вызначаных месцах – капавішчах. Да 1590 г., пакуль уладамі не пачалі прызначацца месцы капавішчаў, як правіла, капа збіралася за вёскай, у лесе ці на межах тэрыторый суседніх абшчын: «коповищо давнее, урочищем у Пезнецкого Фалева моста», «коповищо стародавное, на врочищу у копца нарожного», коповищо стародавнее, звыклое, которое есть на дорозе, где се подданые Плещенские с поддаными Каменскими на копе з давных часов становят, на рубежу», «была копа звыклая на границе Логойской с Колодежаны» і да т.п. Улады прызначалі больш зручныя для іх і для кантролю месцы капавішчаў – пры рынках, цэрквах і касцёлах. Так, з шасцідзесяці капавішчаў, прызначаных у 1590 г. у Гарадзенскім павеце, трыццаць тры былі прызначаны «пры касцёле», сямнаццаць – «пры царкве», пяць – пры гаспадарскіх дварах, тры – пры рынках і толькі два – «под гаем березовым» – у Гудзевічах і Лабне. Гвалтоўная капа не мела строга прызначанага месца і збіралася звычайна на месцы здзяйснення злачынства.

Капа ажыццяўляла адначасова судовыя і следчыя функцыі. Яе ўдзельнікі самі праводзілі расследаванне, пры неабходнасці адшуквалі злачынцу («гналі след»). Следства на капе вялося звычайна на трох (у некаторых выпадках, калі справу не ўдавалася расследваць за гэты час, збіралася і больш пасяджэнняў) пасяджэннях капы. Апошняе называлася «завітой» капай, на якой завівалася, завяршалася справа.

Адказчыкамі на капе ў абсалютнай большасці выпадкаў былі сяляне. Гэта натуральна, таму што для шляхты існавалі свае, саслоўныя суды. Разам з тым, крыніцы сведчаць, што ў некаторых выпадках, калі злачынцамі з'яўляліся шляхціцы ці мяшчане, яны таксама падпадалі пад прысуд капы. Канешне, нават тэарэтычна нельга сабе ўявіць, каб адказчыкам перад абшчынным судом выступіў прадстаўнік сярэдняй ці буйной шляхты. Такога не было і на практыцы. Звычайна на разгляд капы «траплялі» прадстаўнікі дробнай шляхты, якія ў дакументах праходзяць як зямяне. Часцей за ўсё гэта былі малазямельныя людзі, якія жылі побач з прыгоннымі, вялі аднолькавае з імі гаспадарчае жыццё і адрозніваліся ад іх толькі шляхецкім званнем.

Следства, якое вяла капа, абапіралася як на матэрыяльныя доказы (скрадзеныя рэчы, сляды і да т.п.), так і на паказанні сведкаў. Калі капа не магла знайсці доказаў злачынства і адсутнічалі сведкі, да падазронага ў злачынстве маглі быць ужытыя іншыя спосабы і прыёмы дазнання: «проба» (допыт), «туртуры» (катаванне), «мука». Напачатку абвінавачанаму прапаноўвалі прызнацца ў здзяйсненні злачынства. У многіх выпадках так і адбывалася. Калі ж ён не прызнаваўся, а падазрэнне заставалася, да яго прымянялася «проба» ці «мука». Адразу цяжкага катавання не рабілі – першы допыт рабіўся з пакараннем дубцом. Калі ж і гэтым разам абвінавачаны не прызнаваўся, яго маглі катаваць праз агонь. У некаторых выпадках допыт вёў спецыяльна запрошаны на капу кат.

Прысуд капы мог быць самым разнастайным, у залежнасці ад вінаватасці злачынцы, памераў учыненай ім шкоды. Капа магла прыгаварыць нават да смяротнага пакарання («на горла»). Такое пакаранне звычайна адбывалася з дапамогай шыбеніцы. Вядомыя таксама выпадкі, калі капа прысуджала злачынцу да чвартавання і нават да спалення.

Як ужо адзначалася, з сярэдзіны XVI ст. рашэнні капы абавязкова ўносіліся ў кнігі судовых спраў земскіх альбо гродскіх судоў. Рашэнні копных судоў былі канчатковымі, як правіла, выконваліся адразу і абскарджанню не падлягалі. Разам з тым, возны альбо віж, які прысутнічаў на копным судзе, мог затрымаць выкананне яго рашэння.

Напрыканцы неабходна адзначыць, што суд грамады (копны суд), які здаўна быў традыцыйным, звычаёвым органам расследавання злачынстваў і судовага пакарання сярод сельскага насельніцтва, з XVI ст. дзеяннямі Статутаў ВКЛ 1529, 1566 і 1588 г. быў

уключаны ў судовую сістэму дзяржавы як самабытны, але рэгулюемы заканадаўствам судовы інстытут. Копныя суды былі характэрнай з'явай у дачыненні тэрыторыі Беларусі і, несумненна, паўплывалі на фармаванне своасаблівасцей беларускага этнасу, менталітэту беларусаў.

*Н.С.Гардзіенка* *г. Мінск*

## АСАБЛІВАСЦІ СЯМЕЙНАГА СТАТУСУ ШЛЯХЦЯНКІ ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ у XVIII ст.

На сямейнае становішча жанчыны шляхецкага паходжання ў XVIII ст. уплываў комплекс фактараў, звязаных з тымі традыцыйнымі ролямі, якія яна павінна была выконваць у сям'і на працягу свайго жыцця: дачкі, жонкі і маці. Адпаведнае кола правоў і абавязкаў адносна прадстаўнікоў сваяцкай супольнасці, якія шляхцянка мела на розных этапах свайго жыцця, фармавала сістэму сямейнай іерархіі і месца ў ёй жанчыны.

Сярод найбольш значных варта выдзеліць некалькі груп фактараў, што традыцыйна вызначалі сямейны статус жанчыны ў розныя гістарычныя перыяды. Да першай належыць грамадскае і эканамічнае становішча бацькоўскай сям'і, якое ўплывала як на матэрыяльныя ўмовы жыцця шляхцянкі, так і на змест яе адукацыі, а таксама перспектывы будучага шлюбу. Разам з тым, вялікае значэнне мелі асабістыя адносіны бацькоў і дзяцей, што ўплывалі на рэальнае размеркаванне спадчыны і вызначэнне для дзяўчыны пасагу. Памер пасагу вельмі часта вызначаў маёмасны статус жанчыны ў шлюбе. Уплыў гэтых фактараў у XVIII ст. заставаўся дастаткова значны, нават нягледзячы на распаўсюджаную практыку патаемных шлюбаў дзяўчын (у выніку інсцыніраванага выкрадання), з мэтай выйсця з-пад надзвычай моцнага бацькоўскага кантролю.

Другая група фактараў вызначала становішча жанчыны ў сям'і і значна ўплывала на фармаванне не толькі сямейнага, але і грамадскага статусу шляхцянкі. Вялікую вагу мела маёмаснае і грамадскае становішча мужа, якое вызначала і штодзённы дабрабыт сям'і, і магчымасці для пазасямейнага жыцця прадстаўніц шляхецкага саслоўя, актывізацыя якога назіраецца ў XVIII ст. Грамадскае становішча мужа і асабістыя адносіны з ім шмат у чым вызначалі і статус шляхцянкі ў выпадку яго смерці. Пазіцыі жан-

чыны як маці залежалі, між іншым, і ад адносін (маёмасных і эмацыйных) з дзецьмі.

На працягу XVIII ст. адзначаецца паступовае ўмацаванне маёмаснага становішча жанчыны. Ад канца XVIII ст. шляхцянкі набылі права спадчыны бацькоўскай маёмасці не толькі пры адсутнасці братоў, але і разам з імі, што значна павялічыла іх фінансавыя магчымасці. Акрамя таго, у звычайную практыку ўвайшло ўзаемнае запісанне мужам і жонкай правоў на пажыццёвае валоданне ўсёй маёмасцю другога сужэнца. У выніку па смерці мужа жонка (захоўваючы яго тытул і прывілеі) да ўласнай смерці магла распараджацца не толькі асабістымі маёнткамі, на якіх запісана забеспячэнне пасагу, але і ўсімі валоданнямі мужа, уключаючы каралеўшчыны. Дадзеная акалічнасць мела вынікам значную грамадскую актыўнасць менавіта ўдоваў на працягу XVIII ст. Адначасова права маці на пажыццёвае валоданне бацькоўскай маёмасці стварала праблемы ў яе стасунках з дзецьмі, якія павінны былі чакаць смерці абодвух бацькоў для паўнапраўнага атрымання спадчыны.

Умацаванне фінансавага становішча замужняй жанчыны ў XVIII ст. адлюстравалася і ў практыцы прызначэння мужам для жонкі адмысловага рэгулярнага грашовага ўтрымання, нявыплата якога часам магла стаць адной з прычын пачатку шлюбаразводнага працэсу.

Новыя тэндэнцыі ў XVIII ст. назіраюцца і ў вызначэнні права жанчыны на апеку над дзецьмі. Традыцыйнае права ў выніку смерці мужа рэгламентавала пераход апекі над дзецьмі, калі яна не была абумоўленая ў тэстаменце, да сваякоў або іншых паважаных і маёмасных людзей. Жанчына магла атрымаць апеку толькі ў выпадку спецыяльнага распараджэння мужа. Аднак на працягу XVIII ст. у юрыдычнай практыцы сфармавалася традыцыя пераходу дзяцей пад апеку маці ў выпадку смерці мужа ва ўсіх сітуацыях, калі іншы апекун не быў ім вызначаны. Гэта значна пашырала правы жанчыны па распараджэнні маёмасцю дзяцей да дасягнення імі паўналетняга ўзросту, а таксама стварала падставы фінансавай самастойнасці шляхцянкі.

Адзначаныя змены ў вызначэнні маёмаснага і прававога статусу жанчыны ў сям`і выклікалі не толькі замацаванне яе сямейнага становішча, але і актывізацыю дзейнасці, што не была непасрэдна звязаная з выкананнем сямейных абавязкаў. Адначасова ў вызначэнні і сямейнага, і грамадскага статусу кожнай канкрэтнай шляхцянкі ў XVIII ст. вялікую ролю сталі адыгрываць яе ўлас-

ныя якасці, жаданні і памкненні, якія ў значнай ступені стымуляваліся развіццём індывідуалістычных тэндэнцый у культуры.

Актывізацыя свецкага жыцця шляхцянак, пашырэнне сферы іх інтарэсаў на занятпі літаратурнай, тэатральнай, музычнай творчасцю, мецэнацтвам і нават палітычнай дзейнасцю былі вынікам не толькі ўмацавання фінансавага становішча жанчын, але і тагачаснай французскай моды ў міжасабовых стасунках, якая ахапіла вышэйшыя шляхецкія і магнацкія колы ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Звязаныя з гэтым былі і новыя з`явы ў адносінах да жаночай адукацыі, што назіраліся ў грамадстве на працягу XVIII ст. Акрамя паступовага разумення прадстаўнікамі шляхецкіх колаў неабходнасці адмысловай адукацыі для дачок, важна адзначыць і змены ў адносінах да яе зместу.

На працягу XVIII ст. былі ўнесеныя карэктывы ў праграмы навучання жаночых кляштарных пансіёнаў, дзе пэўную ўвагу сталі надаваць нерэлігійнай складальнай часткі навучання, а таксама заняткам спевамі, музыкай, танцамі, якія былі патрэбныя для свецкага жыцця шляхцянак. Адначасова сталі з`яўляцца прыватныя жаночыя пансіёны, а таксама вялікую распаўсюджанасць набылі гувернёры і прыватныя настаўнікі, якія забяспечвалі навучанне дзяўчын модным прадметам і майстэрствам пад кантролем бацькоў.

Змены ў жаночай адукацыі і стылі жыцця на працягу XVIII ст. мелі разнастайныя вынікі для вызначэння як сямейнага, так і грамадскага статусу жанчыны. Фінансавыя магчымасці і характар свецкага жыцця значна пашырылі сферу пазасямейных кантактаў жанчыны, выклікалі значнае распаўсюджанне інстытута каханкаў і каханак. Адначасова адбываецца пэўная пераацэнка сістэмы сямейных каштоўнасцяў. Вынікам гэтых працэсаў стала павелічэнне колькасці разводаў у заможных шляхецкіх сем`ях, якіх усе гэтыя з`явы закранулі ў большай ступені. Усё вышэйадзначанае дазволіла даследчыкам сцвярджаць пра наяўнасць напрыканцы XVIII ст. крызісу інстытуту шлюбу і шлюбных адносінаў.

Усе адзначаныя з'явы паўплывалі на вызначэнне не толькі рэальнага сямейнага статусу жанчыны шляхецкага паходжання, але і на некаторыя змены ў яе грамадскім ідэале, якія адлюстраваліся ў тагачаснай друкаванай літаратуры, а таксама мемуарнай і эпісталярнай спадчыне. Традыцыйны вобраз жанчыны звязваў яе жыццё і дзейнасць выключна з колам сямейных абавязкаў яе як жонкі і маці. Адсюль найбольш характэрныя якасці, якімі павінна была валодаць шляхцянка, набожнасць, паслухмянасць, сціпласць і міласэрнасць, адлюстраваныя найперш у шматлікіх пахавальных

прамовах. Асуджэнне свецкай актыўнасці жанчын вельмі часта сустракалася ў публіцыстыцы Рэчы Паспалітай XVIII ст.

Адначасова на працягу адзначанага перыяду стаў складваецца вобраз жанчыны – свецкай дамы, адлюстраваны ў вершаваных прысвячэннях, мастацкіх творах, мемуарах. Адпаведная новаму ідэалу шляхцянка павінна быць прыгожая, разумная, прыемная ў размове і стасунках. Гэтае ўяўленне пра ўласцівасці свецкай жанчыны вельмі часта суседнічала з традыцыйным бачаннем яе сямейных абавязкаў, што сцвярджае дваістасць разумення ў грамадстве месца шляхцянкі. Разам з тым, важнасць сямейных функцый жанчыны і адпаведных яе якасцяў ніколі не ставілася пад сумнеў.

Вынікам сінтэзу двух вобразаў жанчыны ў грамадстве другой паловы XVIII ст. стала нараджэнне новага грамадскага ідэалу, які ўключаў рысы абодвух. Грамадская актыўнасць шляхцянак напрыканцы XVIII ст. сфармавала ўсведамленне неабходнасці адмысловага патрыятычнага выхавання дзяўчынак, як і хлопцаў. Пры гэтым функцыі такіх выхавацелек павінны былі ўзяць на сябе маці, на якіх ускладалася галоўная адказнасць за выхаванне і навучанне дзяцей, з мэтай зрабіць іх не толькі адукаванымі людзьмі, але і свядомымі грамадзянамі сваёй краіны.

Такім чынам, сямейны статус прадстаўніцы шляхецкага саслоўя на працягу XVIII ст. вызначаўся як традыцыйнымі фактарамі, звязанымі з грамадскім становішчам бацькоў і мужа, так і некаторымі зменамі ў маёмасных і прававых адносінах, накіраванымі на ўмацаванне яе маёмасных пазіцый. Значную ролю адыгралі і новыя з'явы ў культуры, звязаныя з эмансіпацыйнымі тэндэнцыямі эпохі Асветніцтва, а таксама ў грамадскім уяўленні пра ролю і месца жанчыны, у якім адлюстравалася асэнсаванне тых зменаў, што рэальна адбыліся ў сямейным становішчы шляхцянак.

*С.Д.Дернович* *г. Минск*

## МЕЧИ ЭПОХИ ВИКИНГОВ В МЕЖДУРЕЧЬЕ ДНЕПРА И НЕМАНА (К ПРОБЛЕМЕ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНЫХ КОНТАКТОВ В РАННЕСРЕДНЕВЕКОВЫЙ ПЕРИОД)

Изучение такого предмета вооружения, как меч, представляет определенные возможности для реконструкции и оценки историко-культурных контактов между населением междуречья Днепра и Немана и норманнами в IX-XI в.

Двухлезвийный меч стал известен в этом регионе только на рубеже I – II тыс. н.э. Не встречены мечи и в славянских памятниках Руси, предшествующих образованию Древнерусского государства. На территории Северной Европы это оружие получило распространение уже в первой половине I тыс. н.э., а население балтских, германских, фино-угорских племен познакомилось с двухлезвийными мечами, в первой половине - середине I тыс. н.э. Очевидно, что появление такого оружия в междуречье Днепра и Немана в конце I – начале II тыс. н.э. можно рассматривать как новое явление в материальной культуре, не имеющее локальных прототипов.

В 2000 г. в пойме р.Березины у д.Брили Минской области случайно был обнаружен денежно-вещевой комплекс конца IX века. Помимо монетной части, клад содержал десять весовых гирек, свернутую в спираль шейную серебряную гривну с отрубленными окончаниями прута и меч (типа «Н» – по определению О.В.Иова).

Мечи типа «Н» характеризуются прямой гардой, прямым верхним перекрестьем и простым треугольным навершием. Данные мечи включены в I группу типов в культурно-исторической типологии мечей эпохи викингов. Такие мечи, относящиеся к IX – пер. пол. X в., широко использовались в Европе, особенно в Скандинавии, где они составляют 48 % всех находок клинков эпохи викингов.

В Восточной Европе мечи I группы компактно расположены вдоль «Пути из варяг в греки» у ранних торгово-ремесленных и дружинных центров и отражают проникновение норманнов на Волховско-Днепровский путь, начиная с IX века.

Находка у д.Брили позволяет предположить, что с конца IX века ответвление «Пути из варяг в греки» вдоль р.Березины (правого притока Днепра) – важный коммуникационный участок в направлении Север-Юг.

В 1956 г. на правом берегу Западной Двины, примерно в 2,5 км на восток от Верхнего Замка в Полоцке был обнаружен железный двухлезвийный меч. Находка была сделана на месте проведения строительных работ. На плане Полоцка на гравюре С.Пахоловицкого 1579 г. на восток от города вдоль Западной Двины изображены небольшие холмы, отразившие, по мнению Г.В.Штыхова, курганы. Можно предположить, что меч происходит из разрушенного курганного погребения в окрестностях Полоцка.

Общая длина меча составляет 97 см, длина клинка – 70,7 см, высота рукоятки – 17,3 см, ширина лезвия у перекрестья – 5,5 см, ширина гарды – 10,8 см, высота гарды – 2 см, ширина стержня рукояти – 1,8 см, ширина навершия – 7,7 см, высота навершия – 5,6 см.

Рукоять меча представлена прямой гардой со скругленными концами, прямым верхним перекрестьем также со скругленными концами и сложнопрофилированным (трехдольным) яблоком навершия. Предполагают, что рукоять имела сложную орнаментацию, выполненную в трудоемкой технике отделки: на заранее подготовленную бороздчатую поверхность железной рукояти укладывались, чередуясь между собой, проволоки меди, латуни и серебра, которые после обработки принимали вид плоских пластинок, что и создавало геометрический рисунок. Описание рукояти меча с учетом распределения признаков по функционально-инструментальному (техническому), конструктивному и декоративному уровням подтверждает определение меча из Полоцка как тип «V». Следовательно, меч относится к IV группе типов культурно-исторической типологии мечей викингов.

Мечи указанного типа были распространены на севере европейского континента в первой половине X в. В настоящее время на территории Древнерусского государства известно 13 мечей этого типа, а также экземпляр из Полоцка. Все находки происходят из курганных погребений Юго-Восточного Приладожья, Михайловского могильника, Гнездовского некрополя, из Шестовицы, из Киева. На некоторых клинках имеется надпись ULFBERHT.

В результате специальной обработки поверхности дола полоцкого меча на клинке была выявлена надпись, выполненная латинскими буквами ULFBERHT и дополненная вступительным крестом и разделительным крестом между буквами H и T, к тому же буквы – слитные, т.е., имеют общую сторону. На оборотной стороне клинка выведен знак, состоящий из четырех столбиков, разделенных композицией в виде плетения из пересекающихся полос.

Клинки с надписью ULFBERHT охватывают 14 типов мечей по типологии Я.Петерсена и относятся к концу IX – началу XI в. В странах Европы найдено 188-189 мечей с такой надписью. Находки мечей с надписью ULFBERHT концентрируются в Скандинавии, Юго-Восточной Прибалтике и на Руси. Возможно, надпись первоначально обозначала отдельного франкского мастера, а впоследствии превратилась в своего рода марку или клеймо для высо-

кокачественных клинков, что производились уже группой оружейников или мастерскими, которые локализировались на среднем Рейне. По мнению некоторых исследователей, надпись ULFBERHT могла служить своеобразным знаком качества, которому могли подражать скандинавские и другие нефранкские кузнецы, допуская искажение изображения букв, нарушая их последовательность. Нерешенным остается вопрос, относящийся к расшифровке композиций на обратной стороне мечей с надписью ULFBERHT. Возможно, это ремесленные меты клинков, обозначавшие индивидуального производителя, но не являвшиеся фамильно закрепленными, или начертания, имевшие декоративное и заклинательное значение.

Восточноевропейские мечи типа «V» или группы IV (по культурно-исторической типологии мечей викингов Г.С.Лебедева) сконцентрированы близ ранних торгово-ремесленных и дружинных центров на Волжском и Волховско-Днепропетровском пути и отражают присутствие на Руси варяжских дружин и этапы скандинавской инфильтрации в древнерусскую военно-дружинную организацию и культуру. Можно предположить, что и меч из Полоцка отражает развитие подобных процессов на территории Полоцкой земли. Косвенным подтверждением тому является сообщение письменных источников под 980 годом: «Бъ бо Рогъволодъ пришелъ из-заморья, имяше власть свою в Полотьскъ».

Согласно культурно-исторической типологии мечей викингов, в IV группу может быть включен ещё один меч, найденный в междуречье Днепра и Немана.

В 1854 г. в верховьях Березины, правого притока Немана, был обнаружен железный, согнутый вчетверо, двухлезвийный меч. Находка была сделана при исследовании А.Киркором в д.Городилово курганного погребения, совершенного по обряду трупосожжения.

К сожалению, размеры найденного меча неизвестны. Ф.Д.Гуревич, описывая меч, датировала клинок X веком и предположила, что, «по-видимому, меч имел трехчастную головку». В.А.Булкин, В.Н.Зоценко отнесли меч к типу «X». Действительно, для мечей типа «X» характерна полукруглая головка, выкованная из одного куска со своим основанием, и неширокое относительно длинное перекрестье при отсутствии орнаментации.

Находка меча, сделанная в области водораздела Немана и Вилии, на наш взгляд, является свидетельством присутствия норманнов в зоне разветвленной волоковой системы, что связывала

Неман с Зап. Двиной и Днепром, и отражает усилия выходцев из Скандинавии, направленные на функционирование коммуникации по левым притокам Зап. Двины с выходом на верховья Вилии и Немана.

В 1975 г. примерно в 5,5 км на северо-восток от центра древнего Гродно был обнаружен железный обломанный двухлезвийный меч. Находка была сделана на месте проведения строительных работ, что затрудняет определение археологического комплекса, из которого она происходит. Ширина лезвия у меча из Гродно составляет 5,2 см, ширина перекрестия – 7 см, ширина стержня рукояти – 2,7 см, ширина навершия – 6,2 см, высота навершия – 3,4 см.

Рукоять меча представлена прямой гардой со слегка скругленными концами, с изогнутым вверх верхним перекрестьем со скошенными концами и седловидным яблоком навершия с возвышением в центре. Данная рукоять не имеет украшений. Описание рукояти меча с учетом распределения признаков по функционально-инструментальному, конструктивному и декоративному уровням позволяет нам отнести меч из Гродно к типу «Y» по типологии А.Н.Кирпичникова. Определение меча как тип «V», сделанное Н.В.Николаевым, представляется неверным.

В результате химической расчистки поверхности дола меча на клинке был выявлен одиночный подковообразный знак, который являлся или клеймом, или имел, возможно, магическое значение. Подобные знаки несложного геометрического рисунка отмечают восточные источники IX века в верхней части франкских мечей, хотя такие символические знаки могли стать объектом для подражания в ряде стран. Мечи, на клинках которых имеются буквообразные и геометрические фигуры, известны на Руси, в Прибалтике, Англии, Германии и Скандинавии.

На территории Древнерусского государства известны только три меча типа «Y», которые происходят из курганных погребений X века Юго-Восточного Приладожья, Гнездова, Киева, при этом только на клинке из Приладожья имеется надпись, выполненная латинскими буквами INGLRIIFECI. Подковообразный знак имеется только на находке из Гродно.

Мечи типа «Y», найденные в Восточной Европе, датируются X – началом XI в., в то время как норвежские находки этого типа относятся к X-XI в. Такая датировка меча из окрестностей Гродно и определение его как тип «Y» или тип VI группы, по культурно-исторической типологии мечей викингов Г.С.Лебедева, позво-

ляет предположить, что Гродно как важный пункт р. Неман вошел в «зону скандинавской инфильтрации» на достаточно позднем этапе, когда оружие норманнов, прежде всего, мечи, уже получило дополнительный функционально-технический импульс с Востока, так как выпуклое навершие, выпукло-вогнутая гарда являются конструктивными особенностями кочевнической сабли.

Мечи эпохи викингов, найденные в междуречье Днепра и Немана, отражают следующие тенденции норманнского присутствия в регионе. С конца IX века начинается движение выходцев из Скандинавии вдоль «Пути из варяг в греки», в том числе и по Березине в составе военно-торговых экспедиций в направлении Север – Юг. В X веке формирование и развитие раннефеодальных отношений в Полоцкой земле происходило при участии варяжских дружин. С конца X – первой половины XI в. ощутимо лишь наличие своеобразных «гибридных» форм оружия.

*Г.В.Кудзіна* *г. Брэст*

## СТАРОНКІ З ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНАГА КОБРЫНА

Сучасныя працэсы дзяржаўнага будаўніцтва абумоўліваюць неабходнасць уважлівага даследавання гісторыі беларускай дзяржаўнасці на ўсіх этапах яе існавання. У савецкія часы, як правіла, найбольшая ўвага надавалася вывучэнню агульнадзяржаўных пытанняў. Свядома замоўчваліся многія гістарычныя падзеі, якія адбываліся на гвалтоўна далучаных да Расійскай імперыі землях, а на першае месца пры вывучэнні гісторыі ставіліся падзеі і асобы, якія спрыялі ўмацаванню вялікарасійскай агульнанацыянальнай ідэі. Многія гістарычныя падзеі ўвогуле не знаходзілі месца ў савецкай гісторыі. Школьныя падручнікі па гісторыі БССР амаль нічога не гаварылі пра гісторыю ўзнікнення і развіцця старажытных гарадоў Беларусі.

Я нарадзілася і вырасла ў старажытным заходнебеларускім горадзе Кобрыне. Ён вядомы сваёй гісторыяй, карані якой знаходзяцца ў раннім сярэднявечны, а можа, і значна глыбей.

Першы ўспамін аб Кобрыне сустракаецца ў Іпацьеўскім летапісе, дзе гаворыцца: «Се аз, князь Володимер, сын Васильков, внук Романов, пишу грамоту: дал есьм княгине своей, по своём животе город свой Кобрынь и с людьми, и с данью, како при мне даяли, тако и по мне ать дають княгине моей». Так, у 1287 г. княгіня Вольга Раманаўна атрымала Кобрын у спадчыну.

точки зрения уменьшения нагрузки на учащихся, так и насущной необходимостью внедрения в историческое образование информационных технологий. Последнее к тому же неизбежно ведёт к формализации текста. В таких условиях каждый, кто отважится взяться за написание учебного пособия, особенно школьного, окажется перед дилеммой: как изложить всё богатство исторических явлений прошлого и не скатиться до схематизации истории, где останутся не люди, а навешенные на них ярлыки, не всегда противоречивые события, а однозначно оцененные факты.

Решить такую задачу нелегко. Неверное же решение будет иметь далеко идущие последствия. Об этом ещё без малого двести лет назад предупреждал, пожалуй, самый выдающийся министр народного просвещения за всю историю существования этого ведомства в Российской империи С.С.Уваров. В своей работе «О преподавании истории относительно к народному воспитанию» он (правда, ещё не будучи министром) писал: «Если в тиши кабинета учёный иногда заблуждается в исследовании исторических истин, то на кафедре сие исследование становится стократ затруднительнее, с тою разницею, что на кафедре заблуждение увлекает не одного его, но и учащихся».

Тем не менее, полностью избежать формализации изложения истории в учебных пособиях нынешнего времени вряд ли возможно. Но, по крайней мере, смягчить её последствия – задача вполне доступная для современного уровня отечественной исторической науки. А одним из способов решения этой задачи как раз и может стать, на наш взгляд, учёт семантических трансформаций ряда исторических терминов. Особенно тех, которые несут в себе сильную оценочную нагрузку, связанную с расхождением интересов (экономических, политических, национальных, религиозных и т.п.) у разных социальных групп современного белорусского общества.

Такого рода термины (слова и словосочетания) можно разделить на две группы. Первая группа – это термины, которые появились в определённую историческую эпоху, приобрели соответствующие той эпохе смысл и значение, закрепились в массовом сознании как мыслительные шаблоны и до сих пор сохранили свою эмоциональную окраску (чаще всего негативную). Ко второй группе следует отнести термины, изначальный смысл которых остался в далёком (и не очень) прошлом. Сегодня они воспринимаются людьми совершенно иначе, исходя из реалий и ценностей современного общества.

Терминов первого рода, применительно к изложению истории Беларуси времён вхождения её в состав Российской империи, осталось не так много. В последние годы они активно выводятся из лексикона учебных изданий: например, «колониальная политика» и «национальная окраина» по отношению к территории Беларуси. Однако сохранился и продолжает активно использоваться термин «царизм» и все производные от него словосочетания. О недопустимости таких словоупотреблений говорится уже несколько лет, но реализовать это требование на практике смогли лишь немногие авторы.

Гораздо хуже обстоит дело со второго рода терминами. Перечислить их полностью не представляется возможным. Обратимся лишь к самым, на наш взгляд, актуальным.

Это шаблонные лингвистические конструкции типа «политика русификации», «национально-освободительная борьба», «ограничение демократических свобод», «политические репрессии», «вольнолюбивые мысли», «белорусское общество», «патриотические настроения», «национальное самосознание», «жестокая расправа с участниками восстания», «прогрессивные взгляды», «консервативная политика» (список можно продолжать). На любого человека нашего времени они действуют, как рекламные слоганы, т.е., прочно закрепляются в сознании и вызывают различные (в зависимости от ценностных ориентаций) эмоционально окрашенные реакции. Но у людей, далёких от исторической науки, эти реакции направляются, скорее, не на прошлое, а на настоящее, даже сиюминутное.

Если подобные термины невозможно исключить вообще, то, по крайней мере, использование их в тексте учебных изданий требует обязательного и чёткого объяснения смыслового контекста. Причём не только с учётом новых достижений исторической науки, но и конкретно-исторических условий, т.е., отнесённости к определённой социальной группе, национальной и религиозной общности, политическим целям различных общественных организаций. Иначе неизбежно будет формироваться искажённое представление современных людей о прошлом, а оно, в свою очередь, приведёт к проблемам в социальной идентичности сейчас и скажется на поведении в будущем.

В заключение продолжим цитату из С.С.Уварова: «В народном воспитании преподавание истории есть дело государственное. Не каждому гражданину нужно читать Тацита, но каждому необходимо ясное понятие о главнейших происшествиях истории.

Тэхналогія гэтага віду гаспадаркі ў палеаліце і часткова ў неаліце засноўвалася на прымітыўных прыладах працы, галоўнай з якіх была палка-капалка, а пазней – косці або рог жывёлы і гэтак далей. Паляванне – галоўны напрамак працэсу палявання вызначаўся ўдасканаленнем 2 асноўных спосабаў атрымання здабычы: 1) стацыянарных сродкаў і прылад палявання (лоўчыя ямы, капканы і г.д.); 2 механічных лятальных прылад палявання (павелічэнне сілы палёту, дальнасці пападання дзіды, стралы і г.д.) [Галубовіч В.І. Эканамічная гісторыя Беларусі. – Мн., 1996. – С. 68].

Развіццё абодвух напрамкаў ішло шляхам не збірання, а ўзбагачэння вопыту ад эпохі да эпохі.

У рыбалоўстве выкарыстоўвалі сетку яшчэ ў мезаліце.

Чалавек карыстаўся самымі рознымі прыёмамі і спосабамі апрацоўкі крэмню і здолеў атрымаць такія прылады працы, якія здавальнялі яго патрэбы на розных этапах першабытнага грамадства. Так, у палеаліце і мезаліце шырокае распаўсюджванне атрымалі рубіла, скрэблы, крамянёвыя нажы. У неаліце з'явіліся больш складаныя, ужо шліфаваныя прылады, напрыклад, цёслы, матып, каменныя сякеры [Рыер Я.Г. Развіццё сярэдневяковай вёскі на тэрыторыі Беларусі і ў суседніх землях. – М., 1996. – С. 28]. Яшчэ больш разнастайнымі, а галоўнае, больш прадукцыйнымі сталі прылады працы ў жалезным веку, які наступіў на Беларусі ў сярэдзіне I тыс. да н.э.

Па меры ўдасканальвання прылад працы змянялася і гаспадарчая дзейнасць людзей, з паўднёвых і паўднёва-заходніх раёнаў распаўсюджвалася і земляробства. Падсечная сістэма не патрабавала якіх-небудзь складаных прыстасаванняў. Для вызвалення ад лесу выкарыстоўвалі сякеры, для рыхлення попелу – лапаты, матыкі, для загортвання сямян – бараны. Сярод апошніх спрадвеку выкарыстоўвалі так званыя «сухаваткі», якія звычайна рабілі з елкі. З другой паловы I тыс. вядомы і бароны з жалезнымі шыпамі на драўлянай раме.

Складаны шлях прайшлі ў сваім развіцці ворыўныя прылады. Вывучаць іх гісторыю даволі цяжка, бо драўляныя дэталі захоўваліся дрэнна. Найбольш ранім у лесустэпу і ў лясной зоне яшчэ з жалезнага веку было рала. У VI–VII ст. у лесустэпу з’явілася рала з палазам. Такія рала рабілі баразну шырынёй 8-23 см, заходзілі на глыбіню 10-15 см [Там жа. – С. 52].

Але ў лясной зоне такое рала было прыдатным толькі на абальных і старапашных землях. На лясных расчыстках яму перашкаджалі карэнні. Таму тут стала распаўсюджвацца саха. Мел-

кая глыбіня арання (каля 7 см) рабіла прыладу манеўрэннай, яна лёгка абыходзіла перашкоды. Адны даследчыкі лічаць, што сохі ўзнiклi ад рал, іншыя – што ад бараны – суховаткі. З'яўляюцца сохі ў IX–X ст., а ў XII –XI ст. у лясной зоне акціўна выцясняюць рала. Вораўная прылада плужнага тыпу рала з адвалам з'явілася ў лесастэпу ў VIII – X ст. [Дмітрачкоў П.Ф. Старажытная гісторыя Беларусі. – Мн., 1999. – С. 16]. Тады ж яна стала вядома на поўдні лясной зоны. Але распаўсюджанне сталага плуга з усімі яго атрыбутамі большасць даследчыкаў адносяць да XIII-XIV ст. Але ёсць меркаванне аб з'яўленні асноўных элементаў плугаў XI-XII ст. Плуг марудна распаўсюджваўся па прычыне вялікай цаны. Да таго ж, ён патрабаваў пры аранні некалькіх пар валоў.

Галоўнымі прыладамі збору ўраджаю былі сярпы. Радзей выкарастоўваліся косы, т.зв. гарбушы. Абмалот рабілі, у асноўным, цапамі. У землеробаў былі таксама вілы – калатушы.

Такім чынам, па меры ўдасканалення прылад працы мянялася і гаспадарчая дзейнасць людзей. Калі ў каменным веку яна насіла прысвойваючы характер і была звязана са збіральніцтвам, паляваннем і рыбалоўствам, дык з наступленнем веку металаў на Беларусі з'яўляецца і даволі хутка развіваецца вытворчая ці вырабляючая гаспадарка, заснаваная на жывёлагадоўлі і земляробстве. Важным дасягненнем эпохі мезаліту было прымяненне груба абітага тапара, забяспечанага драўлянай ручкай.

*А.М. Янушкевіч* *г. Мінск*

## СУТНАСЦЬ ІНФЛЯНЦКАЙ ПАЛІТЫКІ МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ НА ПАЧАТКОВЫМ ЭТАПЕ ІНФЛЯНЦКАЙ ВАЙНЫ 1558 – 1570 г.

Перадгісторыя і пачатковы перыяд Інфлянцкай (Лівонскай) вайны 1558 –1570 г. уяўляюць асаблівую цікавасць для даследчыка, бо менавіта на пачатку вайны завязаўся той клубок супярэчнасцяў, які вызначаў спецыфічную сутнасць інфлянцкага канфлікту ў шэрагу войнаў паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ у XV-XVII ст.

Характарыстыку падзей Інфлянцкай вайны, зробленую савецкімі гісторыкамі, на сённяшні момант нельга назваць здавальняючай з прычыны яе ідэалагічнай заангажаванасці і бескрытычнага стаўлення да сведчанняў крыніц. «Развянчанне» старых по-

глядаў, ужо паспеўшых стаць у нейкай ступені стэрэатыпнымі, дазволіць убачыць Інфлянцкую вайну ў іншым ракурсе, больш адпавядаючым, на нашу думку, гістарычнай рэчаіснасці.

У 1554 г. скончваўся тэрмін перамір'я паміж Інфлянтамі і Масковіяй. З мэтай яго працягу ў Маскве адбыліся перамовы, якім было наканавана стацца вузлавым момантам у шэрагу падзей, прывёўшых да вайны.

У выніку перамоў было падпісана прынцыпова новае пагадненне. Новае значэнне атрымаў пункт аб «юр'еўскай даніне». Згодна з гэтым пунктам, Дэрпцкае біскупства павінна было выплаціць пскоўскаму намесніку вялікую грашовую суму, якую дэрптцы завінаваціліся за апошнія 50 год. Для правядзення збору даніны даваўся трохгадовы тэрмін. Прыняцце Дэрпцкім біскупствам абавязкаў па выплаце даніны азначала прызнанне сваёй залежнасці ад Маскоўскай дзяржавы, што стварала для апошняй магчымасці ўмешвацца ва ўнутраныя справы Інфлянтаў.

У гістарыяграфіі выказвалася меркаванне, што дамова 1554 г. з'яўлялася своеасаблівай дыпламатычнай падрыхтоўкай да вайны. Аднак логіка падзей сведчыць на карысць думкі, што Масква бачыла і мірныя альтэрнатывы вырашэння пастаўленых задач. Ультыматыўны тон некаторых артыкулаў дамовы, на наш погляд, павінен быў падкрэсліць рашучасць маскоўскага боку ў дасягненні ўласных мэтаў. Урад Івана IV цярпліва чакаў сканчэння трохгадовага тэрміну і не займаўся пошукам новых зачэпак да вайны, хоць пры жаданні іх можна было знайсці дастаткова. Магчымасць вайны, зразумела, не выключалася, аднак, да 1558 г. маскоўскае кіраўніцтва абмяжоўвалася дыпламатычнымі сродкамі для змянення статусу маскоўска-інфлянцкіх адносін.

У тэксце дамовы, заключанай у 1554 г., меўся таксама пункт пра забарону ўступлення Інфлянтаў у ваенныя хаўрусы з Польшчай, Літвой і Швецыяй. 14 верасня 1557 г. паміж ВКЛ і Інфлянтамі было падпісана патаемнае пагадненне аб вайсковай узаемадапамозе, якое павінна было пачаць дзейнічаць пасля сканчэння ў 1562 г. перамір'я ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай. Калі б у гэтыя гады Інфлянцкая дзяржава падверглася інтэрвенцыі, ВКЛ не была абавязана дапамагаць свайму паўночнаму суседу.

На гэты факт мала хто з даследчыкаў звяртаў увагу. У той жа час парушэнне гэтага артыкула дамовы 1554 г. лічылася ў гістарыяграфіі непасрэднай падставай для распачынання Інфлянцкай вайны. Пры гэтым пытанне «юр'еўскай даніны» адыходзіла на другасны план. Але больш справядлівым, на нашу думку, будзе памяняць іх месцамі.

Іван Шаскольскі пераканаўча паказаў, што артыкул пра забарону заключаць ваенныя пагадненні з ВКЛ пераходзіў з пачатку XVI ст. з дамовы ў дамову, маючы толькі фармальнае значэнне. Нідзе ў крыніцах, якія з'явіліся на свет напярэдадні ці ў пачатку Інфлянцкай вайны, няма згадак пра парушэнне гэтага пункту як падставу для развязвання вайны.

Хуткасць інфармацыйнага абмену ў сярэднявеччы была невялікай. У XVI ст. сістэма сталых камунікацый яшчэ толькі-толькі наладжвалася. Замкнёнасць Масковіі, яе непрыхільнасць да еўрапейскага свету стваралі дадатковыя цяжкасці для рухання інфармацыі. Гэтая праблема настолькі важная і цікавая для разумення месца і ролі Маскоўскай дзяржавы ў Еўропе, што патрабуе спецыяльнага пільнага вывучэння. Што датычыць нашай тэмы, то, па ўсёй верагоднасці, на пераломе 1557-1558 г. у Маскве не ведалі ні аб восеньскай выправе паспалітага рушання ВКЛ на Інфлянты, ні аб заключаным у Пазволі антымаскоўскім пагадненні. Слабая інфармаванасць маскоўскага кіраўніцтва не спрыяла апаратыўнаму ўлічванню зменаў у міжнароднай абстаноўцы. Падобны стан рэчаў меў і адваротнае ўздзеянне. У Маскве, пэўна, лічылі, што яе адносіны з Інфлянтамі нікога не павінны датычыць, апрача іх самых. Такая самаізаляцыя не дазваляла рабіць слушных прагнозаў наступстваў уласных дзеянняў.

22 студзеня 1558 г. выправай маскоўскага войска ўглыб Інфлянтаў распачалася Інфлянцкая вайна 1558–1570 г. Як аказалася, у гэтай акцыі былі вельмі цьмяныя мэты з ваенна-стратэгічнага гледзішча. Па сваім характары гэтая выправа нагадвала тагачасныя набегі крымскіх татараў на рускія землі, без відочнай задачы захопу тэрыторыі. Цікава, што асноўную масу войска складалі асобы татарскага паходжання.

На нашу думку, рабаўнічы характар студзеньскай акцыі сведчыць аб пераследаванні маскоўскім урадам не столькі палітычных мэтаў, сколькі аб спробе кампенсаваць выдаткі, звязаныя са зборам і пастоем маскоўскіх ваенных атрадаў, сабраных на інфлянцкай мяжы ў лістападзе 1557 г. У гэтым годзе на прасторах Усходняй Еўропы здарыліся вялікія неўраджаі, якія закранулі і Масковію. Гэта выклікала істотнае пагаршэнне гаспадарчай і фіскальнай сітуацыі. Папаўзлі ўверх кошты на зброю. Маскоўскае войска спадзявалася атрымаць заробак з рук інфлянцкіх паслоў, якія, згодна з дамовай 1554 г., павінны былі прывезці даніну ў выглядзе грашовай сумы напрыканцы 1557 г. Аднак гэтыя спадзяванні аказаліся дарэмнымі.

Невыкананне варункаў дамовы 1554 г. сталася зручнай падставай для распачынання ваенных дзеянняў супраць Інфлянтаў. Ні міжнародная абстаноўка, ні, як убачым, уласныя знешнепалітычныя планы не спрыялі гвалтоўнаму нападу на ўсходнюю Прыбалтыку. Уяўная лагічнасць развіцця падзей хавае за сабой авантурны чын маскоўскага кіраўніцтва на чале з Іванам IV. Цяжка назваць гэтае мерапрыемства добра прадуманым. Геранім Гофман, пасол германскага імператара Фердынанда І, так малюе стан цара, калі той даведаўся, што ў інфлянцкіх паслоў няма ні грошай, ні адпаведных паўнамоцтваў: «*...вялікі князь раз'юшыўся на іх і казаў абодвум пасольствам* (гаворка ідзе пра пасольствы ордэнскага магістра і дэрпцкага біскупа), *ці не лічаць яны яго за дурня, (...) і загадаў спустошыць дэрпцкае біскупства і ўсе Інфлянты агнём*».

Маскоўскае войска праводзіла ў Інфлянтах сапраўдную палітыку «выпаленай зямлі». Пра вынікі выправы маскоўскія ваяводы дакладвалі цару: «*А Немецкую землю повъевали и выжгли и людей побили в многих местех и полону и богатества множества поймали*». Дзеянні маскоўскага кіраўніцтва робяцца тым больш незразумелымі, калі паглядзець на ход падзей на паўднёва-заходняй мяжы Маскоўскай дзяржавы.

«Галавакружэнне ад поспехаў» – ад узяцця Казані ў 1552 г. і падпарадкавання Астрахані ў 1554 г. – прымусіла Івана IV звярнуць увагу і на крымскую праблему. Бой пад Судзьбішчамі ў 1555 г. засведчыў пераход Масковіі ў змаганні з крымскімі татарамі да актыўных наступальных дзеянняў. У гэты час ужо ішла бурлівая дзейнасць па пабудове новых памежных гарадкоў у «Полі» – своеасаблівым буферы паміж Маскоўскай дзяржавай і Крымскім ханствам. Адбылося аднаўленне станічнай службы, якая ў наступныя гады паспяхова папярэджвала маскоўцаў пра крымскія набегі. У 1556 г., бачачы поспехі маскоўскіх вайскоўцаў, на іх бок пераходзіць знакаміты палкаводзец Дзмітры Вішнявецкі, які адразу ж прынёс шмат клопатаў крымскім татарам.

Маскоўская дыпламатыя таксама не бяздзейнічала. Імкнучыся павялічыць шанцы перамогі, маскоўскае кіраўніцтва ў 1555 г. прапаноўвае Вялікаму княству Літоўскаму заключыць антыкрымскае пагадненне і разам арганізаваць вялікую ваенную аперацыю супраць «бусурман». У снежні 1557 г., калі Інфлянцкая вайна павінна была здавацца непазбежнай, Іван IV рашуча адмаўляецца ад крымскіх прапаноў аб міры і саюзе супраць ВКЛ, даводзячы праз пасла да ведама Жыгімонта Аўгуста свае намеры: «*...над пе-*

*рекопским ныне промышляти хочет, сколко ему государю нашему Бог помочи подаст, а на христьянство с ним заодин стояти не хочет, а хочет того, чтоб как ему христьянству избаву учинити от насилованья татарского».*

З пачаткам Інфлянцкай вайны сітуацыя не змянілася. Адначасова з паходам на Інфлянты *«беречи своего дела над Крымским царем»* адпраўляецца з пяцітысячным атрадам Дз. Вішнявецкі. 19 лютага 1558 г. у Літву накіроўваецца маскоўскі пасол Раман Алфер'еў з чарговай прапановай антыкрымскага хаўрусу. Маскоўскае кіраўніцтва не спыніла сваіх настойлівых намаганняў па стварэнню антыкрымскай кааліцыі і пасля поспехаў у Інфлянтах – захопу Нарвы і Дэрпта. Яшчэ вясною 1560 г., калі ўжо выспяваў маскоўска-літоўскі канфлікт з-за Інфлянтаў, Іван IV прапаноўваў ліцвінам *«о добре хрестьянском промышляти с нами заодин».*

Адмова ад перамір'я з Крымскім ханствам, прапанова антыкрымскага хаўрусу Літве і аднačасовае разгортванне ваенных дзеянняў у Інфлянтах сведчаць аб недальнабачнасці маскоўскага ўрада. Масква не ўлічвала таго факту, што ў ВКЛ могуць быць уласныя інтарэсы ў Інфлянтах. Логіка далейшых падзей паказвае, што сутнасцю гэтых інтарэсаў было нежаданне аддаваць стратэгічна важную тэрыторыю ў рукі свайго галоўнага праціўніка.

Масква працягвала патрабаваць ад інфлянцаў выканання варункаў дамовы 1554 г. і далейшага вядзення перамоў: «...*будет у вас хотение перед государем исправитца и вперед кровь уняти, и вы бы прислали бити челом государю».* У бачанні маскоўцаў *«кровь пролилася от вашего неизсправления и крестного преступления».* Цікава, што пасля буйных поспехаў у Інфлянтах – узяцця Нарвы і Дэрпта, – тон размовы з інфлянцамі змяніўся. Цар патрабаваў цяпер падпарадкавання сабе магістра Ордэна: «...*похочет магистр государева жалования* (падкрэслена мною. – А.Я.), *и он бы сам был бити челом и, по его челобитью посмотря, государь его пожалует...».* Гэта першае паведамленне пра інкарпарацыйныя намеры Крамля.

Захоп гэтых двух важных гарадоў меў вялікае значэнне. Маскоўская дзяржава знайшла ў Нарве першакласны марскі порт, вельмі зручны па сваім геаграфічным размяшчэнні. Мінімум гандлёва-эканамічных задач, якія стаялі перад маскоўскім урадам, калі зыходзіць з палажэнняў савецкіх гісторыкаў аб прычынах Інфлянцкай вайны, быў выкананы. Ужо ў 1560-1561 г. наступствы «нарвенскага мораплавання» добра адчуваліся. Выхад да мора быў дасягнуты, і далейшае вядзенне вайны з'яўлялася бессэнсоўным

з гледзішча патрэбаў знешняга гандлю Маскоўскай дзяржавы. Авантурыстычная сутнасць вайны за Інфлянты ў будучыні дыктавалася прычынамі іншага характару. Тут крыецца яшчэ адно слабое месца савецкай канцэпцыі Інфлянцкай вайны.

Спачатку здавалася, што Масква задаволіцца дасягнутымі поспехамі. У сакавіку 1559 г. маскоўскі ўрад заключае перамір'е з Інфлянцкай дзяржавай да лістапада 1559 г. Пасрэднікам пры заключэнні выступілі дацкія паслы, якія паручыліся за прыезд у Маскву ордэнскага магістра. Гэтае перамір'е было фатальнай памылкай маскоўцаў. Інфлянты выкарысталі гэтую перадышку для пераходу пад апякунства ВКЛ (дамова ад 31 жніўня 1559 г.) і падрыхтоўкі контрнаступу, якое адбылося ўвосень яшчэ да сканчэння тэрміну перамір'я. Хуткі пераход канфлікту за межы маскоўска-інфлянцкіх адносін быў нечаканым для Крамля.

Незадоўга да падпісання перамірных граматаў, у лютым 1559 г., ладзіцца вялікая выправа на Крым на чале з Дз.Вішнявецкім і Д.Адашавым. У іх планы ўваходзіла высадка на Крымскім паўвостраве і нанясенне ўдараў па татарах у самым сэрцы іх дзяржавы. Цалкам магчыма, што перамір'е з Інфлянтамі было заключана з прычыны засяроджвання ўвагі на крымскім кірунку. Рэалізацыяй гэтай аперацыі маскоўскі ўрад хацеў паказаць літоўскім паслам, якія знаходзіліся ў гэты час у Маскве, сваё шчырае жаданне знішчыць крымскае «гняздо».

Такім чынам, 1555–1560 г. былі для Маскоўскай дзяржавы часам, калі яна вагалася паміж двума прыярытэтамі сваёй знешняй палітыкі, лічачы, што ёй хопіць сілаў для паспяховых дзеянняў на абодвух напрамках – крымскім і інфлянцкім. Пры гэтым выразна прасочваецца дамінацыя крымскай палітыкі. Раскол сілаў зрабіў дрэнную паслугу маскоўцам. Ваенныя дзеянні супраць Інфлянтаў не вылучаліся ні строгай планамернасцю, ні паслядоўнай мэтанакіраванасцю. Можа здацца крыху дзіўным, але Масква займала пасіўную пазіцыю і прадпрымала ваенныя акцыі толькі ў адказ на неадэкватныя крокі інфлянцкага боку. Гэта быў хутчэй працяг дыпламатыі, але ўжо з выкарыстаннем збройных метадаў, мэтай якой было ператварэнне Інфлянцкай дзяржавы ў свайго васала.

Не выканаўшы цалкам пастаўленых перад сабою задач, Маскоўская дзяржава змагла амаль што беспярашкодна акупаваць паўночна-ўсходнюю частку Інфлянтаў з такімі важнымі стратэгічнымі пунктамі, як Нарва, Дэрпт, Фэлін. На поспехі маскоўцаў, якія выклікалі агонію інфлянцкіх дзяржаўных структураў, імкліва

зрэагавалі суседнія краіны – ВКЛ, Данія, Швецыя. Іх уступленне ў вайну сталася непрыемнай нечаканасцю для маскоўскага боку. Пасля канчатковага распаду Інфлянцкай дзяржавы ў 1561 г. Масковія была ўцягнута ў сур'ёзны міжнародны канфлікт, наступствы якога адмоўна адбіліся на гістарычным развіцці Расійскай дзяржавы.

*С.А.Чаропка* *г. Гомель*

## ДЫСКУСІЯ АБ ХАРАКТАРЫ ВАЙНЫ 1648–1651 г. на БЕЛАРУСІ

Пытанне аб характары вайны 1648–1651 г. на беларускай зямлі з'яўляецца даволі актуальным на сённяшні дзень, бо нават у айчыннай гістарыяграфіі існуе далёка не адна трактоўка гэтай падзеі. Дарэчы, тэма вайны 1648–1651 г. на Беларусі спецыяльна не даследавалася і не вывучалася ў беларускай гістарычнай навуцы, а за савецкім часам і не вылучалася з так званай «вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648–1654 г.».

Вядомы беларускі гісторык пачатку XX ст. У.М.Ігнатоўскі тлумачыць падзеі 1649-1651 г. на Беларусі як казацкае паўстанне, якое вылілася ў нацыянальна-вызваленчую, антыкаталіцкую барацьбу беларускага народа супраць палякаў. «Усе, хто не мог зносіць сацыяльна-рэлігійнага і нацыянальнага ўціску, пачалі гуртавацца». Асаблівую ўвагу ён звяртае на класавую барацьбу беларускага сялянства і мяшчанства супраць шляхты: «Чуткі аб паўстанні казакоў і мужыкоў разышліся па ўсёй Беларусі...Ніжэйшыя станы спачувалі ім...Абодвы лагеры біліся да апошняга, ведаючы, што літасці ні з таго, ні з другога боку не будзе».

З пункту гледжання Л.С.Абэцэдарскага, як адзначаюць аўтары «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», – «прадстаўніка вульгарна-сацыялагічнага кірунку ў гістарычнай навуцы Беларусі савецкага перыяду», падзеі на Беларусі ў 1648–1651 г. былі часткай агульнага для насельніцтва Беларусі і Украіны працэсу нацыянальна-вызваленчай барацьбы з-пад польскага панавання дзеля ажыццяўлення галоўнай мэты – «уз'яднання» з Расіяй. «Барацьба украінскага і беларускага народаў у сярэдзіне XVII ст. за аб'яднанне са сваім старэйшым братам – вялікім рускім народам у адзінай Рускай дзяржаве мела вялізнае гістарычнае значэнне». Між тым аўтары калектыўнай працы «Історія України» адзначаюць: «Б.Хмель-

ницький відзначав можливість замирення з Річчю Посполитою лише за умови визнання її урядом незалежності козацької України в тих кордонах, що «володіли благочестиви великі князи». Л.С.Абэцэдарскі прызнае, што «паўстанне ў Беларусі мела ярка выражаны антыфеадальны характар», і на падставе гэтага абгрунтоўваецца меркаванне, што вайна ішла за зняржэнне феадальнай сістэмы ўвогуле, пры гэтым нацыянальна-вызваленчы фактар ён абсалютызуе. Спрэчным з'яўляецца меркаванне аб тым, што з'яўленне казакоў Хмяльніцкага на Беларусі выклікана памкненнем падтрымаць народны рух на Беларусі. Як адзначае калектыў аўтараў, якія склалі для вайскоўцаў вучэбны дапаможнік па гісторыі Беларусі, «Б.Хмяльніцкі яшчэ ў маі 1648 г. пачаў засылаць...сваіх агітатараў, а затым казацкія загоны для пачатку ваенных дзеянняў. Такім чынам у паветах...інспіраваўся вызваленчы рух мясцовага насельніцтва». Гэта цікавая думка, асабліва калі ўлічыць тую акалічнасць, што масавы сялянскі і мяшчанскі рух разгортваўся менавіта ў тых мясцінах, дзе дзейнічалі казацкія загоны. Апроч таго, варта зазначыць, што пасля вываду казацкіх загонаў з Беларусі паводле Белацаркоўскага мірнага дагавора, масавы сялянскі і мяшчанскі рух сціхае. Рух уласна беларускіх сялян быў досыць сціплы і меў лакальны характар. Дарэчы, сам Абэцэдарскі ўскосна пацвярджае, што ўварванне казакоў на Беларусь было звязана, між іншым, з неабходнасцю забеспячэння спакою на флангах войска Хмяльніцкага.

Іншы падыход да праблемы вызначэння характара ваенных падзей на Беларусі ў 1648–1651 г. прапанаваў В.І.Мялешка. Ён сцвярджае, што «барацьба мела ярка выражаны антыфеадальны характар...ні сяляне, ні гарадскія нізы тады яшчэ не ставілі за мэту змену феадальнай фармацыі і нацыянальнае вызваленне». З гэтага фактычна вынікае, што падзеі на Беларусі напрыканцы 40 – напачатку 50-х г. XVII ст. уяўляюць сабою грандыёзнае сялянска-мяшчанскае паўстанне, пачатак якога падштурхнула вызваленчая барацьба ўкраінскага народа пад кіраўніцтвам Б.Хмяльніцкага.

Дзеля асэнсавання прычын баявых дзеянняў на Беларусі 1648–1651 г. трэба разгледзець сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча ў Вялікім княстве Літоўскім напярэдадні ваенных падзей. Знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай і ВКЛ як яе часткі ў сярэдзіне XVII ст. было досыць цяжкім. Гэта звязана з узмацненнем Рускай дзяржавы на ўсходзе, якая была незадаволена вынікамі Смаленскай вайны 1632–1634 г. і рыхтавалася да новай агрэсіі. З поўдня пагражала Асманская імперыя, на поўначы

ўсё больш умацоўвалася Швецыя, з якой у Рэчы Паспалітай былі тэрытарыяльныя спрэчкі.

У грамадскім жыцці ўзмацніліся супярэчнасці, у першую чаргу выкліканыя ўмацаваннем у сельскай гаспадарцы фальварковай сістэмы. Новая сістэма, заснаваная на паншчыне, прывяла да ўзмацнення эксплуатацыі сялян, што выклікала натуральны пратэст, які праявіўся ў форме «паказачвання». Значна ўскладняла сацыяльныя супярэчнасці, звязаныя з рэлігійным і нацыянальным пытаннямі. Праваслаўная царква пасля Берасцейскай уніі 1596 г. паступова страчвала свае пазіцыі ў грамадстве ВКЛ, таму дзеля захавання свайго статусу распаўсюджвала сярод сваёй паствы – у асноўным беларускага сялянства і мяшчанства – антыўніяцкія настроі. Шляхта, «манячыся «вольнымі хрысціянскімі правамі каруны Польскай», якія даюць ім эканамічную карысць», усё больш актыўна пераходзіць у каталіцтва, што аўтаматычна ў той ці іншай меры цягнула за сабою апалячванне. Такім чынам, шляхта і сялянска-мяшчанскае насельніцтва Беларусі пачынаюць усё болей дыстанцыравацца адзін ад аднаго. «Магнацка-шляхецкая беларуская інтэлігэнцыя кідае культуру працоўных мас народа, да якога яны належалі, і скіроўвае ў польскі бок. На варце беларускай культуры засталіся «худыя і няслаўныя» клясы грамадзянства, якія разам з тым узялі на сябе і сацыяльную апазіцыю».

Падсумоўваючы вынікі, варта адзначыць, што сукупнасць вышэйпаказаных працэсаў і стварыла падмурак для паўстання сялянства і гарадскіх нізоў. У якасці мэты паўстання на Беларусі было не «ўз'яднанне з Расіяй» або знішчэнне феадальнага ладу ў цэлым. Падзеі 1648–1651 г. на Беларусі – гэта барацьба ніжэйшых слаёў грамадства, якая была справакавана паўстаннем казакоў на Украіне і іх уварваннем на Беларусь, супраць усеўладдзя шляхты, з мэтай яе поўнага вынішчэння. Антыпольская накіраванасць сялянска-мяшчанскага руху на Беларусі праявілася ў большай меры не ў барацьбе супраць польскага панавання, а ў змаганні з польскай культурнай экспансіяй, з носьбітамі польскай культуры на Беларусі – беларускай шляхтай.

*Т.Б.Блинова* *г. Гродно*

# ОСНОВНЫЕ ЭТАПЫ ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОРДЕНА ИЕЗУИТОВ В БЕЛАРУСИ: конец XVI – 1820 г.

На основании исторических документов, главным образом ежегодных каталогов, находящихся в архиве издательства «Apostolstwa modlitwy» в Кракове, можно выделить следующие этапы этого процесса. Для первого (конец XVI в. – 1648 г.) характерно возникновение учебных заведений «Общества Иисуса» в крупнейших городах Беларуси: Полоцке, Несвиже, Орше, Бресте, Гродно, Пинске и Витебске. Причем в Несвиже с 1626/1627 учебного года действовали высшие школы. Это стало возможным благодаря поддержке королевской власти, а также крупнейших магнатов Великого княжества Литовского, разорвавших с реформацией и перешедших в лоно католической церкви. Последняя имела немало приверженцев на территории Беларуси ещё до приезда иезуитов, а с появлением таких крупнейших деятелей контрреформации, как П.Скарга, М.Смиглецкий, С.Варшевицкий, Я.Вуйек и других, авторитет и позиции католической церкви все более укреплялись. Этому способствовали следующие причины. К моменту появления в Беларуси они накопили не только богатейший опыт миссионерской деятельности, но и педагогической работы в разных странах, в которых имелись свои особенности реформационного движения. Кроме того, иезуиты являлись проводниками западноевропейской культуры. Так, например, благодаря им жители Беларуси познакомились с театральным искусством. Для привлечения как можно большего количества молодежи в учебные заведения ордена даже некоторое время преподавался белорусский язык. Правда, с внедрением «Ratio studiorum» 1599 г. его изучение учениками прекратилось, и в школах использовался только польский язык. На это обстоятельство в свое время обращал внимание профессор Казанского университета К.В.Харлампович. К сожалению, его работа длительное время не была известна широкому кругу исследователей. Следует отметить также то, что в указанный период орден требовательно относился к подготовке учителей. О работе отдельных из них писал в конце XIX в. И.Я.Митрошенко. К их числу следует отнести и С.Госа (Гурского), А.Слаского, Р.Бокшу, А.Брухмана, Н.Кмитица и, конечно же, М.К.Сарбевского, сыгравшего огромную роль в мировой культуре.

Второй этап педагогической деятельности «Общества Иисуса» охватывает большой промежуток времени: с 1648 по 1740 г. В это время развитию школьного дела помешали военные действия середины XVII в., тяжелым последствием которых был глубокий демографический кризис. Затем последовала Северная война, принесшая ему неисчислимые бедствия. Иезуиты активно занимались миссионерством и, следовательно, организацией новых школ. Появились учебные заведения «Общества Иисуса» в Новогрудке, Мыши (прекратило свое существование в 1693-1694 учебном году), Минске, Бобруйске, Мстиславле, Слуцке, Жодишках, Слониме и Мозыре. К действовавшим высшим школам в предшествующее время присоединились высшие школы в Пинске (с 1683-1684 учебного года), Гродно (с 1700-1701 учебного года). Однако работе последней помешала Северная война. Преподавание философских дисциплин там возобновилось в 1709-1710 учебном году, и вплоть до 1773 г. высшая школа в Гродно работала без перерывов, Новогрудке (1713-1714 учебный год), Бресте и Минске (с 1729-1730 учебного года). В результате иезуиты захватили монополию в школьном деле. Однако прежние позиции, достигнутые в этом направлении на первом этапе, были утрачены. Это выразилось в ухудшении профессиональной подготовки учителей и, следовательно, в снижении уровня преподавания дисциплин и знаний учащихся. Руководство ордена иезуитов знало о неудовлетворительном состоянии школьного дела и несколько раз присылало визитаторов для выработки правильных мер по исправлению этих недостатков. Иезуиты мучительно искали выход из создавшегося положения. Однако к концу этого периода на пальму первенства в школьном деле серьезно претендовали пиары во главе с С.Конарским, развернувшие энергичную работу по созданию своих заведений. В этой обстановке «Общество Иисуса», боясь утраты монополии, активизировало свою деятельность на учебном поприще. Начался третий этап его педагогической деятельности, длившийся с 40-х годов XVIII в. по 1773 г.

Орден иезуитов развернул активную деятельность по подготовке учителей. Наиболее отличившихся своих членов, главным образом из числа молодежи, хорошо зарекомендовавших себя в учебе и работе в школе, он посылал за границу к знаменитым учителям. Иезуиты, вернувшиеся из-за границы, охотно делились приобретенными там познаниями со своими собратьями по ордену. Они рассказывали о Вольтере, Монтескье, Руссо, Дидро и других деятелях эпохи Просвещения, произведения которых получи-

ли широкое распространение в Европе. В своей работе иезуиты не могли пройти мимо их идей. Руководство ордена осуществляло подготовку учителей по иностранным языкам, истории, географии, военной и гражданской архитектуре и другим гуманитарным дисциплинам. Одновременно шел процесс создания нескольких учебников по ним. Лучшие из них внедрялись в учебный процесс. Иезуиты подняли преподавание латинского языка на уровень, соответствующий «Ratio studiorum». Однако они не смогли вернуть былое значение греческого языка, т.к. молодежь не проявляла к нему интереса. Стремясь соответствовать эпохе, иезуиты стали уделять повышенное внимание изучению учениками польского языка. Однако к 1773 г. реформирование своих средних учебных заведений орден не завершил. В результате развернувшейся антирелигиозной борьбы иезуиты были изгнаны из ряда европейских стран, а затем последовала булла Климента XIV 1773 г., запретившая деятельность иезуитов во всем мире.

И в это сложное время орден продолжал создавать в Беларуси свои средние и высшие учебные заведения. С 1756-1757 уч. года начала свою деятельность Юровичская школа. В разные годы этого этапа преподавание философии осуществлялось в Витебске и Мстиславле (в обоих городах с 1741-1742 уч. года) и Слониме (1749-1750 уч. года). Однако некоторые школы прекращали свою работу, как это произошло в Мстиславле (1752-1753 уч. год оказался последним годом её истории). К 1773 г. в Беларуси насчитывалось 17 школ, из них высших было 8, средних – 8, в Мозыре имелась только должность «школьного профессора».

Четвертый этап характерен только для Полоцкой, Оршанской, Витебской коллегий, а также Могилевской и Мстиславской резиденций (две последние стали резиденциями в 1779 г.), т.к. благодаря Екатерине II «Общество Иисуса» было сохранено в Восточной Беларуси, отошедшей к Российской империи после первого раздела Речи Посполитой в 1772 г. (На остальной территории после 1773 г. иезуитские учреждения перешли в ведение Эдукационной комиссии – первого в истории Европы Министерства народного просвещения Речи Посполитой.) Этот этап подразделяется на два периода. Первый охватывает промежуток времени с 1772 по 1812 г., т.е., до времени открытия Полоцкой иезуитской Академии. Второй длился с 1820 г. до 13 марта 1820 г. – издания указа Александра I об изгнании иезуитов из пределов Российской империи.

Иезуиты первыми из всех монашеских орденов, обосновавшихся в Беларуси, присягнули на верность Екатерине II. Она не замедлила осыпать последних привилегиями. Императрица освободила иезуитов от всех налогов и запретила оглашать в России кассационную буллу. К этому же году, а возможно, и к следующему, т.е., к 1775 г., относится ответ викариуша С.Черневича генерал-губернатору З.Г.Чернышеву, в котором он дал краткую характеристику состояния учебного дела в ордене, ознакомил с основными трудностями, которые стояли перед руководством «Societatis Jesu». Они состояли в следующем. Во-первых, материальные богатства полоцких иезуитов значительно сократились. Причем самые богатые находились на территории Речи Посполитой. Между тем члены ордена, проживавшие в различных уголках мира, желали приехать в Беларусь. При этом особое внимание обращалось на образовательный уровень, степень обладания теми способностями, которые были необходимы для того, чтобы продолжить развитие школьного дела в новых исторических условиях. Во-вторых, С.Черневич вынашивал планы создания новициата. Разумеется, никаких проблем по этому вопросу быть не могло. Но викариуш хотел лишний раз продемонстрировать свое послушание лично Екатерине II и её окружению. В начале 1777 г. З.Г.Чернышев представил Екатерине II докладную записку о визите к полоцким иезуитам и копию письма С.Черневича. Императрица отреагировала на его просьбу следующим образом: «...повелеваю, чтобы они начали строение новициата». Невзирая на сложные взаимоотношения с белорусским католическим епископом С.И. Сестренцевичем, последний вынужден был опубликовать свое пастырское послание об открытии новициата. В дальнейшем в число новициата попадали самые одаренные. В числе их был Тадеуш Бжосовский – будущий генерал ордена. Большую роль в создании благоприятного климата сыграл визит Екатерины II к полоцким иезуитам. Всеми подготовительными работами, связанными с торжественным приемом императрицы, руководил Габриэль Грубер – выдающийся ученый, который тайно приехал в Полоцк по приглашению иезуитов. Благодаря ему о пребывании Екатерины II в Полоцке стало известно всей Европе.

С.Черневич проявлял большую заботу о школах ордена. Согласно каталогу за 1783 г., в учебных заведениях «Общество Иисуса» в Беларуси преподавались предметы, предусмотренные «Ratio studiorum» 1599 г., а также французский и немецкий языки (в Оршанской – только немецкий). Причем интересно отметить тот факт, что в Могилеве дети в классе инфима изучали немецкий язык, в

классе синтаксис – французский, а риторики продолжали совершенствовать свои познания в обоих языках. Только юноши, обучающиеся в Полоцке, штудировали архитектуру. Во всех остальных коллегиях этот предмет отсутствовал. Так же, как и в предыдущее время, Полоцкая коллегия продолжала занимать ведущее положение в подготовке кадров для ордена. Всего в указанном году обучались 24 клирика. Оршанская коллегия готовила преподавателей риторики. В указанном году их было 5 человек. Среди них находился Никодем Мусьницкий, поэт и преподаватель, получивший впоследствии звание професса.

О состоянии школьных дел «Общества Иисуса» в 1784 г. можно судить по «Кратким ведомостям» (так называется документ, ныне хранящийся в Ватиканском архиве, любезно предоставленный автору крупнейшим историком ордена Л.Пехником). В коллегиях преподавались те же предметы, что и в предыдущем году. Правда, в Полоцкой коллегии было введено новшество: ученики начали изучать русский язык. Составитель документа называет полоцкие школы самыми многочисленными, точно не определяя количество учеников и студентов, обучавшихся в них. Что касается Могилевской и Мстиславской школ, то там обучались по 160 юношей в каждой. Кроме того, витебские иезуиты-педагоги работали в низших классах грамматики в Чечерске и Лозовице. При всех коллегиях, за исключением Оршанской, имелись конвикты. В самом большом из них – Полоцком – в этом году находились 60 воспитанников, в Витебском, Могилевском и Мстиславском – по 12 человек в каждом. В Полоцкой семинарии иезуиты содержали 24 бедных молодых шляхтича.

Примечательным явлением в жизни Полоцкой коллегии в этом же году стало то обстоятельство, что в ней начал работу Габриэль Грубер.

В марте 1785 г. Екатерина II вызвала иезуитов в Петербург, чтобы они ознакомились с новой программой обучения, которую внедрили в учебный процесс австрийские члены ордена. В ней большое значение отводилось изучению естественных наук и математики. Императрица пожелала, чтобы подобные новшества, соответствующие новой эпохе, иезуиты Беларуси внедрили в свою педагогическую деятельность. Для С.Черневича подобное сообщение Екатерины II не было неожиданностью, т.к. Г.Грубер по прибытии в Полоцк ознакомил с ними генерального викария.

Однако в разгар подготовки школьной реформы в результате несчастного случая С.Черневич 20 июля скончался. Екатерина II дала разрешение на проведение Второй Полоцкой конгрегации,

которая проходила с 20 сентября по 2 октября. В её работе участвовали 30 монахов. Конгрегация приняла следующие решения: во-первых, была создана комиссия для разработки дополнений и исправлений в школьный устав (Ratio studiorum); во-вторых, членам ордена, приехавшим в Беларусь, вменялось в обязанность вступать в него повторно; в-третьих, генеральным викарием был избран Габриэль Ленкевич – высокообразованный иезуит, проявлявший особую заботу о школах.

Необходимо отметить и то обстоятельство, что деятельность иезуитских школ находилась в поле внимания властей. Так, в 1786 г. вице-губернатор Полоцкого наместничества А.М.Лунин дважды был с визитом в Полоцкой коллегии. Первый раз – зимой, а второй – в июне. В ходе проведения проверки учащиеся низших классов проявляли глубокие знания. Согласно «Истории Полоцкой коллегии», А.М.Лунин приложил все усилия к тому, чтобы всюду было известно об их успешной работе, в том числе о состоявшемся мероприятии и его результатах было доложено и императрице.

Одним из новых предметов, предусмотренных реформой, явилось введение в программу иезуитских школ русского языка. Он стал изучаться учениками всех учебных заведений ордена в 1787 г. Так, на смену польскому языку, на котором разговаривала местная шляхта, приходил русский. Интересным является и то обстоятельство, что его иезуиты начали преподавать в низших классах средних школ, главным образом, инфима. В Полоцкой школе он усваивался учащимися в классах инфима и грамматики, а в Витебске – ещё в классе синтаксиса. В последующие годы русский язык постепенно приобретал все большее значение.

В 1787 г. иезуиты проводили очередную проверку знаний студентов и учащихся в присутствии полоцкой общественности. Она дала положительные результаты. В феврале этого же года школу посетил могилевский губернатор П.Б.Пассек.

В 1788 г. состоялось очень важное событие в жизни учителей и учащихся Полоцкой коллегии: здание, спроектированное Г.Грубером и построенное под его руководством, вошло в строй. В нем разместились физико-механический музей, кабинет естествознания, химическая лаборатория, картинная галерея и театральный зал с многочисленными декорациями. Грубер вложил недюжинный труд и талант художника в эстетическое оформление музея, украсив его залы фресками. Все залы этого здания служили учебным целям. Учителя проводили в них занятия, демон-

стрировали опыты, редкие экспонаты, доставленные в Полоцк экс-иезуитами из различных стран. Всё это делало уроки педагогов ордена запоминающимися. Слава Полоцкого музея перешагнула границы губернии.

В этом же году вновь была проведена публичная проверка знаний учащихся по литературе и иностранным языкам. Помимо её положительных результатов, руководство коллегии отметило также усердную воспитательную работу магистров низших классов со своими учениками.

К сожалению, автор не располагает ежегодными полными учебными программами всех школьных заведений, а также сведениями о количестве учеников, в них занимающихся. В его распоряжении имеются лишь отрывочные сведения, опубликованные в 1905 г. польским учёным-иезуитом Ф.К.Гижицким. Так, в ноябре 1796 г. в первом классе иезуиты преподавали основы русского и латинского языков, а также арифметики; библейскую историю; начала физической географии; катахезис; учили переводить простейшие произведения классиков античной литературы: басни Федра, наилегчайшие письма Цицерона и других авторов; этику, которая называлась «моральная наука»; орфографию. В указанное время в нем находился 61 ученик.

В объединённом классе грамматики и синтаксиса продолжалось углубленное освоение русского и латинского языков, основ французского и немецкого, продолжалось познание этики и катахезиса; рассказывалось об ассирийском, персидском и греческом государствах; педагоги знакомили учащихся с географическими данными Российской, Османской и Римской империй. Большое внимание уделялось переводам работ Юлия Цезаря, Корнелия Непота, Цицерона и Овидия. Из арифметики основное внимание уделялось освоению простейших действий с дробями. В конце года освещались основные правила стихосложения. В этом классе обучались 66 ребят.

В классе поэзии ученики продолжали заниматься вышеуказанными языками; осваивали основы новых для них наук – алгебры и геометрии; занимались поэзией и риторикой, римской историей, политической географией, естествознанием (historia naturalna), углубляли свои познания в латинском языке и литературе. Учителя уделяли много внимания нравственному воспитанию, рассказывая на своих уроках о требованиях, предъявляемых к настоящим христианам и гражданам своего Отечества. В этом классе обучался 51 человек.

Как выше указывалось, класс риторики был рассчитан на два года. На первом году продолжалось штудирование иностранных языков и естествознания; из новых предметов преподавались теоретическая и практическая механика, военная и гражданская архитектура, баллистика и пиротехника, практическая и теоретическая гидравлика. Учениками осваивались некоторые ремесла, знания которых были необходимы каждому мужчине в жизни, например, столярное дело и т.д.

В классе находились 7 учеников.

На шестом году обучения, т.е., в заключительном классе риторики, обучались 9 учеников. Юноши заканчивали изучение иностранных языков, естествознания, физики, геометрии и этики. Из новых дисциплин преподавались логика, этиология, психология, космология, астрономия.

Таким образом, в ноябре 1796 г. в Полоцкой средней школе обучались 194 ученика.

Шесть слушателей отделения теологии осваивали в этом году догматическую и моральную теологию, церковную историю, каноническое право и Святое письмо. Итак, судя по перечню дисциплин, изучавшихся иезуитскими воспитанниками, к 1796 г. школьная реформа ордена продвинулась вперед.

Дальнейшие события в государстве и «Обществе Иисуса» складывались следующим образом. В ноябре 1796 г. Екатерина II скончалась и на престол вступил Павел I.

Императрица живо интересовалась учебной деятельностью иезуитов, выступая инициатором проведения реформы школьного образования в их учебных заведениях. Разумеется, это обстоятельство сыграло немаловажную роль в развитии педагогических идей, заложенных в «Ratio studiorum», во внутренние дела «Общества Иисуса» она никогда не вмешивалась, но все её самые лучшие побуждения были направлены на то, чтобы сохранить и увековечить основные достижения иезуитских педагогов.

*А.А. Кандратовіч* *г. Мінск*

## СТРУКТУРА БЕЛАРУСКАГА ЭКСПАРТУ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.

Эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII ст. характарызуецца паступовым аднаўленнем гаспадаркі пасля працяглага перыяду дэградацыі эканомікі, выкліканай ваеннымі катак-

лізмамі другой паловы XVII – першай чвэрці XVIII ст. Сельская гаспадарка краіны выйшла на ранейшыя паказчыкі на захадзе і ў цэнтры – да 60-х гадоў, а на ўсходзе – да 70-х гадоў. Калі ў папярэдні перыяд яна насіла ў асноўным натуральны характар, то ў другой палове XVIII ст. павялічваецца яе таварнасць. Найперш гэта тычыцца фальваркаў. Як адзначае В.І.Мялешка, «феадалы ў другой палове XVIII ст. шукалі новыя, дадатковыя сродкі павышэння сваіх прыбыткаў шляхам гандлёвых аперацый. Асобныя з іх імкнуліся падпарадкаваць фальваркавую гаспадарку амаль выключна рынку».

Рост сувязяў фальваркаў быў выкліканы спрыяльнай кан'юнктурай на замежных рынках, якая выяўлялася ў неаднаразовым росце цэн на збожжа. Так, з 1750 па 1795 г. цэны на збожжа ў Гданьску і Караляўцы павялічыліся: на жыта – у 4,5-5, пшаніцу – 3-4, а на авёс і ячмень – у 2-2,5 раза. Сітуацыя на рынку прымушала феадалаў перабудоўваць уласныя гаспадаркі для таго, каб найлепшым чынам прыстасавацца да яго патрэб. Трэба зазначыць, што ў ролі прадаўцоў збожжа на экспарт выступалі не толькі феадалы. У адным з дакументаў канца стагоддзя пры апісанні заняткаў насельніцтва Нясвіжскай акругі гаворыцца: «Жыхары гэтага павета сеюць жыта... Ураджай жа іх бывае нерэгулярны, але здараецца аднаго году благі, на другі пасрэдны, а часам і прыбытковы, і тады гэтую разам з іншымі прадуктамі адвозяць віцінамі і іншымі суднамі да горада Гродна, а адтуль для продажу ў прускія гарады да Караляўца...».

На думку П.Р.Казлоўскага, магнаты хоць і не былі манапалістамі ў хлебным гандлі, аднак, адыгрывалі дамінуючую ролю ў экспарце збожжа. Яго меркаванне грунтуецца на падліках, праведзеных, праўда, ускосным шляхам, паводле якіх на долю магнатаў прыходзілася 66,9 % усяго экспарту жыта.

Важным артыкулам экспартных аперацый была таксама пянька, якая ў значных колькасцях адпраўлялася водным шляхам у прыбалтыйскія парты. Варта адзначыць, што феадалы не проста куплялі прадукты сельскай гаспадаркі, але і перапрадавалі іх потым на замежным рынку. Так, у 1752 – 1754 г. адзін з Радзівілаў закупіў у сваіх сялян, арандатараў і купцоў у Крычаўскім старостве 27 190 пудоў пянькі, з якіх 15 498 пудоў прадаў у Караляўцы. Даволі часта купцы, сярэдняя і дробная шляхта не мелі ўласнага рачнога транспарту, таму яны заключалі фрахт з уладальнікамі суднаў. Так, чытаем у адным з дакументаў, што ў 1757 г. пэўны шляхціц скупіў значную партыю пянькі і збожжа, «а не маючы ўласных віцін і стругаў, даверыў тавар на фрахт да Рыгі яўрэю».

Трэцім важнейшым экспартным сельскагаспадарчым таварам было ільнасемя, якое нярэдка сустракаецца ў дакументах таго часу. Так, у спісу тавараў, дадзеных яўрэем Аронам Бунявенавічам віцебскаму купцу, яўрэю ж Гіршу Юдавічу для сплаву па р.Дзвіне прэзідэнту рыжскага купецтва Бернгарду Гіхельману для выплаты крэдыту значылася 40 салянак ільнасемя.

Тры вышэйзгаданыя прадукты паляводства складалі пераважную большасць беларускага сельскагаспадарчага экспарту ў разглядаемы перыяд, аб чым сведчыць наступная табліца.

*Структура экспарту сельскагаспадарчых прадуктаў з Вялікага княства Літоўскага ў 1785–1791 г.*

| Тавар | **Аб'ём у грашовым выражэнні па асобных групах тавараў, злотыя** |
|---|---|
| **Паляводства** | |
| Зерне | 34.318.516 |
| Лён, пянька | 34.824.218 |
| | 69.142.734 (83,5 %) |
| **Жывёлагадоўля** | |
| Шэрсць | 436.368 |
| Скуры | 1.828.769 |
| Топлены тлушч | 2.044.149 |
| Малочныя прадукты | 461.687 |
| Жывёла і мяса | 5.079.316 |
| Коні | 997.548 |
| | 10.847.837 (13,1 %) |
| **Птушкагадоўля** | |
| Свойская птушка, яйка | 1.156.655 (0,1 %) |
| Пчалярства | |
| Мёд | 342.422 |
| Воск | 1.115.715 |
| | 1.458.137 (1,8 %) |
| **Агародніцтва і садаводства** | |
| Гародніна і садавіна | 336.471 |
| Хмель | 902.602 |
| | 1.239.073 (1,5 %) |
| **Усяго** | **82.803.436 (100 %)** |

Другую значную групу экспартных тавараў складала прадукцыя лясной гаспадаркі. Продаж лесу прыносіў беларускім магнатам значны даход. Менавіта ў другой палове XVIII ст. павялічва-

ецца таварная высечка, выкліканая павышаным попытам краін Заходняй Еўропы на мачтавы лес.

Беларусь аж да апошняй чвэрці XVIII ст. з'яўлялася галоўным пастаўшчыком лесу і лесаматэрыялаў у Рыгу. Звычайна гандаль гэтай прадукцыяй ажыццяўляўся па загадзя заключаных паміж феадаламі і рыжскімі купцамі кантрактах. У дагаворы ўказваліся абавязацельствы абодвух бакоў. Феадал-землеўладальнік браўся паставіць у пэўны тэрмін патрэбны асартымент таварнага лесу і лесаматэрыялаў, а купец, у адпаведнасці з якасцю і колькасцю тавару, – зрабіць аплату. Велічыня платы, г.зн. цана кожнага віду тавару, у дагаворы заўсёды абумоўлівалася. Нярэдка для адбору патрэбнага таварнага лесу рыжскія купцы пасылалі ва ўладанні магнатаў сваіх бракоўшчыкаў («бракераў»). Напрыклад, рыжскі купец Андрэй Крэгер заключыў кантракт з паверaным стацкага саветніка Паўла Левашова Васіліем Ёлшыным на пастаўку з пушч Левашова, спачатку ўверх па Дняпры, потым уніз па Дзвіне ў Рыгу ляснога дубовага тавару. У кантракце Крэгер абавязваўся прыслаць у пушчу свайго бракера і асігнацыю на 200 бочак солі.

Трэба адзначыць, што эксплуатацыя лясных масіваў дасягнула такіх памераў, што пагражала вынішчэннем лясоў. Спажывецкія адносіны да прыроды адлюстроўвае дакумент сярэдзіны XVIII ст., у якім віцебскі ваявода М.Агінскі абавязваў свайго сына, абознага ВКЛ І.Агінскага, выплаціць прыватныя даўгі бацькі з Барысаўскай пушчы, якая дасталася сыну як бацькоўскі дар. Віцебскі ваявода пісаў: «Не трэба тады пушчы шкадаваць, паводле даўняў прымаўкі: «nie będzie nas, będzie las» («не будзе нас, будзе лес»).

Стан, у якім апынуліся беларускія лясы, добра адлюстроўвае ведамасць, складзеная генерал-маёрам Крачэтнікавым для беларускага генерал-губернатара Чарнышова неўзабаве пасля далучэння Усходняй Беларусі да Расійскай імперыі. У гэтай ведамасці гаварылася, што лесу «засталося не вельмі многа, а мачтавага і зусім ужо няма;... прычыны вывядзення лесу адно нядбайнасць, і што кожны, не думаючы пра будучыню, спяшаўся пра ўласны прыбытак...».

Значны прыбытак беларускім магнатам прыносіў экспарт паташу ў Каралявец. Гандаль гэтай прадукцыяй ляснoй гаспадаркі заціхае ў XVII і XVIII ст. Аднак канец XVIII ст. прыносіць нам ізноў ажыўленне ў гэтай галіне ляснoй гаспадаркі. Вываз паташу складаў адну з найважнейшых крыніц даходу велізарных уладан-

няў, атрыманых у спадчыну Д.Радзівілам. У 1790 г. штогадовы экспарт гэтага тавару з маёнтка Чарэс С.Радзівіла прыносіў каля 4,5 тыс.злотых. У 1783 г. Агінскі вывез у Каралявец паташу на 5 тыс. злотых. Магнаты Масальскі, Юдзіцкі, Патоцкі, якія валодалі паташнымі заводамі каля Рэчыцы, таксама накіроўвалі іх прадукцыю ў Каралявец. Паташ экспартавалі з Чарэйскага графства Сапег.

Такім чынам, другая палова XVIII ст. характарызуецца актыўнай знешнегандлёвай дзейнасцю беларускіх магнатаў, купецтва, дробнай і сярэдняй шляхты. Паводле дадзеных літоўскіх гісторыкаў Л.С.Трускі і Р.В.Ясаса, аб'ём усяго экспарту Вялікага княства Літоўскага (без Усходняй Беларусі) з першай паловы 70-х гадоў да 1789–1792 г. павялічыўся ў 1,5 раза. Прадукты сельскай і лясной гаспадарак складалі 96 % экспарту. Вышэйпрыведзеныя лічбы даюць падставы сцвярджаць, што Вялікае княства Літоўскае ў другой палове XVIII ст. выконвала ў сістэме еўрапейскага гандлю ролю пастаўшчыка сыравіны для краін Заходняй Еўропы, у якіх шпаркімі тэмпамі развівалася капіталістычная вытворчасць. Айчынная мануфактурная вытворчасць была скавана феадальнымі рамкамі, таму не магла актыўна выступаць на замежным рынку, і яе прадукцыя экспартавалася ў колькасці, памеры якой у структуры экспарту былі мізэрныя.

*А.У.Мацук* *г. Мінск*

## МАГНАЦКІЯ ГРУПОЎКІ ВА ЎНУТРЫПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ ВКЛ з 1743 па 1749 г.

Праблема ўдзелу магнацкіх груповак ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ з 1741 па 1748 г. у беларускай гістарыяграфіі мала даследавана. Па гэтай тэме ў Беларусі няма ніводнага спецыяльнага даследавання. Праўда, некаторыя даследчыкі ўзгадваюць пэўныя факты па дадзенай праблеме ў сваіх працах, прысвечаных іншым пытанням.

У адрозненне ад Кароны, у ВКЛ магнаты заўжды адыгрывалі вялікую ролю ва ўнутрыпалітычным жыцці дзяржавы. Не змяніла сітуацыі і Люблінская ўнія 1569 г. Наступныя падзеі гісторыі РП толькі ўзмацнілі ролю магнацкіх груповак ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ. Яны спрачаліся паміж сабой за асноўныя дзяржаўныя пасады ў Княстве. Вельмі часта такі ўнутрыпалітычны канфлікт пераходзіў у збройнае супрацьстаянне ў ВКЛ (на-

прыклад, Сапегаў супраць шэрагу магнатаў і шляхты), а таксама ў збройнае ўмяшанне замежных краінаў (напрыклад, прыход шведскіх войск Карла XII на падтрымку пакрыўджаным Сапегам).

Перыяд з 1741 па 1748 г. з'яўляецца нетыповым для гісторыі ВКЛ. У гэты час асноўным магнацкім групоўкам у Княстве, якімі з'яўляліся Радзівілы і Чартарыйскія, удалося дасягнуць пэўнай згоды па асноўных унутрыпалітычных пытаннях, што абвяргае ўсталяваўшуюся ў айчыннай гістарыяграфіі думку аб перманентным унутрыпалітычным канфлікце ў ВКЛ на працягу ўсяго XVIII стагоддзя.

Збліжэнне паміж Радзівіламі і Чартарыйскімі мела некалькі прычын. Знешнепалітычныя абставіны (захоп Прусіяй у 1741 г., падчас вайны за Аўстрыйскую спадчыну 1741–1745 г.) паскорылі збліжэнне Чартарыйскіх з дворскай партыяй. Радзівілы ўжо даўно карысталіся падтрымкай двара і асабіста караля, бо ў свой час Мікалай Радзівіл Рыбанька быў адным з нешматлікіх літоўскіх магнатаў, які не прызнаў абранне на каранацыйным сойме 1733 г. каралём Станіслава Ляшчынскага, а пасля стаў адным з кіраўнікоў апазіцыі, абвясціўшай каралём Аўгуста III. Аднак прыхільнае стаўленне двара не магло яшчэ прымірыць Радзівілаў і Чартарыйскіх.

